Belarus. The epoch of the Grand Duchy of Lithuania. An illustrated history. Vilnius, 2018.

Faszination Belarus: illustrierte Geschichte eines unbekannten Landes. Kaunas, 2018.

Айчына: маляўнічая гісторыя. Ад Рагнеды да Касцюшкі. Мінск, 2016; 2017; 2019.

Уладзімір Караткевіч: прарок беларушчыны. Мінск, 2016.

Patria aeterna: apaviadańni. Miensk, 2015.

Ад Полацка пачаўся свет. My Polacak, the Cradle of the World. Мінск, 2014.

Краіна Беларусь: Вялікае Княства Літоўскае. Ілюстраваная гісторыя. Браціслава (Славакія), 2012; 2013.
This country called Belarus. An Illustrated History. Bratislava, 2013.
Страна Беларусь. Иллюстрированная история. Братислава, 2013
Пакуль ляціць страла. [Б. м.], 2012.
Ля Дзікага Поля. Гістарычныя апавяданні. Аповесць. Эсэ. Мінск, 2010.
Паўстанцы. Аўдыёкніга, 2008.
Імёны Свабоды. [Б. м.], 2007; дапоўненыя выданні: 2011; 2015; 2020.
Kochanek jej wysokości. Wrocław. 2006.
Ад Полацка пачаўся свет. Гістарычныя эсэ. Мінск, 2005.
Час чумы. Гістарычныя аповесці. Апавяданні. Мінск, 2005; Аўдыёкніга, 2006.
Каханак яе вялікасці. Гістарычныя апавяданні. Эсэ. Мінск, 2004.
Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя. Марцін (Славакія), 2003; Браціслава, 2012; 2013.
Сны імператара. Апавяданні. Аповесці. Эсэ. Мінск, 2001; Аўдыёкніга, 2008.
Еўфрасіння Полацкая. Жыццяпіс і даследаванне спадчыны Асветніцы. Мінск, 2000.
Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны. Гісторыя Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай. Животворный символ Отчизны. История креста святой Евфросинии Полоцкой. Мінск, 1998.
Адкуль наш род. Апавяданні. Мінск, 1996; Вільня, 2000; 2003; Аўдыёкніга, 2007.
Тайны полоцкой истории. Минск, 1995; 2012.
Таямніцы полацкай гісторыі. Гістарычныя эсэ. Мінск, 1994; 2000; 2002; Аўдыёкніга, 2008 (увайшла спіс 100 самых папулярных беларускіх кніг XX ст.).
Еўфрасіння Полацкая. Евфросиния Полоцкая. Мінск, 1992.
Прысуд выканаў невядомы. Ігнат Грынявіцкі. Мінск, 1992.
“Совершенно секретно”, альбо Адзін у трох іпастасях. Літаратурна-публіцыстычныя артыкулы. Эсэ. Мінск, 1992.
Міласць князя Геранiма. Аповесці. Апавяданні. Мінск, 1992.
Асветніца з роду Усяслава. Ефрасіння Полацкая. Мінск, 1989.
День, калі ўпала страла. Аповесці і апавяданні. Мінск, 1988.

***Удзел у калектыўных працах:***
Десять веков белорусской истории. 862–1918. События. Даты. Иллюстрации. Вильня, 2001.
Дзесяць вякоў беларускай гісторыі 862–1918. Падзеі. Даты. Ілюстрацыі. Вільня, 1999; 2000; 2002 (увайшла спіс 100 самых папулярных беларускіх кніг ХХ ст.).

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі (1986). Медаль Францыска Скарыны "за ўклад у распрацоўку тэмы гістарычнага мінулага Беларусі ў літаратуры" (1991). Прэмія імя Уладзіміра Караткевіча (1993). Літаратурная прэмія імя Францішка Багушэвіча Беларускага ПЭН-цэнтра (1996). Прэмія Таварыства вольных літаратараў "Гліняны Вялес" (1998). Прэмія Барыса Кіта (2004). Прэмія імя Васіля Быкава "За свабоду думкі" (2008). Міжнародная літаратурная прэмія "Еўрапейскі паэт свабоды" (2010). Прэмія "Залаты апостраф" часопіса "Дзеяслоў" (2015). Срэбны медаль "Zasłużony Kulturze Gloria Artis" (Польшча, 2015). Міжнародная літаратурная прэмія "Алеко" (Балгарыя, 2016). Літаратурная прэмія імя Алеся Адамовіча Беларускага ПЭН-цэнтра (2016). Прэмія Цёткі (2017). Літаратурная прэмія імя Ежы Гедройца (2018). Медаль "100 гадоў БНР" Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (2019).



## АСІНОЎСКІ Святаслаў Маркавіч
(псеўданімы: Алесь Соніч,
Алесь Смаляніч, Васіль Заранок)

Пісьменнік, журналіст, краязнаўца, гісторык, у творчасці якога пераважае ўвага да падзей і асоб ВКЛ XIV–XVI ст. Член Саюза журналістаў Беларусі (1986). Член Археаграфічнай камісіі Камітэта па архівах і справаводству (2000).

**Тэматыка гісторыка-літаратурнай творчасці**: гісторыя ВКЛ, падзеі і постаці гісторыі Беларусі XI–XIX ст., дзейнасць вялікіх князёў літоўскіх, гісторыя Віцебшчыны, аршанская даўніна.

Нарадзіўся 21.09.1951, в. Смаляны Аршанскага раёна Віцебскай вобласці.

***Адукацыя***: факультэт журналістыкі БДУ (1973), рэдактарскае аддзяленне Ваенна-гуманітарнай акадэміі ў Маскве (1990).

***Працоўная дзейнасць.*** Служба ва Узброеных сілах СССР (1973–1994): прафесійны ваенны, палкоўнік. Газета Беларускай ваеннай акругі "Во славу Родины" (1984–1994): карэспандэнт аддзела баявой падрыхтоўкі і жыцця войск, адказны сакратар. Часопіс "Беларуская мінуўшчына" (1994–1998): намеснік галоўнага рэдактара. Часопіс "Архівы і справаводства" (з 1999): арганізатар і галоўны рэдактар.

***Асноўныя творы:***

Што раньш было...: гісторыка-краязнаўчыя нарысы. Мінск, 2008.
Поле памяці: падзеі і постаці беларускай мінуўшчыны. Мінск, 1999.
Мінск: Даведнік. Мінск, 1999.
Орша: залатыя стрэлы на блакітным полі: ілюстраваны хроналагічны даведнік. Мінск, 1997.
Там, дзе была Неўрыда. Мінск, 1996.

***Удзел у калектыўных працах:***

Евреи: По страницам истории. Мінск, 1997.

## БАНДАРЧЫК Васіль Кірылавіч



Этнолаг, гісторык. Спецыяліст па гістарыяграфіі паходжання і этнічнай гісторыі беларусаў. Член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР (1972). Доктар гістарычных навук (1965), прафесар (1978). Спецыяліст па гісторыі беларускай этналогіі. Заслужаны работнік культуры БССР (1980). Ганаровы член Польскага этнаграфічнага таварыства (1970). Член адміністрацыйнага савета Міжнароднага таварыства этналогіі і фальклору Еўропы (1982). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя беларускай этнаграфіі; этнагенез і этнічная гісторыя беларусаў; матэрыяльная і духоўная

культура беларусаў; іх фальклор, рэлігійныя вераванні, сямейны і грамадскі побыт.

1.08.1920, в. Кірава, Слуцкі раён, Мінская вобласць – 16.02.2009.

***Адукацыя***: Слуцкае педагагічнае вучылішча (1939), гістарычны факультэт БДУ (1952), аспірантура Інстытута літаратуры, мастацтва і мовы АН БССР (1959).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Е. Р. Раманаў як беларускі этнограф" (1958).

***Доктарская дысертацыя:*** "Гісторыя беларускай этнаграфіі другой паловы XIX – пачатку XX ст." (1965).

***Працоўная дзейнасць.*** СШ № 37 Мінска (1952–1957): настаўнік, дырэктар. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (1959–2005): навуковы супрацоўнік, намеснік дырэктара, дырэктар, загадчык аддзела этнаграфіі, дарадца пры дырэкцыі інстытута, галоўны навуковы супрацоўнік.

***Асноўныя працы:***

Беларусы: у 8 т. Т. 3: Гісторыя этналагічнага вывучэння. Мінск, 1999 (прэмія НАН Беларусі, 1999).
Развіццё беларускай этнаграфіі за гады савецкай улады. Мінск, 1979.
Гісторыя беларускай савецкай этнаграфіі. Мінск, 1972.
Гісторыя беларускай этнаграфіі, пачатак XX ст. Мінск, 1970.
Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. Мінск, 1964.
Еўдакім Раманавіч Раманаў. Мінск, 1961.

***Удзел у калектыўных працах:***

Нарысы гісторыі культуры Беларусі: у 4 т. Т. 3: Культура сяла XIV – пачатку XX ст. Кн. 1: Матэрыяльная культура. Мінск, 2015.
Беларусы: у 8 т. Т. 1: Прамысловыя і рамесныя заняткі. Мінск, 1995; Т. 4: Вытокі і этнічнае развіццё. Мінск, 2001; Т. 5: Сям'я. Мінск, 2001.
Белорусы. Москва, 1998.
Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі. Мінск, 1993.
Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. Мінск, 1990.
Сям'я і сямейны быт беларусаў. Мінск, 1990.
Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1989.

Полесье. Материальная культура. Киев, 1988.
Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. Мінск, 1985.
Промыслы і рамёствы Беларусі. Мінск, 1984.
Этнические процессы и образ жизни: на материалах исследования населения городов БССР. Минск, 1980.
Изменения в быту и культуре городского населения Белоруссии. Минск, 1976.
Изменения в быту и культуре сельского населения Белоруссии. Минск, 1976.
Беларускае народнае адзенне. Мінск, 1975.
Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. Мінск, 1974.
Беларускае народнае жылле. Мінск, 1973.
А. К. Сержпутовский. Минск, 1966.
Николай Яковлевич Никифоровский: очерк жизни и деятельности. Минск, 1960.

***Узнагароды, прызнанне.*** Ордэн Айчыннай вайны (1985). Медаль "За абарону Масквы". Медаль "За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 г.". Прэмія НАН Беларусі (1999). Медаль Францыска Скарыны (2001).

***Прысвечана вучонаму***: Бандарчык В. К. Выбраныя працы па гістарыяграфіі паходжання і этнічнай гісторыі беларусаў: да 100-гадовага юбілею. Мінск, 2020.

## БАРЭЙША Юрый Леанідавіч



Гісторык, нумізмат. Спецыяліст у галіне нумізматыкі ВКЛ XIV – сярэдзіны XVI ст.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя ВКЛ XIV–XVI ст., гісторыя эліт, сярэднявечная генеалогія, геральдыка і нумізматыка, гісторыя праваслаўнай царквы.

Нарадзіўся ў 1970 г.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1994).

***Асноўныя працы:***
Княжанне Дзмітрыя-Карыбута ў Новагарадку (1382–1393 гг.) па сведчаннях прасапаграфіі і нумізматыкі. Мінск, 2021.
О хронологии правления князей в Полоцке во второй половине XIII в: несколько замечаний и уточнений в связи с новым изданием “Полоцких грамот”. Минск, 2018.
Волынские монеты Федора Любартовича в свете кладовых данных и реконструкции символики Галицко-Волынского государства. Минск, 2015.
Мсціслаўскі манетны двор Алелькавічаў – Бельскіх “Пісараўшчына” вясны 1482 г.: хроніка змовы 1480–1482 гг. па нумізматычных матэрыялах. Мінск, 2010.
***Удзел у калектыўных працах:***
Трэція навуковыя чытанні памяці прафесара Валянціна Навумавіча Рабцэвіча (1934–2008): тэзісы дакладаў, Мінск, 16–18 мая 2018 г. Мінск, 2018.
“Мстиславские монеты”: монеты заговора Михаила Олельковича 1481 г. Минск, 2009.
О надчеканках “Колюмн” Витовта Кейстутовича и Свидригайлы Ольгердовича. Минск, 2009.
Смоленские монеты Витовта и Романа Михайловича. Каунас: Минск, 2008.



**БАЎТОВІЧ Міхаіл Мікалаевіч**
(псеўданімы: С. Нарушэвіч, М. Равіч, Х. Ясная, І. Янкоўскі)

Краязнаўца, археограф, выдавец. Спецыяліст па гісторыі Полацкай зямлі ў XVI–XIX ст. Старшыня полацкага гістарычнага клуба “Вытокі” (1989–2003).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя Полацка і наваколляў з прыярытэтнай увагай да канфесійнай, генеалагічнай і вайсковай тэматыкі; аналіз, пераклад, публікацыя гістарычных крыніц,

звязаных з Полацкай зямлёй XVI–XIX ст. (перапіска архепіскапа Язафата Кунцэвіча, забойства манахаў у Сафійскім саборы ў 1705 г.; інш.); ахова і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны краю.

Нарадзіўся 21.11.1957, Полацк.

***Адукацыя:*** факультэт аўтаматыкі і вылічальнай тэхнікі Рыжскага політэхнічнага інстытута (1980).

***Працоўная дзейнасць.*** Наваполацкі завод “Вымяральнік” (1980–1992): інжынер-канструктар, начальнік канструктарскага бюро. Полацкі гарадскі раён электрасетак: начальнік дыспетчарскай службы.

***Асноўныя працы:***

Кнігадрук у Полацку (1772–1829): бібліяграфічнае выданне. Полацак, 2018.

Эпісталяцыя Сьвятога Язафата: Збор дакумэнтаў. Полацак, 2006.

Полацкія пакутнікі: Збор дакумэнтаў. Полацак, 2000.

***Удзел у калектыўных працах:***

Сядзібы Віцебшчыны: даведнік. Мінск, 2020.

Дэйніс І. П. Полацкая даўніна. Мінск, 2007.

Архіў уніяцкіх мітрапалітаў: дакументы да гісторыі царквы ў Беларусі XVI–XX стст. у фондах гістарычных архіваў Літвы і Расіі: даведнік. Мінск, Полацк, 2005.

Архіў уніяцкіх мітрапалітаў: дакументы да гісторыі царквы ў Беларусі XVI–XX стст. у фондах гістарычных архіваў Украіны: даведнік. Мінск, Полацк, 2001.

Пануцэвіч В. Сьвяты Язафат, архіяпіскап полацкі. Полацак, 2000.

Архіў уніяцкіх мітрапалітаў: дакументы да гісторыі царквы ў Беларусі XV–XIX стст. у фондзе “Канцылярыя мітрапаліта грэка-уніяцкіх цэркваў у Расіі”: даведнік. Мінск, Полацк, 1999.

Вянок акафістаў. Полацак, 1999.



## БЕКЦІНЕЕЎ Шаміль Іршатавіч

Гісторык, археолаг, нумізмат. Спецыяліст па гісторыі грашовага абарачэння і метралогіі на тэрыторыі Беларусі ў X–XVI ст. Кандыдат гістарычных навук (1989). Член Беларускага нумізматычнага таварыства.

**Напрамкі даследаванняў:** нумізматыка, перыядызацыя грашовага абарачэння і грашовыя сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў X–XVI ст., методыка метралагічнай рэканструкцыі вагаў, гісторыя напалеонаўскіх войнаў (1796–1815), палкавыя гісторыі фарміраванняў расійскай арміі з беларускімі найменнямі (1772–1918), гісторыя татараў і казацтва Расійскай імперыі.

Нарадзіўся 31.08.1947, г. Патсдам, Германія.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1977).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** “Гандлёвыя сувязі гарадоў і грашовае абарачэнне на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў X–XV стст. (паводле археалагічных, нумізматычных і пісьмовых звестак)” (1989).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі АН БССР / НАН Беларусі (1970–2015): мастак-рэстаўратар, старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу, старшы навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных дысцыплін.

***Асноўныя працы:***

Денежное обращение на территории Беларуси в IX–XVI веках: нумизматические исследования. Минск, 2014; 2018.

Формирование российской армии с белорусскими наименованиями. Минск, 1999.

Денежное обращение Великого княжества Литовского в XIII–XV вв. Минск, 1994.

***Удзел у калектыўных працах:***

Банкаўская справа Беларусі. Гісторыя. Мінск, 2017; 2018.

Друцк: Друцк и Друцкая волость (княжество) в IX–XII вв.: летопись древних слоев: князья Друцкие и их владения в XIII–XVIII вв.: ремесло, промыслы, торговля (по данным археологии, нумизматики, письменных источников): памятники архитектуры и объекты туризма. Минск, 2014.
Полоцк. Минск, 2012.
Археалогія Беларусі: у 4 т. Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. Мінск, 2001.

## БЕЛЫ Алесь (Аляксандр Валер'евіч)
(Псеўданімы: Кухмістр Верашчака, Gorliwy Litwin)



Гісторык, публіцыст, культуролаг. Спецыяліст па праблеме лакалізацыі, паходжання і эвалюцыі зместу назвы "Белая Русь" у XIII–XVIII ст. Знаўца гісторыі і сімволікі традыцыйнай кухні Беларусі. Кансультант прадпрыемстваў грамадскага харчавання і вытворцаў прадуктаў па пытаннях беларускай і літвінскай гастранамічнай спадчыны. Кандыдат гістарычных навук (2008). Блогер.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя картаграфіі; іканаграфія ВКЛ і Беларусі Сярэднявечча і Новага часу; гісторыя назвы "Белая Русь"; гісторыя дыпламатыі і замежных сувязяў ВКЛ; заходнееўрапейскі культурны, тэхналагічны і эканамічны ўплыў на фарміраванне матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі; гісторыя кулінарыі і гастранаміі.

Нарадзіўся 17.02.1968, Мінск.

***Адукацыя:*** Беларускі політэхнічны інстытут (1989), Кінгстанская школа бізнесу (1996, Велікабрытанія).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Лакалізацыя хароніма Белая Русь паводле заходнееўрапейскіх тэкставых і картаграфічных крыніц XIII – сярэдзіны XVIII стагоддзяў" (2008, Клайпедскі ўніверсітэт, Літва).

***Асноўныя працы:***
Белорусская кухня. Гастрономический путеводитель.
Мінск, 2018; 2020.
Таямніцы Налібоцкай Пушчы: міні-энцыклапедыя. Мінск, 2018.
Спадчына: традыцыі беларускай кухні. Б. м., 2018.
Сакатала бочачка. Праўдзівая гісторыя нашых напояў. Мінск, 2017.
Літвінская кухня (электронная кніга). 2016.
Хроніка Белай Русі: Імагалогія Беларусі XII–XVIII ст. Смаленск, 2013.
The Belarusian cookbook. New York, 2008.
Хроніка "Белай Русі": нарыс гісторыі адной геаграфічнай назвы. Мінск, 2000.

***Удзел у калектыўных працах:***
Наша страва. Сапраўдная беларуская кухня. Мінск, 2009; 2010.
Энцыклапедыя беларускай кухні. Мінск, 2009.
Энциклопедия белорусской кухни. Минск, 2008.

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэмія імя Францішка Багушэвіча беларускага ПЭН-цэнтра (2001). Прэмія Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі за лепшую манаграфію па гісторыі (2014).



## БЕНЗЯРУК Анатоль Расціслававіч

Гісторык, краязнаўца, пісьменнік, журналіст. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (2007). Член Беларускага саюза журналістаў (2012).

**Тэматыка гісторыка-літаратурнай творчасці:** гісторыя роднага краю (Брэсцкая вобласць, Жабінкаўскі раён), асоба Тадэвуша Касцюшкі.

Нарадзіўся 4.01.1969, в. Бастынь Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт ГрДУ імя Я. Купалы (1994), Інстытут журналістыкі БДУ (2011).

***Працоўная дзейнасць.*** Якаўчыцкая СШ Жабінкаўскага раёна (1991–1998): настаўнік гісторыі. Жабінкаўскі райвыканкам (1998–2005): спецыяліст і вядучы метадыст па ахо-

ве гісторыка-культурнай спадчыны аддзела культуры. Рэдакцыя жабінкаўскай раённай газеты “Сельская праўда”: загадчык аддзела пісьмаў і сацыяльных праблем.

***Асноўныя творы:***

Мячы Грунвальда, альбо Дванаццаць абаронцаў караля: аповесць пра гераічны час і славутых рыцараў. Мінск, 2012.

Свята для сэрца: невялікія гісторыі для юных беларусаў. Мінск, 2009.

Крупчыцы. 1794 год: падзеі і памяць роднай гісторыі. Брэст, 2007.

Касцюшкі-Сяхновіцкія: гісторыя старадаўняга роду. Брэст, 2006.

Памяць нашае зямлі: гісторыка-культурныя мясціны Жабінкаўскага раёна. Брэст, 2002.

Наш край – Жабінкаўшчына: дапаможнік па гісторыі Беларусі. Брэст, 1996.

***Удзел у калектыўных працах:***

Сорак дарог: [пра вядомых нараджэнцаў Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці]. Брэст, 2007.

Дарогамі роднага краю: Турыстычныя маршруты Жабінкаўскага раёна. Брэст, 2007.

Колодец памяти: документальная повесть. Брест, 2006.

Памяць. Жабінкаўскі раён. Мінск, 1999.

***Узнагароды*** (за працы па краязнаўстве і ахове гісторыка-культурнай спадчыны)***, прызнанне.*** Прэмія Брэсцкага фонда Тадэвуша Касцюшкі (1996). Грамата Міністэрства культуры (2003). Лаўрэат рэспубліканскага літаратурнага конкурса “Лепшы твор 2009 года” (2010). Літаратурная прэмія імя Уладзіміра Калесніка (2010). Пераможца ў Конкурсе журналісцкага майстэрства Брэсцкага аблвыканкама ў намінацыі “Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны” (2011). Ганаровы знак “Залаты фаліянт” на нацыянальным конкурсе “Мастацтва кнігі” (2013). Званне “Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі” (2014).



## БІДНАЯ Ганна Аляксандраўна

Гісторык. Спецыяліст па гістарычнай думцы ВКЛ другой паловы XVI – пачатку XVII ст. Кандыдат гістарычных навук (2009).

**Напрамкі даследаванняў:** класічная філалогія, неалатыністыка, гістарычныя творы ВКЛ XVI – пачатку XVII ст., сярэднявечная гістарыяграфія Беларусі.

Нарадзілася 29.09.1977.

***Адукацыя:*** філалагічны факультэт (спецыяльнасць "класічныя мовы і антычная літаратура") ГрДУ імя Я. Купалы (1999), аспірантура пры кафедры ўсеагульнай гісторыі ГрДУ імя Я. Купалы (2007).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Генезіс гістарычнай навукі ў Вялікім Княстве Літоўскім і фарміраванне гістарычнай свядомасці грамадства (XVI – пачатак XVII стст.)" (2009).

***Працоўная дзейнасць.*** ГрДУ імя Я. Купалы (з 1999): лабарант, выкладчык кафедры класічнай філалогіі, выкладчык кафедры англійскай філалогіі, выкладчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства, начальнік аддзела па працы з замежнымі студэнтамі і акадэмічнай мабільнасці Цэнтра інтэрнацыяналізацыі адукацыі.

***Удзел у калектыўных працах:***

Народы и культуры славянского мира Восточной Европы в исторической ретроспективе (Беларусь, Украина, Россия, Польша): [сборник научных статей, посвященный 70-летию профессора, доктора исторических наук Д. В. Карева]. Гродно, 2020.

Беларусь, Расія, Украіна: дыялог народаў і культур: зборнік навуковых артыкулаў. Гродна, 2013.

## БЛІНОВА Тамара Барысаўна



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі адукацыйнай дзейнасці ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі (XVI–XVIII ст.). Кандыдат гістарычных навук (1979), дацэнт (1982).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя каталіцкай царквы і ордэна езуітаў; гісторыя Беларусі XVI–XVIII ст., звязаная з дзейнасцю ордэна езуітаў.

Нарадзілая 29.07.1950, Брэст.

***Адукацыя:*** гісторыка-педагагічны факультэт (1972) і аспірантура (1978) Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Я. Купалы, дактарантура Інстытута гісторыі АН Беларусі (1993).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** “Ордэн езуітаў у Беларусі – буйны вотчыннік і эксплуататар народных мас (1570–1774 гг.)” (1979).

***Працоўная дзейнасць.*** ГрДУ імя Я. Купалы (1972–2004): лабарант, выкладчык, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі.

***Асноўныя працы:***

Иезуиты в Беларуси: роль иезуитов в организации образования и просвещения. Гродно, 2002.

Иезуиты в Белоруссии. Минск, 1990.

## БОХАН Юрый Мікалаевіч



Гісторык-медыевіст, археолаг. Спецыяліст па гісторыі ўзбраення і арганізацыі войска ВКЛ у XIV–XVI ст. Заснавальнік гістарычнага зброязнаўства перыяду Сярэднявечча як напрамку беларускай гістарыяграфіі. Зрабіў гэту сферу мінулага цікавай для многіх аматараў гісторыі і карыснай для руху гістарычнай рэканструкцыі. Доктар гістарычных навук (2003), дацэнт (2008).

**Напрамкі даследаванняў:** урбаністычнае развіццё беларускіх зямель у XV–XVIII ст., гісторыя ваеннай справы ВКЛ, палітычная і ваенная гісторыя ВКЛ XIII–XVI ст., гісторыя паўсядзённасці XV–XVII ст., побыт феадалаў ВКЛ.

21.02.1966, Мінск – 13.04.2017.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт МДПІ імя М. Горкага (спецыяльнасць "гісторыя і замежная мова", 1990), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1993).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Мястэчкі вярхоўяў Віліі і нёманскай Бярэзіны ў XV–XVIII стст. (па археалагічных і пісьмовых крыніцах)" (1994).

***Доктарская дысертацыя:*** "Узбраенне і арганізацыя войска Вялікага княства Літоўскага ў другой палове XIV – канцы XVI ст." (2003).

***Працоўная дзейнасць.*** СШ в. Грэбень Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці (1990): настаўнік англійскай мовы. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (1993–2004): навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст., выконваючы абавязкі загадчыка, загадчык гэтага аддзела. Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт: загадчык кафедры эканамічнай гісторыі (2004–2017). Адначасова БДУ, гістарычны факультэт: прафесар.

Выкладаў у Інстытуце гісторыі Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

***Асноўныя працы:***

Мястэчкі і працэсы ўрбанізацыі на землях Беларусі ў XV–XVIII стст. / уклад. М. А. Волкаў Мінск, 2018; 2020.

Узбраенне насельніцтва беларускіх зямель у XIV–XVI стагоддзях. Мінск, 2012.

Ваяры Грунвальдскай бітвы. Мінск, 2010.

Турнірныя традыцыі ў Вялікім княстве Літоўскім у XIV–XVI стагоддзях. Мінск, 2008.

Вайсковая справа у Вялікім княстве Літоускім у другой палове XIV – канцы XVI стст. Мінск, 2008.

Наёмнае войска ў Вялікім княстве Літоўскім у XV–XVI стст. Мінск, 2004.

Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385–1576. Мінск, 2003.

Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. Мінск, 2002.

***Удзел у калектыўных працах:***

Прыпяцкае Палессе. Мінск, 2016.

Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 1: Культура сацыяльнай эліты XIV – пачатак XX ст. Мінск, 2013.

Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя. Мінск, 2011.

Беларусь: Народ. Государство. Время. Минск, 2009.

Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2008; Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст). Мінск, 2004.

Гісторыя Мінска. Мінск, 2006.

Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. Мінск, 2001.

***Навучальныя дапаможнікі (у сааўтарстве):***

Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XV ст.: вучэбны дапаможнік для 6-га класа: у 2 ч. Мінск, 2016.

Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый. Мінск, 2005; 2007; 2009; 2013.

История Беларуси: в контексте мировых цивилизаций. Минск, 2011.

Гісторыя Беларусі: другая палова XIII – першая палова XVI ст.: вучэбны дапаможнік для 7-га класа. Мінск, 2009.

## БРЭГЕР Герман Максімавіч



Гісторык-медыевіст, архівіст, археограф. Спецыяліст па архіўнай спадчыне ВКЛ XVI–XVIII ст. і рэканструкцыі на яе аснове гісторыі шляхты, населеных пунктаў, культавых установ. Член Археаграфічнай камісіі Дэпартамента па архівах і справаводству.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя дзяржаўных установ ВКЛ XVI–XVIII ст.; гісторыя шляхты і населеных пунктаў

Ашмянскага і іншых паветаў; археаграфічная апрацоўка актавых кніг Метрыкі ВКЛ, земскіх і гродскіх судоў ВКЛ; гістарычнае краязнаўства.

Нарадзіўся 31.10.1962, Мінск.

***Адукацыя:*** Беларускі політэхнічны інстытут (1988).

***Працоўная дзейнасць.*** Будаўнічыя і праектна-канструктарскія ўстановы Мінска. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (1994–1995). Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (з 1997), аддзел старажытных актаў, аддзел публікацыі дакументаў: вядучы палеограф, галоўны архівіст.

***Асноўныя працы:***

Хацюхова: Гісторыя невялікага паселішча. Мінск, 2001.

***Удзел у калектыўных працах:***

Валовічы герба "Багорыя". Мінск, 2019; 2020 (Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі).

Мір Радзівілаў: замак, мястэчка, графства: (1568–1813 гг.): зборнік дакументаў і матэрыялаў. Мір, 2017.

Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565 гг.): палітык, дыпламат, мецэнат: зборнік навуковых прац [да 500-годдзя Мікалая Радзівіла Чорнага]: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, Нясвіж, 28–29 мая 2015 г. Нясвіж, 2016.

Прыватнаўласніцкія гарады Вялікага Княства Літоўскага: лёс праз стагоддзі: матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Нясвіж, 23–24 красавіка 2014 г. Мінск, 2014.

Крыштаф Монвід Дарагастайскі. Гіпіка, альбо Кніга пра коней: пераклад з польскай і лацінскай моў. Мінск, 2007.

Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 2. Мінск, 2007.

## БУЛАТЫ Павел Юр'евіч



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі Ляхавіцкага графства ў XVI–XVIII ст. Кандыдат гістарычных навук (2018).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя ВКЛ, канфесійная гісторыя Беларусі, культурна-гістарычная спадчына Беларусі, рэгіянальны турызм, экскурсійная дзейнасць.

Нарадзіўся 18.05.1993, Ляхавічы.

***Адукацыя:*** Інстытут турызму (спецыяліст у сферы турызму і гасціннасці, 2014) і магістратура (спецыяльнасць "кіраванне інавацыйнымі праектамі", 2015) Установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры". Аспірантура Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, кафедра гісторыка-культурнай спадчыны (спецыяльнасць "даследчык айчыннай гісторыі", 2018).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Ляхавіцкае графства ў сістэме магнацкіх уладанняў (XVI–XVIII ст.)" (2018).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут менеджменту спорту і турызму Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры: дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у турызме і гасціннасці.

***Асноўныя працы:***

Ляхавіцкае графства ў сістэме магнацкіх уладанняў (XVI–XVIII ст.). Мінск, 2020.

Туристический бренд Республики Беларусь: теоретические аспекты и проектные разработки. Saarbrücken, 2014.

По дорогам Литвинского предполесья: историко-краеведческое описание городов, замков, местечек, деревень исторического региона Беларуси. Saarbrücken, 2012.

**БУТЭВІЧ Анатоль Іванавіч**
(псеўданімы: Максім Валошка,
Анатоль Баярскі, Міша Алімпік)



Дзяржаўны дзеяч, дыпламат, пісьменнік, публіцыст. Аўтар кніг гісторыка-дакументальнага жанру і гістарычнай прозы. Кандыдат навук у галіне інфармацыйных тэхналогій. Член Беларускага саюза журналістаў (1972), Саюза беларускіх пісьменнікаў (1994). Заслужаны журналіст (2008). Ганаровы грамадзянін горада Нясвіжа (2015). Намеснік старшыні Беларускага фонда культуры.

**Тэматыка гісторыка-літаратурнай творчасці:** гістарычная публіцыстыка, крытыка, пераклад, гісторыя Беларусі ад старажытнасці, гістарычнае мінулае роднага краю, матэрыяльныя сведчанні даўняга жыцця.

Нарадзіўся 15.06.1948, хутар Язавец, Нясвіжскі раён, Мінская вобласць.

***Адукацыя:*** аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта БДУ (1971).

***Працоўная дзейнасць.*** Беларускае тэлеграфнае агенцтва (1971–1973): рэдактар. Газета “Чырвоная змена” (1975–1979): намеснік рэдактара. Рэспубліканскае выдавецтва “Мастацкая літаратура” (1986–1987): дырэктар. ЦК ЛКСМБ (1973–1975, 1979–1980). ЦК КПБ (1980–1986, 1987–1990). Дзяржаўны камітэт па друку (1990–1992): старшыня. Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь (1992–1994). Міністр культуры і друку Рэспублікі Беларусь (1994–1996). Генеральны консул Рэспублікі Беларусь у Гданьску (1996–1998). Надзвычайны і паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь у Румыніі (1998–2000). Банк міжнароднага гандлю і інвестыцый (2001–2009): саветнік старшыні. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2009): галоўны спецыяліст упраўлення мастацтваў.

***Асноўныя творы:***

**Серыя "Сем цудаў Беларусі":** У гасцях у вечнасці. Мінск, 2001; 2021; Званы Нямігі. Мінск, 2002; За наміткай гісторыі. Мінск, 2003; Адвечны покліч Радзімы. Мінск, 2004; Славутыя родам сваім. Мінск, 2006; Перуновага племені дзеці. Мінск, 2008; На далонях вечнасці. Мінск, 2010 (у сааўтарстве).

Тайны Несвижского замка. Путешествие вглубь столетий с Владиславом Сырокомлей. Минск, 2019.

Жанчыны з легенды. Мінск, 2017.

Таямніцы Крэўскага замка. Падарожжа па нашай гісторыі з Вітаўтам Вялікім. Мінск, 2015.

Тайны Мирского замка. Путешествие по древней фортеции с Адамом Мицкевичем. Минск, 2014.

Таямніцы Нясвіжскага замка. Падарожжа ўглыб стагоддзяў з Уладзіславам Сыракомлем. Мінск, 2013.

Я адной табе належу. Мінск, 2013.

Паміж Княствам і Каронай. Мінск, 2013.

Таямніцы Мірскага замка. Падарожжа па сівых мурах з Адамам Міцкевічам. Мінск, 2011.

Каралева не здраджвала каралю, або Каралеўскае шлюбаванне ў Новагародку. Раман. Мінск, 2009.

Раскіданае гняздо крывіцкай славы. Мінск, 2008.

Пад небам беларускага слова. Пра пісьменнікаў, літаратуру і не толькі. Мінск, 2007.

Мірскі замак. Мінск, 2003.

***Пераклады твораў, звязаных з гісторыяй Беларусі:***

Радзівіл Багуслаў. Аўтабіяграфія. Мінск, 2009.

Курыльчык Рышард. Славянскі світанак. Мінск, 2007.

***Узнагароды, прызнанне.*** Медаль "За асваенне цалінных зямель" (1969). Грамата Вярхоўнага Савета БССР (1978). Ганаровая грамата Савета Міністраў Беларусі (1998). Лаўрэат прэміі Саюза журналістаў "Залатое пяро – 2001". Прэмія польскага Таварыства аўтараў ZAiKS (за пераклады з польскай мовы, 2004). Ордэн Святціцеля Кірылы Тураўскага Беларускай Праваслаўнай Царквы (2008). Юбілейны медаль "90 год Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь" (2008). Юбілейны медаль "65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў" (2009). Ганаровае званне Беларускага саюза журналістаў "Заслужаны журналіст"

(2008). Нагрудны знак Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь “За ўклад у развіццё культуры Беларусі” (2010). Лаўрэат прэміі імя Васіля Віткі часопіса “Вясёлка”. Лаўрэат літаратурнага конкурса “Кімерыйскія музы” на міжнародным фестывалі дзіцячых пісьменнікаў у Феадосіі. Дыпламант літаратурнага конкурса Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. Лаўрэат Гомельскай абласной літаратурнай прэміі імя А. Капусціна. Ганаровы знак Беларускага фонда культуры “Рупліўцу. Стваральніку” (2017). Ганаровая грамата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2018). Юбілейны медаль “100 год дыпламатычнай службе Беларусі” (2019).



## БЯРОЗКІНА Наталля Юр’еўна

Кнігазнаўца. Спецыяліст па гісторыі кніжнай культуры і бібліятэчнай справы Беларусі. Кандыдат гістарычных навук (1990), дацэнт. Заслужаны дзеяч культуры (2010).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя кнігі, менеджмент інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці, інфармацыйныя тэхналогіі бібліятэк, бібліяметрыя.

Нарадзілася ў 1955 г., г. Ветка Гомельскай вобласці.

***Адукацыя:*** Мінскі інстытут культуры (1981), спецыяльнасць “бібліятэказнаўства і бібліяграфія”.

***Працоўная дзейнасць.*** Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі (1981–2013): вучоны сакратар, загадчык навукова-метадычнага аддзела, намеснік дырэктара па навуковай рабоце, дырэктар. Беларускі дзяржаўны інстытут культуры і мастацтваў (з 2013): загадчык кафедры культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін, дацэнт гэтай кафедры.

***Асноўныя працы:***

Библиотеки и распространение научных знаний в Беларуси: XVI–XX вв. Минск, 2011; 2013.

Информационно-библиотечное обеспечение науки Беларуси: история и современное состояние. Минск, 2003.

Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.): вучэбны дапаможнік. Мінск, 1998; 2000.
Роль печати в распространении научных знаний в Белоруссии, 1861–1917 гг. Минск, 1990.

***Удзел у калектыўных працах:***
1000-годдзе Брэста: праз прызму старадаўніх дакументаў [Электронны рэсурс]. Мінск, 2019.
Библиотека Радзивиллов Несвижской ординации: каталог изданий из фонда Центральной научной библиотеки имени Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси: XVIII век: в 4 кн. Минск, 2013–2015.
Рукапісы татараў Беларусі канца XVII – пачатку XX ст. з дзяржаўных кнігазбораў краіны: каталог. Мінск, 2011.
Книжная культура России и Беларуси в контексте историко-культурного взаимодействия. Минск: Москва, 2013; (в 2 кн.) 2015.
Гісторыя выдавецкай дзейнасці ў Польшчы і Беларусі ў XVI–XX стагоддзях: зборнік навуковых артыкулаў. Мінск, 2003.

***Узнагароды, прызнанне.*** Ордэн Пашаны (2002). Нагрудны знак Міністэрства культуры “За ўклад у развіццё культуры Беларусі” (2005). Дыплом лаўрэата “За ўклад у комплекснае вывучэнне гісторыі кнігі і кніжнай культуры Беларусі” конкурса на суісканне Міжнароднай прэміі імя Д. С. Ліхачова Міжнароднай асацыяцыі акадэмій навук.

## ВАРОНІН Васіль Аляксеевіч



Гісторык-медыевіст. Спецыяліст па гісторыі Полацкай і Віцебскай зямель у XIII–XVI ст. Кандыдат гістарычных навук (2000), дацэнт (2005).

**Напрамкі даследаванняў:** дзяржаўна-палітычная і канфесійная гісторыя ВКЛ, гісторыя Беларускага Падзвіння ў часы ВКЛ, выдавецкая археаграфія.

Нарадзіўся 6.12.1971, в. Дзярновічы Верхнядзвінскага раёна, Віцебская вобласць.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (1994) і аспірантура (1998) БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Полацкага ваяводства ў першай палове XVI ст." (2000).

***Працоўная дзейнасць.*** Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (1994–1995, 1998–2000): выкладчык. БДУ (2000–2006, 2007–2015): выкладчык кафедры гісторыі Беларусі Старажытнага часу і Сярэдніх вякоў. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (2016–2020): загадчык аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу. Інстытут гісторыі імя Тадэвуша Мантэйфеля Польскай акадэміі навук (Варшава): дацэнт.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Цэнтр даследаванняў антычнай традыцыі пры Варшаўскім універсітэце (Польшча, 2002, 2003, 2004). Люблінскі ўніверсітэт (Польшча, 2006–2007). Інстытут гісторыі Літвы (Вільнюс, 2009).

***Асноўныя працы:***

Князь Юрай Лынгвеневіч Мсціслаўскі: Гістарычны партрэт. Мінск, 2010.

***Удзел у калектыўных працах:***

История белорусской государственности. В 5 т. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. Минск, 2018.

Рэлігійнае жыццё у Вялікім Княстве Літоўскім і Каралеўстве Польскім у XVI–XVIII стагоддзях: у коле мясцовых спраў і праблем: зборнік навуковых артыкулаў. Мінск, 2019.

Гісторыя Беларусі: дапаможнік для студэнтаў: у 4 ч. Ч. 1. Мінск, 2018.

Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура: зборнік навуковых артыкулаў: у 2 ч. Мінск, 2017.

Друцк: Друцк и Друцкая волость (княжество) в IX–XII в., летопись древних слоев, князья Друцкие и их владения в XIII–XVIII вв., ремесло, промыслы, торговля (по данным археологии, нумизматики, письменных источников), памятники архитектуры и объекты туризма. Минск, 2014.

Да сваёй гісторыі: Сярэднявечча і Ранні Новы час: зборнік навуковых артыкулаў, прысвечаных памяці Паўла Лойкі. Смаленск, 2013.

Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке. Минск, 2012.

***Археаграфічныя выданні:***

Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в.: в 2 т. Москва, 2015.

Рэвізія Полацкага ваяводства 1552 года. Менск, 2011.

Летапісы і хронікі Беларусі: Сярэднявечча і раннемадэрны час. Мінск, 2010; 2013.

Рэестр путных баяр Полацкага ваяводства 1585 года. Мінск, 2009; 2010.

Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковыского и оболецкого державцы М. В. Клочко. 1533–1540 (Литовская метрика. № 228. Книга судных дел № 9). Москва, 2008.

## ВАСЮК Генадзь Уладзіміравіч



Гісторык-медыевіст. Спецыяліст па гісторыі праваслаўнай царквы і міжканфесійных адносін у Рэчы Паспалітай. Кандыдат гістарычных навук (1992), дацэнт (2000).

**Напрамкі даследаванняў:** усеагульная гісторыя царквы, праваслаўная царква ВКЛ і Польшчы ў XIV–XVIII ст., гісторыя краін Заходняй Еўропы і Візантыі ў Сярэдневякоўі, заходнееўрапейская сярэднявечная гістарыяграфія.

Нарадзіўся 13.07.1961, в. Старыя Гернікі, Шчучынскі раён Гродзенскай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт ГрДУ імя Я. Купалы (1988), аспірантура БДУ (1992).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** “Праваслаўная царква ў Рэчы Паспалітай у 80-я – 90-я гады XVI – першай палове XVII стагоддзя” (1992).

***Працоўная дзейнасць.*** ГрДУ імя Я. Купалы (з 1992): асістэнт, дацэнт, загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі, начальнік вучэбнага аддзела, дацэнт кафедры ўсеагульнай і славянскай гісторыі.

***Удзел у калектыўных працах:***

Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава: зборнік навуковых артыкулаў. Гродна, 2021.

Народы и культуры славянского мира Восточной Европы в исторической ретроспективе (Беларусь, Украина, Россия, Польша). Гродно, 2020.

Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: сборник научных статей. Вып. 4. Пинск, 2019.

Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа: зборнік навуковых артыкулаў. Гродна, 2008.

***Узнагароды.*** Грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2013).



## ВЕРАМЕЙЧЫК Сяргей Іванавіч

Краязнаўца, гісторык, мастак, архітэктар-рэстаўратар, музыкант. Першы беларускі "агінсказнаўца", які аднаўляў духоўную і матэрыяльную спадчыну Міхала Клеафаса Агінскага. Знаўца гісторыі і захавальнік сядзібы "Паўночныя Афіны" ў Залессі (Смаргонскі раён, Гродзенская вобласць), дзякуючы якому яна датрывала да маштабнай рэканструкцыі ў 2015 г.

**Напрамкі даследаванняў:** генеалагічнае дрэва роду Агінскіх, біяграфія Міхала Клеафаса Агінскага, праекты рэканструкцыі беларускіх замкаў.

Нарадзіўся ў 1953 г.

***Адукацыя:*** мастак.

***Працоўная дзейнасць.*** Залеская СШ: настаўнік выяўленчага мастацтва, арганізатар і кіраўнік дзіцячай мастацкай школы. Зале-

скі філіял Дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры (1997–2007): навуковы супрацоўнік. Фірма “НЕФ”: супрацоўнік.

***Асноўныя працы:***

Mykolas Kleopas Oginskis (1765–1833). Vilnius, 2008.

Міхал Клеафас Агінскі, 1765–1833: продкі, жыцце ў Залессі, нашчадкі (спроба храналогіі). Мінск, 2003; 2008.

## ВІЦЬКО Дзмітрый Вячаслававіч



Гісторык, картограф, рэдактар. Спецыяліст па вайскова-палітычнай гісторыі ВКЛ канца XVII – пачатку XVIII ст. Рэдактар часопіса “Arche. Пачатак”. Выдавец навуковай спадчыны гісторыка Мікалая Улашчыка. Кандыдат гістарычных навук (2008).

**Напрамкі даследаванняў:** ваенная гісторыя ранняга Новага часу, грамадзянская вайна ў ВКЛ у 1696–1702 г., удзел ВКЛ у Паўночнай вайне ў 1702–1709 г., гісторыя парламентарызму ў ВКЛ, мікрагісторыя, гістарычная геаграфія і картаграфія.

Нарадзіўся 6.03.1981, в. Прусы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (2003), аспірантура пры Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце (2007).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** “Міжусобная барацьба магнацкіх груповак у Вялікім княстве Літоўскім у канцы XVII – пачатку XVIII ст.” (2008).

***Працоўная дзейнасць.*** Старынская базавая школа Стаўбцоўскага раёна (2003–2004): настаўнік гісторыі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (2007–2010): малодшы навуковы супрацоўнік. Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі (з 2010): вучоны сакратар. Часопіс “Arche. Пачатак”, кніжнае выдавецтва ТАА “Гайсак”: рэдактар

***Удзел у калектыўных працах:***
Актуальные проблемы истории и культуры. Вып. 2: Парламентарызм у Вялікім Княстве Літоўскім у XVIII стагоддзі. Мінск, 2020.
Мікалай Улашчык. Збор твораў: у 3 т. Т. 1: Працы па археаграфіі і крыніцазнаўству. Смаленск, 2017; Т. 2: Працы па гісторыі. Смаленск, 2019.

## ВОЛКАЎ Мікалай Аляксандравіч



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі ваеннай справы, артылерыі і фартыфікацыі Беларусі ў XVI–XVIII ст. Кандыдат гістарычных навук (2016).

**Напрамкі даследаванняў:** архітэктура і горадабудаўніцтва ВКЛ у XVI–XVIII ст.; абарончая архітэктура; пісьмовыя і іканаграфічныя крыніцы па гісторыі фартыфікацыі, артылерыі, ваеннай справы беларускіх зямель у XVI–XVIII ст.; навуковыя асновы рэстаўрацыі Старога замка ў Гродна.

Нарадзіўся 9.06.1985, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (2008), магістратура Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта па праграме “Ахова і інтэрпрэтацыя гісторыка-культурнай спадчыны” (Вільнюс, Літва, 2009), магістратура па спецыяльнасці “Мастацтвазнаўства” Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі (2010), аспірантура Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы пры БДУ (2013), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі па спецыяльнасці “Айчынная гісторыя” (2016).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** “Забеспячэнне абароназдольнасці рэзідэнцый роду Радзівілаў на беларускіх землях Вялікага княства Літоўскага ў XVI – пачатку XVIII ст.” (2016).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі НАН Беларусі (2014–2020): малодшы навуковы супрацоўнік, старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (з 2015):

вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытных актаў, старшы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці. Цэнтр па рэгенерацыі гісторыка-культурных ландшафтаў і тэрыторый.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Універсітэт Марціна Лютэра (Гале, Германія, 2006–2007). Варшаўскі ўніверсітэт (2010–2011). Свабодны ўніверсітэт Берліна (Германія, 2012–2013). Літоўскі эдукалагічны ўніверсітэт (Вільнюс, 2014). Санкт-Пецярбург – пры падтрымцы Германскага гістарычнага інстытута ў Маскве (2017).

***Асноўныя працы:***

Замкі і фартэцыі Радзівілаў на беларускіх землях у XVI – пачатку XVIII ст. Мінск, 2020; 2021.

Слуцк на старых планах. Мінск, 2017.

Артылерыя Нясвіжскага замка = Artillery of Niasviž castle. Мінск, 2015.

***Удзел у калектыўных працах:***

“Абрысы розныя”: малюнкі і чарцяжы гетмана Януша Радзівіла. Мінск, 2020.

Юрый Бохан. Мястэчкі і працэсы ўрбанізацыі на землях Беларусі ў XV–XVIII стст. / уклад. М. А. Волкаў Мінск, 2018; 2020.

Ідэальны горад-крэпасць. Ваенная гісторыя Старога Быхава ў XVII стагоддзі. Магілёў, 2018.

Ultima ratio regum. Беларусь у Паўночных войнах сярэдзіны XVII – пачатку XVIII ст.: (міжнародная выстава, Мірскі замак, 21 красавіка – 24 верасня 2017 г.): каталог. Мір, 2017.

## ГАБРУСЬ Тамара Віктараўна



Архітэктар, гісторык архітэктуры, мастацтвазнаўца. Спецыяліст па мураванай сакральнай архітэктуры і манументальнаму мастацтву беларускага барока. Кандыдат архітэктуры (1979), доктар мастацтвазнаўства (2002). Член-карэспандэнт Беларускай акадэміі архітэктуры. Член Саюза архітэктараў СССР (1974), Саюза мастакоў Беларусі (1999), Саюза пісьменнікаў Беларусі (2004).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя і тэорыя архітэктуры; мастацтвазнаўчыя праблемы беларускага дойлідства эпохі ВКЛ; агульнаеўрапейскія стылі ў архітэктуры Беларусі (готыка, рэнесанс, барока); распрацоўка беларускамоўнай архітэктурнай тэрміналогіі; кансервацыя і рэстаўрацыя, ахова помнікаў архітэктуры

Нарадзілася 10.02.1945, Мінск.

***Адукацыя:*** архітэктурнае аддзяленне будаўнічага факультэта Беларускага політэхнічнага інстытута (1968), аспірантура Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (1973).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут "Белпрампраект" (1968–1970): архітэктар. Спецыяльныя навукова-рэстаўрацыйныя вытворчыя майстэрні Міністэрства культуры БССР (1973–1974): старшы архітэктар-рэстаўратар. Выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя" (1974–1980): навуковы рэдактар па архітэктуры, в. а. загадчыка рэдакцыі культуры і мастацтва. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі (1980–2012): старшы, вядучы навуковы супрацоўнік. Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (з 2012): вядучы навуковы супрацоўнік.

***Асноўныя працы:***

Драўлянае хрысціянскае храмабудаўніцтва Беларусі. Мінск, 2020 (дыплом 1-й ступені за лепшую публікацыю ў галіне архітэктуры, горадабудаўніцтва і дызайну XX Рэспубліканскага конкурса ў рамках XIV Нацыянальнага фестывалю архітэктуры).

Сакральнае дойлідства Беларусі: 1000-гадовая спадчына. Мінск, 2014 (дыплом 1-й ступені Нацыянальнага конкурса "Мастацтва кнігі – 2015"; дыплом 1-й ступені Савета па кнігавыданню пры Міжнароднай асацыяцыі Акадэмій навук і Беларуска-Расійскага навуковага форума ў намінацыі "За ўклад у захаванне духоўнай спадчыны").

Паэзія архітэктуры. Мінск, 2012.

Саборы помняць усё: готыка і рэнесанс у сакральным дойлідстве Беларусі. Мінск, 2007.

Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока. Мінск, 2001.

Помнікі манументальнага дойлідства Міншчыны: гісторыка-мастацтвазнаўчы нарыс. Мінск, 1991.

***Удзел у калектыўных працах:***

Архітэктура Беларусі: Нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім и еўрапейскім кантэксце: у 4 т. Мінск, 2005–2009.

Страчаная спадчына. Мінск, 1997; 2003.

Мастацтва бачыць свет: 7-ы клас: эксперыментальны падручнік. Мінск, 2000.

Архітэктура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мінск, 1993.

Барока ў беларускай культуры і мастацтве. Мінск, 1998; 2000; 2005.

Скарына і яго эпоха. Мінск, 1990.

Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Мінск, 1987–1994.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Т. 1–7. Мінск, 1984–1987.

Помнікі старажытнабеларускай культуры: Новыя адкрыцці. Мінск, 1984.

***Узнагароды, прызнанне.*** Ганаровыя граматы Беларускага Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (1989, 1992, 1995, 2005), Міністэрства культуры Беларусі (2005), Міністэрства інфармацыі Беларусі (2005), НАН Беларусі (2015), Беларускага Саюза архітэктараў (2021). Медаль Францыска Скарыны (2020) за распрацоўку навуковай канцэпцыі гісторыі развіцця і сучаснага стану манументальнай архітэктуры Беларусі.

## ГАГУА Руслан Барысавіч



Гісторык-медыевіст. Спецыяліст па гісторыі ваенных канфліктаў ВКЛ і Польшчы з Тэўтонскім ордэнам. Арганізатар серыі міжнародных навуковых канферэнцый "Сацыяльныя, палітычныя і культурныя працэсы на тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў гістарычнай перспектыве". Кандыдат гістарычных навук (2008), дацэнт (2009). Удзельнік руху гістарычнай рэканструкцыі. Заснавальнік (2007) і кіраўнік рыцарскага клуба

гістарычнай рэканструкцыі і мадэлявання эпохі Сярэднявечча "Панцырны Шыхт". Музыкант – аўтар песень, гітарыст, кіраўнік музычнага калектыву "Red Cat" (2005).

**Напрамкі даследаванняў:** еўрапейская ваенная гісторыя Сярэднявечча; гісторыя ВКЛ, Польшчы і Тэўтонскага ордэна; Грунвальдская бітва; пераклад гістарычных крыніц XIV–XV ст. з латыні.

Нарадзіўся 4.08.1972, Гродна.

***Адукацыя:*** факультэт гісторыі і культуры (2001) і аспірантура (2005) ГрДУ імя Я. Купалы.

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Вялікая вайна з Тэўтонскім ордэнам (1409–1411): крыніцы і гістарыяграфія" (2008).

***Працоўная дзейнасць.*** Сярэднія школы Пінскага раёна і г. Пінска: настаўнік гісторыі. Пінскі філіял Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта (2004–2006). Палескі дзяржаўны ўніверсітэт (з 2006): выкладчык; дацэнт кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права; дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны; дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый.

***Асноўныя працы:***

Грюнвальд в источниках: "Хроника конфликта Владислава, короля Польши, с крестоносцами в год Христов 1410". Пинск, 2009.

***Удзел у калектыўных працах:***

Навагрудчына ў гістарычна-культурнай спадчыне Еўропы: (да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы). Мінск, 2010.

***Прысвечана вучонаму:*** Руслан Борисович Гагуа: биобиблиографический указатель. Пинск, 2016 (Серия "Люди науки").

## ГАЛЕНЧАНКА Георгій Якаўлевіч



Гісторык, кнігазнавец. Вядучы беларускі медыевіст. Спецыяліст па гісторыі беларускага кнігадруку XVI–XVIII ст. Скарыназнаўца. Доктар гістарычных навук (2000), дацэнт. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі (1994).

**Напрамкі даследаванняў:** ВКЛ; духоўная і кніжна-пісьмовая культура Беларусі XIV – сярэ-

дзіны XVII ст.; міжнародныя культурныя сувязі; гісторыка-культурныя працэсы, царкоўна-канфесійная і этнічная гісторыя Беларусі; дакументальнае і наратыўнае крыніцазнаўства; Метрыка ВКЛ; гістарыяграфія эпохі феадалізма; скарыназнаўства.

Нарадзіўся 28.02.1937, г. Петразаводск, Расія.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1960), аспірантура Маскоўскага дзяржаўнага гісторыка-архіўнага інстытута (1965).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Гісторыя беларускага (кірылічнага) кнігадрукавання XVI–XVIII стагоддзяў" (1965).

***Доктарская дысертацыя***: "Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар" (1999).

***Працоўная дзейнасць.*** Дзяржаўная бібліятэка БССР, Мінск (1960–1962): бібліятэкар. БДУ (1965–1968): старшы выкладчык. Інстытут гісторыі АН БССР / НАН Беларусі (1968–2020): старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі дасавецкага перыяду, загадчык аддзела спецыяльных гістарычных навук, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу.

Выкладаў у БДУ, Еўрапейскім гуманітарным універсітэце, Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы, Познаньскім універсітэце.

***Асноўныя працы:***

Кнігі Францыска Скарыны: у 20 тамах. Т. 1: Францыск Скарына – жыццё, дзейнасць і творчасць. Мінск, 2014.

Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: гісторыя, даследаванні, выданні: кароткі нарыс. Мінск, 2014.

Невядомыя і малавядомыя помнікі духоўнай спадчыны і культурных сувязей Беларусі XV – сярэдзіны XVII ст. Мінск, 2008.

Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. Мінск, 1993.

Идейные и культурные связи восточнославянских народов в XVI – середине XVII в. Минск, 1989.

Очерки духовной культуры Белоруссии второй половины XVI – первой половины XVII в. Минск, 1981.

***Бібліяграфічныя выданні і каталогі (укладальнік і рэдактар):***

Францыск Скарына: Спадчына і пераемнікі. Анатаваны бібліяграфічны паказальнік. Мінск, 2002.

Кніга Беларусі: 1517–1917 гг.: зводны каталог. Ч. 1: Старадрукаваныя кірылічныя выданні; кнігі грамадзянскага друку XVI–XVIII ст. Мінск, 1986.

***Перавыданні:***

Evanhelije in der Űbersetzung des Vasil Tjapinski um 1580: Facsimile und Kommentare. Műnchen, Wien, Zűrich, 2005 (навуковы кансультант, складальнік, аўтар археаграфічнага каментара).

"Біблія". Факсімільнае ўзнаўленне Бібліі, выдадзенай Францыскам Скарынаю ў 1517–1519 гг.: у 3 т. Мінск, 1990–1991 (навуковы кансультант і ўкладальнік).

***Удзел у калектыўных працах:***

Францыск Скарына: энцыклапедыя. Мінск, 2017.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага княства Літоўскага. Мінск, 2008.

Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 3 т. Мінск, 2005–2010.

Славутыя імёны Бацькаўшчыны. Вып. 2. Мінск, 2000.

Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.

Францыск Скарына і яго час: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 1988.

Francisk Skorina. Paris: UNESKO, 1979.

Узнагароды, прызнанне. Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь (1994) за цыкл прац "Скарына і беларуская культура".

***Прысвечана вучонаму:***

Георгій Якаўлевіч Галенчанка. Нарыс жыцця і навуковай дзейнасці. Мінск, 2018. (Біябібліяграфія вучоных Беларусі).

Silva rerum nova: Штудыі ў гонар 70-годдзя Георгія Якаўлевіча Галенчанкі. Вільня-Мінск, 2009.

## ГАЛУБОВІЧ Віталь Уладзіміравіч



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі грамадска-палітычнага жыцця ВКЛ і яго рэгіёнаў у канцы XVI–XVII ст. Кандыдат гістарычных навук (2003), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** ВКЛ, гісторыя шляхты, полацкая шляхта ў грамадска-палітычным жыцці ВКЛ і Рэчы Паспалітай у канцы XVI–XVII ст., крыніцазнаўства.

Нарадзіўся ў 1974 г. у Гродна.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт ГрДУ імя Я. Купалы (1996), аспірантура БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Кнігі запісаў Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага за час праўлення Уладзіслава IV Вазы як крыніца па гісторыі Беларусі" (2003).

***Працоўная дзейнасць.*** Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт: выкладчык, дацэнт. Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт: дацэнт кафедры грамадскіх навук.

***Асноўныя працы:***

Полацкая шляхта і дынастыя Вазаў. Мінск, 2016.

Полацкая шляхта ў час праўлення дынастыі Вазаў: 1588–1668 гг. Гродна, 2015.

Miscellanea Historica Polocensia: Даследаванні па гісторыі Полаччыны XII–XVII стст. Гродна, 2014.

***Удзел у калектыўных выданнях:***

Grodnæ et orbi. Гісторыя горада: паміж лакальнай традыцыяй і агульнаеўрапейскімі тэндэнцыямі: зборнік навуковых артыкулаў. Гародня, 2021.

Чорная дама з Мірскага замка: княгіня Ганна Кацярына з Сангушкаў Радзівіл (1676–1746). Мір, 2020.

Валовічы герба "Багорыя". Мінск, 2019; 2020 (Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі).

Grodnae et orbi. Гарадскія супольнасці і гарадское асяроддзе XIV–XX стст.: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гародня, 4–5 лістапада 2017 г.). Мінск, 2018.
Мір Радзівілаў: замак, мястэчка, графства (1568–1813 гг.): зборнік дакументаў і матэрыялаў. Мір, 2017.
Князі Друцкія-Горскія ў Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVIII стст. Мір, 2016.
Да сваёй гісторыі: Сярэднявечча і Ранні Новы час: зборнік навуковых артыкулаў, прысвечаных памяці Паўла Лойкі. Смаленск, 2013.



## ГАНЕЦКАЯ Ірына Уладзіміраўна

Гісторык і археолаг. Спецыяліст па гісторыі беларускай керамікі XI–XVIII ст., гісторыі горада Глуска XVI–XVIII ст. Кандыдат гістарычных навук (1993).

**Напрамкі даследаванняў:** археалогія горада, архітэктурная археалогія, гісторыя і археалогія беларускіх замкаў, керамічная вытворчасць XI–XVIII ст., гісторыя культуры XI–XIII ст.

Нарадзілася 22.09.1961, Маладзечна.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт МДПІ імя М. Горкага (1984), аспірантура Інстытута гісторыі АН БССР (1989).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Вытворчасць маёлікі і фаянсу ў Беларусі ў XII–XVIII стст." (1993).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі НАН Беларусі (1989–2022): навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі і гісторыі Полацкай зямлі, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі сярэдневяковага перыяду, аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу.

***Асноўныя працы:***

Глускі замак у святле археалагічных даследаванняў і пісьмовых крыніц. Мінск, 2018.
Маёліка на Беларусі XI–XVIII ст. Мінск. 1995.

***Удзел у калектыўных выданнях:***
Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. Мінск, 2000; Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2008; Т 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). Мінск, 2004.
Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. Мінск, 2001.

## ГАРАНІН Сяргей Лявонцьевіч



Літаратуразнаўца. Спецыяліст па гісторыі беларускай мовы і літаратуры XIV–XVII ст. Кандыдат філалагічных навук (1997), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** усходнеславянскае пісьменства XI–XVIII ст., нацыянальная адметнасць пісьменства позняга Сярэднявечча, станаўленне арыгінальнай беларускай літаратуры і яе сувязі з утварэннем беларускай народнасці, публікацыя помнікаў даўняга пісьменства Беларусі і беларускай літаратуры эпохі ВКЛ.

Нарадзіўся 28.05.1965, г. Петразаводск (Расія).

***Адукацыя***: МДПІ імя М. Горкага (1993), аспірантура Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі (1996).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Жанр хаджэнняў у беларускай літаратуры XIV–XVI стст." (1997).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы (1996–2005): навуковы супрацоўнік. БДПУ імя М. Танка (1997–2008): дацэнт кафедры беларускай літаратуры. Упраўленне вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі: галоўны інспектар. Інстытут мовы і літаратуры НАН Беларусі (2008–2015): загадчык сектара гісторыі беларускай літаратуры, намеснік дырэктара. Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі: намеснік дырэктара па навуковай рабоце. БДУ: дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі.

***Асноўныя працы:***

Шляхамі даўніх вандраванняў: гістарычна-тэарэтычны нарыс развіцця беларускай паломніцкай літаратуры XII–XVI стагоддзяў. Мінск, 1999.

***Удзел у калектыўных выданнях:***

Актуальныя аспекты беларусістыкі: матэрыялы VI Міжнароднага кангрэса беларусістаў, Мінск, 27–29 мая 2015 года: зборнік артыкулаў. Мінск, 2020.

Беларуская мова ў сакральнай сферы: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 21 лютага 2018 г.). Мінск, 2019.

Мовазнаўства. Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка: XV Міжнародны з'езд славістаў (Мінск, 20–27 жніўня 2013 г.): даклады беларускай дэлегацыі. Мінск, 2013.

Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 2: Пратарэнесанс і Адраджэнне. Мінск, 2010.

Беларуская пісьмовая спадчына ў кантэксце еўрапейскага культурна-гістарычнага працэсу XI–XIX стагоддзяў: вытокі, традыцыі, уплывы: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 24 мая 2010 г.). Мінск, 2010.

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў. У 2 т. Т. 1: Даўняя літаратура: XI – першая палова XVIII стагоддзя. Мінск, 2006.

***Археаграфічныя выданні (у складзе калектыву):***

Дыярыушы XVII стагоддзя (1594–1707 гады): Самуэль Маскевіч, Багуслаў Маскевіч, Піліп Абуховіч, Міхал Абуховіч, Тэадор Абуховіч. Мінск, 2016 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).

Летапісы і хронікі Вялікага Княства Літоўскага, XV–XVII стст. Мінск, 2015 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).

Рэлігійнае пісьменства кірылічнай традыцыі XI–XV стст. Мінск, 2013 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).

Славянамоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст. Мінск, 2011 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).

Літаратура XI–XVI стагоддзяў. Мінск, 2011; 2012 (Залатая калекцыя беларускай літаратуры; т. 1).

Літаратура XVII–XVIII стагоддзяў. Мінск, 2012 (Залатая калекцыя беларускай літаратуры; т. 2).

## ГАРБАЦКІ Андрэй Аляксандравіч



Гісторык, культуролаг. Спецыяліст па гісторыі стараабраднiцтва (стараверства) як спецыфічнага феномена беларускай культуры. Доктар гістарычных навук (1999), прафесар (2004).

**Напрамкі даследаванняў:** царкоўна-канфесійная гісторыя беларускіх зямель, гісторыя сацыяльна-эканамічных і сацыякультурных працэсаў беларускага памежжа, сацыяльна-культурная антрапалогія, антрапалогія паўсядзённасці.

Нарадзіўся 22.03.1956, в. Віўнева Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (1982) і аспірантура (1987) БДУ, дактарантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1999).

***Доктарская дысертацыя***: "Стараабраднiцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст." (1999).

***Працоўная дзейнасць:*** Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна (1982-2010-я): выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры культуралогіі, прарэктар па навуковай рабоце, першы прарэктар, прафесар кафедры гісторыі культуры і рэлігіі. Беластоцкі ўніверсітэт: прафесар, загадчык кафедры гісторыі і тэорыі адукацыі.

***Асноўныя працы:***

Православные монастыри Беларуси: история и современность. Чонский монастырь. Брест, 2011.

Христианство: курс лекций: в 3 ч. Брест, 2008–2013.

Старообрядческие храмы Беларуси. Минск, 2008.

Введение в историю религии: учебное пособие. Брест, 2004; Минск, 2005.

Старообрядчество на белорусских землях. Брест, 2004.

Введение в историю религии: курс лекций. Брест, 2003.

Стараабраднiцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX ст.ст. Брэст, 1999.

***Удзел у калектыўных выданнях:***
Дабраверны князь Канстанцін (Васілій) Астрожскі – славуты асветнік і абаронца Праваслаўя: зборнік матэрыялаў Міжнароднай навукова-багаслоўскай канферэнцыі, Тураў – Брэст, 11– 12 мая 2008 г. Брэст, 2011.
Белорусское Полесье: туристские трансъевропейские водные магистрали. Минск, 2005.

***Узнагароды.*** Граматы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2005, 2012). Грамата Брэсцкай і Кобрынскай праваслаўнай епархіі (2011).



## ГАРДЗЕЕЎ Юрый Юр'евіч

Гісторык, культуролаг. Спецыяліст па гісторыі беларускіх гарадоў эпохі ВКЛ, гісторыі рэформ другой паловы XVIII ст. у ВКЛ. Доктар гістарычных навук (2011). Старшыня Беларускага таварыства ў Кракаве.

**Напрамкі даследаванняў:** сацыяльна-эканамічная гісторыя гарадоў і мясцовых супольнасцей ВКЛ, гісторыя Гродна XII–XVIII ст. (грамадства, эліты, эканоміка, юрыдыка, сацыятапаграфія, мясцовае самакіраванне і гарадское права, культура, побыт), мадэрнізацыя мясцовай адміністрацыі падчас Чатырохгадовага сойма, дзейнасць падскарбія ВКЛ Антонія Тызенгаўза, гістарычная палітыка ва Усходняй Еўропе.

Нарадзіўся 2.07.1967, Гродна.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт ГрДУ імя Я. Купалы (1991), аспірантура Педагагічнай акадэміі (Кракаў, Польшча, 1999).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Гародня ў XVIII ст. Даследаванні асваення гарадской прасторы, адносін уласнасці і гарадскога насельніцтва" (2000, Педагагічная акадэмія, Кракаў).

***Доктарская дысертацыя (габілітацыя):*** "Цывільна-вайсковыя парадкавыя камісіі ў Вялікім Княстве Літоўскім у часы Чатырохгадовага сойма (1789–1792)" (2010, Кракаў).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут "Белспецпраектрэстаўрацыя", гродзенскія майстэрні (1988–1992): мастацтвазнаўца. ГрДУ імя Я. Купалы (1993–1995): выкладчык кафедры беларускай культуры. Навуковая бібліятэка Польскай Акадэміі мастацтваў, Польская Акадэмія навук у Кракаве (2001–2005). Інстытут Расіі і Усходняй Еўропы Ягелонскага ўніверсітэта (з 2005): ад'юнкт.

***Асноўныя працы:***

Антоні Тызенгаўз і яго эпоха. Мінск, 2021.

Цывільна-вайсковыя парадкавыя камісіі ў Вялікім Княстве Літоўскім у часы Чатырохгадовага сойма (1789–1792). Смаленск, 2014.

Тапанімія старажытнай Гародні (XII–XVIII стст.). Гародня: Wrocław, 2013.

Komisje Porządkowe Cywilno-Wojskowe w Wielkim Księstwie Litewskim w okresie Sejmu Czteroletniego (1789–1792). Kraków, 2010.

Рамантык эпохі Асветніцтва: Антон Тызенгаўз. Мінск, 2008.

Магдэбургская Гародня (сацыяльная тапаграфія і маёмасныя адносіны ў 16–18 ст.). Гародня: Wrocław, 2008.

Socjotopografia Grodna w XVIII w. Toruń, 2002.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гародня X–XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. Гародня, 2014.

Cmentarz farny w Grodnie. 1792–1939. Kraków, 1999.

## ГАРДЗІЕНКА Наталля Сяргееўна



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі шляхецкай сям'і ў ВКЛ у XVIII ст., па беларускай дыяспары. Кандыдат гістарычных навук (2003). Член Саюза беларускіх пісьменнікаў. Сябра ўправы Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына". Сябра Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.

**Напрамкі даследаванняў:** гендэрная гісторыя ВКЛ, культура памяці, вусная гісторыя, архівазнаўства, з 2002 г. – гісторыя беларускай эміграцыі.

Нарадзілася 6.07.1977, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт і аспірантура БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Становішча жанчыны-шляхцянкі ў Вялікім Княстве Літоўскім у XVIII ст." (2003).

***Працоўная дзейнасць.*** Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі (2002 –2011): выкладчык кафедры гуманітарных дысцыплін, дэкан факультэта, прарэктар па вучэбнай рабоце. Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва (2011–2015): дацэнт. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (з 2014): вядучы архівіст, намеснік дырэктара.

Галоўны рэдактар альманаха "Запісы Беларускага інстытута навукі і мастацтва" (Нью-Ёрк-Мінск).

***Асноўныя працы:***

Беларусы ў Вялікабрытаніі. Мінск, 2010.

Беларусы ў Аўстраліі: Да гісторыі дыяспары. Мінск, 2004.

***Удзел у калектыўных працах:***

Беларусы ў ЗША / Вітаўт Кіпель. Мінск, 2017; 2020.

Кантакты: сіла прыцягнення Бацькаўшчыны: (да 90-годдзя Янкі Запрудніка). Мінск, 2016.

Эмігрант Францыск Скарына, ці Апалогія. Мінск, 2015.

Хронікі БІНіМу: гісторыя Беларускага інстытуту навукі і мастацтва ў дакументах, лістах і ўспамінах. Мінск, 2017.

***Узнагароды, прызнанне.*** Медаль "100 гадоў БНР" Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (2018).

## ГЛІНСКІ Яўген Станіслававіч



Гісторык, архівіст. Спецыяліст па генеалогіі зямянска-баярскіх родаў ВКЛ XVI–XVIII ст., кіраўнік аўтарскага калектыву праекта Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі "Гербоўнік беларускай шляхты". Магістр гістарычных навук.

**Напрамкі даследаванняў:** грамадская думка ВКЛ XV–XVI ст., шляхецкая генеалогія XVI – першай паловы XIX ст., крыніцазнаўства, гісторыя гістарычнай думкі, постмадэрнізм у гісторыяпісанні, гістарычная памяць і гістарычная свядомасць.

Нарадзіўся 3.11.1988, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (2006), магістратура (2012) і аспірантура (2015) БДУ.

***Працоўная дзейнасць.*** Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (з 2014): старшы навуковы супрацоўнік, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навукова-даследчай і публікацыйнай дзейнасці.

***Удзел у калектыўных працах:***

"Для лепшое твердости": пергаментныя дакументы перыяду Вялікага Княства Літоўскага з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (1391–1566 гг.). Мінск, 2018.

Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 4: Г / Д. Мінск, 2016; Т. 5: Д / Я. Мінск, 2018; Т. 6: Е, Ё, Ж. Мінск, 2020; Т. 7: З, І. Мінск, 2020.

Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура: зборнік навуковых артыкулаў: у 2 ч. Ч. 1. Мінск, 2017.

Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565 гг.): палітык, дыпламат, мецэнат: зборнік навуковых прац. Нясвіж, 2016.

Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Ашмяны і Ашмянскі рэгіён: зборнік навуковых артыкулаў. Мінск, 2015.

***Узнагароды, прызнанне.*** Лаўрэат Спецыяльнага фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Ганаровая грамата Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Прэмія Кангрэса даследчыкаў Беларусі за

лепшыя артыкул на сацыяльна-гуманітарную тэматыку за 2018 г. (Фальсіфікацыі дакументаў аб дваранстве ў Слуцкім павеце Мінскай губерні ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. 2018, № 5).



## ГОЛУБЕЎ Валянцін Фёдаравіч

Гісторык, палітычны дзеяч. Спецыяліст па аграрнай гісторыі Беларусі XVI–XVIII ст., гісторыі і гістарыяграфіі ВКЛ. Арганізатар першай у Беларусі афіцыйнай маштабнай міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай ВКЛ ("Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура", 2015). Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР XII склікання (першы парламент незалежнай Рэспублікі Беларусь). Адзін з аўтараў Дэкларацыі "Аб дзяржаўным суверэнітэце Рэспублікі Беларусь" і Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Доктар гістарычных навук (2011), прафесар (2014).

**Напрамкі даследаванняў:** сацыяльна-эканамічнае развіццё ВКЛ, канфесійная гісторыя, гісторыя сям'і, абшчына, беларускі горад і замак у XIV–XVIII ст., гістарыяграфія і крыніцазнаўства гісторыі Беларусі, гісторыя беларускай дзяржаўнасці.

Нарадзіўся 21.06.1955, г. Крывы Рог, Украіна.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1981); аспірантура (1985) і дактарантура (2010) Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Землеўладанне і землекарыстанне сялян Беларусі ў другой палове XVI–XVIII ст." (1987).

***Доктарская дысертацыя:*** "Сельская абшчына ў дзяржаўных, прыватнаўласніцкіх і царкоўных уладаннях Беларусі ў XVI–XVIII ст." (2011).

***Працоўная дзейнасць:*** Інстытут гісторыі НАН Беларусі (з 1981): лабарант, аспірант, навуковы супрацоўнік, дактарант; старшы, вядучы, галоўны навуковы супрацоўнік; загадчык аддзе-

ла гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу, загадчык Цэнтра спецыяльных гістарычных навук і антрапалогіі, загадчык (з 2021) Цэнтра гісторыі Беларусі IX–XVIII ст. і спецыяльных гістарычных навук.

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР XII склікання (1990–1995): сакратар Камісіі па міжнародных справах і знешнеэканамічных сувязях (1992–1996), член Канстытуцыйнай камісіі.

Выкладчыцкая дзейнасць: БДУ, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Жэнеўскі ўніверсітэт, Беластоцкі ўніверсітэт, Варшаўскі ўніверсітэт, Познаньскі ўніверсітэт, Вроцлаўскі ўніверсітэт, Беларускі гуманітарны ліцэй.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Жэнеўскі ўніверсітэт, Беластоцкі ўніверсітэт, Варшаўскі ўніверсітэт, Познаньскі ўніверсітэт, Вроцлаўскі ўніверсітэт, Ягелонскі ўніверсітэт, Вільнюскі педагагічны ўніверсітэт.

***Асноўныя працы:***

Гісторыя Беларусі – даты, падзеі, асобы: інфармацыйна-метадычны дапаможнік. Мінск, 2013.

Сельская абшчына ў Беларусі XVI–XVIII стст. Мінск, 2008.

Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі: XVI–XVIII стст. Мінск, 1992.

***Удзел у калектыўных працах:***

История белорусской государственности. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. Мінск, 2018.

Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура: зборнік навуковых артыкулаў: у 2 ч. Мінск, 2017.

Гісторыя Навагрудка – з глыбінь вякоў да нашых дзён. Мінск, 2014; 2016.

Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. СПб., 2014.

Речица 800 лет истории. Речица, 2013.

Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці. Мінск, 2012.

Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.: у 2 кн. Мінск, 2011–2012.

Белавежская пушча. Вытокі запаведнасці. Гісторыя і сучаснасць. Мінск, 2009.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2008; Т 3. Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). Мінск, 2004.
Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. Т. 1: Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. Мінск, 1997.
Нарысы гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Мінск, 2004.
Гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да пачатку XXI ст. у пытаннях і адказах. Мінск, 2003.
Belarus in the context of times and politics. Stockholm, 1997.
Ці ведаеце Вы гісторыю сваёй краіны? Мінск, 1994.

***Узнагароды, прызнанне.*** Першы лаўрэат Прэміі імя Льва Сапегі (Польшча, 2006). Медаль "100 гадоў БНР" Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (2018).



## ГРУША Аляксандр Іванавіч

Гісторык. Спецыяліст па пісьмовай культуры ВКЛ XIV–XVI ст. і функцыянаванню вялікакняжацкай канцылярыі. Доктар гістарычных навук (2017).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя органаў улады і кіравання ВКЛ, фарміраванне пісьмовай культуры ў ВКЛ у XIII – першай палове XVI ст., методыка выдання гістарычных крыніц, публікацыя гістарычных крыніц перыяду ВКЛ, палеаграфія, кадыкалогія, кнігазнаўства, гісторыя бібліятэк Беларусі.

Нарадзіўся 15.01.1973, Гродна.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДПУ імя М. Танка (1996), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1999).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага 40-х гадоў XV – першай паловы XVI ст." (2001).

***Доктарская дысертацыя:*** "Пісьмовая дакументацыя Вялікага Княства Літоўскага канца XIV – першай трэці XVI ст.: узнікненне, укараненне, выкарыстанне" (2017).

***Працоўная дзейнасць.*** Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (1996): вядучы палеограф. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (з 1999): малодшы навуковы супрацоўнік, старшы навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных навук, выконваючы абавязкі загадчыка аддзела гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст., загадчык аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу, дырэктар (2014–2022) Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі. БДУ: прафесар.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Каса імя Юзэфа Мяноўскага (Польшча, 2007), Польскі камітэт па справах ЮНЕСКА (Польшча, 2007, 2008), Фонд Герды Хенкель (Германія, 2008), Фонд каралевы Ядзвігі Ягелонскага ўніверсітэта (Польшча, 2009), Амерыканскі Савет навуковых таварыстваў (ЗША, 2009).

***Асноўныя працы:***

Кризис доверия? Появление и утверждение правового документа в Великом Княжестве Литовском (конец XIV – первая треть XVI в.). Москва: Санкт-Петербург, 2019.

Документальная письменность Великого Княжества Литовского (конец XIV – первая треть XVI в.). Минск, 2015 (Прэмія Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі за найлепшыя навуковыя публікацыі 2015 г. у намінацыі “Найлепшая гістарычная кніга”).

Альбом палеаграфічных здымкаў (з электронным дадаткам): дапаможнік для студэнтаў. Мінск, 2014.

Мяноўная грамата князя Васіля Нарымонтавіча і фарміраванне пісьмовай культуры ў прававой сферы Вялікага княства Літоўскага ў апошняй трэці XIV – першай трэці XVI ст. Мінск, 2010.

Канцылярыя Вялікага княства Літоўскага 40-х гадоў XV – першай паловы XVI ст. Мінск, 2006.

Беларуская кірылічная палеаграфія: Вучэбны дапаможнік для студэнтаў гістарычнага факультэта. Мінск, 2006.

Метадычныя рэкамендацыі па публікацыі рукапісных актавых кірылічных крыніц у Беларусі (XIII–XVIII стст., перыяд Вялікага княства Літоўскага). Мінск, 2003.

***Удзел у калектыўных працах:***

Францыск Скарына: даўнія факты – новыя ідэі: [зборнік артыкулаў]. Мінск, 2021.

Францыск Скарына: новыя даследаванні: [зборнік артыкулаў]. Мінск, 2019.

Историческая память о Беларуси как фактор консолидации общества: материалы Международной научно-практической конференции, Минск, 26–27 сентября 2019 г. Минск, 2019.
История белорусской государственности. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. Мінск, 2018.
Belarus: pages of history. Minsk, 2018.
Францыск Скарына: асоба, дзейнасць, спадчына: [зборнік артыкулаў]. Мінск, 2017.
Письменная культура конца X–XVI в. Минск, 2012.
Вялікае Княства Літоўскае і яго суседзі ў XIV–XV стст.: саперніцтва, супрацоўніцтва, урокі: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Гродна, 8–9 ліпеня 2010 г.: да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы. Мінск, 2011.

***Археаграфічныя выданні (у супрацоўніцтве):***

Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в.: в 2 т. Москва, 2015.
Библиотека Радзивиллов Несвижской ординации: каталог изданий из фонда Центральной научной библиотеки имени Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси: XVIII век : в 4 кн. Мінск, 2013–2015.
Доўнар-Запольскі М. В. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах. Мінск, 2009.
Судебная книга витебского воеводы, господарского маршалка, волковыского и оболецкого державцы М. В. Клочко. Литовская метрика. Книга № 228. Книга судных дел № 9. 1533–1540 гг. Москва, 2008.
Перапіс войска Вялікага княства Літоўскага 1528 г. Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 523. Кніга Публічных спраў 1. Мінск, 2003.
Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 44. Кніга Запісаў 44 (1559–1566). Мінск, 2001.

***Узнагароды, прызанне.*** Прэмія НАН Беларусі для маладых вучоных за цыкл работ па методыцы навуковага выдання гістарычных крыніц і публікацыі кніг Метрыкі ВКЛ (2003). Стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2008). Прэмія VI Кангрэса даследчыкаў Беларусі (2016). Пераможца конкурса Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь на найлепшую доктарскую дысертацыю ў намінацыі “гуманітарныя навукі” (2017).

## Грыцкевіч Анатоль Пятровіч



Гісторык, грамадскі дзеяч. Спецыяліст па гісторыі Беларусі XIV – пачатку XX ст. Адраджаў нацыянальную канцэпцыю айчыннай гісторыі, якая не ўзгаднялася з афіцыйнай канцэпцыяй яе разгляду скрозь прызму гісторыі Расіі, і рэпрэзэнтаваў беларускую гістарычную навуку ў свеце. Доктар гістарычных навук (1986), прафесар (1987). Сапраўдны член Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі (Масква, 1999). Адзін з заснавальнікаў Беларускага Народнага Фронта (1988) і Таварыства беларускай мовы (1989). Старшыня Міжнароднай грамадскай арганізацыі "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына" (2001–2005). Сябра Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Сябра Маскоўскага гісторыка-радаводнага таварыства. Старшыня грамадскіх камітэтаў па святкаванні 1000-годдзя Літвы ў Беларусі (2009) і 500-годдзя Аршанскай перамогі (2014).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя прыватнаўласніцкіх гарадоў Беларусі XVI–XVIII ст., ваенная гісторыя і знешняя палітыка ВКЛ, канфесійная гісторыя Беларусі, генеалогія і гісторыя шляхты, беларуская гістарыяграфія, нацыянальна-вызваленчы рух у Беларусі ў 1918–1920 г., гісторыя Слуцка.

31.01.1929, Мінск – 20.01.2015.

***Адукацыя:*** Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут (1950), Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў (1955), гістарычны факультэт БДУ (1958).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Сацыяльна-эканамічнае развіццё прыватнаўласніцкага горада Беларусі ў XVI–XVIII стст. (па матэрыялах Слуцка)" (1964).

***Доктарская дысертацыя:*** "Сацыяльна-эканамічнае развіццё прыватнаўласніцкіх гарадоў Беларусі ў XVI–XVIII стст." (1985).

***Працоўная дзейнасць.*** Беларуская чыгунка: лекар. Інстытут гісторыі АН БССР (1959–1975): малодшы навуковы супрацоўнік, старшы навуковы супрацоўні сектара гісторыі Беларусі дасавецкага грамадства. Мінскі інстытут культуры / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (з 1975): загадчык кафедры гісторыі СССР, БССР і замежных краін; загадчык кафедры гісторыі Беларусі і замежных краін; загадчык кафедры гісторыі і музеязнаўства, прафесар гэтай кафедры.

***Асноўныя працы:***

Сцягі Оршы. Мінск, 2014.

Выбранае. Мінск, 2012.

Старонкі нашай мінуўшчыны: [ад XIV ст. да нашага часу]. Мінск, 2009.

Адысея наваградскай лекаркі: Саламея Русецкая. Мінск, 1990.

Вакол "слуцкага паўстання". Мінск, 1987.

Старажытны горад на Случы. Мінск, 1985.

Социальная борьба горожан Белоруссии в XVI–XVIII вв. Мінск, 1979.

Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. Мінск, 1975.

Слуцк: Гістарычна-эканамічны нарыс. Мінск, 1970.

Слуцк: Гістарычны нарыс. Мінск, 1960.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы. Мінск, 2001; 2007.

Славутыя імёны Бацькаўшчыны. Мінск, 2000.

З глыбінь вякоў: (метадычныя рэкамендацыі бібліятэкам рэспублікі па прапагандзе літаратуры аб гісторыі Беларусі). Мінск, 1990.

***Узнагароды, прызнанне.*** "Чалавек года" (1998) па прызнанню Міжнароднага Кембрыджскага біяграфічнага цэнтра. Дыплом імя Аляксандра Гейштара часопіса "Przegląd Wschodni" (2008, Варшаўскі ўніверсітэт). Ганаровы сябра Міжнароднай грамадскай арганізацыі "Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына". Ганаровы сябра Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Ганаровы сябра Таварыства беларускай культуры ў Літве. Ганаровы сябра гістарычнага клуба "Спадчына".

***Прысвечана вучонаму:*** Тарас А. Анатоль Грыцкевіч: лідар беларускай гістарыяграфіі. Мінск, 2018 (100 выдатных дзеячаў беларускай культуры).

## ДАДЗІЁМАВА Вольга Уладзіміраўна



Гісторык музыкі. Спецыяліст па музычнай культуры Беларусі XVII–XIX ст. Вярнула ў кантэкст айчыннай гісторыі вялікі пласт музычнай спадчыны. Доктар мастацтвазнаўства (2004), прафесар (2007). Акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі (2005). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (2020).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя станаўлення і развіцця музычнай культуры Беларусі да XX ст., помнікі айчыннага музычнага мастацтва.

Нарадзілася 5.08.1955, Гомель.

***Адукацыя:*** Беларуская дзяржаўная кансерваторыя (спецыяльнасць "музычнае мастацтва", 1978), аспірантура Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы АН БССР (1989).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Музычная культура гарадоў Беларусі ў XVIII стагоддзі" (1990, Літоўская кансерваторыя, Вільнюс).

***Доктарская дысертацыя:*** "Музычная культура Беларусі XVIII стагоддзя: сацыягістарычнае даследаванне" (2003).

***Працоўная дзейнасць.*** Мінскі інстытут культуры (1978–1992): канцэртмайстар, выкладчык, дацэнт кафедры фартэпіяна. Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, фартэпіянны і кампазітарска-музыказнаўчы факультэт (з 1993): дацэнт, прафесар, загадчык кафедры беларускай музыкі.

Аўтар і вядучая тэле- і радыёпраграм, канцэртаў, фестываляў, у тым ліку цыкла перадач "Галасы мінуўшчыны" Беларускага тэлебачання (з 1995).

***Асноўныя працы:***

Жизнь за чертой боли: стихи, проза. Минск, 2021.

Музыкальная культура Беларуси: историческая судьба и творческие связи. Мінск, 2018; 2019; 2020.

Музыкальная культура Беларуси X–XIX вв. Минск, 2015.

Гісторыя музычнай культуры Беларусі да XX стагоддзя. Мінск, 2012.
Музыка Беларусі эпохі Сярэдневякоўя і Рэнесанса: хрэстаматыя. Мінск, 2005.
Музычная культура Беларусі XVIII стагоддзя: гісторыка-тэарэтычнае даследаванне. Мінск, 2002; 2004.
Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі: вучэбны дапаможнік. Мінск, 2000; 2001.
Ян Давід Голанд. Мінск, 1997.
Восіп Казлоўскі (1757–1831): кароткі нарыс жыцця і творчасці. Мінск, 1995.
Гісторыя музычнай культуры Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. Мінск, 1994.
Музычная культура гарадоў Беларусі ў XVIII ст. Мінск, 1992.

***Удзел у калектыўных працах:***
Беларусы. Т. 11: Музыка. Мінск, 2008.
Музыкальный театр Белоруссии: дооктябрьский период. Минск, 1990.

***Узнагароды, прызнанне.*** Спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне крытыкі і мастацтвазнаўства. Грамата Міністэрства культуры. Грамата Міжнароднай арганізацыі ЮНЕСКА. Грамата Міністэрства адукацыі. Медаль Францыска Скарыны (2013). Ганаровая грамата Міністэрства культуры. Ганаровая грамата Міністэрства адукацыі. Пераможца Рэспубліканскага конкурса “Чалавек года” ў сферы культуры (2017). Ганаровае званне “Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі” (2020).

## ДАЙНЕКА Леанід Марцінавіч



Пісьменнік, аўтар твораў на гістарычную тэматыку, з якіх “сярэднявечная” трылогія (гістарычныя раманы “Меч князя Вячкі”, “След ваўкалака”, “Жалезныя жалуды”) стала заўважным здабыткам нацыянальнай літаратуры. Сябра Саюза пісьменнікаў СССР (1970). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1990).

28.01.1940, в. Змітраўка 2, Клічаўскі раён, Магілёўская вобласць – 21.08.2019.

***Адукацыя:*** тэхнічнае вучылішча ў Ніжнім Тагіле (1959), філалагічны факультэт БДУ, аддзяленне журналістыкі (1967).

***Працоўная дзейнасць.*** Ніжнетагільскі металургічны камбінат. Віцебская студыя тэлебачання: старшы рэдактар. Беларускае тэлебачанне. Часопіс "Маладосць" (1972–1989): адказны сакратар. Выдавецтва "Мастацкая літаратура" (1989–1993): загадчык рэдакцыі паэзіі. Прадпрымальнік (з 1993, алкагольны бізнес), заснавацель фірмы "Пасад" і "БелПі" (выраб брэнда "Крамбамбуля" і інш.).

***Асноўныя творы:***

Выбраныя творы. Мінск, 2018.
Ілоты. Мінск, 2018.
Сын ільва, дачка Зеўса – Леанід і Зінаіда. Мінск, 2018.
Той, каго ўдарылі па шчацэ. Мінск, 2016.
Назаві сына Канстанцінам. Мінск, 2010.
Пра лісоўчыка, злога хлопчыка. Мінск, 2010.
Чалавек з брыльянтавым сэрцам. Мінск, 1994.
Жалезныя жалуды. Мінск, 1993.
След ваўкалака. Мінск, 1988.
Меч князя Вячкі. Мінск, 1987.

***Узнагароды, прызнанне.*** Юбілейны медаль "За доблесную працу ў адзначэнне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна" (1970). Медаль "За працоўную доблесць" (1986). Літаратурная прэмія Саюза пісьменнікаў Беларусі імя І. Мележа (1988) за гістарычны раман "Меч князя Вячкі". Дзяржаўная прэмія Беларусі імя К. Каліноўскага (1990) за гістарычныя раманы "Меч князя Вячкі" (1987) і "След ваўкалака" (1988). Прэмія імя Валянціна Пікуля (2010) з уручэннем залатога медаля за цыкл гістарычных раманаў. Медаль "500-годдзе Аршанскай бітвы" (2015).



## ДАНСКІХ Сяргей Уладзіміравіч

Культуролаг, гісторык. Спецыяліст па гісторыі Гродзенскай ваеннай кампаніі (1705–1706), Паўночнай вайны 1700–1721 г. Кандыдат культуралогіі (1999), дацэнт (2003).

**Напрамкі даследаванняў:** рэгіяналістыка і турысцкае рэсурсазнаўства, культурная спадчына і краязнаўства Гродзеншчыны.

Нарадзіўся ў 1971 г., Шчучын.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (1994) і аспірантура па спецыяльнасці "тэорыя і гісторыя культуры" (1997) ГрДУ імя Я. Купалы.

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Праблемы культуры ў філасофіі В. У. Разанава" (1999).

***Працоўная дзейнасць.*** ГрДУ імя Я. Купалы (з 1997): выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі сусветнай культуры, дацэнт кафедры культуралогіі, начальнік вучэбна-метадычнага ўпраўлення, намеснік дэкана факультэта эканомікі і кіравання, намеснік дэкана гуманітарнага факультэта, намеснік дэкана факультэта турызму і сэрвісу, дэкан факультэта турызму і сэрвісу, загадчык кафедры турызму і культурнай спадчыны, дацэнт кафедры турызму і культурнай спадчыны.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Стыпендыя Праграмы імя Лэна Кіркланда (Польшча–ЗША, 2003).

***Асноўныя працы:***

Щучин: локальная история в контексте региональных процессов. Минск, 2019.

Гродненская военная кампания 1705–1706 гг. Минск, 2017.

Стагоддзі і падзеі Шчучынскай зямлі. Баранавічы, 2007.

Наш Шчучын. Гродно, 2001.

Событийный туризм: учебное пособие. Минск, 2014

Культурология. История культуры. Тексты лекций. Гродно, 2005.

***Удзел у калектыўных працах:***

Культурное наследие в контексте устойчивого развития: материалы международной научно-практической конференции (Гродно, 10–11 декабря 2019 г.). Гродно, 2020.

Планета идей. Трансграничный трансфер знаний в области привлечения инвестиций для приграничного туризма: От замысла до реализации. Минск, 2015.
Гродненский край приглашает гостей: К 70-летию Гродненской области. Гродно, 2014.
Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815. Гродна, 2006.
История мировой культуры: учебное пособие в 4-х частях. Ч. 3. Гродно, 2004.

***Узнагароды, прызнанне.*** Стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь для таленавітых маладых навукоўцаў (2006). Ганаровая грамата Гродзенскага аблвыканкама "За развіццё турызму ў Гродзенскай вобласці" (2015).

## ДАРАШЭВІЧ Энгельс Канстанцінавіч



Філосаф і культуролаг. Спецыяліст па гісторыі беларускай філасофскай, эстэтычнай і навуковай думкі XVII–XVIII ст., даследчык нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, які ўвёў айчынную культуру ва ўсходнееўрапейскі і еўразійскі навуковы абарот. Адзін з заснавальнікаў беларускай культуралогіі, гісторыі і сацыялогіі навукі, дзякуючы якім беларуская гуманітарыстыка пазбавілася правінцыяналізму, што стварыла перадумовы для больш дакладнага самавызначэння і ідэнтыфікацыі беларусаў. Доктар філасофскіх навук (1984), прафесар (1992). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1984).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя філасофіі і культуры Беларусі; іх генезіс, патэнцыял, тэндэнцыі развіцця ад хрысціянізацыі і першых княстваў беларусаў да XX ст.; гісторыя эстэтычнай думкі эпохі Асветніцтва; персаналіі і заканамернасці Асветніцтва на беларускіх землях; сацыялогія культуры; праблемы культуралогіі; этнічная самасвядомасць; міжнацыянальныя адносіны; беларускі фальклор.

26.10.1931, Мінск – 14.02.2020.

***Адукацыя:*** БДУ (1953), аспірантура БДУ (1958).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Георгій Валянцінавіч Пляханаў пра французкі матэрыялізм XVIII ст." (1958).

***Доктарская дысертацыя:*** "Філасофія эпохі Асветніцтва ў Беларусі" (1985).

***Працоўная дзейнасць.*** Горы-Горацкая сельскагаспадарчая акадэмія (1953–1958): выкладчык. Інстытут філасофіі і права АН БССР (1958–1990): вядучы навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела. Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі (1990–2002): загадчык аддзела сацыялагічных даследаванняў ідэалагічных працэсаў Рэспубліканскага цэнтра сацыялагічных даследаванняў, галоўны навуковы супрацоўнік. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (2002–2020): прафесар кафедры культуралогіі, прафесар кафедры этналогіі і фальклору.

***Асноўныя працы:***

Тэорыя фальклору: вучэбна-метадычны дапаможнік. Мінск, 2016.

Философская и социальная мысль Беларуси эпохи Просвещения. Гродно, 2010.

Философия эпохи Просвещения в Белоруссии. Минск, 1971.

Аниол Довгирд – мыслитель эпохи Просвещения. Минск, 1967.

***Удзел у калектыўных працах:***

Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зборнік навуковых прац. Мінск, 2016; 2017; 2018; 2019.

Цень Стралы: культурныя і вербальныя коды традыцыі. Мінск, 2018.

Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 4: Асветніцтва. Мінск, 2017.

Штудыі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы. Мінск, 2007.

Очерки истории науки и культуры Беларуси IX – начала XX в. Минск, 1996.

Антология педагогической мысли Белорусской ССР. Москва, 1986.

Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии: (дооктябрьский период). Минск, 1977.

Очерк истории эстетической мысли Белоруссии. Москва, 1972.

***Узнагароды, прызнанне.*** Дзяржаўная прэмія БССР (1984) за ўдзел у напісанні цыкла даследаванняў па гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі.

***Прысвечана вучонаму:*** У тэзаўрусе Беларусі: да 80-годдзя Энгельса Дарашэвіча. Мінск, 2011.

## ДЗЕМІДОВІЧ Алена Васільеўна



Гісторык. Спецыяліст па знешняй палітыцы ВКЛ і Рэчы Паспалітай у першай трэці XVII ст. Кандыдат гістарычных навук (2012), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя міжнародных адносін Новага часу, палітычная і сацыяльная гісторыя краін Усходняй і Паўночнай Еўропы ў XVI–XVII ст.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт, магістратура і аспірантура БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Вялікае Княства Літоўскае ў знешнепалітычных адносінах Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст." (2012).

***Працоўная дзейнасць.*** БДУ: выкладчык кафедры гісторыі Беларусі Старажытнага часу і Сярэдніх вякоў, дацэнт кафедры міжнародных адносін факультэта міжнародных адносін.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Навуковыя і навучальныя ўстановы Рэспублікі Польшча.

***Асноўныя працы:***

Вялікае Княства Літоўскае ў адносінах Рэчы Паспалітай з Расіяй і Швецыяй у першай трэці XVII ст. Мінск, 2021.

***Удзел у калектыўных працах:***

Да сваёй гісторыі: Сярэднявечча і Ранні Новы час: зборнік навуковых артыкулаў, прысвечаных памяці Паўла Лойкі. Смаленск, 2013.

Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы: матэрыялы II Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Гомель, 9–10 кастрычніка 2008 г. Гомель, 2008.

# ДЗЕМІДОВІЧ Анатолій Віктаравіч



Гісторык. Спецыяліст па гістарыяграфіі культуры Адраджэння ў ВКЛ. Кандыдат гістарычных навук (2009), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** дарэвалюцыйная расійская і беларуская гістарыяграфія; метадалогія гістарычнай навукі і крыніцазнаўства; пытанні сацыяльна-эканамічнага, культурнага, канфесійнага развіцця ВКЛ; гісторыя сельскай гаспадаркі Беларусі; краязнаўства.

Нарадзіўся 14.01.1976, в. Вялікае Сяло, Шчучынскі раён, Гродзенская вобласць.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (2002) і аспірантура (2007) ГрДУ імя Я. Купалы.

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Культура эпохі Адраджэння ў Вялікім Княстве Літоўскім у расійскай і беларускай гістарыяграфіі другой паловы XIX – пачатку XX ст.".

***Працоўная дзейнасць.*** СШ № 16 г. Гродна (2002–2004): настаўнік гісторыі. Лідскі каледж Установы адукацыі "ГрДУ імя Я. Купалы" (2004–2010): выкладчык сацыяльна-гуманітарных дысцыплін. Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт (з 2010): старшы выкладчык, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, загадчык кафедры педагогікі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, дацэнт кафедры агульнаправавых дысцыплін і дзяржаўнага кіравання.

***Асноўныя працы:***

Формирование ренессансных идей и представлений в культуре Беларуси в освещении российской и белорусской историографии (вторая половина XIX –первая треть XX века). Барановичи, 2016; 2018.

***Удзел у калектыўных працах:***
Сохранение национальной идентичности белорусского общества: прошлое, настоящее, перспективы: материалы Респу-

бликанской научной конференции (Барановичи, 21 апреля 2016 г.). Барановичи, 2016.
Философия [Электронный ресурс]: практическое пособие. Барановичи, 2014.

## ДЗЕРБІНА Галіна Вячаславаўна



Гісторык права. Спецыяліст па прававой культуры ВКЛ XV–XVI ст. Кандыдат юрыдычных навук (1990), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя дзяржавы і права Беларусі.

Нарадзілася 29.01.1954, Ушачы, Віцебская вобласць.

***Адукацыя:*** БДУ (1976).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Фарміраванне і развіццё інстытутаў сямейнага права Беларусі (XVI ст.)" (1990).

***Працоўная дзейнасць.*** Мінская абласная калегія адвакатаў (1976–1978): адвакат. Інстытут філасофіі і права НАН Беларусі (1978–1994): малодшы навуковы супрацоўнік, навуковы супрацоўнік, старшы навуковы супрацоўнік аддзела тэорыі і гісторыі дзяржавы і права. Беларускі недзяржаўны інстытут правазнаўства (1995–1999): дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права. Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны (1999–2002): старшы навуковы супрацоўнік, загадчык сектара гісторыі права і палітыка-прававой думкі. Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў (2002–2006): дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права. Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь: дацэнт кафедры канстытуцыйнага і міжнароднага права, прафесар. Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі: старшы навуковы супрацоўнік Рэспубліканскай лабараторыі гісторыка-культурнай спадчыны. Беларускі навукова-даследчы

інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы: старшы навуковы супрацоўнік аддзела археаграфіі.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Лонданскі ўніверсітэт (Інстытут паглыбленых прававых даследаванняў,1995).

***Асноўныя працы:***

Международное частное право: учебно-методическое пособие. Минск, 2008.

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэбна-метадычны дапаможнік. Мінск, 2006.

Права і сям’я ў Беларусі эпохі Рэнесансу. Мінск, 1997.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гісторыка-прававая навука: спадчына, стан і перспектывы: матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння прафесара І. А. Юхо, Мінск, 19–20 сакавіка 2021 г. Мінск, 2021.

Франциск Скорина и его время. 500-летие белорусского и восточнославянского книгопечатания: материалы Международной научной конференции, Минск, 30 ноября – 2 декабря 2017 г. Минск, 2017.

Матэрыялы XI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў “Кніжная культура Беларусі XI – пачатку XX ст.”, Мінск, 16–17 красавіка 2015 г. Мінск, 2015.

Матэрыялы IX Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў “Статут Вялікага Княства Літоўскага ў гісторыі культуры Беларусі”, Мінск, 18–19 красавіка 2013 г. Мінск, 2013.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мінск, 1989.

## ДЗЕРУЖЫНСКІ Вадзім Уладзіміравіч



Журналіст, пісьменнік. Аўтар кніг на тэмы альтэрнатыўнай гісторыі Беларусі, папулярызатар беларускай гісторыі.

**Тэматыка гісторыка-літаратурнай творчасці:** "гістарычна-рамантычныя міфы" пра беларусаў і Беларусь, гістарычна-ментальныя канцэпцыі як падмурак нацыі.

Нарадзіўся ў 1965 г., Растоў-на-Доне, Расія.

***Адукацыя:*** Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў.

***Працоўная дзейнасць.*** Перакладчык у Балгарыі. Аналітычнае кіраванне Выканаўчага Сакратарыяту Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Мінск: дарадца. "Аналитическая газета "Секретные исследования" (з 1998): галоўны рэдактар і сувыдавец.

***Асноўныя творы:***

Правда и ложь о беларуской истории: полемика с западнорусистами: статьи. Минск, 2017.

Мифы о Беларуси. Минск, 2013; 2014; 2015; 2018; 2020.

Забытая Беларусь. Минск, 2011; 2012; 2013; 2016.

Тайны беларуской истории. Минск, 2009; 2010; 2011; 2012; 2013; 2014.

***Удзел у калектыўных працах:***

Деды: дайджест публикаций о белорусской истории. Вып. 1, 2, 6. 9. 11. Минск, 2009, 2011, 2012, 2013.

***Узнагароды.*** Ганаровы медаль "За адраджэнне Беларусі" Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы (ЗША, Бостан, 2009).



## ДЗМІТРАЧКОЎ Пётр Фролавіч

Гісторык. Спецыяліст па пытаннях утварэння, палітычнай гісторыі ВКЛ і фарміравання беларускай народнасці. Кандыдат гістарычных навук (1973), прафесар (2003). Заслужаны работнік адукацыі Беларусі (1998). Член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі (1999).

**Напрамкі даследаванняў:** праблемы зараджэння і развіцця дзяржаўнасці на беларускіх землях, этнагенез і этнічная гісторыя беларусаў, гісторыя ВКЛ.

7.06.1937, в. Ганнаўка, Хоцімскі раён Магілёўскай вобласці – 12.12.2021.

***Адукацыя:*** гісторыка-геаграфічны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (1965), аспірантура Інстытута гісторыі АН БССР (1973).

***Працоўная дзейнасць.*** Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова (1965–2021): дэкан гістарычнага факультэта; прафесар кафедры гісторыі і культуры Беларусі; прафесар кафедры гісторыі Беларусі і ўсходніх славян; прафесар кафедры археалогіі, гісторыі Беларусі і спецыяльных гістарычных дысцыплін.

***Асноўныя працы:***

Белорусская государственность: история зарождения и развития (VI – начало XX в.): учебно-методический комплекс. Могилев, 2021.

Современные проблемы отечественной истории. Могилев, 2020.

Современные проблемы изучения истории Беларуси. Могилев, 2018; 2019.

История Беларуси. С древнейших времен до конца XVIII века. Могилев, 2014; 2015.

Введение в историю Беларуси. Могилев, 2012.

Белорусский этнос: истоки, становление и развитие: методические материалы и рекомендации. Могилев, 2010.

История зарождения и развития государственности на белорусских землях (IX–XVII вв.): учебно-методические материалы и рекомендации. Могилев, 2008.
Беларусь у сярэдневяковы перыяд (V – першая палова XIII ст.): вучэбна-метадычны дапаможнік. Магілёў, 2007.
Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага, другая палова XIII – першая палова XVII стст.: вучэбны дапаможнік. Магілёў, 2003.
Старажытная гісторыя Беларусі: вучэбна-метадычны дапаможнік. Магілёў, 1999.
Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага (другая палова XIII – першая палова XVII стст.): вучэбны дапаможнік: у 2 ч. Магілёў, 1996–1997.
Беларусь у IX – першай палове XIII ст.: вучэбны дапаможнік. Магілёў, 1994.
Аб паходжанні беларусаў, фарміраванні і развіцці беларускай народнасці: вучэбны дапаможнік. Магілёў, 1992.

***Удзел у калектыўных працах:***

Беларусь у другой палове XVII–XVIII стст.: вучэбны дапаможнік. Магілёў, 2000.

***Узнагароды, прызнанне.*** Выдатнік народнай асветы БССР (1982). Знак "Выдатнік асветы СССР" (1985). Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (1998). Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2004). Медаль Францыска Скарыны (2012). Нагрудны знак "За ўклад у развіццё Магілеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова" (2018). Ганаровая грамата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2019).

***Прысвечана вучонаму:*** Петр Фролович Дмитрачков: биобиблиографический указатель. Могилев, 2017 (Биобиблиография ученых МГУ имени А. А. Кулешова).



## ДЗЯНІСАВА Алена Рыгораўна

Гісторык. Спецыяліст па гісторыі Турава-Пінскай праваслаўнай епархіі ў XI–XVII ст. Кандыдат гістарычных навук (2009), дацэнт (2012).

**Напрамкі даследаванняў:** канфесійная гісторыя Беларусі канца X–XVIII ст., праваслаўныя манастыры, гісторыя адукацыі і культуры беларускіх зямель у часы ВКЛ.

Нарадзілася 24.12.1971, Пінск

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (1995) і аспірантура (2002) БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Праваслаўныя манастыры Турава-Пінскай епархіі ў грамадскім жыцці на беларускіх землях у XI–XVII стст." (2009).

***Працоўная дзейнасць.*** Нарачанская СШ (1995–1996): настаўнік. БДУ (з 2003): выкладчык, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Старажытнага часу і Сярэдніх вякоў.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гісторыя Беларусі: дапаможнік: у 4 ч. Ч. 1. Мінск, 2018.

Да сваёй гісторыі: Сярэднявечча і Ранні Новы час: зборнік навуковых артыкулаў, прысвечаных памяці Паўла Лойкі. Смаленск, 2013.



## ДЗЯРНОВІЧ Алег Іванавіч

Гісторык, археолаг, археограф, выдавец. Спецыяліст па гісторыі і крыніцазнаўству ВКЛ XIII–XVII ст., гістарычнай памяці пра ВКЛ. Заснавальнік і галоўны рэдактар штогадовага навуковага альманаха "Metriciana: Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага

княства Літоўскага" (з 2001). Кандыдат гістарычных навук (2004), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя Балтыйскага рэгіёна і балтыйскай палітыкі ВКЛ у XIII–XVII ст., крыніцазнаўства і археаграфія ВКЛ XV–XVII ст., Метрыка ВКЛ, праблемы этнічнасці ў Сярэднявеччы, гістарычная традыцыя ВКЛ і гістарычная памяць, помнікі манументальнага дойлідства, матэрыяльная культура Беларусі XI–XVIII ст., эвалюцыя замкавага мураванага дойлідства ВКЛ, археалагічнае вывучэнне Крэва.

Нарадзіўся 19.08.1966, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1990), аспірантура (1994) і дактарантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Дакументальныя крыніцы па гісторыі палітычных адносін Вялікага Княства Літоўскага і Лівоніі ў канцы XV – першай палове XVI стст. (Сістэматызацыя і актавы аналіз)" (2004).

***Працоўная дзейнасць.*** Беларускі рэстаўрацыйна-праектны інстытут (1988–1991): археолаг. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (з 1994): навуковы супрацоўнік, старшы навуковы супрацоўнік аддзела ўсеагульнай гісторыі і міжнародных адносін, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі XI–XVIII ст.

Выкладаў у Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. А. Куляшова. Чытаў публічныя лекцыі ў Санкт-Пецярбургскім універсітэце, Універсітэце імя Адама Міцкевіча ў Познані (Польшча), Універсітэце Эрнста-Морыца-Арндта ў Грайфсвальдзе (Германія).

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Цэнтр даследаванняў антычнай традыцыі пры Варшаўскім універсітэце. Цэнтр усходнееўрапейскіх даследаванняў Варшаўскага ўніверсітэта. Інстытут гісторыі Польскай акадэміі навук (Варшава). Ягелонскі ўніверсітэт (Кракаў). Вільнюскі ўніверсітэт (Літва). Інстытут гісторыі Літвы (Вільнюс). Інстытут гісторыі Латвіі Латвійскага ўніверсітэта. Вышэйшая школа сацыяльных даследаванняў (Францыя, Парыж). Цэнтральна-еўрапейскі ўніверсітэт (Венгрыя, Будапешт). Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт. Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт.

***Удзел у міжнародных даследчых праектах:*** Fonds d'Aide aux Lettres Polonaises Independantes (Парыж), American Council of Learned Societies (Нью-Ёрк), Centre For Advanced Studies and Education (Нью-Ёрк), Muzeum Polski (Варшава), Deutsches Historisches Institut Moskau (Масква).

***Асноўныя працы:***

Фрэскі гісторыі: Артыкулы і эсэ па гісторыі і цывілізацыі Беларусі і Цэнтральна-Усходняй Еўропы. Мінск, 2011.

Нонканфармізм у Беларусі, 1953–1985 = Belarusian nonconformism: даведнік. Т. 1. Мінск, 2004.

"…in nostra Livonia". Дакументальныя крыніцы па гісторыі палітычных адносінаў паміж Вялікім княствам Літоўскім і Лівоніяй у канцы XV – першай палове XVI ст.: Сістэматызацыя і актавы аналіз. Том I. Мінск, 2003.

***Археаграфічныя выданні:***

Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 560 (1541–1542 гг.). Кніга перапісаў № 3. 2-е выд. Мінск, 2010.

Метрыка Вялікага княства Літоўскага: Кніга 560 (1542 год): Кніга перапісаў № 3 (копія канца XVI ст.). Мінск, 2007.

Віцебска-Рыжскія акты XIII–XVII ст.: Дагаворы і службовая карэспандэнцыя паміж органамі кіравання горада Віцебска і ганзейскага горада Рыгі (з былога комплекса Ruthenica Дзяржаўнага Гістарычнага Архіва Латвіі). Вып. 1: Дакументы гаспадарча-гандлёвыя, XV–XVI ст. Мінск, 2005.

***Удзел у калектыўных працах:***

Крэва: гісторыя, археалогія, культурная спадчына: зборнік навуковых артыкулаў. Мінск, 2020; 2021.

Social and Cultural Relations in the Grand Duchy of Lithuania: Microhistories. 1st Edition. New York and London, 2019.

Ваенныя трыумфы Вялікага Княства Літоўскага: зборнік навуковых артыкулаў. Мір, 2018.

Kunigaikščiai Ostrogiškiai. Vilnius, 2016.

Князі Острозькі. Київ, 2014.

Сны о Византии? Место цивилизационного и культурного наследия Византии в регионе Пограничья Центрально-Восточной Европы. Вильнюс, 2014.

Вялікае княства Літоўскае і яго суседзі ў XIV–XV стст.: саперніцтва, супрацоўніцтва, урокі: Да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы. Мінск, 2011.
Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 2: Протарэнесанс і Адраджэнне. Мінск, 2010.
Silva rerum nova: штудыі ў гонар 70-годдзя Г. Я. Галенчанкі. Вільня: Мінск, 2009.
Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2008.
Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės istorijos šaltiniai. Faktas. Kontekstas. Interpretacija. Vilnius, 2007.
Найясьнейшая Рэч Паспалітая: цывілізацыя. Культура. Рэлігія. Палітыка. Авантура. Героіка. Успамін / [укладальнік А. Дзярновіч]. Мінск, 2007.
Лёс Крэва. Мінск, 1993.

***Узнагароды.*** Грамата (2016) і дыплом І ступені (2018) Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

## ДОЎНАР Аляксандр Барысавіч



Гісторык. Спецыяліст па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі XV–XVIII ст. Кандыдат гістарычных навук (2004).

**Напрамкі даследаванняў:** эканамічнае развіццё беларускіх зямель у часы ВКЛ (стан гарадоў, сельскай гаспадаркі, дарожных камунікацый і транспарту), сацыяльная стратыфікацыя мяшчанскага і сялянскага саслоўяў, праблемы гарадскога самакіравання ў XV–XVIII ст.

Нарадзіўся 1.01.1972, в. Загараны Вілейскага раёна Мінскай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДПУ імя М. Танка (1994), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1998).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** “Сацыяльна-эканамічнае становішча сялян-слуг дзяржаўных і прыватных уладанняў на беларускіх землях у другой палове XVI – сярэдзіне XVIII ст.” (2004).

***Працоўная дзейнасць.*** Хаценчыцкая СШ Вілейскага раёна (1995): настаўнік гісторыі. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (з 1998): малодшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст., загадчык сектара крыніцазнаўства і археаграфіі аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу, загадчык аддзела крыніцазнаўства і археаграфіі, загадчык аддзела спецыяльных гістарычных даследаванняў.

***Асноўныя працы:***

Сяляне-слугі Беларусі другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст. Мінск, 2007.

***Удзел у калектыўных працах:***

Францыск Скарына ў дакументах і сведчаннях. Мінск, 2020.

Рэлігійнае жыццё ў Вялікім Княстве Літоўскім і Каралеўстве Польскім у XVI–XVIII стагоддзях: у коле мясцовых спраў і праблем: зборнік навуковых артыкулаў. Мінск, 2019.

История белорусской государственности. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. Мінск, 2018.

Гісторыя Навагрудка – з глыбінь вякоў да нашых дзён. Мінск, 2014; 2016.

Белавежская пушча: вытокі запаведнасці, гісторыя і сучаснасць. Мінск, 2009.

Беларусь: Народ. Государство. Время. Минск, 2009.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2008.

Ягелоны: дынастыя, эпоха, спадчына: матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Гальшаны–Навагрудак, 8–10 верасня 2006 г.). Мінск, 2007.

## ДОЎНАР Таісія Іванаўна



Вучоны-юрыст. Спецыяліст па гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Доктар юрыдычных навук (1997), прафесар (2000). Выдатнік адукацыі (2009).

**Напрамкі даследаванняў:** характэрныя рысы і асаблівасці развіцця дзяржаўнасці Беларусі і нацыянальнага права на важнейшых гістарычных этапах; гісторыя канстытуцыйнага, крымінальнага і грамадзянскага права; гісторыя палітыка-прававой думкі Беларусі.

Нарадзілася 15.10.1944, г. Шацк, Пухавіцкі раён, Мінская вобласць.

***Адукацыя:*** Мінскае медыцынскае вучылішча (1964), юрыдычны факультэт БДУ (1973).

***Доктарская дысертацыя***: "Развіццё агульназемскага права Беларусі ў XV–XVI стагоддзях" (1997).

***Працоўная дзейнасць.*** БДУ (з 1977): выкладчык, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

***Асноўныя працы:***

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мінск, 2007; 2008; 2009; 2011; 2014; 2018; 2021.

Права Беларусі ў кантэксце гістарычнай эвалюцыі дзяржаўнасці [Электронны рэсурс]. Мінск, 2018 (Электронная библиотека БГУ).

Канстытуцыйнае права Беларусі феадальнага перыяду (па статутах Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гг.): вучэбны дапаможнік. Мінск, 2001.

Помнікі права Беларусі феадальнага перыяду. Мінск, 2001.

Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV–XVI стагоддзях. Мінск, 2000

***Удзел у калектыўных працах:***

Юрыдычная навука і адукацыя ў Беларускім дзяржаўным універсітэце: гісторыя і сучаснасць: да 95-годдзя юрыдычнага факультэта: зборнік навуковых прац. Мінск, 2020.

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэбны дапаможнік. Мінск, 2018.
Статут Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 1588 г.: да 430-годдзя выдання: зборнік навуковых артыкулаў па матэрыялах канферэнцыі, Мінск, 19–20 кастрычніка 2018 г. Мінск, 2018.
Статут Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 1566 г. [Электронны рэсурс]: да 450-годдзя выдання: матэрыялы Рэспубліканскага навукова-практычнага круглага стала, Мінск, 1 красавіка 2016 г. Мінск, 2016.
Матэрыялы IX Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў "Статут Вялікага Княства Літоўскага ў гісторыі культуры Беларусі", Мінск, 18–19 красавіка 2013 г. Мінск, 2013.
Статут Вялікага княства Літоўскага, 1588: юбілейнае выданне. Рэпрынтнае выданне. Мінск, 2010.
Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. Мінск, 2003.
Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мінск, 1989.
Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі. Мінск, 2001.
Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага феадальнага права. Мінск, 2000.
Крымінальнае права Беларусі: Закон, злачынства, адказнасць. Мінск, 1997.
Юрыдычны энцыклапедычны слоўнік. Мінск, 1992.

***Узнагароды, прызнанне.*** Прыз імя У. Д. Спасовіча Міністэрства юстыцыі (2003, 2019). Грамата Міністэрства адукацыі. Нагрудны знак Міністэрства адукацыі "Выдатнік адукацыі" (2009). Ганаровы работнік БДУ (2018). Медаль Францыска Скарыны (2020).

***Прысвечана вучонаму:*** Статут Вялікага Княства Літоўскага 1529 года і яго гісторыка-тэарэтычнае асэнсаванне: матэрыялы міжнароднага навукова-практычнага круглага стала, прысвечанага юбілею гісторыка права, доктара юрыдычных навук, прафесара Таісіі Іванаўны Доўнар, Мінск, 11 кастрычніка 2019 г. Мінск, 2019.

## ДУК Дзяніс Уладзіміравіч



Гісторык, археолаг. Спецыяліст па гісторыі і археалогіі Полацка і Полацкай зямлі ў IX–XVIII ст. Доктар гістарычных навук (2011), прафесар (2014).

**Напрамкі даследаванняў:** матэрыяльная культура, помнікі археалогіі, насельніцтва Полацка і гістарычнай Полацкай зямлі ў IX–XVIII ст.; роля Полацка ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці; краязнаўства.

Нарадзіўся 29.05.1977, Наваполацк.

***Адукацыя:*** гісторыка-філалагічны факультэт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, спецыяльнасць "гісторыя" (1999), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (2003).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Матэрыяльная культура насельніцтва Полацка XVI–XVIII стст. (па выніках археалагічнага вывучэння)" (2004).

***Доктарская дысертацыя:*** "Полацк IX–XVIII стст.: узнікненне, фарміраванне і развіццё (па археалагічных і пісьмовых крыніцах)" (2011).

***Працоўная дзейнасць.*** Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (1999–2017): выкладчык кафедры гісторыі і сацыялогіі, загадчык кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі, прарэктар па вучэбнай рабоце. Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова (з 2017): рэктар.

***Асноўныя працы:***

Виталитивная культура населения Полоцка: (по данным актовых книг магистрата 1656–1657, 1676, 1727 гг. и ревизии 1765 г.). Магілёў, 2021.

Археалагічныя комплексы пасадаў Полацка IX–XVIII стст. (па выніках раскопак 2004–2012 гг.). Наваполацк, 2014.

Полацк і палачане (IX–XVIII стст.). Наваполацк, 2010.

Археалогія: вучэбна-метадычны комплекс. Наваполацк, 2009.

Полацк XVI–XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада. Наваполацк, 2007.
Гісторыя Полацка: па матэрыялах археалагічных даследаванняў: вучэбна-метадычны комплекс. Наваполацк, 2006.

***Удзел у калектыўных працах:***
Полацк у святле станаўлення гістарычных і нацыянальных форм беларускай дзяржаўнасці (IX–XX стст.). Магілёў, 2019.
Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв. Минск, 2012.

***Узнагароды, прызнанне.*** Стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2007). Ганаровая грамата Міністэрства адукацыі (2011). Прэмія НАН Беларусі (2014). Медаль Францыска Скарыны (2017).

***Прысвечана вучонаму:*** Денис Владимирович Дук: биобиблиографический указатель. Могилев, 2021.

## ЕВАРОЎСКІ Валерый Барысавіч



Філосаф. Спецыяліст па інтэлектуальнай гісторыі ВКЛ і філасофскай спадчыне Беларусі. Кандыдат філасофскіх навук (2009), дацэнт (2009).

**Напрамкі даследаванняў:** метадалогія гісторыі і філасофіі, інтэлігенцыя як сацыякультурны феномен, сацыялогія гісторыі, працэс інтэлектуальнага развіцця Беларусі, гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі, філасофія ў нацыянальнай культуры.

Нарадзіўся 12.12.1962.

***Адукацыя:*** філасофскі факультэт БДУ (1985), аспірантура Інстытута філасофіі і права АН Беларусі (1990).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** “Філасофскія ідэі Кіеўскай Русі. Тэндэнцыі фарміравання” (1992).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут філасофіі НАН Беларусі (з 2004): загадчык аддзела беларускай філасофскай, грамадска-палітычнай думкі; кіраўнік Цэнтра гісторыка-філасофскіх і кампаратыўных даследаванняў; загадчык аддзела гісторыі філасофіі. БДУ (аднача-сова, з 2004): дацэнт факультэта філасофіі і грамадскіх навук.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Грант на даследаванні ў Архівах Адкрытага грамадства (1999, Будапешт, Венгрыя). Інстытут Кенана Цэнтра Вудра Вільсана (2000, Вашынгтон, ЗША). Акадэмія навук Літвы (2011, Вільнюс). Інстытут Кенана Міжнароднага Цэнтра даследаванняў імя Вудра Вільсана (2016, па праграме Фулбрайт, Вашынгтон, ЗША).

***Асноўныя працы:***

Нацыянальная філасофія Беларусі: тэорыя, архелогія, гісторыя, генеалогія, школа. Мінск, 2014.

***Удзел у калектыўных працах:***

Трошкі бліжэй да Сонца, трошкі далей ад Месяца: беларуская народная філасофія. Мінск, 2021; 2022.

Философия и вызовы современности: к 90-летию Института философии НАН Беларуси: материалы Международной научной конференции (Мінск, 15–16 апреля 2021 г.): в 3 т. Минск, 2021.

Интеллектуальная культура Беларуси: духовно-нравственные традиции и тенденции инновационного развития: материалы Пятой международной научной конференции (Мінск, 19–20 ноября 2020 г.): в 3 т. Минск, 2020.

Интеллектуальная культура Беларуси: истоки, традиции, методология исследования: материалы Первой международной научной конференции, Минск, 13–14 ноября 2014 г. Минск, 2015.

Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. Т. 1: Эпоха Сярэднявечча. Мінск, 2008; Т. 2: Протарэнесанс і Адраджэнне. Мінск, 2010; Т. 3: Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока. Мінск, 2013; Т. 4: Асветніцтва. Мінск, 2017.

***Узнагароды.*** Грамата НАН Беларусі (2011). Дыплом Незалежнай Акадэміі творчасці / Independent Academy of Creativity (Польшча, Варшава, 2011).



## ЕМЕЛЬЯНЧЫК *Уладзімір Пятровіч*

Гісторык, пісьменнік. Спецыяліст па гісторыі паўстання 1794 г. і постаці Тадэвуша Касцюшкі. Прыўносіў рамантызм у нацыянальную гістарыяграфію. Кандыдат гістарычных навук (1988), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** палітычная і ваенная гісторыя Беларусі XVIII ст., яе дачыненні з Польшчай і Расіяй, падзелы Рэчы Паспалітай.

9.05.1955, в. Вялікія Лукі Баранавіцкага раёна – 5.06.2003.

***Адукацыя:*** БДУ (1980).

***Працоўная дзейнасць.*** Мінскі інстытут культуры: выкладчык. Інстытут гісторыі АН Беларусі / НАН Беларусі (1991–2003): навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі эпохі феадалізма, старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст. БДУ, Беларускі гуманітарны ліцэй: дацэнт.

***Асноўныя працы:***

“Шляхі жыцця праз белы верш”. Мінск, 2012.

Паланез для касінераў: 3 падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі. Мінск, 1994.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). Мінск, 2004.

Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy. Tom I: Województwo wileńskie. XIV–XVIII wiek. Warszawa, 2004.

Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.

“Нарадзіўся я ліцьвінам…”: Тадэвуш Касцюшка. Мінск, 1994.

## ЕРМАЛОВІЧ Мікола Іванавіч



Гісторык, публіцыст, пісьменнік, крытык, літаратуразнаўца. Пачынальнік сучаснай беларускай гістарыяграфіі, які зрабіў пераварот у нацыянальнай гістарычнай навуцы, – выступіў з абвяржэннем савецкай канцэпцыі ўтварэння ВКЛ, вярнуў беларусам спадчыну ВКЛ і тым пазбавіў іх комплексаў гістарычнай непаўнавартаснасці і недзяржаўнай нацыі, а акадэмічную навуку актывізаваў на новыя даследаванні ВКЛ з беларусацэнтрычных пазіцый. "Амаль невідушчы гісторык, які цэламу народу раскрыў вочы на яго гісторыю". Аўтар і выдавец непадцэнзурных тэкстаў 1960–1980-х г. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1989). Лаўрэат дзяржаўнай прэміі (1992). Ганаровы грамадзянін Маладзечна.

**Напрамкі даследаванняў:** палітычная гісторыя старажытных земляў Беларусі, утварэнне і ранняя гісторыя ВКЛ і роля ў іх беларускай зямлі і народа.

29.04.1921, в. Малыя Навасёлкі, Дзяржынскі раён, Мінская вобласць – 5.03.2000.

***Адукацыя:*** беларускае аддзяленне літаратурнага факультэта Мінскага педінстытута (1947). Вучыўся ў аспірантуры пры Мінскім педінстытуце (1947–1948).

***Працоўная дзейнасць.*** Школа ў вёсцы Лабаскі Мардоўскай АССР (1941–1943): настаўнік рускай мовы і літаратуры. Раённы аддзел адукацыі, г. Сураж Віцебскай вобласці (1943–1944): інспектар. СШ у Койданаве / Дзяржынску Мінскай вобласці (1944–1946): завуч. Маладзечанскі настаўніцкі інстытут (1948–1955): выкладчык беларускай літаратуры. Маладзечанскі абласны інстытут удасканалення настаўнікаў (1955–1957): загадчык метадычнага кабінета. З 1957 г. на пенсіі з прычыны значнага пагаршэння зроку.

***Асноўныя працы:***
Выбранае. Мінск, 2010.
Ермаловіч Мікола: Лісты. Выступы. Гутаркі. Вершы. Мінск, 2007.
Беларуская дзяржава Вялікае Княства Літоўскае. Мінск, 2000.
Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд. Мінск, 1994.
Старажытная Беларусь: Полацкі Новагародскі перыяды. Мінск, 1990.
Па слядах аднаго міфа. Мінск, 1989; 1991.

***Узнагароды, прызнанне.*** Дзяржаўная прэмія імя Кастуся Каліноўскага (1992). Медаль Францыска Скарыны (1993). Прэмія імя Уладзіміра Караткевіча. Ганаровы грамадзянін Маладзечна.

***Прысвечана вучонаму:***
Матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі "Летапісец нашай славы": да 95-годдзя з дня нараджэння Міколы Ермаловіча (5 мая 2016 г.). Маладзечна, 2016.
Астапенка А. Мікола Ермаловіч: Той, хто вярнуў нам гісторыю. Мінск, 2015.
Яго чакала Беларусь чатыры стагоддзі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў да 85-годдзя з дня нараджэння Міколы Ермаловіча. Успаміны, творы, фотаматэрыялы. Мінск, 2007.

***Памяць.*** Памятны знак М. Ермаловічу ў Маладзечне (2003).

## ЖЛУТКА Алесь (Аляксандр) Анатольевіч



Класічны філолаг, гісторык, перакладчык, археограф. Знаўца сярэднявечнай лацінскай традыцыі ў Беларусі, які адкрыў і апублікаваў шмат гістарычных дакументаў. Аўтар перакладаў з лацінскай і старажытнагрэчаскай моў. Кандыдат філалагічных навук (1990), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** лацінамоўная літаратура Беларусі, лацінамоўныя крыніцы па гісторыі ВКЛ XIII–XVI ст., праблемы палеаграфіі

і дыпламатыкі лацінскіх крыніц, гісторыя ранняга хрысціянства на беларускіх землях.

Нарадзіўся 12.09.1954, в. Заполле Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці.

***Адукацыя:*** факультэт замежных моў Львоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, спецыяльнасць "класічная філалогія" (1983), аспірантура Інстытута літаратуры АН БССР (1988).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Лацінская літаратура Беларусі эпохі Асветы" (1990).

***Працоўная дзейнасць.*** Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (1983–1985): выкладчык лацінскай мовы. Інстытут літаратуры АН БССР (1988–1991): малодшы навуковы супрацоўнік. Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Францыска Скарыны (1991–1995): старшы навуковы супрацоўнік, даследчык лацінскай пісьменнасці Беларусі XIII–XIX ст. Беларускі гуманітарны ліцэй (1995–1996): выкладчык класічных моў. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (1996–2020): старшы навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу, старшы навуковы супрацоўнік аддзела крыніцазнаўства і археаграфіі. Univerzita Palackého v Olomouci / Універсітэт Палацкага ў Аламоўцы (Чэхія, з 2021).

Выкладаў таксама ў Беларускім інстытуце культуры, Пінскай духоўнай семінарыі імя Тамаша Аквінскага.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Архівы і бібліятэкі Рыма, Ватыканскі таемны архіў (пры падтрымцы Цэнтра еўрапейскіх даследаванняў і кантактаў Рымскага ўніверсітэта "La Sapienza", Італія). Тайны дзяржаўны архіў Прускай культурнай спадчыны (Берлін, Германія). Архівы і бібліятэкі Рыгі (міжакадэмічны абмен, Латвія). Архівы і бібліятэкі Варшавы і Кракава (стыпендыя Касы імя Юзэфа Мяноўскага, Польшча). Ягелонскі, Варшаўскі, Беластоцкі, Вроцлаўскі і Пазнаньскі ўніверсітэты (прэмія імя Льва Сапегі, Польшча, 2009).

***Асноўныя працы:***
Лацінска-беларускі слоўнік актавай мовы Вялікага Княства Літоўскага XIII–XVIII ст.: у 2 т. Мінск, 2021.
Лацінскія дакументы па гісторыі Беларусі XIII–XIV стст. у замежных архівах. Мінск, 2018.
Лацінская актавая палеаграфія. Мінск, 2015.
Лацінска-беларускі слоўнік актавай мовы Вялікага Княства Літоўскага XIII–XVIII стст. Мінск, 2011.
Кароткая граматыка лацінскай мовы. Мінск, 2008.
Mindowe, rex Lithowiae, in litteris et testimoniis = Міндаў, кароль Літовіі, у дакументах і сведчаннях. Менск, 2005.
Метадычныя рэкамендацыі да выдання лацінскіх дакументаў XIII–XIV стст. Мінск, 2005.

***Удзел у калектыўных працах:***
Францыск Скарына ў дакументах і сведчаннях. Мінск, 2020.
“Для лепшое твердости...”: пергаментные дакументы перыяду Вялікага Княства Літоўскага з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (1391–1566 гг.). Мінск, 2018.
Помнікі права Беларусі XIV–XVI стст.: агульназемскія прывілеі і акты дзяржаўных уній: крыніцазнаўчы дапаможнік. Мінск, 2018.
Полоцкие грамоты XIII – начала XVI в.: в 2 т. Москва, 2015.
Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. Т. 1: Даўняя літаратура: XI – першая палова XVIII ст. Мінск, 2006.
Гісторыя даўняй беларускай літаратуры. Мінск, 2005.

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэмія імя Льва Сапегі (Польшча, 2009).



## ЗАЯЦ Юрый Афанасьевіч

Археолаг, гісторык. Спецыяліст па сярэдневяковых старажытнасцях Цэнтральнай Беларусі. Кандыдат гістарычных навук (1989), дацэнт (2009). Ганаровы грамадзянін горада Заслаўя (1996).

**Напрамкі даследаванняў:** праблемы археалогіі і гісторыі Цэнтральнай Беларусі перыяду феадалізма, сярэднявечныя горад і вёска, абарончыя збудаванні, пахавальныя помнікі, станаўленне дзяржаўнасці, распаўсюджванне хрысціянства, крыніцазнаўства, геральдыка.

12.01.1951, Ліда – 3.04.2011.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт МДПІ імя М. Горкага (1977), аспірантура Інстытута гісторыі АН БССР (1983).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** “Заслаўе (Ізяслаўль) X–XVIII стст. Храналогія і сацыяльна-гістарычная тапаграфія” (1989, Кіеў, АН УССР, Інстытут археалогіі).

***Працоўная дзейнасць.*** Дзяржаўны музей БССР (1977–1978). Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (1978–1979): супрацоўнік сектара старажытнай беларускай культуры. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (1979–2001 і 2005–2011): лабарант, навуковы супрацоўнік сектара археалогіі сярэднявечнага перыяду, навуковы супрацоўнік аддзела археалагічных даследаванняў зон новабудоўляў, старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі і гісторыі Полацкай зямлі, старшы навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны. Беларускі дзяржаўны політэхнічны ўніверсітэт (2001–2005): дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі.

***Асноўныя працы:***

Оборонительные сооружения Менска XI–XIII вв. Минск, 1996.
Заславль в эпоху феодализма. Минск, 1995.
Заслаўская кафля. Мінск, 1990.
Заславль X–XVIII веков: Историко-археологический очерк. Минск, 1987.

***Удзел у калектыўных працах:***

Основные итоги археологических исследований на территории Беларуси в 2006–2010 годах. Минск, 2011.
Археологическая научно-музейная экспозиция НАН Беларуси. Минск, 2009.
Беларусь: Народ. Государство. Время. Минск, 2009.
Археалогія Беларусі: у 4 т. Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. Мінск, 2001.
Заславль в XVI в. Минск, 1998.

***Прызнанне.*** Ганаровы грамадзянін горада Заслаўя (1996).

***Прысвечана вучонаму:*** Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Вып. 24: Даследаванне сярэдневяковых старажытнасцей Цэнтральнай Беларусі (памяці Ю. А. Заяца). Мінск, 2013.

## ІВАНОВА *Людміла Сяргееўна*



Гісторык, архівіст, палеограф. Спецыяліст па гісторыі рэфармацыйнага руху ў Беларусі (другая палова XVI – першая палова XVII ст.).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя Рэфармацыі, царкоўна-рэлігійныя уніі, міжканфесійныя адносіны, культурныя працэсы, кнігадрукаванне і міжнародныя культурныя сувязі ВКЛ у XVI–XVII ст., картаграфаванне кальвінісцкіх збораў ВКЛ, актавыя кнігі XVII ст.

Нарадзілася 23.07.1947, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1971).

***Працоўная дзейнасць.*** Выдавецтва “Беларуская Савецкая Энцыклапедыя” (1969–1975): навуковы рэдактар. Інстытут гісторыі АН БССР (1976–2007): навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (з 2007): вядучы палеограф, галоўны архівіст, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытных актаў.

***Асноўныя працы:***

Еўрапейскае аблічча і рэгіянальныя асаблівасці рэфармацыі на Беларусі (другая пал. XVI – сяр. XVII ст.). Мінск, 1998.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гістарычны атлас Беларусі. Мінск, 2020.

Евангельскія хрысціяне ў Беларусі: пяць стагоддзяў гісторыі (1517–2017 гг.). Мінск, 2019.

Рэлігійнае жыццё у Вялікім Княстве Літоўскім і Каралеўстве Польскім у XVI–XVIII стагоддзях: у коле мясцовых спраў і праблем: зборнік навуковых артыкулаў. Мінск, 2019.
Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565 гг.): палітык, дыпламат, мецэнат: зборнік навуковых прац [да 500-годдзя Мікалая Радзівіла Чорнага]: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі, Нясвіж, 28–29 мая 2015 г. Нясвіж, 2016 (Studia Nesvisiensia).
Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. Т. 2. Мінск, 2013; 2018; 2020.
Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2008; Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). Мінск, 2007.
Гістарычны атлас Беларусі. Варшава: Мінск, 2008.
Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.

## КАВАЛЁЎ Сяргей Валер’евіч



Літаратуразнаўца, крытык. Спецыяліст па літаратуры ВКЛ XVI–XVIII ст. Галоўны рэдактар навуковага часопіса “Studia Białorutenistyczne”. Доктар філалагічных навук (2002), прафесар (2012). Драматург, стваральнік жанра германеўтычнай драматургіі. Аўтар п’ес, напісаных на гістарычным, фальклорным матэрыяле і пастаўленых у Беларусі, Расіі, Украіне, Польшчы, Славакіі, Балгарыі. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1989).

**Напрамкі даследаванняў:** старадаўняе беларускае і іншамоўнае пісьменства ВКЛ, усходнеславянская драма і тэатр, найноўшая беларуская літаратура.

Нарадзіўся 20.06.1963, Магілёў.

***Адукацыя:*** філалагічны факультэт БДУ (1985, спецыялізацыя “беларуская і руская філалогія”), аспірантура пры кафедры беларускай літаратуры БДУ (1988), дактарантура БДУ (1999).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** “Героіка-эпічная паэзія Беларусі і Літвы канца XVI ст.” (1991).

***Доктарская дысертацыя:*** “Станаўленне польскамоўнай паэзіі ў полілінгвістычнай літаратуры Беларусі эпохі Рэнесансу” (2002).

***Працоўная дзейнасць.*** БДУ (1988–2004): выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры. Універсітэт імя Марыі Кюры-Складоўскай (Люблін, Польшча, з 1993 – выкладанне, з 2008 – на пастаяннай працы): прафесар, дырэктар Інстытута славянскай філалогіі, загадчык кафедры славянскага літаратуразнаўства Інстытута неафілалогіі. Выкладанне гісторыі беларускай і рускай літаратур у навучальных установах Літвы, Харватыі, Германіі ў межах міжнароднай праграмы “Erasmus”.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Ягелонскі ўніверсітэт (Кракаў, Польшча).

***Асноўныя працы:***

Літаратура Вялікага Княства Літоўскага пачатку XVI–XVII стст.: феномен памежжа. Мінск, 2011.

Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу. Мінск, 2010.

Літаратура Беларусі позняга Рэнэсансу: жанры, творы, асобы. Мінск, 2005.

Гісторыя беларускай літаратуры: другая палова XVI ст.: курс лекцый. Мінск, 2005.

Станаўленне польскамоўнай паэзіі ў полілінгвістычнай літаратуры Беларусі эпохі Рэнэсансу. Мінск, 2002.

Героіка-эпічная паэзія Беларусі і Літвы канца XVI ст. Мінск, 1993.

***Удзел у калектыўных працах:***

Летапісы і хронікі Вялікага Княства Літоўскага, XV–XVII стст. Мінск, 2015 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).

Рэлігійнае пісьменства кірылічнай традыцыі XI–XV стст. Мінск, 2013 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).

Dziedzictwo kulturowe Wielkiego Księstwa Litewskiego: w 440. rocznicę Unii Lubelskiej. Lublin, 2011.

Славянамоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст. Мінск, 2011 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. Т. 1: Даўняя літаратура: XI – першая палова XVIII ст. Мінск, 2006.

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэмія імя Ежы Гедройца Польскага Інстытута ў Мінску (2001). Медаль Камісіі нацыянальнай адукацыі Польшчы (2008). Залаты Крыж Рэспублікі Польшча (2016).

***Прысвечана вучонаму:*** Паміж Беларуссю і Польшчай: Драматургія Сяргея Кавалёва / Pomiędzy Białorusią a Polską: Dramaturgia Siarhieja Kawaloua. Мінск, 2009.

## КАДЗІРА Уладзіслаў Мікалаевіч



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі антыфеадальнага руху і казацтва ў Беларусі ў другой палове XVI – першай трэці XVII ст. Кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання ўкраінцаў "Ватра".

**Напрамкі даследаванняў:** палітычнае і сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVI – першай трэці XVII ст., прававое становішча сялян, грамадска-палітычны рух і роля ў ім народных мас.

Нарадзіўся 30.08.1979, Камень-Кашырскі раён Валынскай вобласці, Украіна.

***Адукацыя:*** Валынскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Лесі Украінкі, спецыяльнасць "гісторыя" (2001), аспірантура БДПУ імя М. Танка (2006). Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, спецыяльнасць "інфармацыйна-ідэалагічная і выхаваўчая работа ва ўстановах адукацыі" (2009). Дактарантура БДПУ імя М. Танка (2020).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Антыфеадальная барацьба беларускага і ўкраінскага народаў у другой палове XVI – першай трэці XVII ст." (2008).

***Працоўная дзейнасць.*** БДПУ імя М. Танка (2003–2020): выкладчык, дацэнт кафедры новай і навейшай гісторыі, намеснік дэкана гістарычнага факультэта. Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава (з 2020): дэкан гуманітарнага факультэта, дацэнт кафедры

сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і менеджмента, першы прарэктар.

***Удзел у калектыўных працах:***

Белорусская государственность: истоки, становление, развитие. IX–XXI вв.: (к 100-летию провозглашения БССР): материалы II Республиканской научно-теоретической конференции, Минск, 21 декабря 2018 г. Минск, 2019.

Палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і этнакультурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.: да 150-годдзя скасавання прыгоннага права ў Расійскай імперыі: матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, Мінск, 4 сакавіка 2011 г. Мінск, 2011.

Сучасныя падыходы да вывучэння крыніц па гісторыі Беларусі: да 1000-годдзя летапіснай Літвы: матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, Мінск, 18 снежня 2009 г. Мінск, 2009.

## КАЗАКОВА Таццяна Пятроўна

Філолаг, гісторык літаратуры. Спецыяліст па дзейнасці Рыгора Цамблака ў ВКЛ і яго творчай спадчыне. Кандыдат філалагічных навук, дацэнт.



**Напрамкі даследаванняў:** хрысціянская духоўная спадчына ў беларускай літаратуры Сярэдневякоўя, паэтыка старажытнай беларускай літаратуры, праблемы параўнальна-гістарычнага літаратуразнаўства.

Нарадзілася ў 1958 г.

***Працоўная дзейнасць.*** БДУ, філалагічны факультэт: загадчык, дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры.

***Асноўныя працы:***

Грыгорый Цамблак: царкоўны дзеяч і пісьменнік. Мінск, 2008.

***Удзел у калектыўных працах:***
Чалавек з сонечнаю ўсмешкай: кніга пра Алега Лойку. Мінск, 2019.
Окрыленные словом: к 80-летию филологического факультета БГУ. Минск, 2019.
Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: да 900-годдзя Кірыла Тураўскага і 200-годдзя Тараса Шаўчэнкі: матэрыялы XI Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 24–26 кастрычніка 2013 г.: у 2 ч. Мінск, 2013.
Роль просветителей в Беларуси и Турции: международная научно-практическая конференция (Минск, 19 апреля 2011 г.). Минск, 2011.
Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: матэрыялы X Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 6–8 кастрычніка 2011 г. Мінск, 2011.
Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. Т. 1: Даўняя літаратура XI – першай паловы XVIII стагоддзя. Мінск, 2006; 2007.
Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя. Мінск, 2003.
Гісторыя Беларусі. Хрэстаматыя для 7 класа. Мінск, 2002.

## КАЗАКОЎ Аляксандр Уладзіміравіч



Гісторык. Спецыяліст па мілітарнай гісторыі і міграцыйных працэсах ва Усходняй Еўропе ў эпоху позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Кандыдат гістарычных навук (2011), дацэнт. Сябра Міжнароднай асацыяцыі гуманітарыеў.

**Напрамкі даследаванняў:** палітычная і сацыяльная гісторыя ВКЛ XV–XVI ст.; гісторыя міграцый, этнічнасці і нацыяналізму; гісторыя шляхецкага саслоўя Беларусі; гісторыя і гістарыяграфія Аршанскай бітвы 1514 г.

Нарадзіўся 2.11.1982, Віцебск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (2005) і магістратура (2006) БДУ, апірантура на кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (2009).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Эміграцыя знаці з рускіх княстваў у Вялікае княства Літоўскае (40-я гг. XV – 30-я гг. XVI ст.)" (2011).

***Працоўная дзейнасць.*** Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, факультэт інфармацыйных тэхналогій, кафедра гісторыі Беларусі і паліталогіі: асістэнт, выкладчык, дацэнт. БДУ: дацэнт. Незалежны даследчык (Беларусь-Швецыя).

***Удзел у калектыўных працах:***

Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII ст.): зборнік навуковых прац. Мінск, 2014.

## КАЗАКОЎ Юрый Леанідавіч

Гісторык. Спецыяліст па пытаннях канфесійнай гісторыі Беларусі XV–XVII ст. Кандыдат гістарычных навук (1978), дацэнт (1982). Выдатнік адукацыі (2000).



**Напрамкі даследаванняў:** рэлігійныя працэсы і іх уплыў на стан беларускага грамадства ў канцы XVI – першай палове XVII ст., грамадская думка і культура XVI–XVIII ст., шляхта ВКЛ у XVI–XVII ст., гісторыя Беларусі другой паловы XX ст.

Нарадзіўся 27.07.1950, г. п. Шуміліна Віцебскай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1972), аспірантура БДУ (1975).

***Працоўная дзейнасць.*** БДУ, гістарычны факультэт (з 1975): выкладчык, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі; загадчык кафедры гісторыі Беларусі Старажытнага часу і Сярэдніх вякоў; намеснік дэкана гістарычнага факультэта; дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Старажытнага часу і Сярэдніх вякоў.

***Удзел у калектыўных працах:***
Мястэчкі ва ўладаннях каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XVII–XVIII ст.: сацыяльна-эканамічнае развіццё. Мінск, 2021.
Гісторыя Беларусі: дапаможнік. У 4 ч. Ч. 1: Ад старажытнасці да сярэдзіны XVI ст. Мінск, 2018.
Становление и развитие белорусской государственности. Минск, 2011.
Гісторыя Беларусі і сусветная цывілізацыя: дапаможнік. Мінск, 2008.
Імёны ў гісторыі. Мінск, 1993.

## КАЗЛОЎ Леў Раманавіч



Гісторык, картограф, пісьменнік, перакладчык, кнігавыдавец. Спецыяліст па гістарычнай геаграфіі і картаграфіі Беларусі. Кандыдат гістарычных навук (1970), дацэнт (1979). Член Саюза прадпрымальнікаў Беларусі. Член Нацыянальнай Геаграфічнай Асацыяцыі (ЗША). Член міжнароднага "Клуба лідараў гандлю".

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя Беларусі, краязнаўства, беларуская картаграфія, выяўленне і аднаўленне рарытэтных карт, складанне новых гістарычных карт і атласаў.

Нарадзіўся 28.07.1938, в. Ліцвінкі Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці.

***Адукацыя:*** гісторыка-геаграфічны факультэт (1965) і аспірантура (1968) МДПІ імя М. Горкага.

***Працоўная дзейнасць.*** МДПІ імя М. Горкага (1969–1981): выкладчык, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі. Мінскі дзяржаўны інстытут культуры (1982–1991): прафесар кафедры гісторыі Беларусі і замежных краін, дэкан факультэта замежных студэн-

таў. Інстытут гісторыі АН Беларусі (1991–1994): старшы навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных навук, кіраўнік картаграфічнай групы. Прыватная выдавецкая фірма УП "Арти-Фекс" (з 1993): генеральны дырэктар. З 1995 – галоўны рэдактар "Вялікага гістарычнага атласа Беларусі", часопісаў "Падарожнік" і "Наш край".

***Асноўныя працы.***

***Картаграфічныя працы:***

Стагоддзі на картах. Мінск, 2021.

Брэст і наваколле ад старажытнасці да сучаснасці: атлас. Мінск, 2020.

Беларускія землі на картах XVII – другой паловы XVIII ст. Мінск, 2018.

Старажытная картаграфія Беларусі: атлас: у 3 вып. Мінск, 2005–2009.

Карэліцкі край на старажытных картах (XVI–XIX ст.). Мінск, 2008.

Беларускае Палессе на старажытных картах. Мінск, 2006.

Беларусь у працах польскіх картографаў (XVI–XX стст.). Мінск, 2004.

Картаграфія Беларусі падчас паўстання Тадэвуша Касцюшкі. Мінск, 2004.

Российская военная топография XIX в. – важнейший источник по истории Беларуси. Москва, 2003.

Картаграфія Беларусі падчас паўстання 1863–1864 гг. Мінск, 2003.

Навагрудак на старажытных картах. Мінск, 2002.

Гістарычны атлас Беларусі. Мінск, 1999; 2001.

Атлас па гісторыі Беларусі старажытных часоў: для вучняў 5-х класаў агульнаадукацыйных школ. Мінск, 1999.

Гісторыя Беларусі сярэдніх вякоў (VI–XV стст.): атлас для вучняў 6-х класаў агульнаадукацыйных школ. Мінск, 1996.

***Навучальны дапаможнік:***

Вспомогательные исторические дисциплины: учебно-методическое пособие. Минск, 1980.

***Мастацкія творы:***

Гудовіч Плат [псеўданім]. Размова нанова: выбраныя вершы. Мінск, 2017.

Радзивилл "Сиротка". Историческая трилогия. Кн. 1: Наследник по мечу. Минск, 2015.

"Афіцына Блавіяна": з сярэднявечча – у новы час . Мінск, 2014.

Крашэўскі Юзэф Ігнацы. Кароль у Нясвіжы; пераклад з польскай: Л. Казлоў. Мінск, 2009.
Падарожжы Мікалая Радзівіла "Сіроткі". Нясвіж, 2009.
Георг Кристоф Лихтенберг. Минск, 2002.

***Зборнікі гістарычных анекдотаў:***

З дазволу караля і вялікага князя: [гістарычныя анекдоты]. Мінск, 1992; 1998; 2016.
Представьте себе: [сборник]. Минск, 2001.
Большой музей остроумия: исторические анекдоты. Минск, 1999.
Музей остроумия. Мінск, 1983; 1986; 1989.
С разрешения короля и великого князя: [исторические анекдоты]. Мінск, 1992.

***Удзел у калектыўных працах:***

Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. Мінск, 2009–2018.
Атлас па гісторыі Беларусі: старажытныя часы і сярэднія вякі. Мінск, 2001; 2002.
Беларусь на сямі рубяжах (XI – пачатак XX ст.). Мінск, 1998; 2000.
Беларусь на сямі рубяжах. Мінск, 1993.
Памяць: Кобрынскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Мінск, 2002.
Беларускія землі ў складзе Вялікага княства Літоўскага ў XVI стагоддзі [Карты]. Мінск, 1997.
Кобрин: историко-экономический. Минск, 1987.

***Узнагароды, прызнанне.*** Выдавецкая фірма УП "Арти-Фекс" (генеральны дырэктар – Л. Р. Казлоў) адзначана еўрапейскім залатым прызам "Europe Award" (Парыж, 2001).

**КАЗЛОЎСКАЯ Наталля Уладзіміраўна**



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі і гістарыяграфіі палітычнай эліты ВКЛ. Кандыдат гістарычных навук (2001), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** сацыяльная гісторыя, гісторыя шляхты ВКЛ, гістарыяграфія ВКЛ, гістарыяграфія гісторыі шляхты ВКЛ, тэорыя і метадалогія гістарычнай навукі.

***Адукацыя:*** факультэт гісторыі і культуры (1994) і аспірантура ГрДУ імя Я. Купалы (1999), дактарантура БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Шляхта беларускіх зямель Вялікага княства Літоўскага (расійская дарэвалюцыйная і савецкая гістарыяграфія і крыніцазнаўства праблемы") (2001).

***Працоўная дзейнасць.*** ГрДУ імя Я. Купалы (з 1999): выкладчык, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі, намеснік дэкана факультэта гісторыі і сацыялогіі, начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю, загадчык кафедры сацыялогіі і спецыяльных сацыялагічных дысцыплін, дацэнт гэтай кафедры, дацэнт кафедры ўсеагульнай і славянскай гісторыі.

***Асноўныя працы:***

История религии: хрестоматия. Минск, 2012.

Новая история стран Европы (XVI–XVIII в.): учебно-методическое. пособие. Гродно, 2002. с

***Удзел у калектыўных працах:***

Народы и культуры славянского мира Восточной Европы в исторической ретроспективе (Беларусь, Украина, Россия, Польша): сборник научных статей. Гродно, 2020.

Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава: зборнік навуковых артыкулаў: у 2 ч. Ч. 1. Гродна, 2019.

Гістарыяграфія і крыніцы вывучэння гісторыі Беларусі: традыцыі і навацыі: зборнік навуковых артыкулаў. Мінск, 2018.

Беларусь, Расія, Украіна: дыялог народаў і культур. Гродна, 2013.

Смена парадигм в историографии XIX – начала XXI вв.: сборник научных статей. Гродно, 2012.

Стэфан Баторый у гістарычнай памяці народаў Усходняй Еўропы. Гродна, 2004.

***Узнагароды.*** Грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2010).

## КАЛЯДЗІНСКІ Леанід Уладзіміравіч



Археолаг. Спецыяліст па гісторыі матэрыяльнай культуры гарадоў і замкаў Беларусі X–XVIII ст. Стваральнік археалагічнага музея ў Віцебску (функцыянаваў у 1982–1989). Навуковы кансультант па бытавой кульуры XVI ст. пры стварэнні мастацкага кінафільма «Анастасія Слуцкая». Кандыдат гістарычных навук (1991), дацэнт (1995).

**Напрамкі даследаванняў:** матэрыяльная культура гарадоў і замкаў Беларусі X–XVIII ст., этапы яе фарміравання; помнікі археалогіі сярэднявечных беларускіх гарадоў Віцебска, Слуцка, Капыля; віталітыўная культура (культура штодзённага побыту, жыццезабеспячэння).

Нарадзіўся 17.02.1952, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1977), дактарантура Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Верхні замак Віцебска ў XI–XVII стст." (1991).

***Працоўная дзейнасць*.** Інстытут гісторыі АН БССР / АН Беларусі (1974–1994): лабарант, старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі сярэдневяковага перыяду. БДПУ імя М. Танка (1994–2013): дацэнт кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі, выкладчык археалогіі. Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (з 2013): старшы навуковы супрацоўнік аддзела архітэктуры, старшы навуковы супрацоўнік рэспубліканскай лабараторыі гісторыка-культурнай спадчыны.

***Асноўныя працы:***

Верхний замок Витебска (IX–XVIII вв.). Гродно, 2021.

Уводзіны ў археалогію: дапаможнік. Гродна, 2013.

Асновы археалогіі: уводзіны ў прадмет. Вучэбна-метадычны дапаможнік. Мінск, 2013.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гарады і вёскі Беларусі. Т. 9: Гродзенская вобласць, кн. 3. Мінск, 2017.

Беларусь замковая: [книга-фотоальбом]. Минск, 2015.

Вялікае княства Літоўскае: ВКЛ: энцыклапедыя: у 3 т. Мінск, 2005–2007, 2010.
Археалогія Беларусі: у 4 т. Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. Мінск, 2001.
Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. Мінск, 2000.
Случчына: мінулае і сучаснасць. Слуцк, 1995.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Мінск, 1993–2003.
Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1993.

***Узнагароды.*** Ганаровая грамата Прэзідыума Цэнтральнага савета Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (1981), падзяка ад Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта “за неацэнны ўклад у вывучэнне гісторыі г. Віцебска” (2002), падзяка ад адміністрацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска “за плённую працу і папулярызацыю гістарычнай спадчыны” (2008).

## КАНАНОВІЧ Уладзімір Ільіч



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі дыпламатычных адносін ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай і Крымскім ханствам у канцы XV – першай чвэрці XVI ст., гісторыі Клецкай бітвы 1506 г. Кандыдат гістарычных навук (1997).

**Напрамкі даследаванняў:** міжнародныя адносіны ва Усходняй Еўропе ў познім Сярэднявеччы, гісторыя ідэй і ўяўленняў у Сярэднявеччы, праблемы гістарычнай антрапалогіі, гісторыя арыстакратыі ВКЛ.

Нарадзіўся 15.12.1964, Клецк.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт ГрДУ імя Я. Купалы (1991), аспірантура Інстытута гісторыі АН Беларусі (1994); аспірантура Цэнтральна-Еўрапейскага ўніверсітэта, факультэт медыевістыкі (Венгрыя, Будапешт, 1996).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** “Дыпламатыя Вялікага княства Літоўскага у 1480 – першай чвэрці XVI ст.: Адносіны з Вялікім княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам” (1997).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі НАН Беларусі (1991–2004): навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (2005–2006). БДПУ імя М. Танка (з 2007): дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі культуры.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Інстытут нямецкай гісторыі (Гётынген, 2003). Цэнтр гістарычнай антрапалогіі сярэднявечнага Захаду, Школа вышэйшых сацыяльных даследаванняў (Парыж, 2004, 2006).

***Асноўныя працы:***

Рыцар на полі бітвы. Клецк, жнівень 1506 года: гісторыка-антрапалагічнае даследаванне. Смаленск, 2017 (Прэмія Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі за найлепшыя навуковыя публікацыі 2017 г. у намінацыі “Найлепшая манаграфія па гістарычных навуках”)

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэміі Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі (2016, 2017).

## КАРАЎ Дзмітрый Уладзіміравіч



Гісторык, гістарыёграф, археограф. Спецыяліст па гістарыяграфіі гісторыі Беларусі. Увёў у абсяг беларускай гістарыяграфіі тэму гістарычнай памяці пра ВКЛ. Арганізатар (з пачатку 1990-х г.) серыі міжнародных навуковых канферэнцый, прысвечаных гісторыі і культуры народаў ВКЛ, якія паспрыялі фарміраванню беларускай школы даследчыкаў ВКЛ і міжнароднаму прызнанню гродзенскай школы гісторыкаў. Выдавец міжнароднага гісторыка-культуралагічнага альманаха “Наш радавод” па праблематыцы ВКЛ (кн. 1–8, 1991–2001). Доктар гістарычных навук (1996), прафесар (2006).

**Напрамкі даследаванняў:** гістарыяграфія і крыніцазнаўства гісторыі Беларусі, гісторыя і культура народаў ВКЛ і Беларусі XVI – пачатку XXI ст., інтэлектуальная гісторыя ўсходнеславянскіх народаў

XVI – пачатку XXI ст., Гродна і заходні рэгіён Беларусі ў еўрапейскім гісторыка-культурным кантэксце.

25.12.1949, Уфа, Башкірская АССР – 7.10.2021.

***Адукацыя:*** Маскоўскі дзяржаўны гісторыка-архіўны інстытут (1973), аспірантура Далёкаўсходняга ўніверсітэта (Уладзівасток, Расія, 1979), юрыдычны факультэт ГрДУ імя Я. Купалы (1995).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Акадэмік М. К. Любаўскі як гісторык феадальнай Расіі" (1983).

***Доктарская дысертацыя***: "Беларуская гістарыяграфія канца XVIII – пачатку XX ст." (1996).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі, археалогіі і этнаграфіі народаў Далёкага Усходу Далёкаўсходняга навуковага цэнтра АН СССР (1973–1974): навуковы супрацоўнік. Далёкаўсходні дзяржаўны ўніверсітэт (1976–1979): асістэнт кафедры гісторыі СССР, намеснік дэкана гістарычнага факультэта. ГрДУ імя Я. Купалы (1979–1997): асістэнт, выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі. Гродзенскі філіял Беларускага інстытута правазнаўства (1997–1999): загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права. ГрДУ імя Я. Купалы (1999–2021): прафесар, загадчык кафедры эканамічнай тэорыі, прафесар шэрагу кафедр факультэта эканомікі і кіравання, прафесар кафедры дызайну. Дырэктар Гуманітарнага цэнтра даследаванняў Усходняй Еўропы (з 1996).

***Асноўныя працы:***

Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.). Минск, 2018.

Западная Беларусь в историко-культурном и историографическом контекстах Восточной Европы. Гродно, 2017.

Белорусская историография и формирование исторического сознания белорусов в 1914–1945 годах: (основные тенденции развития в геополитическом контексте эпохи). Гродно, 2016.

Любавский, М. К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. Минск, 2012 (Помнікі гістарычнай думкі Беларусі).

Белорусская и украинская историография конца XVIII – начала 20-х гг. XX в. в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев. Вильнюс, 2007.

Белорусская историография конца XVIII – начала XX в. / Политика царизма и формирование исторической науки Беларуси // Наш Радавод. Гродно, 1993. Т. 5, ч. 2.

***Удзел у калектыўных працах:***

Искусство в контексте менеджмента культуры Европы и мира. Гродно, 2019.

История белорусской государственности. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. Минск, 2018.

Зарубежное белорусоведение XVI – начала XXI вв.: основные этапы и проблемы становления и развития. Гродно, 2016.

Доўнар-Запольскі М. В. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах. Мінск, 2009; 2013 (Помнікі гістарычнай думкі Беларусі).

Стэфан Баторый у гістарычнай памяці народаў Усходняй Еўропы. Гродна, 2004.

Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі "Гістарычная памяць народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі. XIII–XX ст." (Гродна, 3–5 ліпеня 1996 г.) // Наш радавод. Гродна, 1996. Кн. 7.

Очерки истории архивного дела в Беларуси (XV–1991 г.). Минск, 1999.

Очерки истории науки и культуры Беларуси IX – начала XX в. Минск, 1996.

Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі "Царква і культура народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі XIII – пач. XX стст." (Гродна, 28 верасня – 1 кастрычніка 1992 г.). Гродна, 1992, 1994 (Наш радавод).

Материалы международной научной конференции по региональной истории Восточной Европы "Культура народов Великого княжества Литовского и Белоруссии, XIII – нач. XX вв." (Гродно, 22–24.10.1991). Гродно, 1991 (Наш радавод).

***Узнагароды.*** Ганаровая грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

***Прысвечана вучонаму:*** Народы и культуры славянского мира Восточной Европы в исторической ретроспективе (Беларусь, Украина, Россия, Польша): сборник научных статей. Гродно, 2020.



## КАРОТКІ Уладзімір Георгіевіч

Літаратуразнаўца. Спецыяліст па старабеларускай літаратуры XVI–XVII ст. Кандыдат філалагічных навук (1984), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя і тэорыя літаратуры; тэксталогія; старабеларуская літаратура Рэнесансу і барока; пісьменнікі і помнікі эпохі Рэфармацыі і Контррэфармацыі; творчасць Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Пятра Скаргі, Іпацiя Пацея, Мялеція Смятрыцкага, Андрэя Мужылоўскага, Касьяна Саковіча, Іосіфа Руцкага і інш.

Нарадзіўся 2.01.1956, Мір Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

***Адукацыя:*** філалагічны факультэт БДУ (1978). Вучань Санкт-Пецярбургскай школы медыевістаў.

***Кандыдацкая дысертацыя:*** “Творчасць Мялеція Сматрыцкага” (1984).

***Працоўная дзейнасць.*** Настаўнічаў. Інстытут літаратуры АН БССР (1982–1987). БДУ (з 1987): дацэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры.

***Асноўныя працы:***

Беларуская літаратура і гісторыя. Мінск, 2013.

Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны. Мінск, 1991.

Творческий путь Мелетия Смотрицкого. Минск, 1987.

***Удзел у калектыўных працах:***

Францыск Скарына: энцыклапедыя. Мінск, 2017.

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. Мінск, 2006–2007.

Старажытная літаратура ўсходніх славян XI–XIII стагоддзяў: хрэстаматыя. Гродна, 2004.

Беларуская літаратура, XI–XX стст.: дапаможнік. Мінск, 1999; 2001.

Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд. Мінск, 1985; 1996; 1997; 1998.
Старажытная беларуская літаратура: зборнік. Мінск, 1990; 1996.
Вирши / Симеон Полоцкий. Минск, 1990.

## КАСЦЮКАВЕЦ Ларыса Піліпаўна



Музыказнаўца, фальклярыст, медыевіст. Спецыяліст па гісторыі і тэорыі беларускай музыкі, музычнай медыевістыкі і этнамузыкалогіі, нотнай пісьменнасці ВКЛ і беларускаму канту. Доктар мастацтвазнаўства (2013), дацэнт (1982). Член Беларускага саюза кампазітараў (1985).

**Напрамкі даследаванняў:** экспедыцыйнае даследаванне традыцыйнай музычнай культуры Беларусі, славянскі народнапесенны фальклор, беларуская народная песня (стылістыка, натаванне), старажытнарускі і беларускі знаменны распеў, царкоўная музыка праваслаўнай традыцыі, кантавая культура Беларусі.

15.02.1939, Мінск – 30.10.2014.

***Адукацыя:*** Беларуская дзяржаўная кансерваторыя (спецыяльнасць “музыказнаўства”, 1966), аспірантура Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторый імя П. І. Чайкоўскага.

***Доктарская дысертацыя***: “Стылістыка канта і яе пераўтварэнне ў беларускай народнай песні” (2012).

***Працоўная дзейнасць.*** Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі (1965–2014), фартэпіянны і кампазітарска-музыказнаўчы факультэт: выкладчык кафедры гісторыі музыкі; дацэнт, загадчык кафедры тэорыі музыкі; дацэнт, прафесар кафедры беларускай музыкі.

***Асноўныя працы:***

Избранные труды по белорусскому музыкальному фольклору. Минск, 2019.

Каляндарна-песенная традыцыя Беларускага Панямоння ў экспедыцыйна-палявых запісах Л. П. Касцюкавец. Мінск, 2018 [Электронны рэсурс] (Аўдыяатлас традыцыйнай музычнай культуры Беларусі: вып. 11).
Фольклоризация канта. Минск, 2014.
Рукописный белорусский Ирмолой на квадратных линейных нотах 091/283к и его песнопение “Наславник царевича Ярослава”: исследование. Минск, 2011.
Стилистика канта и ее претворение в белорусской народной песне: в 2 кн. Минск, 2006–2008.
Беларускія народныя абрады. Мінск, 1994.
Беларускія канты: [Ноты]. Мінск, 1992.
Кантовая культура Белоруссии. Минск, 1975.

***Удзел у калектыўных працах:***
Фалькларыстыка. Веснавыя песні; поўнач – поўдзень: дапаможнік. Мінск, 2020.
Фалькларыстычныя даследаванні: зборнік артыкулаў. Вып. 8–12. Минск, 2011–2015.

***Узнагароды, прызнанне.*** Медаль СССР “Ветэран працы” (1985). Ганаровы знак Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (1999).



## КІТУРКА Ірына Фёдараўна

Гісторык. Спецыяліст па эканамічнай гісторыі Беларусі XVIII ст. Кандыдат гістарычных навук (2002), дацэнт (2008). Выдатнік адукацыі (2022).

**Напрамкі даследаванняў:** эканамічная гісторыя ВКЛ XVI–XVIII ст., дзяржаўная мытная служба ВКЛ, Скарбовая камісія ВКЛ, крыніцы эканамічнай гісторыі Беларусі XVI–XVIII ст.

Нарадзілася 1.07.1970, в. Чарнаўчыцы Брэсцкага раёна.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт ГрДУ імя Я. Купалы (1993), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Інстытут дзяр-

жаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (2019). Дактарантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Дзяржаўныя ўладанні на землях Беларусі ў другой палове XVII–XVIII ст.: палітыка гаспадарчага аднаўлення і развіцця" (2002).

***Працоўная дзейнасць.*** СШ № 23 г. Гродна (1993–1998): настаўнік гісторыі. Інстытут паслядыпломнай адукацыі ГрДУ імя Я. Купалы (2001–2007): выкладчык, дацэнт, намеснік дэкана факультэта бесперапыннай адукацыі. Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў ГрДУ імя Я. Купалы (2008–2015): дэкан факультэта перападрыхтоўкі спецыялістаў. ГрДУ імя Я. Купалы (з 2016): начальнік вучэбна-метадычнага ўпраўлення, першы прарэктар, (з 2017) рэктар.

***Асноўныя працы:***

Дзяржаўныя ўладанні на землях Беларусі ў другой палове XVII–XVIII ст.: палітыка гаспадарчага аднаўлення і развіцця. Гродна, 2013.

Гісторыя Беларусі: дапаможнік. Гродна, 2007.

***Удзел у калектыўных працах:***

Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава: зборнік навуковых артыкулаў. Гродна, 2021.

Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава: зборнік навуковых артыкулаў: у 2 ч. Гродна, 2019.

Августовский канал: необычная история и новая жизнь. Минск, 2019.

История белорусской государственности. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. Минск, 2018.

Гісторыя Беларусі ад пачатку XIX да 1945 года. Мінск, 2015.

Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. Санкт-Пецярбург, 2014.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). Мінск, 2007.

Нарысы гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Мінск, 2004.

***Узнагароды, прызнанне.*** Грамата Міністэрства адукацыі (2018). Грамата Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь (2018, 2020). Ганаровая грамата Міністэрства адукацыі (2020). Грамата Цэнтральнага камітэта Беларускага прафесійнага саюза работнікаў адукацыі і навукі (2020). Нагрудны знак Упраўлення ўнутраных спраў "За

адзнаку” (2020). Юбілейны медаль “90 год пракуратуры Рэспублікі Беларусь”. Нагрудны знак Міністэрства адукацыі “Выдатнік адукацыі” (2022). Пераможца рэспубліканскага конкурса “Жанчына года–2021” у намінацыі “За лідэрства і паспяховае кіраўніцтва”.

## КЛІМАЎ Ігар Паўлавіч



Мовазнаўца. Паліглот (валодае ўсімі славянскімі мовамі, англійскай і нямецкай мовамі, ведае класічныя мовы). Спецыяліст па помніках старажытнага беларускага пісьменства. Кандыдат філалагічных навук (1997), дацэнт. Сябра Міжнароднай камісіі па біблейных перакладах пры Міжнародным камітэце славістаў. Сябра Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя беларускай літаратурнай мовы і іншых славянскіх моў; гісторыя лінгвістыкі тэкста; праблемы біблеістыкі і медыевістыкі, сацыялінгвістыкі; сучасныя працэсы ў беларускай мове; саветалогія.

Нарадзіўся 6.01.1968, Светлагорск.

***Адукацыя:*** філалагічны факультэт БДУ (1992), аспірантура пры кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства БДУ (1995).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Мова перакладу Евангелля В. Цяпінскім (графіка, арфаграфія, фанетыка)” (1997).

***Працоўная дзейнасць.*** Гуманітарна-эканамічны недзяржаўны інстытут (1997–1998). Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт (1999–2000). Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (з 2000): дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры, дацэнт кафедры беларускай і замежнай філалогіі.

***Асноўныя працы:***

Евангелле ў перакладзе Васіля Цяпінскага. Мінск, 2012.

Старажытная беларуская літаратура XI–XVI стст.: Эпохі і постаці: вучэбны дапаможнік. Мінск, 2010.

Рэфармацыя ў гісторыі літаратурных моў славян: уклад польска-беларускага і славенска-харвацкага пратэстантызму 16 ст. Мінск, 2004.

## КЛІМАЎ Марат Васільевіч



Археолаг, гісторык. Спецыяліст па сярэднявечных паселішчах Полацкага Падзвіння. Выявіў больш за 180 старажытных паселішчаў. Кандыдат гістарычных навук (2005), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** вясковыя паселішчы; сістэма рассялення, генезіс і гістарычная тапаграфія гарадоў Полацкага Падзвіння X–XVI ст.; фартэцыі перыяду Лівонскай вайны.

Нарадзіўся 6.02.1972, Чавусы Магілёўскай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1994), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1998).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Вясковыя паселішчы ў акрузе Полацка X – сярэдзіны XVI ст." (2005).

***Працоўная дзейнасць.*** Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (1994–1995): выкладчык. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (з 1998): старшы навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны, старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Полацкай зямлі і сумежных тэрыторый.

***Асноўныя працы:***

Археалагічны комплекс Лучна-1 у акрузе Полацка (XI–XVI стст.). Мінск, 2019.

***Удзел у калектыўных працах:***

Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зборнік артыкулаў V міжнароднай

навуковай канферэнцыі, Полацк, 15–16 красавіка 2021 г. Наваполацк, 2021.
Расонскі край: гісторыя, культура, людзі: да 100-годдзя з дня нараджэння П. М. Машэрава: зборнік навуковых артыкулаў. Мінск, 2020.
Гісторыя Беларусі. Т. 1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. Мінск, 2007.
Археалогія Беларусі: у 4 т. Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. Мінск, 2001.
Полацк: карані нашага радавода. Полацкая зямля як сацыякультурная прастора ўзнікнення і развіцця беларускага этнасу і нацыянальнай дзяржаўнасці. Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 5–6 верасня 1995 г. Полацк, 1996.



## КЛІМУЦЬ Лада Яраславаўна

Гісторык. Спецыяліст па ідэалогіі сарматызму ў Беларусі ў XVI–XVIII ст. Кандыдат гістарычных навук (2009), дацэнт. Магістр Нью-Ёркскага ўніверсітэта (ЗША).

**Напрамкі даследаванняў:** грамадска-палітычнае і культурнае жыццё Рэчы Паспалітай у XVI–XVIII ст., сарматызм у яе ідэалогіі, культуры, мастацтве; менталітэт шляхты; асаблівасці і супярэчнасці сармацкай ідэалогіі ў ВКЛ; генезіс, мадыфікацыя, рысы сармацкай культуры на тэрыторыі Беларусі.

***Адукацыя:*** Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава (спецыяльнасць “гісторыя мастацтва”), магістратура Цэнтральна-Еўрапейскага ўніверсітэта (Венгрыя, Будапешт, спецыяльнасць “гісторыя”).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Ідэалогія сарматызму ў грамадскім і культурным жыцці беларускіх зямель Рэчы Паспалітай у XVI–XVIII стст.” (2009).

***Працоўная дзейнасць.*** МДУ імя А. А. Куляшова, гісторыка-філалагічны факультэт: дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі, дацэнт кафедры гісторыі і філасофіі.

***Асноўныя працы:***

История исторической мысли: курс лекций. Ч. 1: Древний мир. Могилев, 2018.

История исторической мысли: курс лекций: в 3 ч. Ч. 2: Средние века и Раннее Новое время. Могилев, 2020.

Сармацкая культура беларускай шляхты ў XVI–XVIII стст. Мінск, 2013.

Сарматызм у культуры беларускіх зямель Рэчы Паспалітай: дапаможнік. Магілёў, 2006.

## КОНАН Уладзімір Міхайлавіч



Філосаф, гісторык, культуролаг, літаратуразнаўца. Знакавая фігура на навуковай гуманітарнай прасторы Беларусі. Адзін са стваральнікаў беларускай гісторыка-філасофскай школы. Спецыяліст па гісторыі беларускай думкі, які прапанаваў новае бачанне беларускай інтэлектуальнай гісторыі, – абверг міф, што ў Беларусі філасофскай традыцыі не было, а існавала толькі вёска, фальклор. Доктар філасофскіх навук (1982). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі. Сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі (1982). Актыўны ўдзельнік адраджэння нацыянальнага духоўнага і інтэлектуальнага жыцця Беларусі.

**Напрамкі даследаванняў:** тэарэтыка-метадалагічныя праблемы філасофіі і культуралогіі; гісторыя філасофскай, эстэтычнай думкі Беларусі, беларускай культуры; беларускі фальклор, рэлігіязнаўства і літаратуразнаўства Беларусі.

23.04.1934, в. Вераскава, Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці – 6.06.2011.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1959), аспірантура Інстытута філасофіі і права АН БССР (1965).

***Доктарская дысертацыя:*** "Станаўленне і развіццё эстэтычнай думкі Беларусі (X ст. – 1917 г.)" (1981, Інстытут філасофіі АН СССР, Масква)

***Працоўная дзейнасць.***

Школа вёскі Стражы Вілейскага раёна (1959–1961): настаўнік, дырэктар. Інстытут філасофіі і права АН БССР (1965–1990): навуковы супрацоўнік, загадчык сектара эстэтыкі і сацыяльнай псіхалогіі, вядучы навуковы супрацоўнік. Выкладаў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны (1991–2004): вядучы навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела гісторыі і тэорыі культуры. Інстытут філасофіі НАН Беларусі (2006–2011): вядучы навуковы супрацоўнік.

***Асноўныя працы:***

Гісторыя эстэтычнай думкі Беларусі. У 3 т. Т. 1: X ст. – 1905 г. Мінск, 2010.

Выбранае. Мінск, 2009 (Выдатныя постаці Беларусі).

Беларуская мастацкая культура эпохі Сярэдневякоўя і Рэнесансу. Мінск, 2006.

Беларуская мастацкая культура ў кантэксце хрысціянскай цывілізацыі: гісторыка-тыпалагічнае даследванне. Ч. 1: Беларуская мастацкая культура эпохі Сярэдневякоўя: X–XV стст. Мінск, 2002.

Боская і людская мудрасць. Францішак Скарына: жыццё, творчасць, светапогляд. Мінск, 1990.

Ля вытокаў самапазнання: станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору. Мінск, 1989.

От Ренессанса к классицизму. Становление эстетической мысли Белоруссии в XVI–XVIII вв. Минск, 1978.

***Удзел у калектыўных працах:***

Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа: зборнік навуковых артыкулаў: у 2 ч. Ч 1. Гродна, 2009.

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. Мінск, 2006–2007.

Философская мысль Беларуси: культурно-исторические этапы, славянский контекст, методология исследования: научный отчет. Минск, 2005.

Культурная спадчына: культуралагічна-сацыялагічныя даследаванні. Мінск, 2001.
Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы. Мінск, 2001.
Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст.: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 2001.
Народная педагогіка беларусаў. Мінск, 1996.
Франциск Скорина – белорусский гуманист, просветитель, первопечатник. Минск,1989.
Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии: (дооктябрьский период). Минск, 1977.
Очерк истории эстетической мысли Белоруссии. Москва, 1972.

***Узнагароды, прызнанне.*** Дзяржаўная прэмія Беларусі за цыкл работ па гісторыі філасофскай і грамадскай думкі Беларусі (1984).

***Прысвечана вучонаму:*** Астапенка А. Уладзімір Конан: творца беларускай нацыянальнай ідэі. Мінск, 2017 (100 выдатных дзеячаў беларускай культуры).

## КРАЎЦЭВІЧ Аляксандр Канстанцінавіч



Археолаг, гісторык-медыевіст. Спецыяліст па палітычнай гісторыі ВКЛ XIII–XVI ст. і беларускаму Сярэднявеччу. Аўтар канцэпцыі ўтварэння ВКЛ як балта-славянскай дзяржавы. Папулярызатар найважнейшых падзей, з'яў, постацей беларускай гісторыі праз цыкл відэафільмаў "Гісторыя пад знакам Пагоні" (2009–2015) і цыкл перадач "Загадкі Беларускай гісторыі" (з 2015). Доктар гістарычных навук (1999), прафесар. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (2005). Старшыня Беларускага Гістарычнага Таварыства (2001).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя ВКЛ XIII–XVI ст.; біяграфістыка вялікіх князёў літоўскіх; матэрыяльная культура гарадоў, мястэчак і замкаў беларускага Панямоння ў XIV–XVII ст.; этнічныя працэсы Сярэднявечча і Новага часу Беларусі.

Нарадзіўся 13.09.1958, в. Лупачы Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1981), аспірантура Інстытута археалогіі АН СССР (Масква, 1984), дактарантура БДУ (1999).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV–XVII стст. (планіроўка, культурны слой)" (1987).

***Доктарская дысертацыя:*** "Вялікае княства Літоўскае ў другой палове XIII – пачатку XIV ст.: генезіс дзяржавы па пісьмовых і археалагічных крыніцах" (1998).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі АН БССР (1985–1987): малодшы навуковы супрацоўнік аддзела сярэднявечнай археалогіі. Беларускі рэстаўрацыйна-праектны інстытут (1987–1990): начальнік аддзела архітэктурна-археалагічных даследаванняў. Архітэктурна-рэстаўрацыйны кааператыў "Арк" пры Міністэрстве культуры БССР (1990–1993): вядучы археолаг. Дзяржаўная інспекцыя аховы гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры (1993): намеснік старшыні. ГрДУ імя Я. Купалы (1994–2004): першы прарэктар, прафесар кафедры гісторыі Беларусі. Выкладаў ва ўніверсітэтах Польшчы і Літвы (з 1999): прафесар Жэшаўскага філіяла Люблінскага ўніверсітэта імя М. Кюры-Складоўскай, Вышэйшай школы публічнай адміністрацыі імя С. Сташыца ў Беластоку, Вышэйшай эканамічнай школы ў Беластоку, Варшаўскага ўніверсітэта, Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта. Варшаўскі ўніверсітэт, Цэнтр беларускіх студый пры Студыі Усходняй Еўропы (Studium Europy Wschodniej): навуковы супрацоўнік.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Ягелонскі ўніверсітэт (Кракаў, 1996–1997).

***Асноўныя працы:***

Кароткая гісторыя Беларусі. Рудня, 2022.

Дзяржава волатаў. Альгерд і Кейстут – гаспадары Вялікага Княства Літоўскага (1345–1377 г.). Мінск, 2020.

Сінія Воды: [верасень, 1362]: гістарычны нарыс. Мінск, 2017.

Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага. 1248–1377 г. Гародня: Уроцлаў, 2015. (прызнана найлепшай кнігай 2015 г.).

Краіна Пагранічча: выбраныя творы. Смаленск, 2014.

Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага: ад пачатку гаспадарства да каралеўства Літвы і Русі (1248–1341 г.). Гароднял Уроцлаў, 2013.
Гедымін (1316–1341). Каралеўства Літвы і Русі = Hiedymin (1316–1341). Kingdom of Lithuania and Ruthenia: нарыс. Мінск, 2012 (Прэмія імя Францішка Багушэвіча).
Гародня. 50 год без Фары Вітаўта: 1961–2011. Гродна, 2012.
Рыцары і дойліды Гародні. Вроцлаў, 2009.
Міндаўг-Mindauh: Пачатак гаспадарства. Мінск, 2005.
Powstanie Wielkiego Księstwa Litewskiego. Białystok, 2003.
Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 1998; Жэшаў, 2000; Беласток, 2008.
Вялікі князь Вітаўт. Мінск, 1998.
Тэўтонскі ордэн. Ад Ерусаліма да Грунвальда. Мінск, 1993.
Гродзенскі замак. Мінск, 1993.
Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV–XVIII стст.: Планіроўка, культурны слой. Мінск, 1991.
Майстар – наш продак. Мінск, 1990.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гародня X–XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. Гародня, 2014.

Белорусы: нация Пограничья. Вильнюс, 2011.

Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка. Мінск, 1994.

Стары Мір. Мінск, 1993.

***Узнагароды, прызнанне.*** Лаўрэат Прэміі імя Францішка Багушэвіча (2013). Медаль “100 гадоў БНР” Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (2018).



## КУЛАГІН Анатоль Мікалаевіч

Мастацтвазнаўца, гісторык архітэктуры. Спецыяліст па гісторыі беларускай архітэктуры XV–XIX ст. і архітэктурнай спадчыне. Доктар мастацтвазнаўства (2005). Член Саюза архітэктараў Беларусі (1979). Член Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (1986). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі (1990). Лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне" (2002).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя і тэорыя архітэктуры і мастацтва Беларусі.

Нарадзіўся 23.01.1947, Барысаў.

***Адукацыя:*** Беларускі політэхнічны інстытут (1960).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Архітэктура палацава-сядзібных комплексаў Беларусі (другая палова XVIII – першая палова XIX ст.)" (1986).

***Доктарская дысертацыя:*** "Архітэктура і мастацтва ракако Беларусі ў кантэксце агульнаеўрапейскай мастацкай культуры (да праблемы стылю)" (2004).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут "Белмясцпрампраект": архітэктар. Кінастудыя "Беларусьфільм": асістэнт мастака. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы АН БССР / НАН Беларусі (з 1970): старшы навуковы супрацоўнік.

***Асноўныя працы:***

Каталіцкія храмы Беларусі: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 2000; 2008.

Праваслаўныя храмы Беларусі: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 2001; 2007.

Эклектыка. Архітэктура Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя. Мінск, 2000.

Адраджэнне готыкі. Мінск, 1993.

Шэдэўры архітэктуры ракако: гісторыка-архітэктурны нарыс. Мінск, 1991.
Архитектура и искусство рококо в Белоруссии: В контексте общеевропейской культуры. Минск, 1989.
Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии: Вторая половина XVIII – начало XIX в. Мінск, 1981.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гарады і вёскі Беларусі. Т. 5–10. Мінск, 2008–2021.
Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце: у 4 т. Мінск, 2005–2009.
Барока ў беларускай культуры і мастацтве. Мінск, 1998; 2005.
Беларусь у малюнках Напалеона Орды. Другая палова XIX стагоддзя. Мінск, 2001; 2004.
Страчаная спадчына. Мінск, 1998; 2003.
Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 2–3. Мінск, 1988–1989.
Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Т. 1–7. Мінск, 1984–1988 (Дзяржаўная прэмія БССР, 1990).
Помнікі Слоніма. Мінск, 1983.

***Узнагароды, прызнанне.*** Дзяржаўная прэмія БССР (1990). Прэмія “За духоўнае адраджэнне” (2002). Польская прэмія “Przegląd Wschodni 2001”. Дыплом XIV Рэспубліканскага конкурса лепшых архітэктурных твораў (2009). Ганаровая грамата архібіскупа Тадэвуша Кандрусевіча (2009).

## КУЛЬ-СЯЛЬВЕРСТАВА Святлана Яўгенаўна



Гісторык. Спецыяліст па культуры Беларусі і ліцвінскай культурнай традыцыі другой паловы XVIII – першай паловы XIX ст. Доктар гістарычных навук (2000). Сябра Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Паэт.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя культуры Беларусі Новага часу, гістарычная храналогія, палеаграфія, краязнаўства, гісторыя Гродзенскага рэгіёна і яго турыстычны патэнцыял.

Нарадзілася 20.09.1959, Гродна.

***Адукацыя:*** гісторыка-педагагічны факультэт (1981) і аспірантура (1988) ГрДУ імя Я. Купалы, дактарантура БДУ (1999).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Развіццё культуры Беларусі ў першай палове XIX ст. (тэатральнае і выяўленчае мастацтва)" (1989).

***Доктарская дысертацыя**:* "Культура Новага часу на беларускіх землях у другой палове XVIII – першай чвэрці XIX ст." (2000).

***Працоўная дзейнасць.*** Школьны настаўнік (1981–1983). ГрДУ імя Я. Купалы (1983–2014): выкладчык, дацэнт кафедры гісторыі БССР; загадчык навукова-даследчай лабараторыі праблем рэгіянальнай культуры; прафесар кафедры археалогіі і этналогіі; прафесар кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін. Беластоцкі політэхнічны ўніверсітэт (з 2014): прафесар кафедры турызму і рэкрэацыі. Беларуская акадэмія ў Польшчы (з 2021): ініцыятар стварэння і адзін з арганізатараў.

***Асноўныя працы:***

Туризм в Подляском воеводстве: система управления, природные ресурсы, инфраструктура. Białystok, 2020.

Беларускі час. Летазлічэнне ў Беларусі са старажытнасці да сучаснасці. Гродна, 2014.

Палітыка. Культура. Асоба. Нарысы па гісторыі культуры Беларусі. Гродна, 2012.

Уводзіны ў беларускую палеаграфію. Гродна, 2009.

Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: Фармаванне культуры Новага часу на беларускіх землях (другая палова XVIII ст. – 1820- я гг.). Мінск, 2000.

Беларуская палеаграфія: навучальны дапаможнік. Гродна, 1996.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 4: Асветніцтва. Мінск, 2017.

Аўгустоўскі канал і яго наваколле: (па дакументах Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці). Слонім, 2011.

Kanał Augustowski: szlak wodny Euroregionu Niemen. Augustów; Suwałki, 2000.

Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. Ч. 1: Са старажытных часоў да канца XVIII ст. Мінск, 2000.

## КУТУЗАВА Наталля Аляксандраўна



Філосаф. Спецыяліст па палемічнай літаратуры Беларусі канца XVI – першай паловы XVII ст. Кандыдат філасофскіх навук (1996), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** пытанні нацыянальнай свядомасці ў філасофскай і грамадска-палітычнай думцы Беларусі XVI–XVIII ст.; культураантрапалагічныя асновы рэлігіі ў сістэме сучаснай культуры.

Нарадзілася ў 1969 г.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1991), аспірантура Інстытута філасофіі і права АН Беларусі (1994).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Сацыяльна-філасофская і этычная думка Беларусі першай паловы XVII ст." (1996).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва: дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін. Інстытут філасофіі НАН Беларусі: старшы навуковы супрацоўнік, кіраўнік Аддзела даследаванняў глабалізацыі, рэгіяналізацыі і сацыякультурнага супрацоўніцтва. Старшыня Міжнароднага грамадскага аб'яднання "Цэнтр вывучэння сучаснай рэлігійнасці".

***Асноўныя працы:***

Нация, религия и государственность в полемической литературе Беларуси конца XVI – первой половины XVII вв. 2-е дополненное изд. Минск, 2005.

Нация, религия и государственность в полемической литературе Беларуси конца XVI – первой половины XVII вв.: учебное пособие. Минск, 1998.

***Удзел у калектыўных працах:***

Философия и вызовы современности: к 90-летию Института философии НАН Беларуси: материалы Международной научной конференции (Мінск, 15–16 апреля 2021 г.): в 3 т. Минск, 2021.

История философской мысли Беларуси: учебное пособие. Минск, 2014.

Каталіцызм на Беларусі: фарміраванне інтэлектуальнай традыцыі [Электронны рэсурс]. Мінск, 2014.
Религиозные организации в общественном пространстве Беларуси и Украины: формирование механизмов партнерства. Вильнюс, 2014.
Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 3: Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока. Минск, 2013.
Национальное самосознание и философия Беларуси: учебно-методическое пособие. Минск, 2012.

## КУШНЯРЭВІЧ Аляксандр Мікалаевіч



Гісторык архітэктуры, археолаг, мастацтвазнаўца. Спецыяліст па дойлідству Беларусі XIV–XVI ст., які адзін з першых сярод айчынных гісторыкаў-медыевістаў звярнуўся да даследавання архітэктурных традыцый ВКЛ. Доктар мастацтвазнаўства (2005), прафесар (2012).

**Напрамкі даследаванняў:** гатычнае дойлідства ВКЛ: характарыстыка, этапы, тэндэнцыі і рэгіянальныя асаблівасці развіцця; спецыфіка фарміравання беларускага напрамку гатычнага дойлідства.

Нарадзіўся 26.05.1958, в. Дзядзілавічы Барысаўскага раёна Мінскай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт МДПІ імя М. Горкага (1982), аспірантура Ленінградскага аддзялення Інстытута археалогіі АН СССР, аспірантура Інстытута гісторыі АН БССР (1990), дактарантура БДПУ імя М. Танка (2003).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** “Культавае дойлідства Беларусі XIV–XVI стст.: гістарычнае і архітэктурна-археалагічнае даследаванне” (1991, Інстытут археалогіі АН СССР, Ленінградскае аддзяленне).

***Доктарская дысертацыя:*** “Гатычнае дойлідства Вялікага княства Літоўскага: функцыянальная і архітэктурная тыпалогія” (2005).

***Працоўная дзейнасць.*** Навукова-даследчы інстытут “Белспецпраектрэстаўрацыя” (1982–1990): археолаг. Інстытут гісторыі АН БССР (1990–1991): навуковы супрацоўнік аддзела археалагічных даследаванняў зон новабудоўляў. БДПУ імя М. Танка (1992–2005): выкладчык, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі культуры. Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут (2005–2006): загадчык кафедры гісторыі сусветных цывілізацый. Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт (з 2006): загадчык кафедры культуралогіі і міжнароднага турызму; прафесар кафедры айчыннай гісторыі і сусветнай культуры; прафесар кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму.

***Асноўныя працы:***

Мураваная дабастыённая фартыфікацыя Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2011; 2014.

Тыпалогія гатычнага абарончага, культавага дойлідства Вялікага княства Літоўскага. Мінск, 2007.

Культавае дойлідства Беларусі XIII–XVI стст.: Гістарычнае і архітэктурна-археалагічнае даследаванне. Мінск, 1993.

***Удзел у калектыўных працах:***

Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: [зборнік навуковых артыкулаў]. Вып. 18. Мінск, 2020.

Беларусь у кантэксце еўрапейскай гісторыі: асоба, грамадства, дзяржава: зборнік навуковых артыкулаў: у 2 ч. Ч. 2. Гродна, 2019.

Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. Мінск, 2005–2006; 2-е выд.: у 3 т. Мінск, 2007–2010.

## ЛАКОТКА Аляксандр Іванавіч



Архітэктар, гісторык, мастацтвазнаўца, этнолаг. Спецыяліст па праблеме эвалюцыі беларускай архітэктуры ў сусветным кантэксце і яе нацыянальных рысаў. Аўтар канцэпцыі феномена беларускай архітэктуры як сінтэзу ўсходне- і заходнееўрапейскіх традыцый дойлідства. Акадэмік НАН Беларусі (2014), доктар гістарычных навук (1993), доктар архітэктуры (2001), прафесар (2003). Акадэмік Беларускай акадэміі архітэктуры (2003). Заслужаны дзеяч навукі (2021). Член Саюза архітэктараў Беларусі. Член еўрапейскага Савета па культуры. Віцэ-прэзідэнт камісіі па архітэктуры і дызайну Міжнароднай арганізацыі народнай творчасці ЮНЕСКА. Член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі архітэктуры. Акадэмік Міжнароднай славянскай акадэміі па пытаннях культуры, адукацыі і навукі.

**Напрамкі даследаванняў:** тэорыя і гісторыя архітэктуры, агульныя і рэгіянальныя асаблівасці беларускага народнага дойлідства, выяўленне помнікаў народнага дойлідства, ахова і рэстаўрацыя гісторыка-архітэктурнай спадчыны, тэорыя і метадалогія ўкаранення нацыянальных асаблівасцей у сучасную архітэктуру Беларусі, беларускае дойлідства як культурная адзнака беларускага этнасу, роля архітэктуры ў ідэалогіі беларускай дзяржавы, праблемы ўключэння мастацкай спадчыны ў сферу турызму.

Нарадзіўся 25.01.1955, в Кузьмічы, Дзятлаўскі раён, Гродзенская вобласць.

***Адукацыя:*** Беларускі політэхнічны інстытут/ Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, архітэктурны факультэт (1977), аспірантура Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (1985).

***Кандыдацкая дысертацыя:***

“Агульныя і рэгіянальныя асаблівасці народнага жылля Беларусі (сярэдзіна XIX–XX стст.)” (1986).

***Доктарскія дысертацыі:***

“Беларускае народнае дойлідства (XIX – сярэдзіна XX стст.)” (1993);

“Беларусы. Дойлідства: Канцэпцыя гістарычнага феномена беларускай архітэктуры” (2001).

***Працоўная дзейнасць.*** Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (1978–1982, 1989–1995): загадчык аддзела, намеснік дырэктара па навуковай рабоце. Беларускі рэстаўрацыйна-праектны інстытут (1982–1989): архітэктар, начальнік архітэктурна-рэстаўрацыйнай майстэрні, галоўны архітэктар праектаў. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (з 1995): загадчык аддзела архітэктуры, намеснік дырэктара па навуковай рабоце, дырэктар.

З 1990 г. выкладае ў БДУ, БДПУ імя М. Танка, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, Еўрапейскім гуманітарным універсітэце.

***Асноўныя працы:***

Мелодии и летопись эпох: по страницам истории белорусской культуры. Минск, 2018.

Маршруты белорусского туризма: историко-культурные ландшафты. Минск, 2018.

Архитектура Беларуси в европейском и мировом контексте. Минск, 2012.

Цвета и легенды родных просторов. Минск, 2017.

Народнае дойлідства. Мінск, 2014.

Туристическая мозаика Беларуси. Минск, 2011.

Историко-культурные ландшафты Беларуси. Минск, 2006.

Топография природноценных территорий и историко-культурного ландшафта Белорусского государственного музея народной архитектуры и быта. Минск, 2005.

Архитектурное наследие Беларуси: развитие традиций, охрана и реставрация. Минск, 2004.

Драўлянае, сакральна-манументальнае дойлідства Беларусі. Мінск, 2003.

Архитектурно-ландшафтная топография белорусско-русского этнического пограничья. Минск, 2003.

Историко-культурные регионы Беларуси. Минск, 2002.

Архитектура европейских синагог. Минск, 2002.
Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. Мінск, 1999.
Беларусы. Т. 2: Дойлідства. Мінск, 1997.
Пад стрэхамі прашчураў. Мінск, 1996.
Бераг вандраванняў, ці Адкуль у Беларусі мячэці. Мінск, 1994.
Белорусское народное зодчество. Минск, 1991.
Сілуэты старога Мінска: нарысы драўлянай архітэктуры. Мінск, 1991

***Удзел у калектыўных працах:***
Художественная культура Радзивилловского Несвижа: XVIII–XXI вв. Минск, 2021.
Регионы Беларуси: в 7 т. Т. 1–6. Минск, 2009–2021.
Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце: у 4 т., 6 кн. Мінск, 2005–2009.
Нарысы гісторыі культуры Беларусі: у 4 т. Мінск, 2013–2017.
Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту. Мінск, 2012.
Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя: у 10 т., 20 кн. Мінск, 2004–2021.

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэміі НАН Беларусі (1999, 2011). Стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2002). Ганаровыя граматы Прэзідыума НАН Беларусі (2005), Міністэрства інфармацыі (2005), Міністэрства культуры (2011), Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь (2011), Міністэрства спорта і турызму (2013), Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей (2013). Нагрудны знак “За ўклад у развіццё культуры Беларусі” Міністэрства культуры (2007). Прэмія “За духоўнае адраджэнне” (2008). Медаль Францыска Скарыны (2016).

***Прысвечана вучонаму:*** Александр Иванович Локотко: к 60-летию со дня рождения. Минск, 2015 (Биобиблиография ученых Беларуси).

## ЛАТУШКІН Андрэй Мікалаевіч



Гісторык, архівіст. Спецыяліст па архіўнай спадчыне ВКЛ. Знаўца архіва і бібліятэчных збораў Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў, які на аснове вынікаў яго даследавання ўнесены (2009) у Міжнародны рэестр Праграмы ЮНЕСКА "Памяць свету". Кандыдат гістарычных навук (2007), дацэнт (2014). Паэт, кампазітар, выканаўца (фольк-спевы). Удзельнік руху гістарычнай рэканструкцыі рыцарскай эпохі.

**Напрамкі даследаванняў:** крыніцазнаўства гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст.; кірылічная, лацінская (польская) палеаграфія; гісторыя і арганізацыя архіўнай справы; фамільныя архівы Беларусі; тэарэтычныя аспекты архівазнаўства; пошук і рэстытуцыя страчанай дакументальнай спадчыны Беларусі; навуковая публікацыя гістарычных крыніц XVI–XVIII ст.; генеалогія Беларусі.

Нарадзіўся 8.08.1979, в. Піямонт, Талачынскі раён, Віцебская вобласць.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт, спецыяльнасць "гісторыка-архівазнаўства" (2001) і аспірантура (2005) БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Нясвіжскі архіў князёў Радзівілаў у канцы XVIII – першай палове XX стагоддзя" (2007).

***Працоўная дзейнасць.*** Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (2000–2005), аддзел аўтаматызаваных архіўных тэхналогій, аддзел старажытных актаў. БДУ (з 2005): выкладчык, дацэнт кафедры крыніцазнаўства.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Інстытут гісторыі Варшаўскага ўніверсітэта (2004–2005, 2013–2014).

***Удзел у калектыўных працах:***
Księga magistratu miasta Połocka z 1676 roku. Toruń, 2020 (Monumenta Magni Ducatus Lithuaniae).

1000-годдзе Брэста: праз прызму старадаўніх дакументаў [Электронны рэсурс]. Мінск, 2019.
Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565 гг.): палітык, дыпламат, мецэнат: зборнік навуковых прац. Нясвіж, 2016.
Дакументальная спадчына Беларусі XIV–XX стст.: матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі. Мінск, 2014.
Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 3. Мінск, 2014.
Альбом палеаграфічных здымкаў: (з электронным дадаткам): дапаможнік. Мінск, 2014.
Архівазнаўства: дапаможнік. Мінск, 2013.
Кніга магістрата места Полацка 1727 г. Беласток: Вільня, 2012.
Клио: грани истории: научно-популярное издание для молодежи. Минск, 2007.

***Узнагароды.*** Ганаровая грамата Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (2019).

## ЛАЎРОЎСКАЯ Ірына Барысаўна



Архітэктар, гісторык, грамадскі дзеяч. Спецыяліст па гісторыі старажытнага Брэста і яго архітэктурнай спадчыне, іх папулярызатар. Аўтар канцэпцыі рэгенерацыі гістарычнай забудовы Брэста. Кандыдат мастацтвазнаўства ў галіне ўрбаністыкі і архітэктуры (2006). Старшыня Фонда “European Urban Institute” (грамадская арганізацыя, створана ў 2013).

**Напрамкі даследаванняў:** урбаністыка, мастацтвазнаўства, гісторыя архітэктуры, сакральная архітэктура, архітэктура барока.

Нарадзілася 8.02.1951, Брэст.

***Адукацыя:*** Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут / Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, архітэктурны факультэт.

***Кандыдацкая дысертацыя:*** “Брэст-Літоўскі ў перыяд І Рэчы Паспалітай (1569–1795). Перамены ў планіроўцы і архітэктура”

(2006, Інстытут мастацтвазнаўства Польскай Акадэміі навук, Варшава).

***Працоўная дзейнасць.*** Праектная арганізацыя “Брэстграмадзянпраект”. Школа. Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт (1989–1999): выкладчык кафедры мастацка-графічных дысцыплін. Беларускі ліцэй пры Брэсцкім філіяле Беларускага гуманітарнага адукацыйна-культурнага цэнтра: выкладчык.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Архівы Варшавы, Любліна, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Вільні, Львова і інш.

***Асноўныя працы:***

Brześć Litewski w okresie I Rzeczypospolitej (1569–1795). Przemiane przstrenne i architektura. Варшава, 2006.

***Удзел у калектыўных працах:***

Wielkie powroty. Tom rozpraw międzynarodowej konferencji naukowej “Wielkie powroty. O dziełach sztuki, zbiorach bibliotecznych, archiwalnych i świętościach polskiego prawosławia utraconych i wywiezionych w czasie I i II Wojen Światowych”, Monaster Św. Onufrego Wielkiego w Jabłecznej, 15-17 października 2021 roku. Jabłeczna, 2021.

Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання: матэрыялы і даклады III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Брэст, 22–25 верасня 2015 г. Мінск, 2016.

Structural Analysis of Historical Constructions. Wrocław, 2012.

## ЛАЎРЫК Юрый Мікалаевіч
(псеўданім – Лаўрэн Юрага)



Гісторык культуры, кнігазнаўца, бібліятэкар, пісьменнік. Спецыяліст па гісторыі кірылічнага кнігадруку ВКЛ. Магістр тэалогіі.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя кнігі і асветы, гістарычнае кнігазнаўства, беларуская кірылічная друкарская традыцыя XVI–XVIII ст., старажытныя і рэдкія дакументы.

Нарадзіўся 30.11.1966, Мінск.

***Адукацыя:*** бібліятэчна-бібліяграфічны факультэт Мінскага інстытута культуры, факультэт тэалогіі і гісторыі Люблінскага каталіцкага ўніверсітэта (Польшча).

***Працоўная дзейнасць.*** Нацыянальная бібліятэка Беларусі (2003–2005): бібліёграф аддзела рукапісаў, рэдкай кнігі і старадрукаў; вядучы навуковы супрацоўнік. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь: вядучы навуковы супрацоўнік аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц.

***Асноўныя працы:***

Замак з люстраной залай: апавяданні. Мінск, 2021.

Кнігі і кнігазборы куцеінскага Богаяўленскага манастыра ў сярэдзіне XVII ст. Мінск, 2012 (Кніжныя цэнтры Беларусі).

Беларускія кніжныя пазнакі ў зборах бібліятэкі імя Ф. Скарыны ў Лондане. Лондан, 2001.

***Удзел у калектыўных працах:***

Сакральная культура Касцёла Беларусі: каталог выставы. Мінск, 2019.

Спірыдон Собаль і вытокі магілёўскага кнігадруку. Мінск, 2016.

Асвета і педагагічная думка на Беларусі: бібліяграфічны паказальнік. Мінск, 1995–2001.

## ЛАЎРЭШ Леанід Лявонцьевіч



Краязнаўца, гісторык, інжынер, пісьменнік. Стваральнік (1999) і адміністратар гісторыка-краязнаўчага сайта “Pawet” з інтэрнэт-бібліятэкай інфармацыйных рэсурсаў па ВКЛ. Аўтар прац па гісторыі Ліды і Лідчыны, грунтаваных на гістарычных крыніцах, аўтарытэтных даследаваннях і створаных згодна з прынцыпамі прафесійнага варштата гісторыка. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (2017).

**Напрамкі даследаванняў:** мікрагісторыя і рэгіяналістыка, гісторыя Ліды і Лідчыны (ад першабытнасці да 1939 г.) і іх месца ў еўрапейскім гістарычным кантэксце, канфесійная гісторыя эпохі ВКЛ і яе помнікі на Лідчыне, біяграфістыка вядомых ураджэнцаў і малавядомыя імёны краю, крыніцы рэгіянальнай гісторыі, гісторыя астраноміі ў Беларусі.

Нарадзіўся 1.03.1963, Ліда.

***Адукацыя:*** Беларускі політэхнічны інстытут / Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, электратэхнічны факультэт (1985).

***Асноўныя працы:***

Маламажэйкаўская царква: гістарычны нарыс. Гродна, 2017.

Вандалін Шукевіч: беларускі археолаг і краязнаўца. Мінск, 2014 (100 выдатных дзеячаў беларускай культуры).

“І зорнае неба над галавой…”: Нарысы з гісторыі астраноміі. Мінск, 2013.

Ліда ўчора і сёння: гісторыя горада ў выявах. Ліда, 2013.

Грэка-каталіцкая (уніяцкая) Царква на Лідчыне. Полацк, 2012.

Pawet: [сайт прысвечаны беларускай гісторыі і культуры] [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: pawet.net

***Прысвечана даследчыку***: Леанід Лаўрэш. Ліда, 2018 (Славутыя землякі).

## ЛАШКЕВІЧ Сяргей Анатольевіч



Гісторык. Спецыяліст па ўсходняму напрамку дыпламатыі ВКЛ у другой палове XVI ст. Кандыдат гістарычных навук (2015), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя знешняй палітыкі і дыпламатыі ВКЛ у другой палове XVI ст., гісторыя знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі ў XX – пачатку XXI ст.

Нарадзіўся ў 1978 г., в. Глебкавічы, Мінскі раён.

***Адукацыя:*** факультэт міжнародных адносін (2002) і аспірантура пры кафедры міжнародных адносін (2005) БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Дыпламатыя Вялікага Княства Літоўскага ва ўзаемаадносінах Рэчы Паспалітай і Расійскай дзяржавы (1586–1598 гг.)" (2015).

***Працоўная дзейнасць.*** Мсціжская СШ (1995–1996): лабарант. БДУ (з 2005): выкладчык кафедры агульнанавуковых дысцыплін; выкладчык, дацэнт кафедры міжнародных адносін.

***Асноўныя працы:***

Вільня і Масква ў канцы XVI ст.: дыпламатыя кампрамісаў. Мінск, 2016.

Асаблівасці знешнепалітычнай актыўнасці Вялікага Княства Літоўскага (1569–1600 гг.). Мінск, 2010.

Усходні накірунак дыпламатычнай дзейнасці Вялікага княства Літоўскага ў апошняй трэці XVI ст. Мінск, 2010.



## ЛІСЕЙЧЫКАЎ Дзяніс Васільевіч

Гісторык, архівіст. Спецыяліст па гісторыі ўніяцкай царквы Беларусі, яе духавенства, выяўленню і публікацыі яе крыніц. Пачынальнік навуковай серыі "Святыні Вялікага Княства Літоўскага". Кандыдат гістарычных навук (2009).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя ўніяцкай царквы XVI–XIX ст., штодзённае жыццё парафіяльнага святарства, канфесійныя архівы ВКЛ, генеалогія.

Нарадзіўся 4.09.1979, в. Дзяніскавічы, Ганцавіцкі раён, Брэсцкая вобласць.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (2001), магістратура БДУ (2002), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (2006).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святарства беларуска-літоўскіх земель (1720–1839 гг.)” (2009).

***Працоўная дзейнасць.*** Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (2002–2022): загадчык аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі, намеснік дырэктара.

***Асноўныя працы:***

Уніяцкія цэрквы Вялікага Княства Літоўскага XVII ст.: матэрыялы генеральных візітацый. Мінск, 2021 (Серыя “Святыні Вялікага Княства Літоўскага”).

Святар у беларускім соцыуме: прасапаграфія ўніяцкага духавенства 1596–1839 гг. Мінск, 2015 (медаль Францішка Багушэвіча).

Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720–1839 гг. Мінск, 2011 (прэмія Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі, 2013).

Візіты уніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага сабораў 1680–1682 гг.: зборнік дакументаў. Мінск, 2009.

***Удзел у калектыўных працах:***

Księga magistratu miasta Połocka z 1676 roku. Toruń, 2020.

“Для лепшое твердости...”: пергаментныя дакументы перыяду Вялікага Княства Літоўскага з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (1391–1566 гг.). Мінск, 2018.

Завещания униатских иерархов киевской митрополии XVII и XVIII вв. как пример религиозной культуры общества Речи Посполитой. Люблин, 2013.

Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917). Мінск, 2009.

Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 2–6. Мінск, 2007–2020.

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэмія Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі (2013). Медаль Францішка Багушэвіча (2015).

## **ЛІЦКЕВІЧ Алег Уладзіміравіч**

Гісторык-медыевіст, журналіст, літаратар. Стваральнік у Сеціве базы звестак па крыніцах гісторыі ВКЛ і беларускіх гістарычных матэрыялах IX–XVIII ст.

**Напрамкі даследаванняў:** старажытная беларуская паэзія, крыніцазнаўства, пісьмовыя крыніцы па гісторыі зямель ВКЛ IX–XVIII ст., палітычная гісторыя ВКЛ XIV–XVI ст., гістарычная геаграфія ВКЛ XIII–XVI ст.

Нарадзіўся ў 1973 г.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1996), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (2007).

***Працоўная дзейнасць.*** Газета "Во славу Родины" (1997–2001): журналіст. Беларускае тэлеграфнае агенцтва: журналіст. Часопіс "Беларуская думка" (2007–2010): рэдактар аддзела палітыкі, эканомікі, навукі. Выдавецтва Свята-Елісавецінскага манастыра, Мінск (2011–2012): літаратурны рэдактар. Акцыянернае таварыства "Эксклюзіўныя лінгвістычныя сістэмы" (з 2012): перакладчык, рэдактар.

***Асноўныя працы:***

"Летописец великих князей литовских" и "Повесть о Подолье": опыт комплексного критического разбора. СПб., 2019.

Гісторыя Беларусі IX–XVIII стагоддзяў. Першакрыніцы [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://starbel.narod.ru. Дата доступу: 2002–2018.

Fontes historiae Magni Ducatus Lithuaniae [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://starbel.by/ Дата доступу: з 2018.

***Удзел у калектыўных працах:***

Свято-Елисаветинский монастырь: история и будни. Минск, 2018.

Інтэграцыйныя працэсы ў гісторыі краін Усходняй Еўропы: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск, 19–20 лістапада 2008 г. Мінск, 2008.

## ЛОЙКА Алег Антонавіч



Філолаг, літаратуразнаўца, паэт, пісьменнік, гісторык. Спецыяліст па гісторыі беларускай літаратуры XVI – пачатку XX ст. Папулярызаваў постаць Францыска Скарыны ў СССР. Член-карэспандэнт АН БССР (1989), доктар філалагічных навук (1969), прафесар (1971). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі (1990). Член Саюза пісьменнікаў СССР (1960).

**Напрамкі даследаванняў:** літаратура часоў ВКЛ, беларускі складнік у польскамоўным пісьменстве Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, узаемасувязі літаратур, узаемадачыненні мастацкай літаратуры і фальклору; жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны.

1.05.1931, Слонім – 19.11.2008.

**Адукацыя:** філалагічны факультэт (1953) і аспірантура (1956) БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Адам Міцкевіч і беларуская літаратура" (1956).

***Доктарская дысертацыя:*** "Максім Багдановіч і праблемы развіцця беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя" (1969).

***Працоўная дзейнасць.*** БДУ (з 1956): выкладчык кафедры беларускай літаратуры; прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры; загадчык кафедры беларускай літаратуры XX ст., прафесар гэтай кафедры; дэкан філалагічнага факультэта. Выкладаў у Варшаўскім універсітэце (Польшча), Іенскім універсітэце (Германія).

***Асноўныя працы:***

Займальная літаратура: эсэ. Мінск, 2009.
Старабеларуская літаратура. Мінск, 2001.
Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае: раман-эсэ. Мінск, 1990 (Дзяржаўная прэмія БССР імя Якуба Коласа, 1990).
Скарына на Градчанах. Мінск, 1990.
Скорина. Москва, 1989 (Серия "Жизнь замечательных людей").

Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд: у 2 ч. Мінск, 1977–1980; 1989.

***Удзел у калектыўных працах:***
Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. Мінск, 2006–2007; 2010.
Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў. Т. 1: Даўняя літаратура XI – першай паловы XVIII стагоддзя. Мінск, 2007.
Традыцыі літаратуры старажытнай Русі ў беларускай літаратуры. Мінск, 1982.

***Узнагароды, прызнанне.*** Ордэн Дружбы народаў. Медаль Францыска Скарыны. Медаль “Заслужаны перад польскай культурай” (Польшча). Дзяржаўная прэмія БССР імя Якуба Коласа. Прэмія БДУ імя Уладзіміра Пічты. Срэбны Ганаровы знак (Германія).

***Прысвечана вучонаму:*** “Чалавек з сонечнаю ўсмешкай”: кніга пра Алега Лойку. Мінск, 2019.

***Памяць.*** Імем Алега Лойкі, якога лічаць узорам нацыянальнага інтэлігента, патрыёта і грамадзяніна Беларусі, названа вуліца ў Слоніме.

**ЛОЙКА Павел Алегавіч**



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі беларускага сялянства другой паловы XVI–XVIII ст. Адзін з першых у сучаснай беларускай гістарыяграфіі даследчыкаў палітычнай гісторыі ВКЛ і яго палітычнага народа – шляхты. Аўтар першых падручнікаў па айчыннай гісторыі ў суверэннай Беларусі. Кандыдат гістарычных навук (1984), дацэнт (2000).

**Напрамкі даследаванняў:** аграрная гісторыя Беларусі XVI–XVIII ст., дзяржаўна-палітычнае жыццё ВКЛ у XVI ст.: органы ўлады і кіравання, склад і дзейнасць прадстаўнічых інстытутаў шляхты (сойм), унутраная палітыка вялікіх князёў літоўскіх.

12.07.1958, Слонім – 22.10.2010.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1980), аспірантура Інстытута гісторыі АН БССР (1983).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Феадальная рэнта ў прыватнаўласніцкіх маёнтках Беларусі ў другой палове XVI–XVIII ст." (1984).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі АН БССР / НАН Беларусі (1983–2000): навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст. БДУ (1994–2010): загадчык кафедры гісторыі Беларусі Старажытнага часу і Сярэдніх вякоў, дацэнт гэтай кафедры. Выкладаў гісторыю Беларусі ў Беларускім гуманітарным ліцэі імя Я. Коласа.

***Асноўныя працы:***

Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. Мінск, 2002.

Гісторыя Беларусі XVI–XVIII стст.: вучэбны дапаможнік для 7 класа агульнаадукацыйнай школы. Мінск, 1993; 1998; 2000; 2004.

Unia lubelska na tle przemian politycznych i procesów państwotwórczych w Rzeczpospolitej // Ostatnie lata I Rzeczpospolitej. Łowicz, 1996.

Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI–XVIII ст. Мінск, 1991.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гісторыя Беларусі: дапаможнік: у 4 ч. Ч. 1. Мінск, 2018.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага княства Літоўскага. Мінск, 2008; Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). Мінск, 2004.

Гісторыя Беларусі XVI–XVIII ст.: вучэбны дапаможнік для 7 класа агульнаадукацыйнай школы. Мінск, 1993; 1998; 2000; 2004.

Handbuch der Geschichte Weißrusslands. Göttingen, 2001.

Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. Т. 1: Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. Мінск, 1997.

Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.

І ўзняўся люд просты. Мінск, 1992.

Скарына і яго эпоха. Мінск, 1990.

Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии, конец XIV в. – 1648 г.: сборник документов и материалов. Минск, 1988.

Паўстанне сялян пад кіраўніцтвам Вашчылы. Мінск, 1988.

***Прысвечана вучонаму:*** Да сваёй гісторыі: Сярэднявечча і Ранні Новы час: зборнік навуковых артыкулаў, прысвечаных памяці Паўла Лойкі. Смаленск, 2013.

## ЛЮБАЯ Алёна Аляксандраўна



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі татарскага фактару ў міжнародных адносінах дзяржаў Усходняй Еўропы канца XV – першай трэці XVI ст. Кандыдат гістарычных навук (2009), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя міжнародных адносін у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе ў познім Сярэднявеччы і раннім Новым часе, гісторыя нацыянальных меншасцяў Беларусі (гісторыя татараў), інтэлектуальная гісторыя, метадалогія гістарычнага даследавання.

Нарадзілася 2.08.1982, Бабруйск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (2004) і магістратура (2005) БДУ, аспірантура Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ (2009).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Татарскі фактар ва ўзаемаадносінах дзяржаў Усходняй Еўропы ў канцы XV – першай трэці XVI ст.” (2009).

***Працоўная дзейнасць.*** Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ, факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, кафедра гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі (2009–2022): выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры, прафесар. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (з 2022): навуковы супрацоўнік.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гісторыя Беларусі: дапаможнік. У 4 ч. Ч. 1: Ад старажытнасці да сярэдзіны XVI ст. Мінск, 2018.

East-Central Europe vis-à-vis Global Challenges. Parva 12. Warsaw, 2017.

Alba Ruscia: белорусские земли на перекрестке культур и цивилизаций (X–XVI вв.). Москва, 2015.
Средневековые тюрко-татарские государства. Вып. 3. Казань, 2011.
Общество, государство, верховная власть в России в средние века и раннее Новое время в контексте истории Европы и Азии (X–XVIII вв.). Москва, 2005.

## ЛЮБЫ Андрэй Уладзіміравіч



Гісторык. Спецыяліст па палітычнай гісторыі ВКЛ XIV–XVI ст. і гістарыяграфіі гісторыі ВКЛ. Кандыдат гістарычных навук (2006), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** гістарыяграфія гісторыі Беларусі, унутрыпалітычныя канфлікты ў гісторыі ВКЛ, эпоха Ягелонаў у гісторыі і гістарыяграфіі дзяржаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, палітычная культура ВКЛ, царкоўная гісторыя.

Нарадзіўся 2.01.1980, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (2002) і аспірантура (2005) БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Унутрыпалітычная барацьба ў Вялікім княстве Літоўскім у 30-40-ыя гг. XV ст.” (2006).

***Працоўная дзейнасць.*** Гістарычны факультэт БДУ (2003–2005): навуковы супрацоўнік, выкладчык. Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт (2006–2007): выкладчык. Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў: загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін (2007–2010). Гістарычны факультэт БДУ (з 2010): дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Старажытнага часу і Сярэдніх вякоў.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Удзел у міжнародных даследчых праграмах Вышаградскага фонда, Фонда імя Юзэфа Мяноўскага, Польскага камітэта ЮНЕСКА, Міністэрства адукацыі Літвы, Міністэрства нацыянальнай адукацыі і вышэйшай школы

Рэспублікі Польшча. Удзельнік міжнародных гуманітарных школ пры Даследчым цэнтры антычнай традыцыі і Інстытуце “Artes Liberales” Варшаўскага ўніверсітэта.

***Удзел у калектыўных працах:***
Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да канца XVIII ст.: вучэбны дапаможнік для 10-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. Мінск, 2020.
Гісторыя Беларусі: дапаможнік. У 4 ч. Ч. 1: Ад старажытнасці да сярэдзіны XVI ст. Мінск, 2018.
Беларускае мастацтва: гісторыя і сучаснасць / III Няфёдаўскія чытанні. Т. 2: Вялікае княства Літоўскае ў гісторыі і культуры Беларусі. Мінск, 2009.

## ЛЯЎКО Вольга Мікалаеўна



Археолаг, гісторык. Спецыяліст па гісторыі Віцебскай зямлі і помніках эпохі жалеза і Сярэдневякоўя паўночна-ўсходняй Беларусі. Заснавальнік новага навуковага кірунку – археалогія Беларусі XIV–XVIII ст. Доктар гістарычных навук (2000), прафесар (2010). Заслужаны дзеяч навукі (2017).

**Напрамкі даследаванняў:** айчынная сярэдневяковая гісторыя і археалогія; гарады, замкі, манастыры, гарадзішчы, курганныя магільнікі, селішчы паўночна-ўсходняй Беларусі эпохі жалеза і Сярэдневякоўя; матэрыяльная культура і гандлёва-культурныя сувязі гарадоў Беларусі перыяду ВКЛ; этна- і культурагенез славян; вытокі беларускай дзяржаўнасці; фарміраванне і развіццё раннедзяржаўных структур, тэрытарыяльна-адміністрацыйных утварэнняў IX–XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі.

21.05.1947, вёска Астравок, Капыльскі раён, Мінская вобласць – 26.10.2021.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1972).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Віцебск XIV–XVIII стст. (паводле археалагічных звестак)” (1980, Ленінградскі ўніверсітэт).

***Доктарская дысертацыя:*** “Фарміраванне і развіццё тэрытарыяльна-адміністрацыйных цэнтраў паўночна-ўсходняй Беларусі ў IX–XVIII стст.”.

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі АН БССР / НАН Беларусі (1970–2021): лабарант, навуковы супрацоўнік, загадчык Цэнтра гісторыі даіндустрыяльнага грамадства, загадчык Цэнтра археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу.

МДУ імя А. А. Куляшова (з 2004): прафесар кафедры археалогіі (па сумяшчальніцтву).

***Асноўныя працы:***

Археологическое наследие Беларуси. Минск, 2012; 2020.

Витебск. Минск, 2010 (Древнейшие города Беларуси).

Введение в археологию: пособие. Могилев, 2009.

Практическая археология: учебное пособие. Могилев, 2006.

Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: формирование и развитие. Минск, 2004.

Культовые памятники Орши конца XIV–XVIII вв.: историко-археологическое исследование. Орша, 1996.

Средневековая Орша и ее округа: историко-археологический очерк. Орша, 1993.

Средневековое гончарство северо-восточной Белоруссии. Минск, 1992.

Торговые связи Витебска в X–XVIII вв. Минск, 1989.

Экскурсия по древнему Витебску. Минск, 1984.

Витебск XIV–XVIII вв.: Стратиграфия, хронология, социально-историческая топография и технология производств. Минск, 1984.

Витебские изразцы XIV–XVIII вв. Минск, 1981.

***Удзел у калектыўных працах:***

История белорусской государственности. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. Мінск, 2018.

Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура: зборнік навуковых артыкулаў: у 2 ч. Мінск, 2017.

Славяне на территории Беларуси в догосударственный период: в 2 кн. Минск, 2016, 2019.

Друцк: Друцк и Друцкая волость (княжество) в IX–XII вв.: летопись древних слоев: князья Друцкие и их владения в XIII–XVIII вв.: ремесло, промыслы, торговля (по данным археологии, нумизматики, письменных источников): памятники архитектуры и объекты туризма. Минск, 2014.
Полоцк. Минск, 2012.
Археологическое наследие Беларуси: из глубин тысячелетий, памятники дописьменной эпохи (1-е тысячелетие н. э.), археологическое наследие эпохи древней Руси, материальная культура Беларуси XIV–XVIII веков (между Западом и Востоком). Минск, 2012.
Беларусь: Народ. Государство. Время. Минск, 2009.
Археологическая научно-музейная экспозиция НАН Беларуси. Минск, 2009.
История и материальная культура Витебска (X–XVIII вв.). Витебск, 2003.
Археалогія Беларусі: у 4 т. Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. Мінск, 2001.
Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 1: Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. Мінск, 2000.

***Узнагароды, прызнанне.*** Ганаровыя граматы Прэзідыума НАН Беларусі (1999, 2000, 2006). Ганаровы знак “2000 гадоў хрысціянству” (2000). Ганаровая грамата Аршанскага гарвыканкама (2002). Ганаровая грамата Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь (2007). Медаль “За працоўныя заслугі” (2008). Дыплом лаўрэата конкурса Топ-10 НАН Беларусі (2016). Ганаровае званне “Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь” (2017).



## ЛЯЎШУК Уладзімір Яўгеньевіч

Гісторык, культуролаг. Спецыяліст па гісторыі Таварыства езуітаў у Рэчы Паспалітай у 1569–1772 г. і яго дзейнасці ў сферы ўніверсітэцкай і школьнай адукацыі. Кандыдат гістарычных навук (2017).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя адукацыі, педагагічная дзейнасць Таварыства Езуса ў

Рэчы Паспалітай, гісторыя езуітаў у Гродна, турыстычны патэнцыял беларускіх рэгіёнаў.

Нарадзіўся 26.11.1964.

***Адукацыя:*** факультэт педагогікі ГрДУ імя Я. Купалы, магістратура па спецыяльнасці "педагогіка" (1989), факультэт фізікі (1998) і аспірантура па спецыяльнасці "гісторыя і тэорыя культуры" (2016) ГрДУ імя Я. Купалы.

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Езуіцкі калегіум у сацыякультурным гарадскім кантэксце беларускіх зямель ВКЛ у 1569–1773 гг." (2017).

***Працоўная дзейнасць.*** ГрДУ імя Я. Купалы (з 1998): выкладчык кафедры эканамічнай тэорыі і камерцыйнай дзейнасці, дацэнт кафедры міжнароднага бізнесу і маркетынгу, загадчык кафедры турызму і культурнай спадчыны, дацэнт кафедры міжнароднага бізнесу і маркетынгу. Філіял Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ў галіне тэхналогій інфарматызацыі і кіравання БДУ у Гродна: выкладчык.

***Асноўныя працы:***

Jezuici w Grodnie, 1622–1700: ludzie i dzieje kolegium: люди и история коллегиума. Kraków, 2013.

Организационные аспекты образовательной модели иезуитского коллегиума. Гродно, 2010.

***Удзел у калектыўных працах:***

Народы и культуры славянского мира Восточной Европы в исторической ретроспективе (Беларусь, Украина, Россия, Польша): сборник научных статей. Гродно, 2020.

Этнакультурныя і прыродныя турыстычныя рэсурсы Гродзеншчыны і Сувальшчыны: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 2014.

Обеспечение качества высшего образования: европейский и белорусский опыт: материалы Международной научно-практической конференции (Гродно, 28 ноября – 1 декабря 2007 г). Гродно, 2008.

Обеспечение качества высшего образования: европейский и белорусский опыт: сборник научных статей. Гродно, 2007.



## ЛЯЎШУН Любоў Віктараўна

Філолаг-медыевіст. Спецыяліст па ўсходнеславянскай сярэднявечнай кніжнасці. Доктар філалагічных навук (2012).

**Напрамкі даследаванняў:** усходнеславянская медыевістыка, тэорыя і гісторыя ўсходнеславянскай сярэднявечнай кніжнасці і культуры беларускіх земель.

Нарадзілася ў 1964 г., Віцебск.

***Адукацыя:*** БДУ (1988), аспірантура Інстытута сусветнай літаратуры імя М. Горкага (Масква, 1991).

***Доктарская дысертацыя***: "Катэгорыя творчага метаду ва ўсходнеславянскай пісьменнасці XI–XVII стагоддзяў" (2011).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы НАН Беларусі (1991–2012): навуковы супрацоўнік, кіраўнік сектара беларускай літаратуры. Беларускі экзархат (з 2012): навуковы кансультант. Цэнтр сямейнага выхавання "Наша гарадзішча" (2012–2018): намеснік дырэктара па навуцы. Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт (с 2018): прафесар кафедры стылістыкі англійскай мовы.

***Асноўныя працы:***

Златоусту подобный. Жизнеописание и духовное наследие преподобноисповедника Леонтия Виленского (к 400-летию со дня кончины). Москва, 2021.

Полоцкий князь Борис Всеславич. Москва, 2020.

О слове преображенном и слове преображающем: теоретико-аналитический очерк истории восточнославянского книжного слова XI–XVII веков. Минск, 2009.

История восточнославянского книжного слова X–XVII веков. Минск, 2001.

Леонтий Карпович: жизнь и творчество. Минск, 2001.

Очерки истории восточнославянской средневековой книжности: эволюция творческих методов. Минск, 2000.

***Удзел у калектыўных працах:***
Летапісы і хронікі Вялікага Княства Літоўскага, XV–XVII стст. Мінск, 2015 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).
Рэлігійнае пісьменства кірылічнай традыцыі XI–XV стст. Мінск, 2013 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).
Літаратура XI–XVI стагоддзяў. Мінск, 2011; 2012 (Залатая калекцыя беларускай літаратуры).
Славянамоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст. Мінск, 2011 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).
Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. Т.1: Даўняя літаратура: XI – першая палова XVIII стагоддзя. Мінск, 2006.

## ЛЯХАР Віктар Аляксандравіч

Гісторык, мастак-геральдыст. Эксперт у галіне гістарычнай і сучаснай геральдыкі, ваеннай сімволікі і атрыбутыкі. Стваральнік дзясяткаў гербаў населеных пунктаў Беларусі, эмблем, сцягоў. Падпалкоўнік запаса. Член Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (2001–2018). Сябра Беларускага саюза журналістаў. Сябра Міжнароднага саюза дызайнераў.



**Напрамкі даследаванняў:** ваенная сімволіка; графічная рэканструкцыя даспехаў; узбраенне, касцюмы і сцягі войска ВКЛ; гербы і сцягі гарадоў Беларусі.

Нарадзіўся ў 1965 г., Брэст.
***Адукацыя:*** Львоўскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча, спецыяльнасць “культпрасветработнік” (1987).
***Працоўная дзейнасць.*** Брэсцкі завод “Тэкстыльмаш”: мастак. Узброеныя Сілы СССР, Узброеныя Сілы Расійскай Федэрацыі (1987–1997). Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь (1997–2010): рэдакцыя часопіса “Армія” Міністэрства абароны: начальнік аддзела ілюстра-

цый і афармлення; намеснік начальніка Інфармацыйнага агенства Міністэрства абароны “Ваяр”. Займаўся распрацоўкай ваеннай сімволікі, атрыбутыкі, наглядной агітацыяй, музейнай справай, графічнай рэканструкцыяй даспехаў і ўніформы, ілюстраваннем кніг, газет і часопісаў.

***Асноўныя працы:***

Служить Беларуси! Иллюстрированная история. Минск, 2020.
Военная символика белорусов. Знамена и мундиры. Минск, 2014.
7 битв белорусского воинства. Минск, 2010.

***Удзел у калектыўных працах:***

Беларусь геральдычная. Мінск, 2014; 2020.
Современная геральдика Беларуси. Минск, 2012; 2014.
Ваенная энцыклапедыя Беларусі. Мінск, 2010.
7 битв Белой Руси. Минск, 2010.
Твои сыновья, Беларусь!: XII–XVIII вв. Минск, 2010.
Ваяры Белай Русі. Мінск, 2006.

***Узнагароды, прызнанне.*** Медаль “За бездакорную службу”(2003).

## МАКАРАЎ Максім Дзмітрыевіч



Гісторык, краязнаўца, архівіст. Спецыяліст па гісторыі гарадскога самакіравання ў Беларускім Падзвінні ў XIV–XVIII ст. Кандыдат гістарычных навук (2006).

**Навуковыя інтарэсы:** гісторыя гарадскога права і самакіравання, афармленне мяшчанства як саслоўя ў Беларускім Падзвінні, арганізацыя і функцыянаванне магістрата Полацка ў канцы XVI–XVIII ст. і яго дакументальная спадчына (магістрацкія кнігі) другой паловы XVII–XVIII ст.

Нарадзіўся 31.12.1976, Віцебск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1998), аспірантура Універсітэта імя Мікалая Каперніка (Польшча, Торунь).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Ад пасада да Магдэбургіі. Юрыдычнае становішча мест Беларускага Падзвіння ў XIV–XVI ст.” (2006, Торунь).

***Працоўная дзейнасць.*** Рэспубліканскае інавацыйнае ўнітарнае прадпрыемства “Навукова-тэхналагічны парк БНТУ “Палітэхнік”: старшы навуковы супрацоўнік. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі: намеснік дырэктара па навуковай рабоце.

***Асноўныя працы:***

Месцкія ўлады Полацка (1580–1772 гг.): арганізацыя, персанальны склад. Смаленск, 2014.

Ад пасада да магдэбургіі: прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст. Мінск, 2008.

***Удзел у калектыўных працах:***

Księga magistratu miasta Połocka z 1676 roku. Toruń, 2020 (Monumenta Magni Ducatus Lithuaniae).

Кніга магістрата места Полацка, 1727 г. Смаленск, 2014.

Кніга магістрата места Полацка 1727 г. = Księga magistratu miasta Połocka, 1727 r. Вільня, Беласток, 2012.

Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы. Мінск, 2008.

## МАЛЬДЗІС Адам Іосіфавіч



Літаратуразнаўца, гісторык, пісьменнік, журналіст, асветнік. Спецыяліст па беларускай культуры і літаратуры XVI–XIX ст. Выявіў шэраг каштоўных літаратурных і музычных беларускіх твораў XVI–XVIII ст. Доктар філалагічных навук (1986), прафесар (1990). Стваральнік (1987) і старшыня камісіі “Вяртанне” (Беларускі фонд культуры) па ўліку, пошуку і арганізацыі працы па вяртанні культурных скарбаў Беларусі, што апынуліся за яе межамі. Сябра Саюза пісьменнікаў СССР (1965). Сябра Беларускага ПЭН-цэнтра (1989). Удзельнік дэлегацыі БССР на 45-й сесіі Арганізацыі Аб’яднаных Нацый (1990). Прэзідэнт (1991–2005), ганаровы старшыня (з 2010) Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1980). Заслужаны дзеяч польскай культуры (1982).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя беларускай культуры і літаратуры XVI–XIX ст.; беларуска-польскія, беларуска-літоўскія, беларуска-украінскія літаратурныя ўзаемасувязі; рэстытуцыя культурных каштоўнасцей.

7.08.1932, в. Расолы, Астравецкі раён, Гродзенская вобласць – 3.01.2022.

***Адукацыя:*** аддзяленне журналістыкі БДУ (1956), аспірантура Інстытута літаратуры імя Я. Купалы АН БССР (1962).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі ў другой палове XIX ст." (1963).

***Доктарская дысертацыя:*** "Заканамернасці развіцця беларускай літаратуры пераходнага перыяду (другая палова XVII–XVIII ст.)".

***Працоўная дзейнасць.*** Радашковіцкая раённая газета "Сцяг Ільіча" (1956–1959): сакратар. Інстытут літаратуры імя Я. Купалы АН БССР (1962–1991): навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Францыска Скарыны (1991–1998): дырэктар. Міжнародная акадэмія навук Еўразіі (1996–2006): кіраўнік аддзела культуралогіі.

***Асноўныя працы:***

Што было, што ёсць, што будзе з беларусамі?: артыкулы, эсэ, інтэрв'ю. Мінск, 2022.

Ад Скарыны і Фёдарава – у XXI стагоддзе: зборнік эсэ. Мінск, 2018.

Восень пасярод вясны: аповесць. Мінск, 2014.

Соотечественики: очерки о белорусах и уроженцах Беларуси, обогативших мировую культуру. Минск, 2013.

Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі: эсэ; Восень пасярод вясны: аповесць, сатканая з гістарычных матэрыялаў і мясцовых паданняў. Мінск, 2009.

Белорусские сокровища за рубежом. Минск, 2009.

Выбранае. Мінск, 2007.

Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. Мінск, 2001.

І ажываюць спадчыны старонкі: Выбранае. Мінск, 1994.

Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: Партрэт пісьменніка і чалавека. Мінск, 1990.

Францыск Скарына як прыхільнік збліжэння і ўзаемаразумення людзей і народаў. Мінск, 1988.

З літаратуразнаўчых вандраванняў: Нарысы, эсэ, дзённікі. Мінск, 1987.

Восень пасярод вясны: Аповесць, сатканая з гістарычных матэрыялаў і мясцовых паданняў. Мінск, 1984.

Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя: Нарысы быту і звычаяў. Мінск, 1982.

На скрыжаванні славянскіх традыцый: Літаратура Беларусі пераходнага перыяду: другая палавіна XVII–XVIII ст. Мінск, 1980.

Таямніцы старажытных сховішчаў. Мінск, 1974.

Традыцыі польскага Асветніцтва ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Мінск, 1972.

Падарожжа ў XIX стагоддзе: З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры. Навукова-папулярныя нарысы. Мінск, 1969.

Творчае пабрацімства: Беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі ў XIX ст. Мінск, 1966.

***Удзел у калектыўных працах:***

Сузор'е беларускага памежжа: беларусы і народжаныя ў Беларусі ў суседніх краінах: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 2014.

Даўняя Беларусь. З настальгіяй аб мінулым. Мінск, 2010.

Супольнасць традыцыі – садружнасць у будучыні: беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі: зборнік артыкулаў. Мінск, 2012.

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. Мінск, 2007–2010; 2010.

Тысяча гадоў добраму суседству: беларуска-літоўскае гістарычнае і літаратурнае сужыццё: анталогія. Мінск, 2009.

Гісторыя беларускай кнігі. Т. 1: Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2009.

На шляху да ўзаемаразумення: навуковы зборнік. Мінск, 2000.

Выяўленне, сумеснае выкарыстанне і вяртанне архіўных, бібліятэчных і музейных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў замежных краінах. Мінск, 1999.

480 год беларускага кнігадрукавання: матэрыялы Трэціх Скарынаўскіх чытанняў, Полацк, 9–12 верасня 1997 г. Мінск, 1998.

Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя

аспекты): Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, якая адбылася ў Мінску пад эгідай UNESCO 19–20 чэрвеня 1997 г. Мінск, 1997.
Беларусь паміж Усходам і Захадам: праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. Мінск, 1997.
Францыск Скарына: жыццё і дзейнасць: паказальнік літаратуры: дадаткі за 1530–1988 гг., 1989–1993 гг. Мінск, 1995.
Вяртанне: дакументы і архіўныя матэрыялы па праблемах пошуку і вяртання нацыянальных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. Мінск, 1992.
Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. Мінск, 1992–1995.
Кніжная культура Беларусі: да 500-годдзя Ф. Скарыны. Мінск, 1991.
История белорусской дооктябрьской литературы. Минск, 1977.

***Узнагароды, прызнанне.*** Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980). Заслужаны дзеяч польскай культуры (1982). Чатыры польскія ганаровыя адзнакі. Ордэн Францыска Скарыны (2013). Медаль Францыска Скарыны. Медаль “100 гадоў БНР” Рады Беларускай Народнай Рэспублікі” (2019).

***Прысвечана вучонаму:*** Беларусь і беларусы ў прасторы і часе: Зборнік да 75-годдзя прафесара Адама Мальдзіса. Мінск, 2007.



## МАРЗАЛЮК Ігар Аляксандравіч

Гісторык, археолаг, палітык. Спецыяліст па праблеме ментальнасці насельніцтва Беларусі ў эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Член-карэспандэнт НАН Беларусі (2019), доктар гістарычных навук (2003), прафесар (2010). Выдатнік адукацыі (2014).

**Напрамкі даследаванняў:** матэрыяльная і духоўная культура беларускага сярэдневяковага горада; менталітэт, этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы беларусаў эпохі фе-

адалізма; этнічная і канфесійная гісторыя Беларусі X–XVII ст.; праблема беларускага нацыягенезу; гістарыяграфія гісторыі Беларусі эпохі Кіеўскай Русі і ВКЛ.

Нарадзіўся 11.09.1968, пас. Краснаполле Магілёўскай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт МДПІ імя А. А. Куляшова (1992).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Магілёў у XII–XVIII стст. (па матэрыялах археалагічнага даследавання і пісьмовых крыніц)" (1996).

***Доктарская дысертацыя:*** "Этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы насельніцтва беларускіх зямель у X–XVII стст." (2003).

***Працоўная дзейнасць.*** Магілёўская архітэктурна-рэстаўрацыйная фірма "АРТ-М" (1992–1996): археолаг. МДУ імя А. А. Куляшова (1996–2016): старшы выкладчык кафедры філасофіі, дацэнт кафедры археалогіі, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі, загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2012–2016): член, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (з 2016): дэпутат, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы.

***Асноўныя працы:***

100 лет БССР. Реалии и мифы. Минск, 2020.

Археалагічнае вывучэнне курганнага могільніка Усход. Магілёў, 2017.

Міфы "адраджэнскай" гістарыяграфіі Беларусі. Магілёў, 2009.

Этнічны і канфесійны свет беларускага горада XVI–XVIII стст. (этнаканфесійны склад насельніцтва, этнічныя і канфесійныя стэрэатыпы беларускіх гараджан). Магілёў, 2007.

Е. Р. Раманаў. З гісторыка-археалагічнай спадчыны (выбраныя творы): хрэстаматыя. Магілёў, 2006.

Людзі даўняй Беларусі: этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X–XVII стст.). Магілёў, 2003.

Магілёў у XII–XVIII стст.: людзі і рэчы. Магілеў: Мінск, 1998.

Гісторыя рэлігіі Беларусі (X–XVIII стст.): вучэбны дапаможнік. Магілёў, 1997.

***Удзел у калектыўных працах:***

Государственность – национальная идея Беларуси: сборник статей. Москва, 2016.

Belarus: Independence as National Idea. New York, 2015.

Українське Козацтво і Велике князівство Литовське. Київ, 2014.

Грюнвальдська битва – битва народів (1410–2010): середньовічна історія України, Білорусі, Литви. Київ, 2010.

Žalgirio mūšis – tautų mūšis. Vilnius, 2011.

Гарадзішча Змяёўка (Пелагееўскае гарадзішча) у Магілёве. Археалагічнае даследаванне. Магілёў, 2010.

Магілёўская даўніна ў пытаннях і адказах. Магілёў, 1997; 1998.

***Узнагароды, прызнанне.*** Грамата Міністэрства адукацыі (2004). Ганаровая грамата Міністэрства адукацыі (2007). Лаўрэат стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі "Маладыя дактары навук" (2006, 2012). Ганаровая грамата НАН Беларусі (2008, 2018). Памятны медаль "У памяць 300-годдзя бітвы пры Лясной" (2008). Пераможца спаборніцтва Ленінскага раёна горада Магілёва "Лепшы па прафесіі" (2010). Званне "Чалавек года Магілёўскай вобласці" (2011). Медаль "За ўмацаванне парламенцкага супрацоўніцтва" Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаўудзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў (2013). Медаль "За працоўныя заслугі" (2014). Нагрудны знак Міністэрства адукацыі "Выдатнік адукацыі" (2014). Ганаровая грамата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2015). Юбілейны медаль "70 гадоў вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў" (2015). Нагрудны знак МДУ імя А. А. Куляшова "За ўклад у развіццё Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова" (2018). Ордэн Пашаны (2019). Ордэн Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў (2019).

***Прысвечана вучонаму:*** Игорь Александрович Марзалюк: биобиблиографический указатель. Могилев, 2018 (Биобиблиография ученых МГУ имени А. А. Кулешова).

## МАРОЗАВА Святлана Валянцінаўна



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі ўніяцкай (грэка-каталіцкай) царквы Беларусі. Доктар гістарычных навук (2003), прафесар (2007). Сябра Міжнароднай асацыяцыі гуманітарыеў.

**Напрамкі даследаванняў:** канфесійная гісторыя Беларусі другой паловы XVI – першай паловы XIX ст., этнакультурныя аспекты дзейнасці ўніяцкай царквы (1596–1839), мастацкая спадчына Беларусі, гісторыя Гродзеншчыны.

Нарадзілася 22.11.1954, с. Ілья, Вілейскі раён Мінскай вобласці.

***Адукацыя:*** гісторыка-педагагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Я. Купалы (1977), аспірантура ГрДУ імя Я. Купалы (1982), дактарантура Інстытута гісторыі АН Беларусі (1996); Вільнюскі ўніверсітэт (2013–2014): Lituanistinės studijos.

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Брэсцкая царкоўная унія 1596 года і барацьба народных мас Беларусі супраць нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту (1596–1667 гг.)" (1983).

***Доктарская дысертацыя:*** "Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады)" (2002).

***Працоўная дзейнасць.*** Настаўнік у школах Барысаўскага раёна Мінскай вобласці (1977–1979). ГрДУ імя Я. Купалы (з 1982): асістэнт, выкладчык, дацэнт, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі; прафесар кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. Ламаносава, Варшаўскі ўніверсітэт (пры падтрымцы Фонда імя Стэфана Баторыя), Ягелонскі ўніверсітэт (Кракаў, пры падтрымцы Фонда каралевы Ядзвігі), Амерыканскі савет навуковых таварыстваў, Акадэмія навук Чэшскай Рэспублікі, Вільнюскі ўніверсітэт (пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і навукі Літоўскай Рэспублікі). Удзел у праграмах акадэмічна-

га абмену: Універсітэт у Хельсінкі (Фінляндыя, 2015), Універсітэт Арыстоцеля ў Салоніках (Грэцыя, 2016), Познаньскі ўніверсітэт імя А. Міцкевіча (Польшча, 2019), Універсітэт Эберхарда і Карла (Цюбінген, Германія, 2019).

***Асноўныя працы:***

“Сваёй веры ламаць не будзем…”: Супраціў дэўнізацыі ў Беларусі (1780–1839 гады). Гродна, 2014.

Берасцейская царкоўная унія 1596 г. у беларускай гістарыяграфіі. Гродна, 2002.

Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады). Гродна, 2001.

***Удзел у калектыўных працах:***

Мастацкая спадчына Беларусі. Гродна, 2022.

Гісторыя Беларусі, канец XVIII – пачатак XX ст.: вучэбны дапаможнік для 8-га класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. Мінск, 2018.

Гродназнаўства: Гісторыя еўрапейскага горада. Гародня: Wrocław, 2012.

Прафесар Ігнат Анацэвіч. Жыццё. Спадчына. Гродна, 2005.

Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі. Мінск, 2003.

Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. Ч. 1: Са старажытных часоў да канца XVIII ст. Мінск, 2000.

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэмія Спецыяльнага фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў (2006). Медаль ГрДУ імя Я. Купалы “За заслугі перад універсітэтам” (2010). Медаль Францішка Багушэвіча Беларускага ПЭН-цэнтра (2015).

## МАРОЗАЎ Сяргей Паўлавіч



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі ідэй і праектаў адраджэння ВКЛ у грамадска-палітычным жыцці Беларусі канца XVIII – першай паловы XX ст. Кандыдат гістарычных навук (2016), дацэнт (2019). Сябра Міжнароднай асацыяцыі гуманітарыеў. Фотамастак. Удзельнік байкерскага руху.

**Напрамкі даследаванняў:** гістарычная памяць аб ВКЛ у канцы XVIII – пачатку XXI ст., палітыка памяці ў Рэспубліцы Беларусь.

Нарадзіўся 6.04.1985, Дрэздэн, Германія.

***Адукацыя.*** Факультэт гісторыі і сацыялогіі (2007), магістратура (2008) і аспірантура (2011) ГрДУ імя Я. Купалы. Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт (2009): магістратура па спецыяльнасці "Параўнальная гісторыя краін Паўночна-Усходняй Еўропы". Маскоўскі ўніверсітэт культуры і мастацтва (пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М. Ламаносава, 2006–2007): прафесійная перападрыхтоўка па спецыяльнасці "PR–сувязі з грамадскасцю". Курс педагагічнага дызайну (Deutsche Gesellschaft fur Osteuropakunde Fellowship Programm Belarus у супрацоўніцтве з BE Student Support Organization, 2020–2021). Школа англійскай мовы Mr. English (Гродна, 2020–2022).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Грамадска-палітычны рух у Беларусі за адраджэнне Вялікага Княства Літоўскага (канец XVIII – першая чвэрць XX стст.)" (2016).

***Працоўная дзейнасць.*** ГрДУ імя Я. Купалы (2009–2020): лабарант навукова-даследчага сектара, выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры журналістыкі. Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт (2021): навуковы супрацоўнік Цэнтра беларускіх і рэгіянальных даследаванняў.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Інстытут гісторыі Варшаўскага ўніверсітэта (пры падтрымцы Fundacja na rzecz nauki Polskiej oraz Kasa im. Mianowskiego, 2010). Вільнюскі ўніверсітэт

(стыпендыя Education Exchanges Support Foundation, 2010). Нямецкі гістарычны інстытут у Маскве (2021).

***Асноўныя працы:***

Ідэя адраджэння Вялікага Княства Літоўскага ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1795–1939 гг.). Гродна, 2019.

Часы истории бьют... всех: афоризмы / [составитель С. П. Морозов]. Гродно, 2013.

***Удзел у калектыўных працах:***

Мастацкая спадчына Беларусі. Гродна, 2022.

***Узнагароды, прызнанне.*** Імянная стыпендыя імя Францыска Скарыны (2005–2006). “Студэнт года” г. Гродна (2005). Пасведчанні (2005, 2007), званне лаўрэата (2008) Спецыяльнага фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Прэмія імя прафесара Юліюша Бардаха на міжнародным конкурсе навуковых работ Інстытута Вялікага Княства Літоўскага (Літва, Каўнас, 2016). Міжнародныя байкерскія намінацыі Saddle Sore 1000 (2012) і Bun Burner Gold 1500 (2017), пацверджаныя і зарэгістраваныя Міжнароднай асацыяцыяй Iron Butt (ЗША). Дыплом I ступені выставы-конкурса маладых фатографаў “Я молодой!” (Расія, Дэпартамент культуры горада Масквы, 2014). Дыплом фіналіста фотаконкурса “Мой кадр у абарону прыроды” (Пасольства Францыі ў Беларусі, 2015). Дыплом намесніка Міністра культуры Рэспублікі Беларусь за арганізацыю персанальнай фотавыставы (Гродна, 2015). Медаль “100 год міліцыі Беларусі” (2017).

## МАРТЫНЮК Аляксей Віктаравіч



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі палітычных узаемаадносін і культурных кантактаў Усходняй Еўропы з Аўстрыяй у XIII–XVI ст., па візуальных крыніцах XIII–XVI ст. Рэдактар і выдавец (з 2008) навуковага зборніка “Studia Historica Europae Orientalis”/ “Даследаванні па гісторыі Усходняй Еўропы”. Доктар гістарычных навук (2021), дацэнт (2005).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя Усходняй Еўропы ў Сярэднявеччы і раннім Новым часе, візуальныя крыніцы, метадалогія гістарычнага даследавання, тэндэнцыі развіцця вышэйшай гуманітарнай адукацыі.

Нарадзіўся 8.05.1972, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1997), дактарантура Рурскага ўніверсітэта (2002, г. Бохум, Германія).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Усходнія, заходнееўрапейскія і рускія выяўленчыя крыніцы па гісторыі Мангольскай імперыі і дзяржаў – яе спадкаемцаў у XIII–XVI ст." (2002, Рурскі ўніверсітэт, г. Бохум, Германія; настрыфікацыя ў Беларусі, 2003).

***Доктарская дысертацыя:*** " Аўстрыя і Усходняя Еўропа: станаўленне і развіццё палітычных узаемаадносін і культурных кантактаў (XIII–XV стст.)" (2021).

***Працоўная дзейнасць.*** БДУ: выкладчык-сумяшчальнік на кафедры гісторыі Расіі (2003–2015). Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ: дацэнт, загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

***Асноўныя працы:***

До Герберштейна: Австрия и Восточная Европа в системе персональных связей и культурных контактов (XIII – начало XVI века). Москва, 2019 (прэмія Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі, 2020).

Средневековая Русь. Хрестоматия: в 2 ч. Минск, 2012.

Die Mongolen im Bild: orientalische, westeuropäische und russische Bildquellen zur Geschichte des Mongolischen Weltreiches und seiner Nachfolgestaaten im 13.–16. Jahrhundert. Hamburg, 2002.

***Удзел у калектыўных працах:***

"Книга хроник" Хартмана Шеделя (1493) – энциклопедия Позднего средневековья: с электронным приложением. Минск, 2021.

ALBA RUSCIA: белорусские земли на перекрестке культур и цивилизаций (X–XVI вв.): [сборник статей]. Москва, 2015.

Современная российская историография: в 2 ч. Минск, 2009.

Средневековая Русь в текстах и документах: учебное пособие. Минск, 2005.

История восточных славян. Монгольское нашествие на Русь: Учебное пособие. Минск, 2003.

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэмія Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі (2020). Лаўрэат конкурса 2021 г. Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь на лепшую доктарскую дысертацыю.

## МАРЦІНОВІЧ Алесь Андрэевіч



Пісьменнік, крытык, літаратуразнаўца. Аўтар шматтомнай мастацкай гісторыі Беларусі ў асобах, пабудаванай на гістарычным матэрыяле і крыніцах. Член Саюза журналістаў Беларусі. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1987). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі (1998). Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі (2016). Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (2018).

**Тэматыка гісторыка-літаратурнай творчасці:** лёсы знакамітых суайчыннікаў і ўраджэнцаў іншых краін, якіх лёс звязаў з беларускім краем; іх месца ў беларускай навуцы, літаратуры, у палітычным жыцці Беларусі.

Нарадзіўся 18.08.1946, в. Казловічы, Слуцкі раён, Мінская вобласць.

***Адукацыя:*** факультэт журналістыкі БДУ (1968).

***Працоўная дзейнасць.*** Работа ў раённых газетах, у штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва" (1972–2001, 2007), у часопісах "Беларуская думка", "Нёман", "Маладосць", "Полымя".

***Асноўныя творы:***

Гісторыя праз лёсы: у 10 т. Мінск, 2016–2021.
Цяпло колішніх вогнішчаў. Мінск, 2015.
Успамін пра будучыню: мастацка-гістарычныя апавяданні, эсэ. Мінск, 2012.
Герб, сцяг і гімн Беларускай дзяржавы. Мінск, 2011.

Серенада под сенью столетий: Признание в любви Беловежской пуще. Минск, 2011.
Нежность звёздного неба: Историческая повесть. Минск, 2011.
Пяшчота апалага лісця: эсэ, нарысы. Мінск, 2010.
Исповедь старых замков: документально-художественные очерки. Минск, 2009.
Маладзік над заснежаным шляхам: эсэ, нарысы. Мінск, 2008.
Хто мы, адкуль мы…: Гістарычныя эсэ, нарысы: у 2 кн. Мінск, 1996–1998; 2-е выданне: у 3 кн. Мінск, 2008.
Горадна, Горадзен, Гродна: Нарысы Мінск, 2008.
Птушкі з пакінутых гнёздаў: гісторыя ў асобах: эсэ, нарысы. Мінск, 2007.
Хто мы, адкуль мы…: Гістарычныя эсэ, нарысы. Мінск, 2007.
Свечка на золкім ветры: эсэ. Мінск, 2006.
Сполахі далёкіх зарніц: гісторыя ў асобах: эсэ, нарысы. Мінск, 2005.
Сімяон, сын Полацка: Нарыс. Мінск, 2001.
Есть имена, которые не забываются. Минск, 2001.
Элегіі забытых дарог. Мінск, 2001.
У часе прасветленыя твары: Гістарычныя эсэ, нарысы. Мінск, 1999.
Зерне да зерня: гісторыя ў асобах: эсэ, нарысы. Мінск, 1996 (Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Кастуся Каліноўскага, 1998).

***Узнагароды, прызнанне.*** Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Кастуся Каліноўскага ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры (1998). Лаўрэат літаратурнай прэміі “Дэбют” імя М. Багдановіча. Літаратурная прэмія ў галіне крытыкі імя У. А. Калесніка. Прэмія “Залаты Купідон”. Прэмія Беларускага саюза журналістаў “Залатое пяро”. Медаль Францыска Скарыны. Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі «Лепшы твор прозы» (2016). Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (2018).



## МАЦУК Андрэй Уладзіміравіч

Гісторык. Спецыяліст па палітычнай гісторыі ВКЛ XVIII ст. Кандыдат гістарычных навук (2005). Доктар хабілітаваны (2021).

**Напрамкі даследаванняў:** унутрыпалітычнае становішча беларускіх зямель ВКЛ у XVIII ст., гісторыя дзяржавы і права, прававая і палітычная думка, дзяржаўныя інстытуты, парламенцкая сістэма і рэгіянальныя эліты ВКЛ у XVIII ст.

Нарадзіўся 4.12.1978, Полацк.

***Адукацыя:*** гісторыка-філалагічны факультэт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (2001), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (2004).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Барацьба магнацкіх груповак на беларускіх землях ВКЛ за палітычнае вяршэнства (1717–1763 гг.)” (2005).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі НАН Беларусі (2005–2020): навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст., вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Праграма міжнароднага супрацоўніцтва Міністэрства адукацыі і навукі Літвы, Праграма польскага ўраду для маладых вучоных з дзяржаў былога СССР, Каса імя Юзэфа Мяноўскага (Варшава), Польскі камітэт па справах ЮНЕСКА, Фонд Герды Хенкель (Германія), Фонд каралевы Ядзвігі Ягелонскага ўніверсітэта (Польшча), Амерыканскі савет навуковых таварыстваў, Музей гісторыі Польшчы, Спецыяльная праграма імя Роберта Боша для вучоных Беларусі, Украіны, Малдавіі і Расіі Нямецкага інстытута гісторыі. Удзельнік міжнароднага даследчага праекта (з 2004) па выданні спісаў дэпутатаў Галоўнага Трыбунала ВКЛ і паслоў з павятовых соймікаў ВКЛ на сойм Рэчы Паспалітай, а таксама па выданні актаў навагрудскіх соймікаў.

***Асноўныя працы:***

Грамадска-палітычнае жыццё Вялікага Княства Літоўскага ў часы бескаралеўя 1733–1735 гг. Мінск, 2020.

Полацкае ваяводства ў XVIII ст.: ваявода, шляхецкая эліта, сойміکі. Мінск, 2014.
Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717–1763 гг.). Мінск, 2010.

***Удзел у калектыўных працах:***

Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy: w X t. Tom I: Województwo wileńskie. XIV–XVIII wiek. Warszawa, 2004; Tom II: Województwo trockie. XIV–XVIII wiek. Warszawa, 2009; T. V: Ziemia połocka i województwo połockie. XIV–XVIII wiek. Warszawa, 2018; T. VIII: Ziemia brzeska i województwo brzeskie XIV–XVIII wiek. Warszawa, 2020; T. IX: Województwo mścisławskie. XVI–XVIII wiek. Warszawa, 2019.
История белорусской государственности: В 5 т. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. Минск, 2018.
Гісторыя Навагрудка – з глыбінь вякоў да нашых дзён. Мінск, 2016.
Dzieje rodziny Ciechanowieckich herbu Dąbrowa (XIV–XXI wiek). Warszawa, 2013.
Да сваёй гісторыі: Сярэднявечча і Ранні Новы час: зборнік навуковых артыкулаў, прысвечаных памяці Паўла Лойкі. Смаленск, 2013.
Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697–1794): Spis. Warszawa, 2004.

***Узнагароды, прызнанне.*** Лаўрэат стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь таленавітым маладым вучоным (2010). Прэмія Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі (2021).

## МЯНЖЫНСКІ Валерый Станіслававіч



Гісторык, археограф. Спецыяліст па Метрыцы ВКЛ, выдавец кніг Метрыкі. Кандыдат гістарычных навук (1988).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя архіва вялікакняжацкай канцылярыі ВКЛ, Метрыка ВКЛ, гісторыя землеўладання ў Беларусі і ВКЛ, гісторыя шляхецкага саслоўя ў XVI ст., гістарычнае краязнаўства, дакументазнаўства, археаграфія.

Нарадзіўся 29.12.1954, Віцебск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1981), аспірантура Інстытута гісторыі АН СССР (Масква, 1988).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Феадальнае землеўладанне ў Беларусі ў другой чвэрці XVI ст. (па матэрыялах кніг запісаў Літоўскай метрыкі)" (Масква, Інстытут гісторыі АН СССР, 1988).

***Працоўная дзейнасць.*** Тэхнічнае вучылішча (1976): выкладчык. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (1981–2010-я): лабарант, навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі БССР эпохі феадалізма, аддзела спецыяльных гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу, старшы навуковы супрацоўнік аддзела крыніцазнаўства і археаграфіі. БДУ (з 2001): выкладчык.

***Археаграфічныя выданні:***

Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 42 (1556–1562 гг.) Кніга запісаў № 42 (копія канца XVI ст.). Мінск, 2015.

Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 30 (1480–1546 гг.). Кніга запісаў № 30 (копія канца XVI ст.). Мінск, 2008.

Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 46 (1562–1565). Кніга запісаў 46 (копія канца XVI ст.). Мінск, 2006.

Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга 43 (1523–1560). Кніга запісаў 43. Мінск, 2003.

Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 28 (1522–1552 гг.). Кніга запісаў 28. Мінск, 2000.

Электронная версія "Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 28 (1522–1552 гг.). Кніга запісаў 28". Мінск, 2000.

## МЯЦЕЛЬСКІ Андрэй Анатольевіч



Археолаг, гісторык. Спецыяліст па гісторыі і археалогіі гарадоў беларускага Пасожжа і Нясвіжскага замка. Доктар гістарычных навук (2019).

**Напрамкі даследаванняў:** археалогія і гісторыя Сярэднявечча і Новага часу Усходняй Беларусі, гістарычная геаграфія, археаграфія, Нясвіжскі замак.

Нарадзіўся 16.09.1960, г. Котбус, Германія.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт ГрДУ імя Я. Купалы (1984), аспірантура Інстытута гісторыі АН БССР (1990).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Гарады беларускага Пасожжа X–XIII стст." (1992).

***Доктарская дысертацыя:*** "Мсціслаўская воласць, княства і ваяводства: адміністрацыйна-тэрытарыяльнае, гаспадарчае і канфесійнае развіццё ў XI–XVIII стст." (2018).

***Працоўная дзейнасць.*** Ярэміцкая СШ Карэліцкага раёна, СШ № 20 г. Бабруйска: настаўнік гісторыі. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (з 1990): навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі сярэдневяковага перыяду; старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу, аддзела крыніцазнаўства і археаграфіі; вядучы навуковы супрацоўнік аддзела крыніцазнаўства і археаграфіі; загадчык аддзела гістарыяграфіі і метадаў гістарычнага даследавання; загадчык аддзела гісторыі Беларусі IX–XVIII ст. Інстытут турызму Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізкультуры, Міжнародны дзяржаўны экалагічны інстытут імя А. Д. Сахарава БДУ: выкладчык.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Фонд каралевы Ядзвігі Ягелонскага ўніверсітэта (Кракаў, 2007), Каса імя Юзэфа Мяноўскага (Варшава, 2010).

***Асноўныя працы:***

Забытая Альба: очерк истории загородной резиденции Радзивиллов под Несвижем. Минск, 2014.

Владельцы старого Несвижа. Минск, 2011; 2014.

Мсціслаўскае княства і ваяводства ў XII–XVIII стст. Мінск, 2010; 2014.

Старадаўні Крычаў: гістарычна-археалагічны нарыс гісторыі горада ад старажытных часоў да канца XVIII ст. Мінск, 2003.

***Археаграфічныя выданні:***

Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 35 (1541–1558): кніга запісаў № 35 (копія канца XVI ст.). Мінск, 2020.

Метрыка Вялікага княства Літоўскага. Кніга № 272 (1576–1579): кніга судовых спраў № 58 (копія канца XVI ст.). Мінск, 2015.

Помнікі права Беларусі XIV–XVI стст.: агульназемскія прывілеі і акты дзяржаўных уній: крыніцазнаўчы дапаможнік. Мінск, 2015.

Метрыка Вялікага княства Літоўскага: Кніга запісаў № 70 (1582–1585): кніга запісаў № 35 (копія канца XVI ст.). Мінск, 2008.

***Удзел у калектыўных працах:***

История белорусской государственности. В 5 т. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. Минск, 2018.

Гісторыя Навагрудка з глыбінь вякоў да нашых дзён. Мінск, 2014; 2016.

Гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. Мінск, 2000.

## НАРЫЖНАЯ Алена Паўлаўна



Гісторык, культуролаг. Спецыяліст па гісторыі беларускага садова-паркавага мастацтва канца XVI – пачатку XX ст. Кандыдат гістарычных навук (1999), дацэнт.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя і тэорыя культуры, культура Беларусі XIV – пачатку XX ст., сядзібна-замкавая культура беларусаў.

Нарадзілася 24.05.1972, Гомель.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны (1994), аспірантура БДПУ імя М. Танка (1997).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Гісторыя фарміравання і развіцця садова-паркавай культуры Беларусі (канец XVI – пачатак XX стагоддзя)" (1999).

***Працоўная дзейнасць.*** Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі (Гомель): дацэнт кафедры філасофіі і гісторыі, дацэнт кафедры правазнаўства, дацэнт кафедры права і эканамічных тэорый.

***Асноўныя працы:***

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: практыкум. Гомель, 2021.

Садово-парковая культура Беларуси конца XVI – начала XX века (источники и историография проблемы): учебное пособие. Гомель, 1999.

***Удзел у калектыўных працах:***
История Беларуси в контексте европейской цивилизации: учебное пособие. Минск, 2014; 2016.
История Беларуси: пособие. Гомель, 2011.
Культурология: учебник. Минск, 2011.
Культурология: учебное пособие. Минск, 2004; 2005; 2007; 2008.
Гісторыя Беларусі: дапаможнік. Гомель, 2003; 2007.
Основы идеологии белорусского государства: учебно-методическое пособие. Гомель, 2006.

## НАСЕВІЧ Вячаслаў Леанідавіч



Гісторык, археолаг, архівіст. Спецыяліст па гістарычнай і архіўнай інфарматыцы, ранняй палітычнай гісторыі ВКЛ. Галоўны рэдактар "Вялікага гістарычнага атласа Беларусі" (у 4 т.). Кандыдат гістарычных навук (1991). Член Асацыяцыі "Гісторыя і камп'ютар" краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў (1993–2007). Член Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (2007). Лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне" (2020).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя Беларусі ў перыяд ВКЛ; беларуская гістарычная сімволіка; працэсы этнагенезу беларусаў; гістарычная геаграфія і картаграфія Беларусі; беларуская генеалогія, гістарычная дэмаграфія; гістарычная і архіўная інфарматыка; камп'ютарнае мадэляванне гісторыка-дэмаграфічных працэсаў; забеспячэнне захаванасці гістарычных і архіўных інфармацыйных рэсурсаў.

Нарадзіўся 20.07.1957, Віцебск.

***Адукацыя:*** факультэт журналістыкі БДУ (1982), суіскальнік на кафедры археалогіі гістарычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта (1991).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Папуляцыйна-дэмаграфічныя працэсы ў эпоху ніжняга і сярэдняга палеаліту (Досвед камп’ютарнага мадэлявання)” (1991, Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі АН БССР (1983–1993): лабарант, навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі зон новабудоўляў, аддзела археалогіі сярэдневяковага перыяду; навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных навук. Камітэт па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь (1993–1997): загадчык аддзела дзяржаўнай геральдычнай службы, загадчык аддзела геральдыкі і генеалогіі. Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі (1998–2020): дырэктар. Гістарычны факультэт БДУ (1994–2020), гістарычны факультэт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (1998, 2000): выкладчык.

***Асноўныя працы:***

Беларусы: станаўленне этнасу і нацыянальная ідэя. Смаленск, 2015.
Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе. Минск, 2004.
Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы. Мінск, 1993.
Генеалагічныя табліцы старадаўніх княжацкіх і магнацкіх беларускіх родаў 12–18 стагоддзяў. Мінск, 1993.
Персональный сайт белорусского историка Вячеслава Носевича. Рэжым доступу: vln.by

***Удзел у калектыўных працах:***

Гістарычны атлас Беларусі. Мінск, 2020.
Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. Т. 1. Мінск, 2020.
Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. Мінск, 2009–2018 (прэмія “За духоўнае адраджэнне”, 2020)
Вялікія князі Вялікага Княства Літоўскага: [для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту]. Мінск, 2017.
Беларусь. Свой посад меж народами [Электронный ресурс]: Беларусь в международных отношениях в XVIII веке. Минск, 2011.
Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2008.
Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 3 т. Мінск, 2007–2010.
Нацыянальны атлас Беларуси. Мінск, 2002.
Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Мінск, 1996–2004.

Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Мінск, 1993–2003.

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне” (2020).

## НЕКРАШЭВІЧ-КАРОТКАЯ
## *Жанна Вацлаваўна*



Літаратуразнаўца, гісторык літаратуры і культуры. Спецыяліст па старажытнай беларускай літаратуры і лацінамоўнай паэзіі ВКЛ XVI–XVII ст. Перакладчык помнікаў лацінскай паэзіі на беларускую мову. Доктар філалагічных навук (2013), прафесар (2014).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX ст.; лацінамоўная паэзія ВКЛ эпохі Рэнесансу і ранняга Барока; пераклад з лацінскай, польскай, царкоўнаславянскай і старабеларускай моў.

Нарадзілася 14.04.1972, Мінск.

***Адукацыя:*** філалагічны факультэт, аспірантура пры кафедры гісторыі беларускай літаратуры і дактарантура БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Драматургія Францішкі Уршулі Радзівіл” (1999).

***Доктарская дысертацыя:*** “Лацінамоўны ліра-эпас у полілінгвістычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стагоддзяў: традыцыя, гісторыка-эстэтычная эвалюцыя” (2013).

***Працоўная дзейнасць.*** БДУ (1995–2001): выкладчык кафедры гісторыі беларускай літаратуры. Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт (2001–2004): загадчык кафедры класічнай і славянскай філалогіі, дацэнт кафедры раманскай і класічнай філалогіі. БДУ (з 2005): дацэнт кафедры сучасных замежных моў факультэта міжнародных адносін, прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры.

***Асноўныя працы:***

Беларусь як культурная прастора і еўрапейскі літаратурны працэс XVI–XIX стст.: дапаможнік. Мінск, 2020.

Шматмоўная літаратура Беларусі ў кантэксце актуальных літаратуразнаўчых канцэпцый: дапаможнік. Мінск, 2015.

Беларуская літаратура і гісторыя. Мінск, 2013.

Беларуская лацінамоўная паэма: позні Рэнесанс і ранняе Барока. Мінск, 2011.

Беларуская лацінамоўная паэзія: ранні Рэнесанс. Мінск, 2009.

Joannis Visliciensis. Bellum Prutenum = Ян Вісліцкі. Пруская вайна: На лацінскай і беларускай мовах. Мінск, 2005.

Нясвіжская Мельпамена: Драматургія Францішкі Уршулі Радзівіл. Мінск, 2002.

***Удзел у калектыўных працах:***

Зубрыны неруш і сусветная спадчына: гісторыя польска-беларускага нацыянальнага парку "Белавежская пушча". Мінск, 2021.

Дыярыушы XVII стагоддзя (1594–1707 гады): Самуэль Маскевіч, Багуслаў Маскевіч, Піліп Абуховіч, Міхал Абуховіч, Тэадор Абуховіч. Мінск, 2016 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).

Летапісы і хронікі Вялікага Княства Літоўскага, XV–XVII стст. Мінск, 2015 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).

Рэлігійнае пісьменства кірылічнай традыцыі XI–XV стст. Мінск, 2013 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).

Залатая калекцыя беларускай літаратуры. Т. 1: Літаратура XI–XVI стагоддзяў. Мінск, 2011; Т. 2: Літаратура XVII–XVIII стагоддзяў. Мінск, 2012.

Славянамоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст. Мінск, 2011 (Помнікі даўняга пісьменства Беларусі).

Нясвіжскі альбом: зборнік любоўнай лірыкі / Францішка Уршуля Радзівіл. Мінск, 2011.

Латинский язык: пособие для студентов. Минск, 2010.

Творы прадстаўнікоў роду Радзівілаў [Электронны рэсурс]. Мінск, 2009.

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. Т. 1. Мінск, 2006.

Старажытная літаратура ўсходніх славян XI–XIII стагоддзяў: хрэстаматыя. Гродна, 2004.

## НЕСЦЯРЧУК Леанід Міхайлавіч



Гісторык. Спецыяліст па гістарычнай спадчыне і персаналіях славутых ураджэнцаў Берасцейшчыны другой паловы XVIII–XIX ст. Кандыдат гістарычных навук (1996). Ініцыятар стварэння (1994) і старшыня Брэсцкага абласнога гісторыка-культурнага аб'яднання імя Тадэвуша Касцюшкі. Член Беларускага камітэта Міжнароднай рады па пытаннях помнікаў і гістарычных мясцін (2002).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя населеных пунктаў і архітэктурных помнікаў Берасцейшчыны, праблемы аховы матэрыяльнай і духоўнай спадчыны Беларусі, знакамітыя асобы Беларусі, падзеі вайны 1812 г. на тэрыторыі Беларусі.

Нарадзіўся 2.10.1945, в. Харкі Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна (1970), Мінская вышэйшая партыйная школа (1978), Варшаўская Акадэмія палацава-паркавай архітэктуры (1996).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Баявыя дзеянні 3-й Заходняй Рускай арміі ў Айчынную вайну 1812 года на тэрыторыі Беларусі" (1996).

***Працоўная дзейнасць.*** Прафтэхвучылішча № 27 г. Брэста: выкладчык гісторыі. Брэсцкі гаркам ЛКСМБ: інструктар. Брэсцкі райкам ЛКСМБ: першы сакратар. Брэсцкі абкам КПБ: загадчык аддзела. Брэсцкі аблвыканкам: намеснік начальніка ўпраўлення адукацыі, вядучы спецыяліст (1991–2010) па ахове гістарычнай спадчыны.

***Асноўныя працы:***

Адам Міцкевіч: Геній, Паэт, Ліцвін. Брэст, 2019.

Міхал Клеафас Агінскі: Ліцвін, Патрыёт, Творца. Брэст, 2015.

Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны. Мінск, 2012.

Беларусь у вайне 1812 года. Паміж Напалеонам і Аляксандрам. Брэст, 2012.
Станіслаў Аўгуст Панятоўскі: манарх, асветнік, мецэнат. Брэст, 2011.
Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны: кніга-альбом: у 3 ч. Мінск, 2009 (гран-пры на VI Міжнародным конкурсе "Мастацтва кнігі" дзяржаў-удзельніц СНД, 2009).
Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка: Вяртанне героя на радзіму. Брэст, 2006.
Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы. Мінск, 2003.
Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў: гісторыя, стан, перспектывы. Мінск, 2002.
Гарадзечна: матэрыяльная і духоўная спадчына: гісторыка-архітэктурны нарыс. Брэст, 1997.



## ПАДАЛІНСКІ Уладзімір Аляксеевіч

Гісторык. Спецыяліст па гісторыі парламентарызму, палітычнай культуры і палітычных элітаў ВКЛ у другой палове XVI – пачатку XVII ст. Кандыдат гістарычных навук (2004), дацэнт (2008).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя права, парламентарызм, прадстаўнічыя інстытуты ўлады і палітычныя эліты ВКЛ і Рэчы Паспалітай.

Нарадзіўся 18.05.1978, Шчучын.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (2000), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (2003).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Прадстаўніцтва і палітычная пазіцыя Вялікага Княства Літоўскага на вальных соймах Рэчы Паспалітай у апошняй трэці XVI ст." (2004).

***Працоўная дзейнасць.*** Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (2004-2013): дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі. БДУ (з 2013): дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі Старажытнага

часу і Сярэдніх вякоў. Беларускі інстытут правазнаўства, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт: выкладчык.

***Асноўныя працы:***

Прадстаўніцтва Вялікага Княства Літоўскага на Люблінскім сойме 1569 года: удзел у працы першага вальнага сойма Рэчы Паспалітай. Мінск, 2017.

Удзел у калектыўных працах:

Валовічы герба "Багорыя". Мінск, 2019; 2020 (Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі).

Гісторыя Беларусі: дапаможнік. У 4 ч. Ч. 1: Ад старажытнасці да сярэдзіны XVI ст. Мінск, 2018.

Да сваёй гісторыі: Сярэднявечча і Ранні Новы час: зборнік навуковых артыкулаў, прысвечаных памяці Паўла Лойкі. Смаленск, 2013.

История Беларуси в контексте мировых цивилизаций: учебное пособие. Минск, 2008; 2009; 2010; 2016.

Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): вучэбны дапаможнік. Мінск, 2013.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2008.

## ПАДОКШЫН Сямён Аляксандравіч



Філосаф, гісторык-медыевіст, культуролаг. Спецыяліст па гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі XVI–XVII ст. Доктар філасофскіх навук (1987), кандыдат гістарычных навук (1965). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984).

**Напрамкі даследаванняў:** філасофія беларускай гісторыі і культуры, нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, духоўна-культурнага сінтэзу Усходу і Захаду, дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага суверэнітэту; адметныя рысы Рэнесансу і гуманізму ў Беларусі.

8.03.1931, Гомель – 21.12.2004.

***Адукацыя:*** Брэсцкае педагагічнае вучылішча, Мінскі педагагічны інстытут (1953), аспірантура Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (1960).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Радыкальна-рэфармацыйны рух у Беларусі і Літве: (другая палова XVI ст.)” (1964).

***Доктарская дысертацыя:*** “Філасофская і грамадска-палітычная думка эпохі Адраджэння ў Беларусі” (1985).

***Працоўная дзейнасць:*** СШ у г. Тураве (1953–1954): настаўнік. Інстытут філасофіі і права АН БССР / НАН Беларусі (1960–2004).

***Асноўныя працы:***

Этычная думка ў культуры Беларусі XVI–XVII стст. Мінск, 2004.

Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры. Мінск, 2003.

Іпацій Пацей: Царкоўны дзеяч, мысліцель, пісьменнік на пераломе культурна-гістарычных эпох. Мінск, 2001.

Унія. Дзяржаўнасць. Культура: філасофска-гістарычны аналіз. Мінск, 1998; 2000.

Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага. Мінск, 1990.

Франциск Скорина. Москва, 1981 (Мыслители прошлого).

Скорина и Будный: очерк философских взглядов. Минск, 1974.

Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы (вторая половина XVI – начало XVII в.). Минск, 1970.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 2: Протарэнесанс і Адраджэнне. Мінск, 2010; Т. 3: Рэфармацыя. Контррэфармацыя. Барока. Мінск, 2013.

Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. Минск, 1991.

Идейные связи прогрессивных мыслителей братских народов (XVII–XVIII вв.). Минск, 1978.

Идеи гуманизма в общественно-политической и философской мысли Белоруссии (Дооктябрьский период). Минск, 1977.

Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.). Минск, 1973.

***Узнагароды, прызнанне.*** Медаль Францыска Скарыны (1993). Стыпендыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2000).

## ПАЗДНЯКОЎ Валерый Сямёнавіч



Гісторык, археограф, археолаг. Адзін з ініцыятараў і арганізатараў выдання, складальнік фундаментальнай энцыклапедычнай працы "Вялікае княства Літоўскае" (2005–2010, 3 тамы; 2-е выданне: 2007, 2 тамы) і аўтар 1922 артыкулаў. Стваральнік электроннай энцыклапедыі "Вялікае Княства Літоўскае". Кандыдат гістарычных навук (1992). Кіраўнік прац па падрыхтоўцы серыі даведнікаў, прысвечаных помнікам права Беларусі XIV–XVI ст. Ганаровы архівіст Беларусі (2016). Намеснік старшыні Археаграфічнай камісіі Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (2008).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя і археалогія феадальнай Беларусі; гісторыя яе матэрыяльнай і духоўнай культуры; археаграфія і крыніцазнаўства Беларусі XIV–XVIII ст.; праблемы яе этнічнай гісторыі, генеалогіі, гістарычнай геаграфіі, картаграфіі, баністыкі.

Нарадзіўся 6.02.1963, Вілейка.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1985); аспірантура Інстытута гісторыі АН БССР (1988).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Клецк X–XVIII стст. (Гісторыя матэрыяльнай культуры беларускага феадальнага горада)" (1991).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі АН Беларусі (1988–1994): малодшы навуковы супрацоўнік. Выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" (1994–2007): навуковы рэдактар, вядучы навуковы рэдактар. Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы (з 2007): вядучы навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела археаграфіі.

***Асноўныя працы:***

Помнікі права Беларусі XIV–XVI стст.: валасныя граматы: крыніцазнаўчы дапаможнік. Мінск, 2021.

Помнікі права Беларусі XIV–XVI стст.: абласныя прывілеі: крыніцазнаўчы дапаможнік. Мінск, 2018.
Архіў праваслаўных і грэка-каталіцкіх мітрапалітаў Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст. (гісторыя, структура, склад). Мінск, 2014.
Электронная энцыклапедыя "Вялікае Княства Літоўскае". Рэжым доступу: http://vkl.by/
Філіграні архіўных дакументаў Беларусі XVI – пачатку XX ст. Мінск, 2013.
Бібліяграфічны паказальнік археаграфічных публікацый у Рэспубліцы Беларусь (1991–2006 гг.). Мінск, 2010.
Клецк X–XVIII стст.: матэрыяльная і духоўная культура беларускага феадальнага горада. Мінск, 2008.
Папяровыя грошы Беларусі: ад XVIII ст. да нашых дзён. Мінск, 2008.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гістарычны атлас Беларусі. Мінск, 2020.
Вялікія князі Вялікага Княства Літоўскага: [для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту]. Мінск, 2017.
Помнікі права Беларусі XIV–XVI стст.: агульназемскія прывілеі і акты дзяржаўных уній: крыніцазнаўчы дапаможнік. Мінск, 2015.
Каталікі на абшарах Панізоўя і Севершчыны: гісторыя Гомельскага дэканата. Мінск, 2012.
Культура Беларусі: энцыклапедыя: у 6 т. Мінск, 2010–2016.
Города, местечки и замки Великого княжества Литовского: энциклопедия. Минск, 2009; 2013.
Археаграфічныя даследаванні і распрацоўкі ў Рэспубліцы Беларусь (1991–2008 гг.): бібліяграфічны паказальнік. Мінск, 2010.
Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 3 т. Минск, 2007–2010.
Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 3 т. Т. 1. Мінск, 2009.
Гістарычны атлас Беларусі. Т. 1. Беларусь са старажытных часоў да канца XVIII ст. Варшава: Мінск, 2008.
Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Мінск, 1996–2004.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Мінск, 1993–2003.
Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя. Т. 1–3. Мінск, 2004–2006.
Беларусь: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 1995.

***Узнагароды, прызнанне.*** Ганаровы архівіст Беларусі (2016).

## ПАЛІКОЎСКАЯ Таццяна Ігараўна



Гісторык. Спецыяліст па гістарыяграфіі культурна-асветніцкай дзейнасці езуітаў на беларускіх землях. Кандыдат гістарычных навук (2006), дацэнт (2014).

**Напрамкі даследаванняў:** вывучэнне культурна-асветніцкай дзейнасці езуітаў на тэрыторыі Беларусі, гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый, эканамічная гісторыя Беларусі.

Нарадзілася ў 1978 г., Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (2000), магістратура (2001) і аспірантура БДУ (2004).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Культурна-асветніцкая дзейнасць езуітаў на беларускіх землях у апошняй трэці XVI – 20-ыя гг. XIX стст.: (стан і праблемы айчыннай гістарыяграфіі другой паловы XIX – пачатку XXI ст.)" (2006).

***Працоўная дзейнасць.*** Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт: дацэнт.

***Удзел у калектыўных працах:***

Экономическая история зарубежных стран и Беларуси: учебное пособие. Минск, 2013; 2018; 2019; 2021.

Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура: зборнік навуковых артыкулаў: у 2 ч. Ч. 2. Мінск, 2017.

Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): вучэбны дапаможнік. Мінск, 2013.

История Беларуси в контексте мировых цивилизаций: учебно-методическое пособие. Минск, 2009; 2010; 2011; 2015; 2016; 2017; 2018; 2019.



## ПАЎЛОЎСКАЯ Ганна Генрыхаўна

Філолаг. Спецыяліст у галіне класічнай філалогіі, неалацініст. Кандыдат гістарычных навук (2012). Кандыдат навук у галіне літаратуразнаўства (2013).

**Напрамкі даследаванняў:** новалаціназнаўства, гісторыя ВКЛ, гісторыя культуры ВКЛ, рэцэпцыя антычнасці ў культуры Савецкага Саюза.

Нарадзілася ў 1977 г., Гродна.

***Адукацыя:*** філалагічны факультэт ГрДУ імя Я. Купалы (1999), факультэт Artes Liberales Варшаўскага ўніверсітэта (2012), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (2009), аспірантура факультэта Artes Liberales Варшаўскага ўніверсітэта.

***Кандыдацкія дысертацыі***: “Гродзенскія кляштарныя хронікі як крыніца па гісторыі Гродна другой паловы XVII–XVIII ст.” (2012).

Дысертацыя па літаратуразнаўству (Варшаўскі ўніверсітэт, 2013).

***Працоўная дзейнасць.*** Аддзел старадрукаў і рэдкай кнігі Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея: навуковы супрацоўнік. Інстытут сучасных ведаў (Гродна): выкладчык лацінскай мовы. Варшаўскі ўніверсітэт, факультэт Artes Liberales (з 2014): дацэнт.

***Асноўныя працы:***

Grodzieńskie kroniki klasztorne XVII i XVIII wieku: formy gatunkowe i aspekty komunikacyjne. Warszawa, 2016.

***Удзел у калектыўных працах:***

Каталог кніг XV–XVI ст. з фондаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. Слонім, 2003.

***Узнагароды, прызнанне:*** прэмія прэм’ер-міністра Рэспублікі Польшча за выдатныя навуковыя і мастацкія дасягненні (2015).

## ПАШКЕВІЧ Уладзімір Іванавіч



Гісторык. Спецыяліст па сацыяльна-эканамічнай, палітычнай і ваеннай гісторыі Беларусі першай паловы XVIII ст.

**Напрамкі даследаванняў:** сацыяльна-эканамічная гісторыя Беларусі XVIII ст., Паўночная вайна 1700–1721 г.

Нарадзіўся 17.01.1963, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1988).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі НАН Беларусі (з 1988): лабарант; навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст., аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу; навуковы супрацоўнік аддзела крыніцазнаўства і археаграфіі; навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных даследаванняў.

***Удзел у калектыўных працах:***

Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура: зборнік навуковых артыкулаў: у 2 ч. Ч. 2. Мінск, 2017.

Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): вучэбны дапаможнік. Мінск, 2013.

Беларусь: Народ. Государство. Время. Минск, 2009.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). Мінск, 2007.

## ПІЛЕЦКІ Віктар Аляксандравіч



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў сярэдневяковай Беларусі. Доктар гістарычных навук (2006).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя старажытнай і сярэдневяковай Беларусі, гісторыя

эканомікі і культуры Беларусі, генезіс і месца школьнай палітыкі ў гісторыі народаў.

Нарадзіўся 5.05.1960, в. Русоўшчына Клецкага раёна Мінскай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт МДПІ імя М. Горкага (1986), спецыяльнасць "Гісторыя. Замежная мова (французская)".

***Доктарская дысертацыя:*** "Выхаваўча-адукацыйны працэс на беларускіх землях у дахрысціянскі перыяд: праблема гістарычнага генезісу" (2006).

***Працоўная дзейнасць.*** Мінскае ПТВ-47 (1986–1988): настаўнік. БДПУ імя М. Танка (1988–2010): асістэнт, выкладчык, дацэнт, прафесар кафедры гісторыі Беларусі, загадчык кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі. Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь. Мінскі інавацыйны ўніверсітэт (з 2010): загадчык кафедры гісторыі і тэорыі права, загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін, загадчык кафедры камунікацый і інфармацыйных тэхналогій, прафесар кафедры права і эканомікі.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Канскі ўніверсітэт (Францыя, 1985).

***Асноўныя працы:***

Гісторыя культуры Беларусі: вучэбны дапаможнік. Мінск, 2017; 2019.

Выхаваўча-адукацыйны працэс у гісторыі Беларусі дахрысціянскага перыяду. Мінск, 2013; 2017.

Гісторыя эканомікі Беларусі (ад старажытных часоў да пачатку XXI ст.): Вучэбна-метадычны дапаможнік. Мінск, 2007; 2008; 2009.

Генезіс выхаваўча-адукацыйнага працэсу ў гісторыі Беларусі. Мінск, 2004.

Першабытнае грамадства на Беларусі: вучэбны дапаможнік. Мінск, 1996.

***Узнагароды.*** Медаль Мінскага інавацыйнага ўніверсітэта "За выдатную працу III ступені" (2020).

## ПІЛІПЕНКА Міхаіл Фёдаравіч



Этнолаг, гісторык. Аўтар канцэпцыі паходжання беларускага народа. Доктар гістарычных навук (1993), член-карэспандэнт НАН Беларусі (1994), прафесар (1995). Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь (1999). Заслужаны работнік БДУ (2016).

**Напрамкі даследаванняў:** тэарэтычныя пытанні этнаграфіі; гісторыя беларускай этналогіі і фалькларыстыкі; праблемы этнагенезу і этнічнай гісторыі беларускага народа; гісторыя сям'і беларускіх сялян; гісторыя звычаяў і абрадаў славянскіх народаў; гісторыя беларускіх народных святаў, традыцыйных народных вераванняў, беларускага мастацтва і фальклору.

Нарадзіўся 19.05.1936, в. Нежыхаў, Брагінскі раён, Гомельская вобласць.

***Адукацыя:*** Мазырскае педагагічнае вучылішча, гістарычны факультэт БДУ (1961), аспірантура Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. Ламаносава (1967).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Сям'я і шлюб у беларускіх сялян у другой палове XIX – пачатку XX ст." (1970).

***Доктарская дысертацыя:*** "Узнікненне Беларусі (Новая канцэпцыя)" (1992).

***Працоўная дзейнасць.*** Настаўнік гісторыі ў школах Віцебскай, Гомельскай абласцей. БДУ, гістарычны факультэт (1967–1991): выкладчык кафедры гісторыі Старажытнага часу і Сярэдніх вякоў; дацэнт, прафесар кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі (з 1991): загадчык аддзела этнаграфіі, галоўны навуковы супрацоўнік, дырэктар, загадчык аддзела.

***Асноўныя працы:***

Возникновение Белоруссии: новая концепция. Минск, 1991.

Этнография Белоруссии. Минск, 1981.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя: у 10 т. Мінск, 2004–2020.

Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. Мінск, 2005–2006.

Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мінск, 2000.
Беларусы: у 11 т. Мінск, 1995–2008.
Беларусы. Мінск, 1998.
Народная педагогіка беларусаў. Мінск, 1996.
Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1989.



## ПОЛЯК Наталля Аляксандраўна

Гісторык. Спецыяліст па гісторыі дысідэнцкага пытання ў Беларусі ў XVII–XVIII ст. Кандыдат гістарычных навук (2007), дацэнт (2013).

**Напрамкі даследаванняў:** канфесійная гісторыя ВКЛ і Рэчы Паспалітай, узаемаадносіны хрысціянскіх канфесій і еўрапейскі кантэкст беларускага рэлігійнага фактару ў XVII–XVIII ст.

Нарадзілася ў 1979 г., Слуцк.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (2001) і магістратура БДУ, аспірантура Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ (2006).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Дысідэнцкае пытанне на Беларусі ў кантэксце міжнародных адносін (1660–1768 гг.)” (2007).

***Працоўная дзейнасць.*** Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (з 2009): дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі.

***Асноўныя працы:***

Рэлігія на землях Беларусі ад старажытнасці да нашых дзён: дапаможнік. Мінск, 2017.
История белорусской культуры: своеобразие культурного типа: пособие. Минск, 2013.

## ПРАНЕВІЧ Генадзь Мікалаевіч



Літаратурны крытык, паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч. Спецыяліст па праблеме ўзаемасувязі сярэднявечнай і новай беларускай літаратуры. Кандыдат філалагічных навук (1990), дацэнт. Старшыня Брэсцкага аддзялення Грамадскай арганізацыі "Фонд імя Льва Сапегі" (1994–2004).

**Напрамкі даследаванняў:** літаратура сярэднявечнай Беларусі, працэсы гісторыка-культурнага ўзаемадзеяння і развіцця рамантызму ў славянскіх літаратурах, біяграфія і погляды Льва Сапегі.

3.10.1950, в. Жарабковічы Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці – 26.04.2017.

***Адукацыя:*** беларуска-рускае аддзяленне філалагічнага факультэта (1974) і аспірантура пры кафедры беларускай літаратуры БДУ (1983). Дактарантура Інстытута літаратуры імя Я. Купалы НАН Беларусі (2000).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Літаратура сярэдневяковай Беларусі і станаўленне класічнай мастацкай традыцыі ў паэзіі Янкі Купалы" (1990).

***Працоўная дзейнасць.*** Брэсцкі завод "Газаапарат": токар. "Аблміжкалгаспраект" у Брэсце: рабочы. Брэсцкі СГПТВ-65 будаўнікоў (1976–1978): выкладчык беларускай і рускай літаратуры, намеснік дырэктара. Партыйная работа (1978–1980). Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна (1983–2017): выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры беларускага літаратуразнаўства.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Інстытут Польскай філалогіі Ягелонскага ўніверсітэта (Кракаў, 1999, 2002).

***Асноўныя працы:***

Старажытная беларуская літаратура: вучэбна-метадычны комплекс. Брэст, 2005.

Леў Сапега: Жыццё дзеля Айчыны. Віцебск, 2003.
Славянскі рамантызм эпохі нацыянальна-вызваленчых рухаў і вобраз беларускага нацыянальнага адраджэння ў паэзіі Янкі Купалы. Брэст, 1993.

***Удзел у калектыўных працах:***
Вялікі канцлер Вялікага княства: (да 450-годдзя з дня нараджэння Льва Сапегі). Мінск, 2007; 2008.
Леў Сапега (1557–1633 гг.) і яго час: зборнік навуковых артыкулаў. Гродна, 2007.
Белавежская пушча ў духоўнай і культурнай спадчыне беларусаў. Брэст, 2003.
Беларуская літаратура: падручнік для 10-га класа. Мінск, 1997.



## ПРЫБЫТКА Генадзь Віктаравіч

Гісторык, мовазнаўца. Спецыяліст па гісторыі барацьбы магнацкіх груповак у ВКЛ у XVII–XVIII ст. Кандыдат гістарычных навук (2000).

**Напрамкі даследаванняў:** унутрыпалітычная гісторыя ВКЛ XVII–XVIII ст., шляхецкія канфедэрацыі ў Беларусі, беларусы ў Маскве ў XVI–XVII ст.

Нарадзіўся ў 1963 г., Янаў.

***Адукацыя:*** Маскоўскі абласны педагагічны інстытут імя Н. Крупскай, філалагічны факультэт (1987).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Барацьба магнацкіх груповак у Вялікім Княстве Літоўскім у сярэдзіне XVII ст. (1655–1668 гг.)” (2000).

***Працоўная дзейнасць.*** Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт: выкладчык беларускай мовы. Незалежны даследчык (Масква).

***Удзел у калектыўных працах:***
Белорусский след в культуре и архитектуре Москвы. Мінск, 2017.
Белорусы Москвы. XVII век. Мінск, 2013.

## РАБЦЭВІЧ Валянцін Навумавіч



Гісторык, нумізмат, археолаг. Спецыяліст па гісторыі грашовага абарачэння ў ВКЛ і Каралеўстве Польскім. Заснавальнік беларускай нумізматычнай школы. Стваральнік (на аснове ўласнай калекцыі) Нумізматычнага кабінета БДУ (1964). Доктар гістарычных навук (1996), прафесар (1997). Член Нумізматычнай камісіі Нацыянальнага камітэта гісторыкаў СССР.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя грашовага абарачэння Беларусі, Літвы, Украіны і Польшчы; тапаграфія манетных скарбаў на тэрыторыі Беларусі.

26.11.1934, в. Красная, Кіраўскі раён Магілёўскай вобласці – 29.05.2008.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1957), аспірантура Дзяржаўнага Эрмітажа (Ленінград, 1963).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Тапаграфія манетных скарбаў на тэрыторыі Беларусі” (1964, Ленінградскае аддзяленне Інстытута археалогіі АН СССР).

***Доктарская дысертацыя:*** “Расійска-”польскія” манетныя эмісіі эпохі Пятра І” (1996).

***Працоўная дзейнасць.*** Дзяржаўны музей БССР (1957–1959): навуковы супрацоўнік. БДУ, гістарычны факультэт (з 1963): выкладчык; дацэнт кафедры гісторыі Старажытнага свету і Сярэдніх вякоў; дацэнт, прафесар кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных дысцыплін; прафесар кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін.

***Асноўныя працы:***

Нумизматика Беларуси. Минск, 1995.

Российско-“польские” монетные эмиссии эпохи Петра I. Тольятти, 1995.

О чём рассказывают монеты. Минск, 1968; 1977; 1978.

***Удзел у калектыўных працах:***
Брылеўскі скарб. Мінск, 2011.
Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1993.
Историческое краеведение Белоруссии. Минск, 1980.
Очерки по археологии Белоруссии: в 2 ч. Ч. 2. Минск, 1972.

***Узнагароды, прызнанне.*** Лаўрэат прэміі імя У. І. Пічэты (БДУ). Залаты знак Польскага нумізматычнага таварыства.

***Прысвечана вучонаму:*** Трэція навуковыя чытанні памяці прафесара Валянціна Навумавіча Рабцэвіча (1934–2008): тэзісы дакладаў, Мінск, 16–18 мая 2018 г. Мінск, 2018.



## РАДАМАН Андрэй Аляксандравіч

Гісторык. Спецыяліст па гісторыі дзяржавы і права ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Падпалкоўнік міліцыі ў запасе.

**Напрамкі даследаванняў:** палітычная гісторыя ранняга Новага часу; гісторыя палітычнай, юрыдычнай думкі і права ВКЛ XVI–XVIII ст.; гісторыя парламентарызму ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай; палітычныя эліты ВКЛ XV–XVIII ст.: прасапаграфія; генеалогія і сфрагістыка.

Нарадзіўся 2.01.1971, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт МДПІ імя М. Горкага (1993), аспірантура БДПУ імя М. Танка (1995).

***Працоўная дзейнасць.*** Міжнародны дзіцячы цэнтр “Артэк” (1989–1991): важаты. Сярэднія школы № 147, 42, 173 г. Мінска (1993): настаўнік. Акадэмія міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў (1995–2016): выкладчык, старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права. Служба ў органах унутраных спраў (1996–2016). Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Ф. Скарыны (2000–2002): навуковы супрацоўнік сектара гісторыі права і палітыка-прававой думкі. Шэраг прыватных вышэйшых навучаль-

ных устаноў г. Мінска (па сумяшчальніцтву): выкладчык гісторыі дзяржавы і права. БДУ (2016–2018): навуковы супрацоўнік кафедры гісторыі Беларусі Старажытнага часу і Сярэдніх вякоў. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (2018–2020): навуковы супрацоўнік аддзела генеалогіі, геральдыкі і нумізматыкі. Беластоцкі Універсітэт, факультэт гісторыі і міжнародных адносін (з 2021): дактарант.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Ягелонскі ўніверсітэт (Кракаў, 2002, стыпендыя Фонда каралевы Ядвігі). Варшаўскі ўніверсітэт (2010, 2018, навуковая стыпендыя Польскага камітэта па справах ЮНЕСКА). Акадэмія навук Літвы, Інстытут гісторыі Літвы (2019). Інстытут гісторыі імя Тадэвуша Мантэйфеля Польскай акадэміі навук, Нямецкі гістарычны інстытут у Варшаве (2021).

***Удзел у калектыўных працах:***

История белорусской государственности: В 5 т. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. Минск, 2018.

Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy: w X t. T. V: Ziemia połocka i województwo połockie. XIV–XVIII wiek. Warszawa, 2018; T. IX: Województwo mścisławskie. XVI–XVIII wiek. Warszawa, 2019; T. VIII: Ziemia brzeska i województwo brzeskie XIV–XVIII wiek. Warszawa, 2020.

Гісторыя Навагрудка – з глыбінь вякоў да нашых дзён. Мінск, 2014; 2016.

Unus pro omnibus: Валовічы ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага XV–XVIII ст. Мінск, 2014.

Беларусь: Народ. Государство. Время. Минск, 2009.

***Узнагароды, прызнанне.*** Памятны медаль “80 год міліцыі Беларусі”. Медаль “90 год міліцыі Беларусі”. Памятны знак “70 год міліцыі Мінскай вобласці”. Нагрудны знак “За адзнаку”.



## РЫБЧОНАК Сяргей Аляксандравіч

Гісторык, архівіст. Спецыяліст па генеалогіі шляхецкіх родаў Беларусі. Кандыдат гістарычных навук (2010), дацэнт (2017). Ганаровы архівіст Беларусі (2008).

**Напрамкі даследаванняў:** генеалогія і геральдыка беларускай шляхты, крыніцазнаўства Беларусі Сярэдніх вякоў і Новага Часу, крыніцы па генеалогіі Беларусі, культура Беларусі XVI–XIX ст.

Нарадзіўся 7.09.1966, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1990).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Крыніцы масавага паходжання па генеалогіі Беларусі сярэдзіны XVII – пачатку XX ст. (па матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі)" (2010).

***Працоўная дзейнасць.*** Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (1990–2009): археограф, навуковы супрацоўнік аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў; галоўны архівіст, вядучы навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела інфармацыі і навуковага выкарыстання дакументаў. Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі (2010–2012): старшы навуковы супрацоўнік аддзела інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (2013–2020): старшы навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных навук і інфармацыйна-аналітычнай працы; старшы навуковы супрацоўнік аддзела генеалогіі, геральдыкі і нумізматыкі.

***Асноўныя працы:***

Крыніцы па генеалогіі Беларусі XVI – пачатку XX ст.: метадычныя парады. Мінск, 2003.

***Удзел у калектыўных працах:***

Урадніки (пасады, тытулы) Менскага ваяводства XVI–XVIII стагоддзяў. Мінск, 2018; 2021.

Чорная дама з Мірскага замка: княгіня Ганна Кацярына з Сангушкаў Радзівіл (1676–1746). Мір, 2020 .
Валовічы герба “Багорыя”. Мінск, 2019; 2020 (Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі).
Банкаўская справа Беларусі. Гісторыя. Мінск, 2017; 2018.
Мір Радзівілаў: замак, мястэчка, графства: (1568–1813 гг.): зборнік дакументаў і матэрыялаў. Мір, 2017.
Князі Друцкія-Горскія ў Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVIII стст. Мір, 2016.
Род Іллінічаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVI стст.: радавод, гербы, уладанні. Мір, 2015.
Unus pro omnibus: Валовічы ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага XV–XVIII стст. Мінск, 2014.
Гербоўнік беларускай шляхты. Т. 1–3. Мінск, 2002–2014.
Малы гербоўнік Наваградскай шляхты. Мінск, 1997.

***Узнагароды, прызнанне.*** Ганаровая грамата Дзяржаўнага Камітэта па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь (1998). Нагрудны знак “Ганаровы архівіст Беларусі” (2008).

## РЫЕР Якаў Рыгоравіч



Археолаг, гісторык. Спецыяліст па аграрнай археалогіі сярэднявечнай Еўропы і гісторыі цывілізацый Сярэднявечча. Доктар гістарычных навук (1993), прафесар (1995). Выдатнік адукацыі (2003).

**Напрамкі даследаванняў:** сярэднявечная аграрная гісторыя і археалогія, аграрныя парадкі ў Еўропе, фарміраванне цывілізацый у Старажытнасці і Сярэднявеччы ў свеце і роля прыроднага асяроддзя і дэмаграфічных працэсаў.

Нарадзіўся 21.03.1947, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1969).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Феадальная вёска Магілёўскага Падняпроўя ў X–XIV стст. па археалагічных звестках” (1980, Інстытут гісторыі АН Літоўскай ССР, Вільнюс).

***Доктарская дысертацыя:*** “Сярэдневяковая вёска Усходняй і Цэнтральнай Еўропы (па археалагічных звестках)” (1993, Інстытут археалогіі АН СССР, Масква).

***Працоўная дзейнасць.*** Магілёўскі абласны краязнаўчы музей (1969–1975): навуковы супрацоўнік. Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут / МДУ імя А. А. Куляшова: старшы выкладчык, дацэнт, прафесар, загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі, прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі, прафесар кафедры гісторыі і філасофіі.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Інстытут ўсеагульнай гісторыі АН СССР, сектар гісторыі сярэдніх вякоў (1984). Інстытут славяназнаўства і балканістыкі АН СССР, сектар гісторыі сярэдніх вякоў (1989). Універсітэт Вёкшэ (Швецыя, 1996) і інш.

***Асноўныя працы.***

***Манаграфіі:***

Средневековая деревня Восточной и Центральной Европы в археологической литературе. Могилев, 2021.

Локальные цивилизации средневековья: генезис и особенности. Могилев, 2016.

Сельское общество Могилевского Поднепровья X–XIII вв. По археологическим данным. Могилев, 2010.

Цивилизации средневековья и начала нового времени: опыт структурного анализа. Могилев, 2003.

Аграрный мир Восточной и Центральной Европы в средние века (по археологическим данным). Могилев, 2000.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гарадзішча Змяёўка (Пелагееўскае гарадзішча) у Магілёве. Археалагічнае даследаванне. Магілёў, 2010.

***Навучальныя дапаможнікі і курсы лекцый:***

Новое в исторической демографии: методические материалы. Могилев, 2018.

Очерки становления средневековых европейских государств в контексте общеисторических процессов: природная среда и социальное развитие. Могилев, 2016.

Археология средневековой европейской деревни: общие черты и региональные особенности: курс лекций. Могилев, 2008.
Народы Центральной и Юго-Восточной Европы: учебное пособие: в 2 ч. Ч. 1: Славяне и их соседи в средние века. Могилев, 2005.
История средневековых цивилизаций: учебное пособие: в 5 ч. Могилев, 2001–2003.
Историческая демография. Могилев, 1999; 2006.
Развіццё сярэднявяковай вёскі на тэрыторыі Беларусі і ў суседніх землях. Магілёў, 1990.

***Узнагароды, прызнанне.*** Ганаровыя граматы: ЦК КПСС, Саўміна СССР і ВЦСПС (1987), Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (1993, 1998, 2013, 2020), НАН Беларусі (2008), Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў (2009), Савета міністраў Рэспублікі Беларусь (2013). "Чалавек года" ў намінацыі "Лепшы па прафесіі" Цэнтральнага раёна г. Магілёва (2002). Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь (2003). Нагрудны знак "За ўклад у развіццё Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова (2018). Медаль Францыска Скарыны (2020).

***Прысвечана вучонаму.*** Яков Григорьевич Риер: биобиблиографический указатель. Могилев, 2018.

## САВЕРЧАНКА Іван Васільевіч



Літаратуразнаўца, пісьменнік, гісторык, палітолаг. Спецыяліст па гісторыі беларускай літаратуры XVI–XVII ст. Доктар філалагічных навук (2001), прафесар (2013). Сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя і тэорыя літаратуры, гісторыя Беларусі, палітычныя і культурныя дзеячы ВКЛ XVI–XVII ст., філасофская думка Беларусі, сучасныя праблемы ўлады і дзяржаўнасці, міжнародныя адносіны.

Нарадзіўся 2.04.1962, в. Малінаўка Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці.

***Адукацыя:*** філалагічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1983), аспірантура Інстытута літаратуры АН БССР (1988).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Фарміраванне старабеларускай кніжнай паэзіі XVI – першай паловы XVII ст." (1989).

***Доктарская дысертацыя:*** "Публіцыстычная літаратура Беларусі другой паловы XVI–XVII стст.: праблемы паэтыкі" (2001).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут мовы і літаратуры НАН Беларусі (з 1988): вядучы навуковы супрацоўнік. Філіял "Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы" Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (з 2015): дырэктар.

***Асноўныя навуковыя працы:***

Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стст. Мінск, 2012.

Menschliche Dimension: intellektuelle und geistige Bereiche = Чалавечае вымярэнне: інтэлектуальная і духоўная сферы. Minsk, 2004.

Aurea mediokritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. Мінск, 1998.

Апостал яднання і веры: Язэп Руцкі. Мінск, 1994.

Сымон Будны – гуманіст і рэфарматар. Мінск, 1993

100 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі. Менск, 1993.

Старажытная паэзія Беларусі (XVI – першая палова XVII ст.). Мінск, 1992.

Астафей Валовіч: гісторыка-біяграфічны нарыс. Мінск, 1992.

Канцлер Вялікага Княства: Леў Сапега. Мінск, 1992.

Удзел у калектыўных працах:

Сусветная спадчына Францыска Скарыны. Мінск, 2017.

Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. Т. 1. Мінск, 2006.

150 пытанняў і адказаў з гісторыі Беларусі. Менск, 1999.

***Выданні літаратурных помнікаў:***

Шэдэўры пісьменства і літаратуры Беларусі X–XVII стагоддзяў. Мінск, 2016.

Беларуская літаратура XVI ст. Мінск, 2015.

Памятники литературы Беларуси X–XVIII вв. Минск, 2013.

Старажытная беларуская літаратура (XII–XVII стст.). Мінск, 2007; 2010.

Беларуская літаратура X–XV стст. Мінск, 2010.
Кладезь мудрости и благодати. Фольклор и литературные памятники Беларуси. Москва, 2010.
Францыск Скарына. Выбраныя творы. Мінск. 2008.

***Літаратурна-мастацкія і гісторыка-дакументальныя творы:***
Рыцары Белай Русі. Мінск, 2022.
Магія слова. Беларускія пісьменнікі XII–XVII стагоддзяў: эсэ. Мінск, 2019 (Нацыянальная літаратурная прэмія ў намінацыі "Літаратурная крытыка і літаратуразнаўства", 2020).
Трон: легенда, повесть, мистерия. Минск, 2019.
Улада пячаткі: легенда, аповесць, містэрыя, эсэ. Мінск, 2016.
Блеск короны: повесть-нарация, эссе. Минск, 2014.

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэмія імя Францішка Багушэвіча Беларускага ПЭН-цэнтра (1999). Лаўрэат прэміі НАН Беларусі (1993). Лаўрэат Літаратурнай прэміі "Залаты купідон" (2012). Лаўрэат Міждзяржаўнай прэміі "Зорка Садружнасці" (2017). Нацыянальная літаратурная прэмія (2020).

## САГАНОВІЧ Генадзь Мікалаевіч



Гісторык, археолаг. Спецыяліст па ваеннапалітычнай гісторыі Беларусі і ВКЛ XV–XVII ст., кавальству Беларусі XIV–XVIII ст. Заснавальнік і галоўны рэдактар часопіса "Беларускі Гістарычны Агляд" (выходзіць з 1994). Доктар габілітаваны ў галіне гуманітарных навук (2018), прафесар.

**Напрамкі даследаванняў:** ваенна-палітычная гісторыя ВКЛ, адносіны ВКЛ і Нямецкага ордэна, палітычная культура шляхты ВКЛ, гістарыяграфія Усходняй Еўропы, калектыўныя ідэнтычнасці ў ранні Новы час.

Нарадзіўся 13.01.1961, в. Турная Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт МДПІ імя М. Горкага (1984), аспірантура Інстытута гісторыі АН БССР (1987).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Кавальскае рамяство Беларусі XIV–XVIII ст." (1989).

***Доктарская дысертацыя:*** "Грунвальд у беларускай гісторыі. Спроба разбору палітычнага міфа" (2018, Гістарычны інстытут Варшаўскага ўніверсітэта).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі НАН Беларусі (1987–2005): навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі, старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст. Інстытут гісторыі АН Літвы і Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт (Вільнюс, з 2005).

***Асноўныя працы:***

Грунвальд у беларускай гісторыі: спроба разбору палітычнага міфа. Мінск, 2015; Вільнюс, 2016.

Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. Мінск, 2001.

Невядомая вайна: 1654–1667. Мінск, 1995.

Войска Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVII стст. Мінск, 1994.

Айчыну сваю баронячы: Канстанцін Астрожскі. Мінск, 1992.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). Мінск, 2004.

Дзесяць вякоў беларускай гісторыі 862–1918. Падзеі. Даты. Ілюстрацыі. Вільня, 1999; 2000; 2002.

Імя тваё Белая Русь. Мінск, 1991.

***Узнагароды, прызнанне.*** Медаль Францішка Багушэвіча Беларускага ПЭН-цэнтра (1996). Узнагарода журнала "Przeglаnd Wschodni" (2001). Медаль "100 гадоў БНР" Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (2019).

## САЛЕЙ Сяргей Міхайлавіч



Гісторык, грамадскі дзеяч. Спецыяліст па ўсходняму напрамку дыпламатыі ВКЛ у XVI ст. Магістр гісторыі Цэнтральна-Еўрапейскага ўніверсітэта. Арганізатар (1995) і старшыня Гродзенскай грамадскай асацыяцыі маладых інтэлектуалаў "ВІТ", якая рэалізавала шэраг даследчых і адукацыйных праектаў па гісторыі ВКЛ.

**Напрамкі даследаванняў:** дыпламатычная служба ВКЛ у XVI ст., узаемаадносіны ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай, гравюра Гродна 1567 г. як гістарычная крыніца.

Нарадзіўся 15.01.1973, Гродна.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (1995) і аспірантура ГрДУ імя Я. Купалы. Цэнтральна-Еўрапейскі ўніверсітэт (Венгрыя, Будапешт): магістратура па спецыяльнасці "Даследаванне Сярэднявечча" (1998), юрыдычны факультэт БДУ (2016).

***Працоўная дзейнасць.*** ГрДУ імя Я. Купалы (1999–2005): выкладчык, загадчык аддзела міжнародных сувязяў.

***Асноўныя працы:***

Ivan The Terrible's imperial title and problem of its recognition in the West and in the East // Castrum, urbis et bellum: зборнік навуковых прац. Баранавічы, 2002. С. 320–341.

***Удзел у калектыўных працах:***

Жалудок. Гісторыя нашага краю. Гродна, 2020.

Канструкцыя і дэканструкцыя Вялікага княства Літоўскага: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, Гродна, 23–25 красавіка 2004 г. Мінск, 2007.

Вялікае княства Літоўскае: гісторыя вывучэння ў 1991–2003 гг.: матэрыялы міжнароднага круглага стала (Гродна, 16–18 мая 2003 г.). Мінск, 2006.

Вялікае княства Літоўскае: метадалогія і метады даследавання. Санкт-Пецярбург, 2003.



## САМУСІК Андрэй Фёдаравіч

Гісторык. Спецыяліст па гісторыі адукацыйнай дзейнасці хрысціянскіх канфесій у Беларусі ў XVI – першай трэці XIX ст. Кандыдат гістарычных навук (1998), дацэнт (2003).

**Напрамкі даследаванняў:** сістэма адукацыі ў Еўропе і Беларусі ў XV–XIX ст., гісторыка-культурная спадчына Беларусі.

Нарадзіўся 20.11.1972, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (1995) і аспірантура (1998) БДУ; дактарантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (2018).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Развіццё сістэмы асветы на беларускіх землях у 1770–1830-я гг." (1998).

***Працоўная дзейнасць.*** Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт: дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі.

***Асноўныя працы:***

Помнікі гісторыі і культуры Беларусі: вучэбны дапаможнік. Мінск, 2004; 2013.

***Удзел у калектыўных працах:***

История Беларуси: в контексте мировых цивилизаций: пособие для студентов-заочников. Минск, 2018; 2019.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2008.

Гісторыя Беларусі: у кантэксце сусветных цывілізацый: вучэбны дапаможнік. Мінск, 2005; 2007; 2009; 2013.

## САСНОЎСКІ Зміцер Алегавіч



Музыкант, гісторык. Папулярызатар сярэднявечнай беларускай музыкі. Заснавальнік (1999) і лідар музычнага гурта сярэднявечнай музыкі "Стары Ольса", прадзюсар. Майстар старадаўніх музычных інструментаў.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя беларускай музычнай культуры, старадаўнія музычныя інструменты Беларусі.

Нарадзіўся 22.11.1974, Гомель.

***Адукацыя:*** гісторыка-юрыдычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта (1996), Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы (спецыяльнасць "філасофія", 1997).

***Працоўная дзейнасць.*** Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (1996–2000): выкладчык кафедры філасофіі і культуралогіі. СШ №19 Гомеля (2000): выкладчык сусветнай мастацкай культуры. Інфармацыйны аддзел Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" (2001–2009): загадчык. Турыстычнае агенцтва "Гісторыя-тур" (2009): арт-дырэктар. Дударскі клуб (2007–2009): адміністратар. Прадзюсар і арганізатар культурных і музычных мерапрыемстваў (з 2001). Фестываль "Дударскі фэст" (з 2006): прадзюсар. Гістарычны музей Дукорскага маёнтка (2015–2017): загадчык. ІП "Сасноўскі Дз.А." (з 2015): арганізацыя святаў.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Мадрыдскі каталіцкі ўніверсітэт "Comillas" (1998). Навучанне ў музычнага майстра Донатса Вуцыса (Латвія, 1998). Kolegium Europy Wschodniej (Польшча, Вроцлаў, 2004). United States Department of State, International Visitor Leadership Program (ЗША, 2006).

***Асноўныя працы:***

Гісторыя беларускай музычнай культуры XIX–XX стст. Мінск, 2012.
Музычная культура рыцарскага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага. Мінск, 2010.

Гісторыя беларускай музычнай культуры ад першабытнасці да канца XVIII ст. Мінск, 2010.
Гісторыя беларускіх музычных уплываў. Мінск, 2009.
Дакументальны фільм “Старыя інструменты Беларусі” (2007) // https://www.youtube.com/watch?v=jYIOJszs7Uc

***Узнагароды, прызнанне.*** Лаўрэат міжнароднага фальклорнага фестывалю ў Паставах (1999). Нацыянальная музычная прэмія (2013).



## СВЯЖЫНСКІ Уладзімір Мітрафанавіч

Лінгвіст, літаратуразнаўца, гісторык. Спецыяліст па беларускай мемуарыстыцы XVI–XVII ст. і мове беларускай пісьменнасці часоў ВКЛ. Кандыдат філалагічных навук (1978).

**Напрамкі даследаванняў:** этнакультурная, моўная сітуацыя ў ВКЛ і статус беларускай мовы; праблемы кірылічнай, лацінскай і арабскай палеаграфіі; эдыцыйная археаграфія; крыніцазнаўства палітычнай і ваеннай гісторыі Беларусі; беларуская мемуарыстыка часоў ВКЛ; генеалогія.

Нарадзіўся 28.04.1945, в. Новыя Турасы, Ушацкі раён, Віцебская вобласць.

***Адукацыя:*** філалагічны факультэт БДУ (1971), аспірантура Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа АН БССР (1973).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “З гісторыі беларуска-польскіх моўных кантактаў даўняй пары (на матэрыяле “Дзённіка” Ф. М. Еўлашоўскага)” (1978).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут мовазнаўства АН БССР (1971–1992). Інстытут гісторыі НАН Беларусі (1993–2007): старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу.

***Асноўныя працы:***
“Гістарычныя запіскі“ Ф. Еўлашоўскага. Мінск, 1990.
Слова Скарыны (Скарбы мовы). Мінск, 1984.

***Удзел у калектыўных працах:***
Ягелоны: дынастыя, эпоха, спадчына: матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Гальшаны – Навагрудак, 8–10 верасня 2006 г. Мінск, 2007.
Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Т. 2–4, 11, 15–19, 25–26. Мінск, 1983–2006.
Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Менск, 2000.
Метрыка Вялікага Княства Літоўскага. Кніга 28: Кніга запісаў (1522–1552): Копія канца XVI ст. Менск, 2000.
Metriciana. Т. 1– 3. Мінск. 2001–2004.
Пытанні культуры пісьмовай мовы. Мінск, 1991.
Мова выданняў Францыска Скарыны. Мінск, 1990.
Статут Вялікага Княства Літоўскага. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мінск, 1989.
Мова беларускай пісьменнасці XIV–XVIII стст. Мінск, 1988.

## СЕМЯНЧУК Альбіна Аляксандраўна



Гісторык. Спецыяліст па летапісанню і гістарычнай памяці народаў ВКЛ у XV–XVII ст. Кандыдат гістарычных навук (1997), дацэнт (1998).

**Напрамкі даследаванняў:** наратыўныя крыніцы XV–XVII ст., польскія хронікі, беларуска-літоўскія летапісы, гістарычная думка ў ВКЛ, беларуская культура.

Нарадзілася 25.01.1963, пас. Савецкі, Марыйская АССР.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт ГрДУ імя Я. Купалы (1988), аспірантура Інстытута гісторыі АН Беларусі (1996).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Польскія хронікі другой паловы XVI ст. як крыніцы па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага” (1997).

***Працоўная дзейнасць.*** ГрДУ імя Я. Купалы (1996–2022): выкладчык, дацэнт кафедры беларускай культуры, дацэнт кафедры турызму і культурнай спадчыны.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Навуковыя і навучальныя ўстановы Познані (1996), Варшавы (1994, 1998), Кракава (2005, 2006–2007).

***Асноўныя працы:***

Гродно. Королевский город: путеводитель. Минск, 2016.

Беларуска-літоўскія летапісы і польскія хронікі: вучэбны дапаможнік. Гродна, 2000.

***Удзел у калектыўных працах:***

Валовічы герба “Багорыя”. Мінск, 2019; 2020 (Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі).

Recepcja twórczości Jana Długosza w historiografii krajów europejskich. Częstochowa, 2019.

Ваенныя трыумфы эпохі Вялікага Княства Літоўскага: зборнік навуковых артыкулаў. Мір, 2017.

Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.): зборнік навуковых прац. Мінск, 2014.

Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. Т. 2: Протарэнесанс і Адраджэнне. Мінск, 2010.

Королевский город Гродно: путеводитель. Минск, 2006; 2009; 2010.

Культура Гродзенскага рэгіёну: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа. Гродна, 2003.

## СЕМЯНЧУК Генадзь Мікалаевіч



Гісторык-медыевіст, археолаг. Спецыяліст па сацыяльна-палітычнай гісторыі Полацкага княства. Кандыдат гістарычных навук (1993), дацэнт (1998). Сябра Еўрапейскай Археалагічнай асацыяцыі (2006). Сябра Браслаўскага краязнаўчага таварыства.

**Напрамкі даследаванняў:** сацыяльна-палітычная гісторыя Беларусі VI–XVI ст., дзяржаватворчыя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў IX–XII ст., археалогія сярэднявечнага перыяду Беларусі, культура Гродзенскага рэгіёна (горадабудаўніцтва, культавая і свецкая архітэктура).

Нарадзіўся 6.10.1963, Ваўкавыск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт ГрДУ імя Я. Купалы (1985), аспірантура Інстытута гісторыі АН БССР (1990).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Фарміраванне і развіццё тэрыторыі Полацкай зямлі ў IX – першай палове XIII ст.”

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторы АН Беларусі (1990–1991): малодшы навуковы супрацоўнік аддзела археалагічных даследаванняў зон новабудоўляў. ГрДУ імя Я. Купалы (1991–2015): дацэнт кафедры беларускай культуры; дацэнт кафедры археалогіі і этналогіі; дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін. Інстытут гісторыі Універсітэта імя Адама Міцкевіча (Познань, Польшча, 1998): выкладчык. Інстытут усходнеславянскай філалогіі, Інстытут этналогіі і культурнай антрапалогіі Ягелонскага ўніверсітэта (Кракаў, Польшча, 2003–2009): выкладчык. Цэнтр беларускіх студый пры Варшаўскім універсітэце (з 2015): выкладчык.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Навуковыя і навучальныя ўстановы Познані (1995), Варшавы (1996), Любляны (1999), Кракава (2000).

***Удзел у калектыўных працах:***

Rocznik Centrum Studiów Białoruskich / Гадавік Цэнтра Беларускіх Студыяў. Nr 1–6. Warszawa, 2015–2020.

Historia Białorusinów Podlasia. Białystok, 2016.
Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Ваўкавыскага раёна. Мінск, 2004.
Castrum, urbis et bellum. Баранавічы, 2002.
Археалогія Беларусі: навучальны дапаможнік. У 2-х ч. Ч. 1: Ад палеаліта да ранняга сярэднявечча; Ч. 2: Эпоха сярэднявечча. Гродна, 1996–1997.



## СІНЧУК Іван Іванавіч

Гісторык, археолаг, нумізмат. Спецыяліст па гісторыі грашовага абарачэння Беларусі IX–XX ст. Член Расійскай асацыяцыі "Гісторыя і камп'ютар". Член Міжнароднай асацыяцыі нумізматаў Балтыі.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі XVI–XX ст., гісторыя грашовага абарачэння Беларусі, тэхніка манетнай справы IX–XX ст., праблемы этнічнай антрапанімікі Беларусі, прымяненне матэматычных і фізіка-хімічных метадаў у гістарычных даследаваннях.

Нарадзіўся 8.03.1956, Кобрын.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1981), спецыяльная падрыхтоўка ў аддзеле нумізматыкі Дзяржаўнага гістарычнага музея (Масква, 1983–1984), аспірантура Інстытута гісторыі АН Беларусі (1992).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут "Белспецпраектрэстаўрацыя" (1985–1991): вядучы археолаг. Супрацоўнічае (з 1995) з Інстытутам археалогіі і этналогіі Польскай АН, вывучаў манетныя зборы ў музеях Польшчы. Беларускі ўніверсітэт культуры, Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт (1995–1998): выкладчык. Нацыянальны музей Літвы (1999–2008). Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь (2008–2014): вядучы навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускага мастацтва.

*Асноўныя працы:*
Рецензии и аннотации (нумизматика, сфрагистика, археология). Beau Bassin, Mauritius, 2019.
Беларуска-літоўская нумізматычная бібліяграфія: 1950–2000. Мінск, 2017.
Аннотации. Минск, 2016.
Ненужные рецензии. Минск, 2015.
История одной фальшивой монеты. Минск, 2006.
Итоги – 50. Мінск, 2007.
Клады Беларуси: законодательство и практика. Минск, 2003.
Нумізматычная гістарыяграфія: метадычныя матэрыялы для спецыялізацыі "Музеязнаўства". Мінск, 1998.
Фалерыстыка: праграма для студэнтаў спецыялізацыі "Музеязнаўства". Мінск, 1998.
Традиционные способы переноски, хранения и сокрытия денег в Белоруссии, на Украине и в России: материалы пилотажного исследования: записи 1983 г. Минск, 1994.
*Удзел у калектыўных працах:*
Культура Беларусі: у 6 т. Т. 5. Мінск, 2014.
Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. Мінск, 2005–2006.
Находки монет 16–20 вв. в Дисне и Друе: (к истории товарно-денежных отношений города и округи). Минск, 2001.
Находки единичных монет в г. Кобрине. Минск, 2000.
Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1993.

## СКВАРЧЭЎСКІ Дзмітрый Вячаслававіч



Гісторык. Спецыяліст па беларускаму паганству і міфалогіі (ад старажытнасці да ранняга ВКЛ) і гісторыі станаўлення навуковай астраноміі ў ВКЛ. Кандыдат гістарычных навук (2017).

**Напрамкі даследаванняў:** беларуская дахрысціянская традыцыя; язычніцкі пантэон,

вераванні, міфы і ахвярапрынашэнні; этнаастраномія; уяўленні жыхароў ВКЛ пра Сусвет; апісанне астранамічных з'яў у летапісах ВКЛ; сакральная геаграфія; традыцыйная культура насельніцтва беларускіх зямель.

Нарадзіўся ў 1988 г., Барысаў.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (2011), магістратура (2012) і аспірантура (2015) БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Фарміраванне і развіццё астранамічных ведаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XIV–XVII стст." (2017).

***Працоўная дзейнасць.*** БДУ: дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Старажытнага часу і Сярэдніх вякоў.

***Асноўныя працы:***

Навука звяздарская: астраномія ў Вялікім Княстве Літоўскім у XIV–XVII ст. Мінск, 2022.

Па слядах багоў: нарысы беларускай міфалогіі. Мінск, 2019.

***Удзел у калектыўных працах:***

Трошкі бліжэй да Сонца, трошкі далей ад Месяца: беларуская народная філасофія. Мінск, 2021; 2022.

Беларусь: путь в космос = Belarus: the way to space. Минск, 2018.

## СКЕП'ЯН Анастасія Анатольеўна



Гісторык. Спецыяліст па гарадской і шляхецкай культуры XVI–XVII ст., мецэнацтве на беларускіх землях, гісторыі магнацкіх родаў ВКЛ і іх рэзідэнцый. Кандыдат гістарычных навук (2000), дацэнт (2012).

**Напрамкі даследаванняў:** культура Беларусі XVI–XVII ст., гісторыя штодзённасці, гісторыя шляхецкіх родаў ВКЛ, міжнародныя культурныя сувязі ВКЛ.

Нарадзілася 12.10.1974, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1996), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (1999).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Шляхецкае мецэнацтва ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI – першай палове XVII ст." (2000).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі НАНБ (з 1999): малодшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст., вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі IX–XVIII ст. Адначасова Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт (1999–2003): выкладчык, дацэнт кафедры філасофіі і гісторыі. Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (2001–2006): выкладчык, дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Летняя Усходняя Школа пры Варшаўскім універсітэце, стыпендыя Фонда каралевы Ядзвігі Ягелонскага ўніверсітэта (Кракаў, 2001), стыпендыя Касы імя Юзэфа Мяноўскага (Варшава, 2002–2003), стыпендыя Польскага камітэта па справах ЮНЕСКА.

***Асноўныя працы:***

Князі Слуцкія. Мінск, 2013 (Прэмія Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі за найлепшыя навуковыя публікацыі 2014–2015 г. у намінацыі "Найлепшая гістарычная кніга").

***Удзел у калектыўных працах:***

Валовічы герба "Багорыя". Мінск, 2019; 2020 (Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі).

Рэлігійнае жыццё у Вялікім Княстве Літоўскім і Каралеўстве Польскім у XVI–XVIII стагоддзях: у коле мясцовых спраў і праблем: зборнік навуковых артыкулаў. Мінск, 2019.

Сапегі: асобы, кар'еры, маёнткі: зборнік навуковых артыкулаў. Мінск, 2018.

Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст. Атлас. Вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. Мінск, 2018.

Гісторыя Беларусі XVI–XVIII ст.: вучэбны дапаможнік для 7 класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. Мінск, 2017.

Замак у г. п. Мір. Архітэктурна-гістарычныя даследаванні [Электронны рэсурс]. Мінск, 2014.

Людзі і ўлада Навагрудчыны: гісторыя ўзаемадзеяння: (да 500-годдзя надання Навагрудку прывілея на магдэбургскае права): зборнік навуковых артыкулаў. Мінск, 2013.
Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV–XVII стст. Мінск, 2011.
Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі: (да 940-годдзя горада): матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 7–9 верасня 2007 г. Мінск, 2008.
Ягелоны: дынастыя, эпоха, спадчына: матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Гальшаны – Навагрудак, 8–10 верасня 2006 г. Мінск, 2007.

***Узнагароды, прызнанне.*** Грамата Міністэрства культуры за ўдзел у музеефікацыі палацава-замкавага комплексу "Мір". Лаўрэат Прэміі Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі (2015) за манаграфію "Князі Слуцкія" (Мінск, 2013). Прэмія Прэзідыума НАН Беларусі за цыкл работ па тэме "Рэгіянальная гісторыя Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу" (2015). Ганаровая грамата Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (2019). Грамата Нацыянальнага інстытута адукацыі (2019).



## СКЕП'ЯН Ніна Анатольеўна

Гісторык. Спецыяліст па гісторыі інстытута канцлерства ВКЛ у XV–XVI ст. Кандыдат гістарычных навук (2008).

**Напрамкі даследаванняў:** палітычная гісторыя ВКЛ XV–XVI ст.; гісторыя палітычных інстытутаў, магнацкіх родаў і іх рэзідэнцый.

Нарадзілася 9.10.1978, Мінск.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (2002), Берлінскі свабодны ўніверсітэт (Германія, 2007).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Інстытут канцлерства ў дзяржаўна-палітычным жыцці Вялікага княства Літоўскага ў канцы XV – першай палове XVI ст." (2008).

***Працоўная дзейнасць.*** Пасольства Федэратыўнай Рэспублікі Германія (Мінск, 2002–2005): супрацоўнік. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь (2008–2009): старшы навуковы супрацоўнік. Карлаў універсітэт (Чэхія, Прага, з 2009): запрошаны выкладчык.

***Удзел у калектыўных працах:***
Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.): зборнік навуковых прац. Мінск, 2014.
Ягелоны: дынастыя, эпоха, спадчына: матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Гальшаны – Навагрудак, 8–10 верасня 2006 г. Мінск, 2007.

## СЛІЖ Наталля Уладзіміраўна



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі беларускага сямейнага права і гендэрнай гісторыі часоў ВКЛ. Кандыдат гістарычных навук (2002).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя шляхецкай сям'і і шлюбу, Гродна ў XVI–XVII ст., цудатворныя абразы, гендэрная тэорыя ў гістарычным даследаванні, астралогія.

Нарадзілася ў 1974 г., Гродна.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт і аспірантура ГрДУ імя Я. Купалы.

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Шляхецкая сям’я ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI–XVII ст.: уздзеянне саслоўнага падзелу грамадства на яе фарміраванне і развіццё” (2002).

***Працоўная дзейнасць.*** Гродзенскі філіяла БІП–Інстытут правазнаўства: дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных і лінгвістычных дысцыплін.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Нямецкі гістарычны інстытут у Варшаве, Вільнюская Акадэмія мастацтваў, Беластоцкі ўніверсітэт і інш.

***Асноўныя працы:***
“Збор знакамітых цудаў і ласкаў Найсвяцейшай Панны Марыі Студэнцкай” як унікальная крыніца па гісторыі Гародні. Мінск, 2019.

Культура сексуальных стасункаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XVI–XVII стст. Мінск, 2019.
Katalog testamentów mieszkańców Brześcia i Grodna od XVI do początku XVIII wieku. Warszawa, 2017.
Шлюбныя і пазашлюбныя стасункі шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў XVI–XVII стст. Смаленск, 2015.



## СМАЛЯКОЎ Дзмітрый Анатольевіч

Філосаф, паэт, пісьменнік. Магістр філасофскіх навук (2008). Кандыдат філасофскіх навук (2016).

**Напрамкі даследаванняў:** беларуская філасофія, гісторыя рэлігіі, гісторыя ідэй, марксізм, постструктуралізм.

***Адукацыя:*** факультэт філасофіі і сацыяльных навук БДУ (2008), філасофскае аддзяленне Беларускага калегіума (2008).

***Магістарская дысертацыя:*** "Феномен рэлігійнасці ў кантэксце Беларускай культуры XVI-XVIII стагоддзяў".

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Сацыяльна-філасофскія погляды мысліцеляў Беларусі ў кантэксце рэлігійнай палемікі канца XVI – сярэдзіны XVII стагоддзя" (2016).

***Працоўная дзейнасць.***

Міністэрства адукацыі: галоўны спецыяліст упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва. Інстытут філасофіі НАН Беларусі: навуковы супрацоўнік.

***Асноўныя працы:***

Сацыяльна-філасофскія погляды рэлігійных палемістаў у Беларусі канца XVI – сярэдзіны XVII стагоддзя. Мінск, 2020 (Прэмія Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі за лепшую навуковую публікацыю 2020 г.)

***Удзел у калектыўных працах:***

Анталогія філасофскай думкі Беларусі: дапаможнік для студэнтаў: у 3 т. Т. 1. Мінск, 2017.

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэмія Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі за лепшую навуковую публікацыю 2020 г.

## СОБАЛЕВА Любоў Паўлаўна



Гісторык. Спецыяліст па гендэрнай гісторыі Беларусі XIV–XVIII ст. Папулярызатар гістарычных ведаў на беларускім радыё і тэлебачанні.

**Напрамкі даследаванняў:** культура Беларусі XVI–XVIII ст., гендэрная гісторыя, інстытут сям'і ВКЛ у XIV–XVII ст.

Нарадзілася 17.10.1960, пас. Леніна Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт МДПІ імя А. А. Куляшова (1983).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі НАН Беларусі (з 1991): малодшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст.; навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу, аддзела гісторыі Беларусі IX–XVIII ст. Адначасова БДУ: выкладчык кафедры гісторыі Беларусі Старажытнага часу і Сярэдніх вякоў. Намеснік старшыні прафсаюзнай арганізацыі работнікаў НАН Беларусі (з 2010). Беларускае радыё (2004): аўтар і вядучая цыклаў праграм па гісторыі Беларусі ("Наша Мінуўшчына", "Эўрыка"). Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія "Мір" (1997 – па сённяшні дзень): аўтар і вядучая штодзённай праграмы "Хвіліна з гісторыкам" (150 выпускаў штогод).

***Удзел у калектыўных працах:***

Каралева Соф'я і гарады, якія прадвызначылі яе лёс. Мінск, 2015; 2018.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2008; Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). Мінск, 2004.

***Узнагароды:*** Ганаровая грамата Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь за папулярызацыю гістарычных ведаў у сродках масавай інфармацыі.



## СОБАЛЬ Валянцін Енісеевіч

Археолаг. Спецыяліст па матэрыяльнай культуры Мінска, Гродна, Смаленска часоў ВКЛ. Кандыдат гістарычных навук (1988).

**Напрамкі даследаванняў:** даследаванне архітэктурных помнікаў археалагічнымі метадамі, храналогія культурных пластоў, матэрыяльная культура беларускіх гарадоў і замкаў XIV–XVIII ст.

Нарадзіўся 4.03.1949, Паставы.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1972).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Мінск XIV–XVIII стст. (па матэрыялах археалагічнага вывучэння” (1988).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі АН БССР (1974–1988): малодшы навуковы супрацоўнік аддзела археалагічных даследаванняў зон новабудоўляў. Беларускі рэстаўрацыйна-праектны інстытут (1988–1994, 1996–2001): вядучы археолаг, начальнік аддзела комплексных даследаванняў помнікаў. ААТ “Стары Менск” (1994–1996): галоўны навуковы супрацоўнік. Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (2000–2009): старшы навуковы супрацоўнік, загадчык навукова-экспазіцыйнага аддзела. Інстытут археалогіі Расійскай акадэміі навук (2008–2013): кіраўнік раскопак на тэрыторыі Смаленска. Музей гісторыі горада Мінска (з 2014): вядучы навуковы супрацоўнік навукова-фондавага аддзела.

***Удзел у калектыўных працах:***

Смоленские изразцы XVI–XIX веков. Смоленск, 2013.

Оборонительные укрепления Смоленска конца XVI–XVII вв. у Молоховских ворот. Смоленск, 2012.

Древний Смоленск. Археология Пятницкого конца. Смоленск, 2011; Москва, 2020.

Стары замак у Гродне, XI–XVIII стст.: гісторыка-археалагічны нарыс. Мінск, 1993.

Беларуская кафля. Мінск, 1989.

## СОКАЛ Сцяпан Фёдаравіч



Юрыст, гісторык, філосаф. Заснавальнік новага напрамку ў беларускай юрыдычнай навуцы – гісторыя палітычных і прававых вучэнняў Беларусі. Арганізатар беларускай юрыдычнай навукі і адукацыі. Доктар юрыдычных навук (1988), прафесар (1990). Выдатнік адукацыі БССР. Ганаровы работнік юстыцыі. Член Беларускага рэспубліканскага саюза юрыстаў.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя прававой, палітычнай і сацыялагічнай думкі Беларусі XVI–XVII ст.

8.01.1943, в. Шавялі, Ляхавіцкі раён, Брэсцкая вобласць – 5.12.2020.

***Адукацыя:*** Гродзенскае музычнае вучылішча, юрыдычны факультэт БДУ (1967), аспірантура Інстытута філасофіі і права АН БССР (1971).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Сацыялагічная і палітычная думка ў Беларусі ў другой палове XVI ст."

***Доктарская дысертацыя:*** "Палітычная і прававая думка ў Беларусі XVI – першай паловы XVII ст." (1987, Інстытут дзяржавы і права Акадэміі навук УССР, Кіеў).

***Працоўная дзейнасць.*** Чэрыкаўскі раён (1967–1971): памочнік пракурора. Інстытут філасофіі і права АН БССР (1971–1974, 1981–1985): навуковы супрацоўнік. Мінскі радыётэхнічны інстытут (1974–1977): дацэнт, выконваючы абавязкі загадчыка кафедры філасофіі. Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР (1977–1981): інспектар. ГрДУ імя Я. Купалы (1985–1990): загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, дэкан факультэта правазнаўства. Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў (1990–1993): старшыня. БІП–Універсітэт права і сацыяльна-інфармацыйных тэхналогій (1991–2020): заснавальнік, рэктар.

***Асноўныя працы:***
Зігзагі лёсу: музыкант, філосаф, юрыст: [успаміны]. Мінск, 2018.
Зарождение и становление Европейской юриспруденции: Древняя Греция, Рим, Средневековье. Минск, 2011.
Гісторыя дзяржавы і права БССР (дакастрычніцкі перыяд): тэксты лекцый. Мінск, 1989.
Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI – первой половины XVII в. Минск, 1984.
Социологическая и политическая мысль в Белоруссии во второй половине XVI в. Мінск, 1974.

***Удзел у калектыўных працах:***
Вялікае Княства Літоўскае і суседзі: Права. Вайна. Дыпламатыя: зборнік навуковых прац. Мінск, 2012.
История государства и права Беларуси: курс лекций. Минск, 2007.
Палітычная і прававая думка Беларусі XVI–XVII стст. Мінск, 2000.
История юридической науки Беларуси. Минск, 2000.

***Узнагароды, прызнанне.*** Ордэн “Знак Пашаны”. Знакі “Выдатнік адукацыі”, “Ганаровы работнік юстыцыі” і інш.

***Прысвечана вучонаму:*** Прававая думка і праватворчасць: зборнік матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі “Палітычная і прававая думка ВКЛ і Рэчы Паспалітай XVI–XVIII стст. і яе ўплыў на права і прававую сістэму”, прысвечанай 75-годдзю доктара юрыдычных навук, прафесара Сокала Сцяпана Фёдаравіча (Мінск, 24–25 лістапада 2017 г.). Мінск, 2018.



## СПІРЫДОНАЎ Міхаіл Фёдаравіч

Гісторык-медыевіст, картограф. Спецыяліст па гісторыі сялянства Беларусі XV–XVI ст. і па картаграфіі ВКЛ, заснавальнік беларускай картаграфіі. Кандыдат гістарычных навук (1982).

**Напрамкі даследаванняў:** эвалюцыя аграрных адносін у Беларусі XV–XVI ст., гістарычная геаграфія і картаграфія Беларусі XVI–XVII ст.

10.04.1937, Бабруйск – 6.07.2017.

***Адукацыя:*** Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава (1960).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Запрыгоньванне сялянства Беларусі (XV–XVI ст.)” (1981).

***Працоўная дзейнасць.*** Школы Астравецкага, Полацкага і Пухавіцкага раёнаў (1960–1965): настаўнік. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (1965–2003): малодшы навуковы супрацоўнік сектара гісторыі Беларусі эпохі феадалізма, старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі эпохі феадалізма, старшы навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных навук.

***Асноўныя працы:***

Беларускія землі ў другой палове XVI ст. Утварэнне Рэчы Паспалітай [Карта]: вучэбны наглядны дапаможнік для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2021.

Беларусь у другой палове XVI ст. 1:1.500.000 [карта] // Нацыянальны атлас Беларусі. Мінск, 2002.

Заславль в XVI в. Минск, 1998.

Метрика Великого княжества Литовского как источник по истории поселений. Вильнюс, 1998.

Беларускія землі ў складзе Вялікага княства Літоўскага ў XVI стагоддзі [Карта]. Мінск, 1997.

Закрепощение крестьянства Беларуси (XV–XVI вв.). Минск, 1993.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гістарычны атлас Беларусі. Мінск, 2020.

Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. 2-е выд. Т. 1–2. Мінск, 2018, 2020.

Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. Т. 2. Мінск, 2013.

Гістарычны атлас Беларусі. Т. 1: Беларусь са старажытных часоў да канца XVIII ст. Варшава: Мінск, 2008.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2008.

Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. Мінск, 2005–2006.

Нацыянальны атлас Беларусі. Мінск, 2002.

Гісторыя сялянства Беларусі: са старажытных часоў да 1996 г.: у 3 т. Т. 1: Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. Мінск, 1997.

Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
История крестьянства СССР с древнейших времен до Великой Октябрьской социалистической революции: в 5 т. Т. 2. Москва, 1990.
Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии, конец XIV в. – 1648 г.: сборник документов и материалов. Минск, 1988.

***Прысвечана вучонаму:*** Памяць стагоддзяў на карце Айчыны: зборнік навуковых прац у гонар 70-годдзя Міхаіла Фёдаравіча Спірыдонава. Мінск, 2007.



## СПІРЫН Іван Уладзіміравіч

Археолаг, гісторык. Спецыяліст па гісторыі фартыфікацыі XII–XVIII ст. на тэрыторыі Аршанскага і Магілёўскага Падняпроўя. Кандыдат гістарычных навук (2017).

**Навуковыя інтарэсы:** абарончая архітэктура ВКЛ і звязаныя з ёй падзеі ваеннай гісторыі Беларусі.

Нарадзіўся 21.02.1988, Магілёў.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт МДУ імя А. А. Куляшова (2012), магістратура (2013), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (2016).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Фарміраванне і развіццё сістэмы абарончых збудаванняў Аршанска-Магілёўскага Падняпроўя ў XII–XVIII стст. (па археалагічных звестках)” (2017).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторы НАН Беларусі (з 2016): навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны, старшы навуковы супрацоўнік аддзела археалогіі Сярэдніх вякоў і Новага часу.

***Удзел у калектыўных працах:***
Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зборнік артыкулаў. Наваполацк, 2014.

## СТАРАСЦЕНКА Віктар Уладзіміравіч



Гісторык філасофіі, рэлігіявед. Спецыяліст па гісторыі філасофскай, грамадскай думкі Беларусі і нацыянальнай самасвядомасці беларусаў XVI–XVII ст. Кандыдат філасофскіх навук (2000), дацэнт (2002). Выдатнік адукацыі (2008).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя айчыннай філасофіі і станаўленне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў; тэорыя і гісторыя рэлігіі, вальнадумства і свабоды сумлення ў Беларусі; навукова-метадычнае і вучэбнае забеспячэнне выкладання рэлігіязнаўства і гісторыі філасофскай думкі.

Нарадзіўся 11.04.1967, Магілёў.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт МДПІ імя А. А. Куляшова (1991), аспірантура Інстытута філасофіі і права НАН Беларусі (1998).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Беларуская думка XVI–XVII стст. і станаўленне нацыянальнай самасвядомасці" (2000).

***Працоўная дзейнасць.*** МДУ імя А. А. Куляшова (з 1991): асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры філасофіі, дэкан факультэта замежных моў, прарэктар па навуковай рабоце, прафесар кафедры філасофіі, загадчык кафедры гісторыі і філасофіі.

Кіраўнік "Магілёўскага рэлігіязнаўчага цэнтра" МДУ імя А. А. Куляшова. Каардынатар Міжнародных навукова-практычных канферэнцый "Рэлігія і грамадства" (Магілёў, з 2006).

***Асноўныя працы:***

История религии и свободы совести в Беларуси в документах и материалах: пособие: в 4 ч. Ч. 1: От Древней Руси до конца XVI в. Могилев, 2014; Ч. 2: От Брестской церковной унии до второй половины XVIII в. Могилев, 2015; Ч. 3: Со второй половины XVIII в. до октября 1917 г. Могилев, 2015.

Религия и свобода совести в Беларуси: очерки истории. Могилев, 2011.

История общественной и философской мысли в Беларуси: раннее и развитое Возрождение: хрестоматия. Могилев, 2010.
История общественной и философской мысли в Беларуси: эпоха Средневековья: хрестоматия. Могилев, 2009.
Общественная и философская мысль в Беларуси X–XVII вв.: учебное пособие. Могилев, 2005.
Свободомыслие и свобода совести в Беларуси: очерки истории. Могилев, 2004.
Становление национального самосознания белорусов: этапы и основополагающие идеи (X–XVII вв.). Могилев, 2001.
"Лабиринт" Фомы Иевлевича: Из истории национально-культурной и религиозной жизни Могилёва и Беларуси конца XVI – первой половины XVII вв. Могилев, 1998.

***Удзел у калектыўных працах:***
Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. Т. 1: Эпоха Сярэднявечча. Мінск, 2008; Т. 2: Протарэнесанс і Адраджэнне. Мінск, 2010; Т. 3; Рэфармацыя, Контррэфармацыя. Барока. Мінск, 2013.

***Узнагароды, прызнанне.*** Памятны Знак "2000 год хрысціянству" (2000). Ганаровыя граматы Міністэрства адукацыі (2004, 2015). "Выдатнік адукацыі" (2008). Ганаровыя граматы Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (2013, 2017). Медаль Францыска Скарыны (2018).

***Прысвечана вучонаму:*** Виктор Владимирович Старостенко: биобиблиографический указатель. Могилев, 2017 (Биобиблиография ученых МГУ имени А. А. Кулешова).

## СТРЭНКОЎСКІ Сяргей Пятровіч



Гісторык. Спецыяліст па праблеме самакіравання гарадоў ВКЛ і інстытутаў гарадской дэмакратыі. Доктар гістарычных навук (2014), прафесар (2018).

**Напрамкі даследаванняў:** самакіраванне дзяржаўных і прыватнаўласніцкіх гарадоў ВКЛ; інстытуты дэмакратыі гарадскіх суполак; карпаратыўнае самакіраванне цэхаў, гільдый і брацтваў, суполак нацыянальных меншасцяў у XIV – пачатку XIX ст.; гісторыя праваслаўнай царквы Беларусі.

Нарадзіўся 23.04.1969, в. Юрацішкі, Іўеўскі раён, Гродзенская вобласць.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (1994) і аспірантура (1997) БДПУ імя М. Танка, дактарантура (2013).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Гарадское самакіраванне ў вялікакняжацкіх уладаннях заходняй часткі Вялікага княства Літоўскага” (1999).

***Доктарская дысертацыя:*** “Гарадское самакіраванне на тэрыторыі Беларусі (канец XIV–XVIII ст.)” (2014).

***Працоўная дзейнасць.*** СШ № 179 г. Мінска (1993–1998): намеснік дырэктара. СШ № 199 г. Мінска (1998–2003): дырэктар. Упраўленне адукацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска (2003–2007): начальнік упраўлення. Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі (з 2007): прарэктар па вучэбна-метадычнай рабоце, першы прарэктар, прафесар кафедры ўпраўлення і эканомікі адукацыі. Мінская духоўная акадэмія: выкладчык кафедры царкоўнай гісторыі і царкоўна-практычных дысцыплін.

***Асноўныя працы:***

Под омофором Святителя Николая Чудотворца: история православного прихода в местечке Юратишки. Минск, 2017.

Гарадское самакіраванне на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIV–XVIII ст.: у 2 ч. Мінск, 2013.

Прывілеі і вольнасці беларускіх гарадоў з нямецкім правам у канцы XIV – канцы XVIII стагоддзя. Мінск, 2008.
Мінск у другой палове XIII – канцы XVIII стагоддзя: вучэбны дапаможнік. Мінск, 2011.
Мінск у другой палове XIII – канцы XVIII стагоддзя: хрэстаматыя. Мінск, 2011.
Вольнасці і прывілеі гарадоў заходняй часткі Вялікага княства Літоўскага: вучэбны дапаможнік. Мінск, 1997.

***Удзел у калектыўных працах:***
Жыровічы: пад святым пакровам: энцыклапедыя. Мінск, 2020.

***Узнагароды, прызнанне.*** Юбілейны медаль “60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 г.”. Граматы Міністэрства адукацыі (2009, 2012). Юбілейны медаль Беларускай Праваслаўнай Царквы “В память 500-летия Успенского Жировичского мужского монастыря”.

***Прысвечана вучонаму:*** Неординарная личность: к 50-летию со дня рождения С. П. Стренковского. Юратишки, 2019.

## СУША Аляксандр Аляксандравіч



Культуролаг, кнігазнаўца. Даследчык і папулярызатар спадчыны Францыска Скарыны, ініцыятар праектаў і ўдзельнік прац па факсімільным узнаўленні каштоўных помнікаў кніжнай культуры Беларусі. Кандыдат культуралогіі (2009). Старшыня Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (2015–2021).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя кніжнай культуры Беларусі, гісторыя хрысціянства ў Беларусі, уніяцкая царква, культурная спадчына Беларусі.

Нарадзіўся 15.12.1982, Мінск.

***Адукацыя:*** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (2005), аспірантура Рэспубліканскага інстытута вышэйшай

школы БДУ (2007), Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Культурная спадчына грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі ў кантэксце дыхатаміі “Усход–Захад” (2009).

***Працоўная дзейнасць.*** Нацыянальная бібліятэка Беларусі (2005–2022): супрацоўнік аддзела рукапісаў, рэдкай кнігі і стадрукаў; вучоны сакратар; намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці; у 2020–2022 – намеснік генеральнага дырэктара. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў і іншыя ВНУ: выкладчык. НАН Беларусі (з 2022): Цэнтр энцыклапедычных выданняў. Цэнтральная навуковая бібліятэка: намеснік дырэктара.

***Асноўныя працы:***

Беларускі Буквар у нацыянальнай і сусветнай прасторы. Мінск, 2021.

Вынаходства буквара ў Беларусі. Мінск, 2021.

Асэнсаванне шэдэўра. Берасцейская Біблія. Мінск, 2020.

Берасцейская Біблія [факсімільнае выданне]. Мінск, 2019.

Нараджэнне Буквара: асветніцкія традыцыі ў кніжнай культуры Беларусі. Мінск, 2018.

Францыск Скарына і сучаснасць. Мінск, 2017.

Са слаўнага горада Полацка. Мінск, 2017.

Франциск Скорина – человек мира. Минск, 2016.

Францыск Скарына. Чалавек-энцыклапедыя. Мінск, 2016.

Францыск Скарына. Чалавек свету. Мінск, 2016.

Францыск Скарына. Чалавек-легенда. Мінск, 2016.

Буквар у жыцці нашых продкаў. Мінск, 2012.

Даведнік па Беларусі для імператрыцы. Мінск, 2009.

***Удзел у калектыўных працах:***

Узнікненне кнігадрукавання ў Еўропе і Беларусі. Мінск, 2017.

Сусветная спадчына Францыска Скарыны. Мінск, 2017.

Францыск Скарына: энцыклапедыя. Мінск, 2017.

Тураўскае Евангелле: факсімільнае ўзнаўленне. Даследаванні. Мінск, 2014; 2015.

Кніжныя помнікі: выяўленне, апісанне, захоўванне, выкарыстанне: метадычныя матэрыялы. Мінск, 2013.

Беларуская і руская літаратура: у дапамогу навучэнцам [электронны рэсурс]. Мінск, 2011.
Беларуская літаратурная спадчына: анталогія: у 2 кн. Мінск, 2011.
Спадчына Напалеона Орды (з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі). Мінск, 2007.
Шэдэўры літаратурнай спадчыны Беларусі. Мінск, 2007.
Кніга Беларусі. 1517–1917: зводны каталог. Мінск, 2006.

***Узнагароды, прызнанне.*** Стыпендыят Спецыяльнага фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2003, 2005). Грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы культуры (2015). Чалавек года ў сферы культуры (2018). Медаль Францыска Скарыны (2020).



## СЦЕБУРАКА Анатоль Мікалаевіч

Гісторык. Спецыяліст па гісторыі адукацыі другой паловы XVI – першай паловы XVII ст. і французскіх архіўных калекцыях Беларусі. Кандыдат гістарычных навук (2011), дацэнт (2015).

**Напрамкі даследаванняў:** этнаканфесійны і сацыяльны аспекты адукацыі ў Беларусі ў XVI–XVII ст., Беларусь у часы напалеонаўскіх войнаў, беларуска-французскія кніжныя і культурныя кантакты.

Нарадзіўся 22.08.1983, в. Амговічы Слуцкага раёна, Мінская вобласць.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (2005), аспірантура Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ (2011).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Развіццё адукацыі ў Беларусі ў другой палове XVI – першай палове XVII стагоддзяў: этнаканфесійны і сацыяльны аспекты" (2011).

***Працоўная дзейнасць.*** Нацыянальная бібліятэка Беларусі (2005–2010). Інстытут бізнесу БДУ (2010): выкладчык.

Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы (з 2011): дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

***Удзел у калектыўных працах:***

Sept ans d'absence, 1807–1814: témoignage d'un soldat de Napoléon (Joseph Quantin). Paris, 2020.

Лісты да Жазефіны: ваенныя шляхі французскага афіцэра: 1805–1812. Мінск, 2018.

Françoise Albertine Mas, Charles-P. Fitte de Soucy (1776–1813): Lettres d'un officier Napoléonien... Paris, 2015.

Гісторыя Беларусі XIX ст. у мемуарах // ARCHE. 2014. № 1–2.

Французские автографы в фонде Национальной библиотеки Беларуси [Электронный ресурс]. Минск, 2011.

## ТАРАС Анатоль Яфімавіч



Пісьменнік, выдавец, журналіст, гісторык-аматар. Папулярызатар беларускай гісторыі і культуры. Заснавальнік і рэдактар кніжнай серыі "100 выдатных дзеячаў беларускай культуры" (2012–2019). Складальнік і рэдактар серыі "Невядомая гісторыя". Кандыдат педагагічных навук (1979). Доктар навук у галіне інфармацыйных тэхналогій (1998) і прафесар (1998) ад грамадскага абъяднання "IAIT – Міжнародная акадэмія інфармацыйных тэхналогій".

**Тэматыка гісторыка-литаратурнай творчасці:** цікавыя, дыскусійныя і невядомыя старонкі гісторыі Беларусі; уклад выдатных дзеячаў у развіццё нацыянальнай літаратуры, мастацтва, навукі.

Нарадзіўся 24.05.1944, Гомель.

***Адукацыя:*** філасофскае аддзяленне гістарычнага факультэта БДУ (1972), аспірантура Акадэміі педагагічных навук СССР (Масква, 1979).

***Працоўная дзейнасць.*** Рабочы на заводах (1961–1963). Ваенная служба ў асобным разведвальна-дыверсійным батальёне 7-й

танкавай арміі (1963–1966). Удзел у 11 аперацыях, што праводзіліся спецыяльнымі падраздзяленнямі Галоўнага ўпраўлення выведкі СССР у розных рэгіёнах свету (1967–1975, атрымаў шэраг урадавых узнагарод). Навукова-даследчы інстытут педагогікі Міністэрства асветы БССР (1972–1980): навуковы супрацоўнік. Навукова-практычны цэнтр "Сігнум" (1989–1991): загадчык лабараторыі. Мінскія выдавецтвы "Эридан", "Красико-принт", "МЕТ" (1991–1999): рэдактар. Выдавецтва „Харвест" (1999–2009): галоўны рэдактар. Гістарычны альманах "Деды" (з 2009): рэдактар. Грамадская арганізацыя "Інстытут беларускай гісторыі і культуры" (Рыга, Латвія, з 2012): вучоны сакратар.

***Асноўныя творы:***

Ад Рагвалода да Уніі: нарысы з гісторыі сярэднявечнай Беларусі. Рыга, 2020.

Белорусские замки Великого Княжества Литовского: (краткий справочник для туристов). Рига: Минск, 2020.

Язэп Юхо: прапагандыст нацыянальнай гісторыі. Рыга, 2019.

Кастусь Тарасаў: знаўца і настаўнік айчыннай гісторыі. Мінск, 2018.

Анатоль Грыцкевіч: лідар беларускай гістарыяграфіі. Мінск, 2018.

Войны Московской Руси с Великим княжеством Литовским и Речью Посполитой в XIV–XVII веках. Москва, 2006; Минск, 2018.

Краткий курс истории Беларуси, IX–XXI вв. Минск, 2014; 2016.

Орша, 8 сентября 1514 года. Минск, 2014; 2016.

Мітрафан Доўнар-Запольскі: бацька беларускай гістарыяграфіі. Мінск, 2012.

Грюнвальд, 15 июля 1410 года. Мінск, 2010; 2011; 2017.

***Удзел у калектыўных працах:***

Великий миф маленькой Летувы: сборник статей. Рига, 2016.

Бітва пад Оршай, 1514–2014. Рыга, 2014.

Деды: дайджест публикаций о беларуской истории: специальный выпуск: (репринт №№ 1–5). Минск, 2013.

Вялікі беларус Леў Сапега: зборнік артыкулаў. Рыга, 2012; Мінск, 2017.

История имперских отношений: беларусы и русские, 1772–1991 гг. Смоленск, 2008.

***Прысвечана пісьменніку:*** Анатоль Тарас: зборнік матэрыялаў да 75-годдзя. Рыга, 2019.

## ТАРАСАЎ Кастусь Іванавіч



Пісьменнік, журналіст. Майстар гістарычнай прозы, аўтар гістарычных аповесцей пра мінулае Беларусі. Сябра Саюза пісьменнікаў СССР (1982). Сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі.

10.10.1940, Мінск – 20.03.2010.

***Адукацыя:*** хімічны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута (1965).

***Працоўная дзейнасць.*** Шклозавод "Нёман" (Бярозаўка): майстар шкловарэння. Завод "Маналіт" (Віцебск): тэхнолаг. Выдавецтва "Вышэйшая школа" (1967–1975): рэдактар, загадчык рэдакцыі. Газета "Знамя юности" (1975–1977): журналіст, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі. Часопіс "Нёман" (1977–1983): рэдактар аддзела мастацтва і крытыкі. Газета "Літаратура і мастацтва" (1986–1988): спецыяльны карэспандэнт. Часопіс "Спадчына" (1990–2010): адказны сакратар.

***Асноўныя творы:***

Крывавы патоп. Мінск, 2016.

Скарбы князёў Радзівілаў, альбо Обер-аўдытарская праверка ў Нясвіжы. Мінск, 2016.

Пагоня на Грунвальд. Мінск, 2015.

Выбраныя творы. Мінск, 2012.

Апошняе каханне князя Міндоўга: Аповесць. Мінск, 2000; 2015.

Крыж памяці. Кароткі спіс войнаў, паўстанняў, рэпрэсіяў, катастрофаў, якія выпалі на лёс Беларусі за тысячагоддзе. Мінск, 2001.

Беларусь: Гістарычнае падарожжа для дзяцей. Мінск, 1999.

Тры жыцці княгіні Рагнеды: Аповесць; Пагоня на Грунвальд: Гістарычны раман. Мінск, 1997; 2016.

Три жизни княгини Рогнеды: Повести. Минск, 1994.

Погоня на Грюнвальд: Исторический роман. Минск, 1992.

Памяць пра легенды: Постаці беларускай мінуўшчыны. Мінск, 1990; 1993.

Погоня на Грюнвальд: Историческая повесть. Москва, 1986.

Память о легендах: Белорусской старины голоса и лица. Мінск, 1984.
День рассеяния: Повесть. Мінск, 1980.

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэмія Міністэрства абароны СССР за раман “Погоня на Грюнвальд” (1988). Прэмія “Залаты апостраф” часопіса “Дзеяслоў” (2007). Прэмія імя Францішка Багушэвіча Беларускага ПЭН-цэнтра “За актыўную і плённую працу ў галіне гістарычнай прозы і эсэістыкі, што спрыяе фармаванню сучаснай нацыянальнай ідэнтыфікацыі беларусаў” (2010).

***Прысвечана пісьменніку:*** Тарас А. Кастусь Тарасаў: знаўца і настаўнік айчыннай гісторыі. Мінск, 2018 (100 выдатных дзеячаў беларускай культуры).

## ТАРАСАЎ Сяргей Васільевіч



Археолаг, гісторык, пісьменнік, асветнік. Спецыяліст па гісторыі Полацка IX–XVIII ст. Кандыдат гістарычных навук (1992), дацэнт. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў. Член праўлення Беларускага камітэта па помніках і памятных мясцінах (ICOMOS). Член Міжнароднага савета музеяў (ICOM). Член Еўрапейскай асацыяцыі археолагаў. Член праўлення Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Член Савета па манументальнай прапагандзе і мастацтве Рэспублікі Беларусь.

**Напрамкі даследаванняў:** археалогія і гісторыя беларускіх гарадоў IX–XVIII ст.; матэрыяльная культура, тапаграфія, палітычая, эканамічная, сацыяльная структура грамадства IX–XVII ст.; вытокі беларускай дзяржаўнасці; пранікненне і распаўсюджанне хрысціянства; узнікненне і развіццё культавага дойлідства XI–XII ст., пісьменнасці і эпіграфікі на Беларусі.

Нарадзіўся 20.01.1961, Мінск.

***Адукацыя:*** МДПІ імя М. Горкага (1982).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Гісторыка-тапаграфічная структура Полацка IX–XVIII стст.” (1992).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут гісторыі НАН Беларусі (1982–2006): лабарант, навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела археалогіі сярэдневяковага перыяду. Адначасова Беларускае тэлебачанне (1995–1998): намеснік галоўнага рэдактара рэдакцыі літаратурна-мастацкіх праграм; аўтар і вядучы гістарычных праграм (“Скарбы беларускай гісторыі”, “Кола часу” і інш.), аўтар сцэнараў гістарычных мастацкіх і дакументальных фільмаў (“Пастка для зубра. Вітаўт”, “Пастка для зубра. Ягайла”, “Замкі Беларусі”, “Беларусь на крыжы вякоў” і інш.). Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва (з 2006): дацэнт кафедры паліталогіі і гуманітарных навук, дацэнт кафедры паліталогіі і эканомікі. Адначасова Музей гісторыі горада Мінска: вядучы навуковы супрацоўнік.

***Асноўныя працы:***

Еўфрасіння – Офрасіння – Афрасіння Полацкая. Яе час, яе крыж. Мінск, 2021.

Археалогія Беларусі: час, таямніцы, скарбы, людзі: нататкі археолага. Мінск, 2017.

Мнение: сборник эссе. Минск, 2014.

Усяслаў Чарадзей. Мінск, 2012.

Фрэскі: Абразкі і апавяданні. Мінск, 2004.

Полацк IX–XVII ст.: Гісторыя і тапаграфія. Мінск, 1998; 2001.

Чарадзей сёмага веку Траяна: Усяслаў Полацкі. Мінск, 1991.

***Удзел у калектыўных працах:***

Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь: вучэбны дапаможнік для 4-га класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2018.

Мая Радзіма – Беларусь: вучэбны дапаможнік для 3-га класа агульнаадукацыйных школ. Мінск, 2001.

Археалогія Беларусі: у 4 т. Т. 4: Помнікі XIV–XVIII стст. Мінск, 2001.

Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. Мінск, 2000.

## ТКАЧОЎ Міхаіл Аляксандравіч



Археолаг, гісторык-медыевіст. Спецыяліст па ваенна-абарончаму дойлідству Беларусі XIII–XVIII ст. Пачынальнік гістарычнай археалогіі – новага напрамку гістарычных даследаванняў у Беларусі. Доктар гістарычных навук (1987), прафесар (1989). Заснавальнік (1986) і кіраўнік гісторыка-культурнага клуба "Паходня" (Гродна), які шмат зрабіў для вяртання ВКЛ у гістарычную памяць.

**Напрамкі даследаванняў:** ваенная гісторыя Беларусі, матэрыяльная культура і архітэктура гарадоў Беларусі X–XVIII ст., замкі і абарончыя сістэмы беларускіх гарадоў і арганізацыя іх абароны.

10.03.1942, Мсціслаў – 31.10.1992.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1964), аспірантура Інстытута гісторыі АН БССР (1971).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Ваеннае дойлідства Беларусі XIII–XVIII ст. (па помніках паўночна-заходняй і паўднёва-заходняй і Беларусі)" (1972).

***Доктарская дысертацыя:*** "Арганізацыя абароны гарадоў Беларусі XIV–XVIII ст." (1987).

***Працоўная дзейнасць.*** СШ № 3 г. Жодзіна (1964–1968): настаўнік гісторыі. Інстытут гісторыі АН БССР (1971–1978): старшы навуковы супрацоўнік сектара археалогіі. ГрДУ імя Я. Купалы (1978–1989): прафесар, загадчык кафедры гісторыі СССР і БССР. Выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" (1989–1992): загадчык рэдакцыі, галоўны рэдактар.

***Асноўныя працы:***

Замки Беларуси. Минск, 2002; 2007.

Паходня. Мінск, 1994.

Замкі і людзі. Мінск, 1991.

Замки Белорусии. Минск, 1987.

Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII–XVIII стст. Мінск, 1978.

Замкі Беларусі (XIII–XVII ст.). Мінск, 1977.

***Удзел у калектыўных працах:***
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Мінск, 1993–2003.
Страчаная спадчына. Мінск, 1998.
Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1993.
Вялікае мастацтва артылерыі: Казімір Семяновіч. Мінск, 1992.
Старажытны Мсціслаў. Мінск, 1992.
Беларуская кафля. Мінск, 1989.
Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Т. 1–2. Мінск, 1987–1988.
Очерки по археологии Белоруссии: в 2 ч. Ч. 2. Минск, 1972.

***Прысвечана вучонаму:*** Castrum, urbis et bellum: зборнік навуковых прац. Баранавічы, 2002.

***Памяць.*** Мемарыяльная дошка на доме ў Гродна, дзе жыў і працаваў М. Ткачоў.

## ТРАФІМЧЫК Анатоль Віктаравіч



Літаратуразнаўца, гісторык, паэт. Спецыяліст па праблеме адлюстравання вобраза Тадэвуша Касцюшкі ў беларускай літаратуры. Кандыдат гістарычных (2004), кандыдат філалагічных навук (2014).

**Напрамкі даследаванняў:** літаратуразнаўства; гісторыя Беларусі, беларускай гістарычнай думкі і гістарычнай памяці; гісторыя заходняга рэгіёна Беларусі; палітычная гісторыя першай паловы XX ст.

Нарадзіўся 14.02.1976, в. Вялікія Круговічы, Ганцавіцкі раён, Брэсцкая вобласць.

***Адукацыя:*** філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта (1998), аспірантура Інстытута літаратуры імя Я. Купалы НАН Беларусі (2001), аспірантура Інстытута еўрапейскіх даследаванняў НАН Украіны (2003), паліталагічны курс Студый Усходніх пры Варшаўскім універсітэце (2008).

***Кандыдацкія дысертацыі***: “Станаўленне савецкай сістэмы адукацыі ў заходніх абласцях БССР у 1939–1941 гг.” (2004, Інстытут гісторыі НАН Украіны); “Беларуская дзіцячая драматургія” (2014).

***Працоўная дзейнасць.*** Дзяніскавіцкая СШ (Ганцавіцкі раён, Брэсцкая вобласць). Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт (2004–2007): старшы выкладчык, дацэнт кафедры філасофіі і гісторыі. Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа (2009–2012): старшы навуковы супрацоўнік. Інстытут культуры Беларусі (2011): метадыст аддзела міжнароднай і сацыякультурнай дзейнасці. Інстытут літаратуразнаўства імя Я. Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (з 2012): навуковы супрацоўнік, вучоны сакратар, вядучы навуковы супрацоўнік. Выкладаў у Еўрапейскім гуманітарным універсітэце.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі:*** Варшаўскі ўніверсітэт (2009), Універсітэт Лазарскага (Варшава, 2011).

***Асноўныя працы:***

“Наш Касцюшка слаўны!”: гістарычная постаць Тадэвуша Касцюшкі ў беларускай літаратуры. Мінск, 2017.

Ленін і Сталін думаюць пра Беларусь. Мінск, 2013.

Якуб Колас – вядомы і невядомы. Мінск, 2012.

Беларуская дзіцячая драматургія. Мінск, 2012.

Пра нашу і вашу гісторыю. Баранавічы, 2010.

Вобраз Тадэвуша Касцюшкі ў беларускім мастацкім слове. Баранавічы, 2002

***Узнагароды, прызнанне.*** Лаўрэат Прэміі імя Францішка Багушэвіча Беларускага ПЭН-цэнтра (2014) за кнігу “1939 год і Беларусь: забытая вайна” (Мінск, 2014).

## ТРУСАЎ Алег Анатольевіч



Археолаг, гісторык архітэктуры, публіцыст, палітык і грамадскі дзеяч. Спецыяліст па гісторыі манументальнага дойлідства Беларусі XI–XVIII ст. Удзельнік абвяшчэння дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Адзін з заснавальнікаў і старшыня (1999–2017) Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Кандыдат гістарычных навук (1981), дацэнт (1995).

**Напрамкі даследаванняў:** матэрыяльная культура Беларусі XI–XVIII ст., помнікі манументальнага дойлідства, гісторыя будаўнічай тэхнікі, эвалюцыя будаўнічых матэрыялаў у XI–XVIII ст.

Нарадзіўся 7.08.1954, Мсціслаў.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1976), аспірантура Інстытута гісторыі АН БССР (1980), дактарантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Археалагічнае вывучэнне помнікаў манументальнага дойлідства XI–XVII ст. на тэрыторыі Беларусі (метадычныя даследаванні)" (1981).

***Працоўная дзейнасць.*** Беларускі рэстаўрацыйны праектны інстытут (1976–1992): супрацоўнік, начальнік археалагічнага аддзела. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь XII склікання (1990–1996): народны дэпутат; намеснік старшыні Камісіі па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны; старшыня Камісіі па забеспячэнню адзінай палітыкі выкарыстання дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь пры Прэзідыуме Вярхоўнага Савета. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (з 1995): дэкан факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (1996–1998), дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны. Прыватны Нацыянальны ўніверсітэт імя Ніла Гілевіча: выконваючы абавязкі рэктара (з 2017).

***Асноўныя працы:***
Эвалюцыя будаўнічых матэрыялаў і тэхнікі манументальнага дойлідства Беларусі XI–XVIII стст. Мінск, 2020.
Гісторыя сярэднявечнай Еўропы (V–XV стагоддзі). Мінск, 2016; 2017.
Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі. Мінск, 2015.
Невядомая нам краіна: Беларусь у яе этнаграфічных межах. Мінск, 2009; 2013.
Падсумаванне. Мінск, 2004.
Манументальнае дойлідства Беларусі XI–XVIII стагоддзяў. Гісторыя будаўнічай тэхнікі. Мінск, 2001.
Беларускае кафлярства. Мінск, 1993.
Старадаўніх муроў адраджэнне: Мінулае і сучаснасць Лідскага замка. Мінск, 1990.
Старонкі мураванай кнігі: Манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму. Мінск, 1990.
Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв. Архитектурно-типологический анализ. Минск, 1988.

***Удзел у калектыўных працах:***
Гісторыя Расіі. Нарысы. Мінск, 2018.
Летапіс дзейнасці Грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны", 2009–2014. Менск, 2014.
Летапіс дзейнасці Грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны", 1989–2009. Ліда, 2009.
Магілёўская ратуша: гістарычны лёс і адраджэнне. Мінск, 2008; 2010.
Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы. Мінск, 2007.
Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка. Мінск, 1994.
Стары замак у Гродне XI–XVIII ст.: гісторыка-археалагічны нарыс. Мінск, 1993.
Лёс Крэва. Мінск, 1993.
Беларуская паліваная кераміка XI–XVIII стст. Мінск, 1993.
Старажытны Мсціслаў. Мінск, 1992.
Беларуская кафля. Мінск, 1989.

***Узнагароды, прызнанне.*** Медаль "100 гадоў БНР" Рады Беларускай Народнай Рэспублікі (2018).

## УВАРАЎ Ігар Юр'евіч



Гісторык. Спецыяліст па праблеме эвалюцыі саслоўя шляхты ВКЛ у XVI ст. Кандыдат гістарычных навук (2003), дацэнт (2009).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя палітычных эліт ВКЛ у канцы XIV–XVI ст.

Нарадзіўся 19.10.1963, Гомель.

***Адукацыя.*** Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, гісторыка-юрыдычны факультэт (1997). Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, саіскальніцтва (2002).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Пашырэнне правоў і свабод беларускай шляхты ў Вялікім княстве Літоўскім да Люблінскай уніі (па матэрыялах вальных соймаў XVI ст.)" (2003).

***Працоўная дзейнасць.*** Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. Сухога (з 2006): дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных і прававых дысцыплін.

***Асноўныя працы:***

Сословные права и привилегии шляхты Великого княжества Литовского (конец XIV – конец XVI столетий). Гомель, 2017.

История Беларуси. Белорусские земли в эпоху феодализма: пособие к семинарским занятиям. Гомель, 2009.

## ФЛІКОП-СВІТА Галіна Аляксандраўна



Гісторык мастацтва. Спецыяліст па іканаграфіі ўніяцкіх храмаў Беларусі XVII–XIX ст. Кандыдат мастацтвазнаўства (2014). Чэмпіёнка па танцам на пілоне.

**Напрамкі даследаванняў:** рэлігійнае мастацтва, іканапіс Беларусі, іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі.

Нарадзілася 13.11.1984, Ліда.

***Адукацыя:*** Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтва (2007), магістратура Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (2009), магістратура Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі (2010), аспірантура Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (2013).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Мастацкія і іканаграфічныя асаблівасці іканапісу грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай паловы XIX ст." (2014).

***Працоўная дзейнасць:*** Лылойцінскі цэнтральны дом культуры Смаргонскага раёна (2007–2009): дырэктар. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь (2012–2018): старшы навуковы супрацоўнік. Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (з 2013): навуковы супрацоўнік аддзела старажытнабеларускай культуры.

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Германскі гістарычны інстытут у Маскве (2016).

***Асноўныя працы:***

Іканастасы і алтары грэка-каталіцкіх храмаў Беларусі XVII – першай трэці XIX ст.: з электронным дадаткам. Мінск, 2021.

Беларускі іканапіс XVI – першай паловы XX ст.: альбом. Мінск, 2019.



## ЦЕМУШАЎ Віктар Мікалаевіч

Гісторык, картограф. Спецыяліст па гісторыі ўсходняй мяжы ВКЛ у XIV – першай палове XVI ст., аўтар шматлікіх карт па гісторыі Беларусі. Кандыдат гістарычных навук (2002), дацэнт (2008).

**Напрамкі даследаванняў:** гістарычная геаграфія і картаграфія Усходняй Еўропы IX–XVI ст., тэрытарыяльнае развіццё дзяржаў Усходняй Еўропы ў XIV – першай палове XVI ст., палітычныя падзеі на карце Усходняй Еўропе эпохі Сярэднявечча і Новага часу.

4.03.1975, Бабруйск – 23.06.2011.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (1997), магістратура (1998) і аспірантура (2001) БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Тэрыторыя і межы Маскоўскага княства ў канцы XIII – першай палове XIV ст.” (2002).

***Працоўная дзейнасць.*** Школа: настаўнік. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (2002–2011): малодшы навуковы супрацоўнік аддзела спецыяльных гістарычных навук; старшы навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела выдавецкай і інфармацыйна-аналітычнай работы; старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу. БДУ, гістарычны факультэт (па сумяшчальніцтву): выкладчык.

***Асноўныя працы:***

Русско-литовское пограничье: Гомельская земля в конце XV – первой половине XVI в. Москва, 2018.

На восточной границе Великого княжества Литовского (середина XIV – первая половина XVI в.). Тула, 2016.

На ўсходняй мяжы Вялікага княства Літоўскага (сярэдзіна XIV – першая палова XVI ст.). Мінск, 2014.

Первая московско-литовская пограничная война 1486–1494. Москва, 2013; 2017.

Гомельская земля в конце XV – первой половине XVI в.: территориальные трансформации в пограничном регионе. Москва, 2009.

Исторические карты. Проблемы их создания и применения на уроках истории: практическое пособие. Минск, 2007.

***Карты:***

Вялікае княства Літоўскае і Каралеўства Польшча. 1377–1392 гг. Крэўская унія; Максімальнае пашырэнне Вялікага княства Літоўскага ў часы Вітаўта. 1392–1430 гг.; Вялікая вайна 1409–1411 гг. Бітва пад Грунвальдам 15 ліпеня 1410 г.; Великое княжество Литовское в 1345–1430 гг.; Московско-литовская граница во второй половине XV – первой трети XVI в.; Узаемаадносіны Вялікага княства Літоўскага з Вялікім княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам. 1487–1537 гг.; Пограничная война Великого княжества Московского с Великим княжеством Литовским. 1487–1494 гг.; Змены ўсходняй граніцы ВКЛ у канцы XV – першай трэці XVI ст.; ВКЛ у другой палове XVI ст. Утварэнне Рэчы Паспалітай; Тэрыторыя паў-

ночна-усходняй Беларусі падчас Інфлянцкай вайны 1558–1570 гг.; Grand Duchy of Lithuania and its administrative, geographical and religious divisions, 1654–1667; інш.

***Удзел у калектыўных працах:***

Ваенная энцыклапедыя Беларусі. Мінск, 2010.
Вялікі гістарычны атлас Беларусі: у 4 т. Т. 1. Мінск, 2009.
Беларусь: Народ. Государство. Время. Минск, 2009.
Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага. Мінск, 2008.
Речь Посполитая в конце XVI – середине XVIII в.: учебное наглядное пособие для общеобразовательных учреждений. Минск, 2008.
Беларускія землі ў сярэдзіне XVII–XVIII ст.: вучэбны наглядны дапаможнік: для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мінск, 2006.
Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 3 т. Мінск, 2005–2010.
Гісторыя Беларусі, XVI–XVIII стст.: атлас. Мінск, 2005.



## ЦІТОЎ Анатоль Кірылавіч

Гісторык, геральдыст, сфрагіст. Сябра геральдычных таварыстваў Украіны, Польшчы. Ганаровы сябра Усерасійскага геральдычнага таварыства. Сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў.

**Напрамкі даследаванняў:** геральдыка, генеалогія, гісторыя рамёстваў, гістарычная геаграфія.

27.11.1947, Дрэздэн, Германія – 5.01.2021.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1975).

***Працоўная дзейнасць.*** Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў БССР (1975–1983): навуковы супрацоўнік, старшы палеограф. Мінскі інстытут культуры (1983–1994): выкладчык. Беларускі навукова-даследчы інстытут справаводства і архіўнай справы (1994–1998): старшы навуковы супрацоўнік. Гуманітарна-эканамічны ўніверсітэт (1989–2002): выкладчык. БДУ: выкладчык.

***Асноўныя працы:***

Злотніцтва Беларусі. XII – пачатак XX ст. Мінск, 2020.

Зэгармістры Беларусі: гадзіннікавых спраў майстры (XVI – пачатак XX ст.). Мінск, 2017.

Шляхамі Францыска Скарыны. Мінск, 2016; 2021.

Гербоўнік беларускіх гарадоў (XVI – пачатак XX ст.). Мінск, 2015.

Краіна майстроў (рамесныя цэхі Беларусі: 16 – канец 18 ст.). Мінск, 2013.

Геральдыка Беларусі: (ад пачаткаў – да канца XX стагоддзя). Мінск, 2007; 2010.

Менск – места майстроў: Рамесныя цэхі XVI–XVIII стст. Мінск, 2002.

Сфрагістыка і геральдыка Беларусі: (ілюстраваны курс лекцый). Мінск, 1999.

Геральдыка беларускіх местаў (XVI – пачатак XX ст.). Мінск, 1998.

Метадычныя парады па апісанню помнікаў сфрагістыкі для архіваў і музеяў. Мінск, 1997.

Вольныя беларускія месты: (самакіраванне ў нашых гарадох XIV–XVIII стст.). Мінск, 1996.

“Пагоня” ў сэрцы – тваім і маім: [зборнік артыкулаў] / складальнік і навуковы рэдактар Анатоль Цітоў. Мінск, 1995.

Наш сімвал – Пагоня: Шлях праз стагоддзі. Мінск, 1992; 1993.

Пячаткі старажытнай Беларусі: нарысы сфрагістыкі. Мінск, 1993.

Гарадская геральдыка Беларусі. Мінск, 1989.

Гербы беларускііх гарадоў. Мінск, 1983.

## ЦІТОЎ Віктар Сцяфанавіч



Гісторык, этнолаг, фальклярыст. Спецыяліст па этнаграфічнай спадчыне і традыцыйнай культуры беларусаў. Доктар гістарычных навук (1991), прафесар (1995).

**Напрамкі даследаванняў:** этнічная гісторыя і геаграфія Беларусі, тыпалогія культурных ландшафтаў, гісторыка-этнаграфічнае раянаванне

Беларусі, традыцыйная бытавая культура беларусаў, народныя звычаі і абрады, гістарычныя стасункі Беларусі і сумежных тэрыторый, музеязнаўства і ахова гісторыка-культурных помнікаў.

15.11.1938, в. Дрожджаніцы Крычаўскага раёна, Магілёўская вобласць – 20.11.2020.

***Адукацыя:*** Магілеўскі педагагічны інстытут (1963).

***Працоўная дзейнасць.*** Настаўнік. Міністэрства асветы БССР. Гродзенскі педагагічны інстытут (1974–1977): выкладчык. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (1977–1993). Беларускі ўніверсітэт культуры (1993–1998): загадчык кафедры этналогіі і музеязнаўства. Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка (1998–2003): загадчык кафедры этналогіі і фалькларыстыкі. Вроцлаўскі ўніверсітэт (Польшча, 2003–2009): прафесар. Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва (2011–2016): прафесар.

***Асноўныя працы:***

Гісторыя айчыннай культуры: у 2 ч. Мінск, 2009.
Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Краіна і людзі. Мінск, 2001.
Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Традыцыйна-бытавая культура. Мінск, 2001.
Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці. Мінск, 1994.
Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов, XIX – начало XX в. Минск, 1983.

***Удзел у калектыўных працах:***

Этнаграфія і літаратура. Мінск, 2004.
Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. Т. 2. Мінск, 2002.
Народная культура Беларусі: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 2002.
Нацыянальны атлас Беларусі. Мінск, 2002.
Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: У 6 т. Т. 1. Мінск, 2001.
Беларусы: у 10 т. Т. 1. Мінск, 1995.
Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі. Мінск, 1993.
Промыслы і рамёствы Беларусі. Мінск, 1989.
Палессе. Матэрыяльная культура. Мінск, 1988.
Помнікі этнаграфіі. Мінск, 1981.

## ЦІШЧАНКА Віктар Васільевіч

Гісторык. Спецыяліст па праблеме функцыянавання вялікакняжацкай улады ў ВКЛ у канцы XIV – пачатку XVI ст. Кандыдат гістарычных навук (2007).

**Напрамкі даследаванняў:** палітычная сістэма ВКЛ у канцы XIV – пачатку XVI ст.; органы дзяржаўнай улады; манархі ВКЛ, іх адміністрацыйная, судовая, ваенная дзейнасць; арганізацыя дыпламатычнай службы ў ВКЛ.

***Адукацыя:*** аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Вялікакняжацкая ўлада ў структуры органаў дзяржаўнага кіравання ВКЛ у канцы XIV – пачатку XVI ст." (2007).

## ЧАКВІН Ігар Усеваладавіч



Гісторык, этнолаг, антраполаг. Спецыяліст па праблемах этнагенезу і этнічнай гісторыі беларусаў эпохі феадалізму. Аўтар больш за 20 антрапалагічных рэканструкцый твару і фізічнага тыпу беларусаў X–XVIII ст. Доктар гістарычных навук (1995), дацэнт (2010). Лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне" (2008).

**Напрамкі даследаванняў:** антрапалогія старажытнага і сучаснага насельніцтва Беларусі, палеадэмаграфія Беларусі X–XVI ст., этнасацыяльныя і канфесійныя працэсы ў Беларусі, фарміраванне этнічнай самасвядомасці, культура беларускага народа эпохі Сярэднявечча і Новага часу.

20.08.1954, Мінск – 26.04.2012.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1977), аспірантура Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (1980).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Праблема паходжання беларускай народнасці: гістарыяграфія і досвед вывучэння працэсу этнічнага фарміравання" (1981).

***Доктарская дысертацыя:*** "Этнічная гісторыя беларусаў эпохі феадалізму (XIV – першая палова XVII ст.)" (1995).

***Працоўная дзейнасць.*** Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы АН БССР / НАН Беларусі (1977–2012): малодшы навуковы супрацоўнік, старшы навуковы супрацоўнік, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела этналогіі.

***Асноўныя працы:***

Избранное: теоретические и историографические статьи по этногенезу, этническим и этнокультурным процессам, конфессиональной истории белорусов. Минск, 2014.

***Удзел у калектыўных працах:***

Нарысы гісторыі культуры Беларусі: у 4 т. Т. 1: Культура сацыяльнай эліты XIV – пачатку XX ст. Мінск, 2013.

Кто живет в Беларуси. Минск, 2012.

Этнокультурные процессы Восточного Полесья в прошлом и настоящем. Минск, 2010.

Беларусы: сучасныя этнакультурныя працэсы. Мінск, 2009.

Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве: вучэбна-метадычны дапаможнік. Мінск, 2009.

Беларусы: у 11 т. Т. 10: Славянскія этнакультурныя традыцыі. Мінск, 2007.

Беларусы: Вытокі і этнічнае развіццё. Т. 4. Мінск, 2001.

Этноконфессиональные процессы в Беларуси и формирование патриотизма. Минск, 2004.

Handbuch der Geschichte Weißrusslands. Göttingen, 2001.

Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мінск, 2000.

Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. Т 1: Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. Мінск, 1997.

Белорусы. Москва, 1998.

Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі. Мінск, 1993.

Белорусско-польские культурные связи. Минск, 1991.
Сям'я і сямейны быт беларусаў. Мінск, 1990.
Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. Мінск, 1990 .
Скарына і яго эпоха. Мінск, 1990.
Спадчына Скарыны. Мінск, 1989 .
Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1989.
Этнаграфія беларусаў: гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. Мінск, 1985.
Праблемы сучаснай антрапалогіі. Мінск, 1983.
Праблемы этнагенезу беларусаў у працах славянскіх вучоных. Мінск, 1982.

***Узнагароды, прызнанне.*** Лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" (2008, за ўдзел у напісанні 10-томнага выдання "Беларусы").

## ЧАМЯРЫЦКІ Вячаслаў Антонавіч



Літаратуразнаўца-медыевіст, крытык, культуролаг, перакладчык, пісьменнік. Спецыяліст па старажытнай беларускай літаратуры. Кандыдат філалагічных навук (1967). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994). Сябра Саюза пісьменнікаў СССР (1983). Сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**Напрамкі даследаванняў:** пісьмовая спадчына Беларусі, старажытная беларуская літаратура XI–XVIII ст., беларускае летапісанне, творчасць Францыска Скарыны.

Нарадзіўся 22.07.1936, в. Рабкі, Дзятлаўскі раён Гродзенскай вобласці.

***Адукацыя:*** беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта БДУ (1958), аспірантура Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1965).

***Працоўная дзейнасць:*** Слабадская сямігадовая школа, Вілейскі раён (1958–1959): настаўнік. Маладзечанская абласная газета "Чырвоны сцяг" (1959): карэктар. Аддзел народнай асветы Маладзечанскага раёна (1959–1962): інспектар. Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (з 1965): навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела старажытнай і новай беларускай літаратуры, галоўны навуковы супрацоўнік. Цяпер – на заслужаным адпачынку.

***Асноўныя працы:***

Жыватворная спадчына. Мінск, 2017.

Беларускі тытан эпохі Адраджэння (да 500-годдзя з часу нараджэння Францыска Скарыны). Мінск, 1990.

Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: Узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў. Мінск, 1969.

***Удзел у падрыхтоўцы да выдання помнікаў даўняга пісьменства Беларусі:***

Летапісы і хронікі Вялікага Княства Літоўскага (XV–XVII стст.). Мінск, 2015.

Беларускія летапісы і хронікі. Мінск, 1997.

Полное собрание русских летописей. Т. 35: Летописи белорусско-литовские. Москва, 1980.

Полное собрание русских летописей. Т. 32. Хроники: Литовская и Жмойтская, Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного. Москва, 1975.

Дыярыушы XVII стагоддзя (1594–1707 гады): Самуэль Маскевіч, Багуслаў Маскевіч, Піліп Абуховіч, Міхал Абуховіч, Тэадор Абуховіч. Мінск, 2016.

Рэлігійнае пісьменства кірылічнай традыцыі XI–XV стст. Мінск, 2013.

Літаратура XVII–XVIII стагоддзяў. Мінск, 2012.

Літаратура XI–XVI стагоддзяў. Мінск, 2011; 2012.

Славянамоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII стст. Мінск, 2011.

Беларуская літаратурная спадчына, XI–XX стст. [Электронны рэсурс]: [хрэстаматыя]. Мінск, 2007.

Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя. Мінск, 2003.

Францыск Скарына. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. Мінск, 1990.

***Удзел у калектыўных працах:***
Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. Мінск, 2006–2007; 2007–2010.
Францыск Скарына: энцыклапедыя. Мінск, 2017.
Гісторыя беларускай літаратуры: Старажытны перыяд. Мінск, 1985; 1996.
Скарына і яго эпоха. Мінск, 1990.
Францыск Скарына і яго час: Энцыклапедычны даведнік. Мінск, 1988.
История всемирной литературы. Т. 3, 4. Москва, 1985; 1987.
Францыск Скарына (1979, на французскай мове; 1980, на англійскай мове).
История белорусской дооктябрьской литературы. Мінск, 1977.
Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Т. 1. Мінск, 1968.

***Узнагароды, прызнанне.*** Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994). Медаль Францыска Скарыны. Імя В. А. Чамярыцкага ўнесена ў Кнігу Славы Навагрудскага раёна (2009).

## ЧАРАЎКО Віктар Уладзіміравіч



Гісторык, археолаг. Спецыяліст па познесярэднявечных пахаваннях на тэрыторыі Беларускага Падзвіння. Стваральнік гістарычнага сайта http://adverbum.org/. Кандыдат гістарычных навук (2020).

**Напрамкі даследаванняў:** рэлігійная гісторыя Беларусі XIII–XVIII ст., пахавальныя помнікі і пахавальныя традыцыі насельніцтва Беларускага Падзвіння XIV–XVIII ст.

Нарадзіўся 4.01.1985, Полацк.

***Адукацыя:*** гісторыка-філалагічны факультэт (2007) і магістратура (2008) Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта; аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (2012).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Пахавальныя помнікі Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стагоддзяў” (2019).

***Працоўная дзейнасць.*** Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (з 2008): старшы выкладчык кафедры гісторыі і турызму, старшы выкладчык кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі, загадчык кафедры сацыяльных камунікацый.

***Асноўныя працы:***
Сайт AdVerbum.org (2011), які ўтрымлівае сістэматызаваную калекцыю спасылак на кнігі, карты, фільмы, гуказапісы па гісторыі Беларусі і іншых галінах гістарычных ведаў.

***Удзел у калектыўных працах:***
Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке. Минск, 2012.

***Узнагароды, прызнанне.*** Прэмія Спецыяльнага фонда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі (2006, 2007, 2008).



## ЧАРОПКА Вітаўт (сапр. Віктар) Кузьміч

Пісьменнік, гісторык. Аўтар гістарычных раманаў, прысвечаных пераважна падзеям і асобам сярэднявечнай Беларусі, а таксама гісторыка-літаратурных нарысаў і артыкулаў па гісторыі Беларусі. Папулярызатар айчыннай гісторыі.

Нарадзіўся 21.08.1961, Мінск.

***Адукацыя:*** Па адукацыі – электрык на чыгунцы.

***Працоўная дзейнасць.*** Мінскі трактарны завод (1981–1990): сталявар. Часопіс “Хрысціянская думка” (1990–1993): рэдактар. Часопіс “Спадчына” (1993): рэдактар. Часопіс “Беларуская мінуўшчына” (з 1994): загадчык аддзела. “Беларускі гістарычны часопіс” (з 1998): супрацоўнік рэдакцыі.

***Асноўныя працы:***

Ян Караль Хадкевіч: да 400-годдзя Хацінскай бітвы. Мінск, 2021.
Сигизмунд Ягеллон. Минск, 2020.
Ольгерд. Минск, 2019.
Свидригайло. Минск, 2019.
Ягайло. Минск, 2018.
Геркулес, Руды і Пярун: Радзівілы-пераможцы. Мінск, 2014.
Великие князья Великого Княжества Литовского. Минск, 2012; 2013; 2017.
Великий князь Витовт. Минск, 2010.
Імя ў летапісе. Мінск, 1994; 2003; 2018.
Уладары Вялікага княства. Мінск, 1996; 2002; 2007.
Лёсы ў гісторыі: нарысы. Мінск, 2005.
Перамога ценю: Аповесці. Апавяданні. Эсэ. Мінск, 1996.
Гісторыя нашага імя: Гістарычнае даследаванне. Мінск, 1995.
Імя ў летапісе. Мінск, 1994.
Храм без бога. Мінск, 1992 (увайшла ў спіс "100 беларускіх кніг XX стагоддзя").

## ЧАРОПКА Станіслаў Аляксандравіч



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі казацка-сялянскай вайны 1648–1651 г. у Беларусі. Кандыдат гістарычных навук (2009), дацэнт (2011).

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя сацыяльнай барацьбы ў Беларусі ў сярэдзіне XVII ст., ваенная гісторыя і гісторыя міжнародных адносін ва Усходняй Еўропе ў XVI–XVIII ст.

Нарадзіўся 11.01.1977, в. Новазаслонава, Лепельскі раён, Віцебская вобласць.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны (1999), аспірантура БДУ (2005).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Казацка-сялянская вайна ў Беларусі 1648–1651 гг.” (2009).

***Працоўная дзейнасць.*** Пакалюбіцкая СШ (1997–2001): настаўнік гісторыі. Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны (з 2001): асістэнт, старшы выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі, дэкан гістарычнага факультэта.

***Навуковыя стажыроўкі, гранты***: Інстытут гісторыі Ягелонскага ўніверсітэта (Кракаў, Польшча, 2012). Варшаўскі ўніверсітэт (Польшча, 2013). Міжнародная школа вывучэння Халакоста “Яд Вашэм” (Іерусалім, Ізраіль, 2016). Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава (Расія, 2017). Міжнародны мемарыяльны комплекс Дом Ванзейскай канферэнцыі (Берлін, Германія, 2017). Універсітэт Эберхарда і Карла (Цюбінген, Германія, 2017).

***Удзел у калектыўных працах:***

Православие: история и современность: сборник научных статей. Гомель, 2017.

Беларусь і суседзі: гістарычны вопыт стасункаў народаў і дзяржаў Цэнтральна-Усходняй Еўропы: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. Гомель, 29–30 мая 2018 г. Гомель, 2018.

Гістарычныя шляхі беларускага народа і суседзяў: узаемадзеянне і ўзаемаўплывы: зборнік навуковых артыкулаў. Гомель, 2015.



## ЧЫРВІНСКІ Віталь Станіслававіч

Ваенны гісторык. Падпалкоўнік запасу. Галоўны гісторык (былы) Міністэрства абароны. Стваральнік ютуб-канала “Размовы аб ваеннай гісторыі Беларусі”

**Напрамкі даследаванняў:** ваенная гісторыя Беларусі, беларускія палкаводцы.

Нарадзіўся 15.05.1968, Мінск.

***Адукацыя:*** Бакінскае вышэйшае агульнавайскавое каманднае вучылішча (Азербайджан, 1992); гістарычны факультэт БДПУ імя М. Танка (2010).

***Працоўная дзейнасць.*** Узброеныя сілы Рэспублікі Беларусь: камандзір мотастралковага ўзвода, роты; начальнік штаба танкавага батальёна, мотастралковага батальёна; камандзір стралковага батальёна; намеснік начальніка штаба разведвальнага батальёна, (з 2007) начальнік групы ваенна-гістарычнага і геральдычнага забеспячэння ваенна-навуковага камітэта. Ваенная акадэмія (2013–2020): старшы выкладчык кафедры тактыкі.

***Асноўныя працы:***

Відэалекцыі па курсу “Ваенная гісторыя беларускага народа” // ютуб-канал “Размовы аб ваеннай гісторыі Беларусі”
https://www.youtube.com/channel/UCrAC4oObCLTvZoDueVFgbUQ
Беларусь у войнах Расійскай імперыі: асобы і падзеі. Мінск, 2019.
Беларусь у войнах. Асобы і падзеі. Мінск, 2016.
Палкаводцы і военачальнікі зямлі беларускай: камплект плакатаў. Мінск, 2013.

## ШАБЛЮК Валерый Уладзіміравіч



Археолаг, гісторык. Спецыяліст па гісторыі сельскіх паселішчаў Цэнтральнай Беларусі ў XIV–XVIII ст. Кандыдат гістарычных навук (1991).

**Напрамкі даследаванняў:** сацыяльна-эканамічнае развіццё сярэднявечных беларускіх сельскіх паселішчаў, мястэчак, маёнткаў у басейне ракі Нёман; гаспадарчая дзейнасць і матэрыяльная культура сельскага насельніцтва.

3.08.1953, г. п. Узда, Мінская вобласць – 2.05.1997.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт БДУ (1975).

***Кандыдацкая дысертацыя***: “Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння XIV–XVIII ст. (паводле археалагічных і пісьмовых крыніц)” (1991).

***Працоўная дзейнасць.*** Настаўнік гісторыі ў Мінску. Інстытут гісторыі АН Беларусі (1980–1997): навуковы супрацоўнік аддзела сярэдневяковай археалогіі.

***Асноўныя працы:***
Сельскія паселішчы Верхняга Панямоння: XIV–XVIII ст. Мінск, 1996.
***Удзел у калектыўных працах:***
Гісторыя сялянства Беларусі: у 3 т. Т. 1: Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. Мінск, 1997.



## ШАЛАНДА Аляксей Іванавіч

Гісторык. Спецыяліст па геральдыцы ВКЛ. Кандыдат гістарычных навук (2000), дацэнт. Заснавальнік (2001) і рэдактар часопіса "Герольд Litherland".

**Напрамкі даследаванняў:** геральдыка, сфрагістыка і вексілалогія ВКЛ; генеалогія і гісторыя шляхецкіх родаў ВКЛ; беларуская медыевістыка.

Нарадзіўся 31.05.1969, Гродна.
***Адукацыя:*** гістарычны факультэт (1993) і аспірантура ГрДУ імя Я. Купалы.
***Кандыдацкая дысертацыя***: "Шляхецкая геральдыка Беларусі ў другой палове XVI–XVIII ст." (2000).
***Працоўная дзейнасць.*** Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт. Інстытут гісторыі НАН Беларусі (2008–2020): старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі Сярэдніх вякоў і пачатку Новага часу, загадчык сектара геральдыкі і нумізматыкі аддзела спецыяльных гістарычных навук і інфармацыйна-аналітычнай работы; загадчык аддзела спецыяльных гістарычных навук і інфармацыйна-аналітычнай работы; загадчык аддзела генеалогіі, геральдыкі і нумізматыкі.
***Асноўныя працы:***
Код Францішка Скарыны. Геральдычныя матэрыялы ў пражскіх і віленскіх выданнях беларускага першадрукара. Мінск, 2017.
Таямнічы свет беларускіх гербаў. Шляхецкая геральдыка Вялікага княства Літоўскага. Мінск, 2014.

Сімвалы і гербы зямель Беларусі ў X–XVIII ст. геральдычна-сфрагістычныя нарысы. Мінск, 2012 (Прэмія Міжнароднага кангрэса даследчыкаў Беларусі за найлепшую навуковую публікацыю па гісторыі, 2013).

Метадычныя рэкамендацыі па апісанні сфрагістычных матэрыялаў XV–XVIII стст. у архівах Беларусі. Мінск, 2015.

Метадычныя рэкамендацыі па публікацыі польскамоўных дакументаў па гісторыі Беларусі XVI – першай паловы XIX ст. Мінск, 2012.

***Удзел у калектыўных працах:***

Чорная дама з Мірскага замка: княгіня Ганна Кацярына з Сангушкаў Радзівіл (1676–1746). Мір, 2020.

Валовічы герба "Багорыя". Мінск, 2019 (Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі).

Мір Радзівілаў: замак, мястэчка, графства (1568–1813 гг.): зборнік дакументаў і матэрыялаў. Мір, 2017.

Князі Друцкія-Горскія ў Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVIII стст. Мір, 2016.

Род Іллінічаў у Вялікім Княстве Літоўскім у XV–XVI ст.: радавод, гербы, уладанні. Мір, 2015.

Валовічы ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага XV–XVIII стст. Мінск, 2014.

Ягелоны: дынастыя, эпоха, спадчына: матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Гальшаны – Навагрудак, 8–10 верасня 2006 г. Мінск, 2007.

Узнагароды, прызнанне. Прэмія Міжнароднага кангрэса даследчыкаў Беларусі за найлепшую навуковую публікацыю па гісторыі (2013).

## ШНІП Макар Аляксандравіч



Гісторык. Спецыяліст па гісторыі палітычных падзей 1508 г. у ВКЛ. Кандыдат гістарычных навук (2010).

**Напрамкі даследаванняў:** унутры- і знешнепалітычная сітуацыя ў ВКЛ у пачатку XVI ст.

Нарадзіўся 26.04.1981.

***Адукацыя:*** гістарычны факультэт і аспірантура БДУ.

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Унутрыпалітычны канфлікт 1508 г. у Вялікім княстве Літоўскім у кантэксце міжнародных адносін ва Усходняй Еўропе" (2010).

***Працоўная дзейнасць.*** БДУ (2003–2005, 2007–2008): выкладчык кафедры гісторыі Беларусі Старажытнага часу і Сярэдніх вякоў. Ліцэй БДУ (2007–2019): намеснік дырэктара, дырэктар. Парк высокіх тэхналогій, Інавацыйная кампанія Promwad (з 2019).

***Навуковыя гранты і стажыроўкі.*** Інстытут гісторыі права Варшаўскага ўніверсітэта (2005–2006).

## ЮХО Іосіф (Язэп) Аляксандравіч



Вучоны-юрыст, гісторык права. Заснавальнік нацыянальнай гісторыка-прававой школы. Доктар юрыдычных навук (1982), прафесар (1983). Удзельнік падрыхтоўкі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. Ветэран Вялікай Айчыннай вайны.

**Напрамкі даследаванняў:** гісторыя дзяржавы і права Беларусі, ВКЛ; Статуты ВКЛ; Тадэвуш Касцюшка ў паўстанні 1794 г.

19.03.1921, Пінск – 29.07.2004.

***Адукацыя:*** Беларускі політэхнічны інстытут (1939), Мінскі юрыдычны інстытут (1949), аспірантура Інстытута філасофіі і права АН БССР (1954).

***Кандыдацкая дысертацыя:*** "Устанаўленне Савецкай улады ў Заходняй Беларусі ў 1939 г." (1954).

***Доктарская дысертацыя***: "Грамадска-палітычны лад і права Беларусі ў XVI ст." (1980, Кіеўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Т. Шаўчэнкі).

***Працоўная дзейнасць.*** Народны суддзя Варашылаўскага раёна г. Мінска (1949–1951). Інстытут філасофіі і права АН БССР (1954–1956): навуковы супрацоўнік. БДУ (1956–1961): дацэнт кафедры грамадзянскага і грамадзянска-працэсуальнага права. Юрыдычная камісія пры Савеце Міністраў БССР (1961–1964): намеснік старшыні. БДУ (1965–2004): дацэнт, загадчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, намеснік дэкана юрыдычнага факультэта, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

***Асноўныя працы:***

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэбны дапаможнік: у 2 ч. Мінск, 2000; 2003.

Дзяржаўнасць і права Беларусі са старажытных часоў да канца XVI ст. Ч. 1: Гістарыяграфія гісторыі дзяржавы і права феадальнай Беларусі. Мінск, 1999.

Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мінск, 1992.

Крыніцы беларуска-літоўскага права. Мінск, 1991.

За вольнасць нашу і вашу: Тадэвуш Касцюшка. Мінск, 1990.

Правовое положение населения Белоруссии в XVI ст. Минск, 1978.

***Удзел у калектыўных працах:***

Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы. Мінск, 2001; 2005; 2007.

Дзяржаўнасць і права Беларусі са старажытных часоў да канца XVI стагоддзя. Мінск, 1999.

Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 года. Мінск, 2003.

Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах са старажытных часоў да нашых дзён: вучэбны дапаможнік. Мінск, 2003.

Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мінск, 1989.

Мысліцелі і асветнікі Беларусі, X–XIX стагоддзі: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 1995.
“Нарадзіўся я ліцьвінам…”: Тадэвуш Касцюшка. Мінск, 1994.
Францыск Скарына і яго час: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 1988.
Юрыдычны энцыклапедычны слоўнік: А–Я. Мінск, 1992.

***Узнагароды, прызнанне.*** Баявыя ўзнагароды: ордэн Чырвонай зоркі, ордэн Вялікай Айчыннай вайны I ступені, медалі. Медаль Францыска Скарыны (1996). Лаўрэат навуковай прэміі імя У. І. Пічэты.

***Прысвечана вучонаму:***

Гісторыка-прававая навука: спадчына, стан і перспектывы: матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння прафесара І. А. Юхо, Мінск, 19–20 сакавіка 2021 г. Мінск, 2021.
Тарас А. Язэп Юхо: прапагандыст нацыянальнай гісторыі. Рыга, 2019 (100 выдатных дзеячаў беларускай культуры).
Гісторыя і сучаснасць: беларуская дзяржаўнасць ва ўсходнееўрапейскім цывілізацыйным кантэксце: зборнік навуковых прац, прысвечаных 90-годдзю з дня нараджэння прафесара І. А. Юхо. Мінск, 2012.
Памяць і слава: Іосіф Аляксандравіч Юхо: да 90-годдзя з дня нараджэння. Мінск, 2011.
Праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі: матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 90-годдзю з дня нараджэння І. А. Юхо, Мінск, 18–19 сакавіка 2011 г. Мінск, 2011.

## ЯКУБАЎ Віктар Уладзіміравіч



Гісторык. Спецыяліст па грамадска-палітычнай, ваеннай і эканамічнай гісторыі ВКЛ другой паловы XVI – першай паловы XVII ст. Кандыдат гістарычных навук (2013). Музыкант, удзельнік фольк-гурта "Княжыч".

**Напрамкі даследаванняў:** міжнародныя адносіны ў Еўропе і ваенныя канфлікты ВКЛ, сацыяльныя інстытуты ВКЛ, палітычная культура і міжканфесійныя адносіны ў Полацкім ваяводстве і Паўночнай Еўропе (другая палова XVI – першая палова XVII ст.), феномен этнічнасці і самасвядомасці ў эпоху Новага часу.

Нарадзіўся 12.09.1979, Наваполацк.

***Адукацыя:*** гісторыка-філалагічны факультэт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (2001), аспірантура Інстытута гісторыі НАН Беларусі (2007).

***Кандыдацкая дысертацыя***: "Інфлянты ў знешняй і ўнутранай палітыцы Вялікага княства Літоўскага ў канцы XVI – пачатку XVII стст." (2013).

***Працоўная дзейнасць.*** Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт (2007–2021): дацэнт, намеснік дэкана фінансава-эканамічнага факультэта.

